ISBN 978-985-581-439-0

Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі

ТОМ 2

Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі

ў рамках Года малой радзімы

У двух тамах

ТОМ 2

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь
Грамадскае аб’яднанне «Беларускі фонд культуры»
пры падтрымцы
Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

ПЕРШЫ РЭСПУБЛІКАНСКІ КРАЯЗНАЎЧЫ ФОРУМ БЕЛАРУСІ

ў рамках Года малой радзімы

Зборнік матэрыялаў

У двух тамах

Том 2

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2020

УДК 908(476)(082)
ББК 26.89(4Беи)я43
П27

Выданне ажыццёўлена пры падтрымцы генеральнага партнёра Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь – ЗТАА «Джапан Табака Інтэрнэшнл ЭсЭндДзі»

Укладальнікі:
П. М. Сапоцька, Ю. В. Юшкевіч

Рэдакцыйная калегія:
А. М. Карлюкевіч (старшыня), Т. І. Стружэцкі (намеснік старшыні), П. М. Сапоцька (намеснік старшыні), У. І. Адамушка, А. І. Бутэвіч, В. У. Ваніна, У. А. Гілеп, А. А. Гужалоўскі, Я. Л. Іванова, А. А. Каваленя, Н. У. Калымага, А. Я. Кравец, А. І. Лакотка, А. А. Лесін, І. А. Марзалюк, Р. С. Матульскі, С. С. Мітраховіч, В. Г. Пішчык, І. М. Пракаповіч, У. С. Пучынскі, В. Ю. Себруковіч, П. Я. Сухарукаў, А. А. Трусаў, Ю. В. Юшкевіч

Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой радзімы : зборнік матэрыялаў. У 2 т. Т. 2 / укл. : П. М. Сапоцька, Ю. В. Юшкевіч ; рэдкал. : А. М. Карлюкевіч (старшыня) і інш. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2020. – 476 с.

П27

ISBN 978-985-581-439-0.

Зборнік уключае ў сябе даклады ўдзельнікаў Першага Рэспубліканскага краязнаўчага форуму Беларусі, які адбыўся 12–13 сакавіка 2020 г. у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у рамках Года малой радзімы. У другім томе змешчаны артыкулы ўдзельнікаў секцый «Экалагічнае краязнаўства і турыстычная дзейнасць», «Асоба ў краязнаўстве: з гісторыі біяграфій беларускіх краязнаўцаў», «Пазашкольнае краязнаўства: вопыт рэгіёнаў» і студэнцкай канферэнцыі «Моладзь і краязнаўства».

Выданне адрасавана навукоўцам, гісторыкам, настаўнікам, студэнтам, школьнікам, краязнаўцам і ўсім зацікаўленым вывучэннем і даследаваннем роднага краю.

УДК 908(476)(082)
ББК 26.89(4Беи)я43

ISBN 978-985-581-439-0 (т. 2)
ISBN 978-985-581-437-6

© Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, 2020
© Сапоцька П. М., Юшкевіч Ю. В., укладанне, 2020
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2020

СЕКЦЫЯ «АСОБА Ў КРАЯЗНАЎСТВЕ: З ГІСТОРЫІ БІЯГРАФІЙ БЕЛАРУСКІХ КРАЯЗНАЎЦАЎ»

НІНА БОХАН: САМАБЫТНАЯ МАСТАЧКА, ЯКАЯ МАЛЯВАЛА ДЫВАНЫ І ГРОШЫ

Антонава Галіна Францішкаўна,
загадчык аддзела культуры, маралі і права
ўстановы «Рэдакцыя газеты «Светлы шлях»,
г. Смаргонь

Практычна дэтэктыўная гісторыя, пра якую пойдзе размова, пачалася напрыканцы студзеня 2019 года. Аляксей Крукоўскі з Мінска, сябра Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, даслаў мне фота, зробленае падчас экспедыцыі па Смаргоншчыне летам 2018 года. На здымку – маляваны дыван, які ўдзельнікі экспедыцыі купілі ў вёсцы Лісічына.

Маляванка ўразіла сваім самабытным дзіцяча-наіўным «почыркам», незвычайным сюжэтам і яркасцю фарбаў. Яшчэ адну маляванку этнографам перадала журналістка Святлана Станкевіч, шукальніца скарбаў даўніны, якая літаральна выцягнула яшчэ адных «аленяў» з-пад завалаў старой хаты ў Клочках. Знойдзены дыван аказаўся вельмі падобным да лісічынскага.

«У 20–30-я гады мінулага стагоддзя ў кожнай сялянскай хаце сцены былі ўпрыгожаны маляванымі дыванамі. Да народных майстроў цягнуліся людскія душы – усім жадалася ўнесці ў сваё жытло шчасце і свята» [1, с. 4].

На падставе ўнікальнай калекцыі гісторыка-культурнага запаведніка «Заслаўе» (каля 200 адзінак), сабранай па крупіцах з розных куткоў краіны, упершыню ў Беларусі пабачыла свет выданне «Беларускія маляваныя дываны». Альбом «распавядае пра феномен народнай творчасці, дзякуючы якой у самыя цяжкія гады станаўлення нашай дзяржавы народ імкнуўся захаваць нацыянальныя традыцыі» [1, с. 4].

«Язэп Драздовіч, Алена Кіш, Фёдар Сухавіла, Ядвіга Вайцешык, Генадзь Кузаўкоў – гэта далёка не ўсе імёны, якія дайшлі да нашага часу, але творы гэтых мастакоў застануцца ў нашай памяці» [1, с. 5].

У гэтым спісе пакуль няма імя самабытнай мастачкі Ніны Бохан, якое мы раскрылі. І прадаўжаем гэта рабіць.

Выпадкова нам стала вядома, што на Смаргоншчыне была самадзейная мастачка. Тады ўпершыню я пачула пра Боханіху – менавіта так называлі па-мясцоваму Ніну Бохан. У цяжкі пасляваенны час, здавалася б, усім было не да карцін. А жанчына хадзіла па вёсках і зарабляла на хлеб маляваннем. Людзі, хоць і жылі бедна, але шукалі спосабы ўпрыгожыць сваё жыллё.

Калі я расказала Аляксею Крукоўскаму пра свае здагадкі наконт аўтарства «аленяў», ён зацікавіўся асобай Ніны Бохан і актыўна далучыўся да пошуку інфармацыі па-за межамі Смаргоншчыны.

Так, 62-гадовая смаргонка Наталля Трацяк узгадала, што яна была даволі малая, але помніць Нініны работы. У суседзяў мастачка размалявала дзверы і сцяну, а яе дываны былі практычна ў кожнай укропенскай хаце. Маляванка з Лісічына падобная да тых. Мая суразмоўца прыпомніла, што на адной карціне маглі быць і возера з лебедзямі, і алені, і бярозы, і кветкі буйныя – ружы і лілеі. Маляванкі нагадвалі дзіцячы малюнак, толькі вялікага памеру. Вядома, гэта не пейзажы Шышкіна ці Левітана, але ў сціплы хатні інтэр'ер яны цудоўна ўпісваліся.

91-гадовая маці Наталлі Трацяк расказвала, што Ніна з'явілася ва Укропенцы пасля вайны не адна – з братам і сёстрамі. Яны былі, як казалі людзі, «бежанцамі». Бацькоў не мелі, жылля таксама; хадзілі па людзях. Ніна малявала, старэйшая сястра і брат дапамагалі ёй. У месцы, дзе працавалі, там і жылі. У астатні час спыняліся ў лесе, паміж Чарнятамі і Укропенкай, у адной з зямлянак, дзе вайной хаваліся мясцовыя жыхары. Той акоп у народзе празвалі Боханіхін.

Боханы на Смаргоншчыну прыйшлі з Вілейскага раёна. Жылі ў вёсцы Пукелы (цяпер Засценкі). Бацька Ніны таксама быў мастаком. Ён вёў вандроўны лад жыцця. Смаргонец Міхаіл Бохан, 76-гадовы стрыечны пляменнік мастачкі, прыпомніў, як яшчэ падлеткам з мамай трапіў у царкву ў вёсцы Ручыца Вілейскага раёна. Мама тады ўзгадала, што на пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя родны брат яго дзеда Сцяпан Бохан распісваў царкву. Яму сказалі, што фрэскі і дагэтуль захаваліся.

У сеціве фотаздымкаў з роспісамі Ручыцкай царквы не знайшлося. Давялося ехаць на Вілейшчыну, каб на свае вочы пабачыць, што захавалася. Фрэскі сапраўды ёсць. Высока пад столлю. Сцены святыні шмат разоў перабельвалі, але ні ў каго не паднялася рука поўнасцю знішчыць старыя роспісы. Вобразы святых выглядаюць, як аплікацыі на выбеленым фоне. На жаль, ні мясцовыя жыхары, ні святар нічога не ведаюць пра аўтарства гэтых роспісаў.

Міхаіл Бохан з усіх дзяцей дзядзькі найбольш помніць Ніну. Яна нарадзілася ў 1917 годзе. Пасля вайны зусім нядоўга жыла ў смаргонскім Доме

культуры, дзе ёй адвялі невялікі пакойчык. Афармляла наглядную агітацыю, афішы для кіно, а таксама стварала маляванкі.

1947 год стаў трагічным у лёсе мастачкі. У Вільні яе злавілі з падробнымі грашыма: сама намалявала. У міліцыю пра яе, быццам, данёс кавалер, калі ўбачыў, як Ніна капіруе асігнацыі. Свой тэрмін, сем гадоў, адбывала на Калыме. Гісторыя з Нінай і падробнымі грашыма ператварылася ў народны жарт. Працяглы час людзі яе ўспаміналі прыслоўем: не маеш грошай – ідзі да Боханіхі, хай намалюе.

Ніна вярнулася з Калымы на Смаргоншчыну ў 1954 годзе. Пасялілася ў Чарнятах – прытуліла жанчыну цётка Броня, удава Нінінага стрыечнага брата. Малявала Ніна вельмі шмат. Працавала ў хляве ці пад паветкай. Розныя дываны з лебедзямі, аленямі, прыродай, кветкамі прадавала па вёсках і ў Смаргоні на кірмашы. Афармляла насценную агітацыю, плакаты з надпісамі кшталту «дагонім, перагонім, пераможам». Пісала па клетачках партрэты правадыроў – Леніна і Сталіна. Каб карціна была больш трывалай, аснову грунтавала растворам крухмалу ці зубнога парашку. Фарбы купляла ў Смаргоні ў нейкай Зязюлі, якая прывозіла фарбы з Вільні. Яны былі вельмі яркія, з гадамі зусім не бляклі.

Той, хто бачыў, як працуе мастачка, гаварылі, што эскізаў яна не рабіла, трафарэтамі ніколі не карысталася. А малявала на ўсім, што людзі прапаноўвалі, – на старых капах, на дзіцячых коўдрах, цыратах, паперы, кардоне, на саматканай тканіне. Размалёўвала шафы, люстэркі, сцены.

У Чарнятах Ніна пражыла да канца 1950-х гадоў, пакуль сын гаспадыні не ажаніўся. Адтуль яна накіравалася да малодшай сястры Веры ў Ленкаўшчыну Маладзечанскага раёна. Пасля гэтага Міхаіл бачыў цётку толькі аднойчы, калі на пачатку 1970-х гадоў яна заязджала ў госці.

Прыкладна ў 1963–1964 гадах Ніну бачылі на Астравеччыне. Сын Броні, Аляксандр Бохан, з жонкай Фаінай перабраўся ў вёску Віктасіна. Пачаў там будаваць дом. Іх дачка Людміла Гродзь з вёскі Варона Астравецкага раёна расказала, што ёй было гадоў шэсць, калі ў іх доме з'явілася сваячка-мастачка. Ніна жыла ў іх, харчавалася і малявала. Рабочым кабінетам ёй служыў вялікі пакой у хаце, у ім тата Людмілы яшчэ нават падлогу не паслаў. Яна малявала вялікія і малыя вянкі з кветак, казачныя сюжэты, жывёл (звычайна аленяў ці ласёў), лебедзяў. Хадзіла па вёсках, каб прадаць свае маляванкі. Там таксама спынялася ў мясцовых людзей і малявала, а пасля вярталася ў Віктасіна. Прыгожы дыван (з выявамі трох волатаў) знайшоўся ў Варнянах, а пазней і ў іншых вёсках Астравеччыны.

У Маладзечанскім раёне выявіліся раннія работы Ніны Бохан – «кветкавы» абрус і вельмі цікавы абраз Святой Кацярыны. Многае распавяла пра сваячку пляменніца Галіна з Радашковічаў.

Пазней аказалася, што працяглы час (у 70-я гады мінулага стагоддзя) мастачка жыла і малявала ў вёсках Смаргонскага раёна. Усе насілі Ніне Бохан свае старыя капы, а мастачка ператварала іх у квяцістыя дываны. Адзін такі мы знайшлі ў Сяльцы, адзін – у Наваспаску і тры – у Сіньках.

У Сяльцы, у хаце 85-гадовай Галіны Вяршковіч, чакаў незвычайны скарб – карціны, што малявала Ніна Бохан на сценах. На выяву трох волатаў павесілі сучасны дыван. Дзве іншыя карціны заклеілі шпалерамі. Тым не менш гаспадыня, убачыўшы зацікаўленасць да насценных малюнкаў, дазволіла нам іх «адкрыць» – зняць шпалеры. На адной сцяне – казачныя павы (паўліны) на ярка-блакітным фоне. На другой – плывуць лебедзі.

Ларыса, дачка Галіны Вяршковіч, успамінае пра нязвыклую тэхніку стварэння гэтых карцін: Ніна малявала знізу ўверх. Напрыклад, пачынала з хваста паўліна і пайшла-пайшла ўверх. Гэта здзіўляе, бо звычайна чалавека ці жывёлу пачынаюць маляваць з галавы.

Галіна Вяршковіч успамінае, што Ніна прыйшла ў Сялец з Ленкаўшчыны. Там жыла яе малодшая сястра. Мастачка была вельмі простая ў зносінах, неперабарлівая ў ежы, худзенькая. Па ўсім было відаць, што многа гаравала. Вялікіх грошай за работу ў людзей не прасіла. Сярод сясцёр і брата (якія былі шатэнамі з прамымі валасамі) яна найперш выдзялялася цёмненькай шавялюрай. Фарбавала вусны і вочы (што на той час было рэдкасцю), сачыла за модай. Галоўны аксесуар, па якім здалёку пазнавалі мастачку, – вялікі драўляны чамадан, дзе знаходзіліся пэндзлі і фарбы.

Ад пляменніцы Ніны стала вядома, што цётка памерла прыкладна ў 1980 годзе ў смаргонскай бальніцы. На жаль, радня не ведала, дзе яе пахавалі. Мы настойліва шукалі месца пахавання мастачкі. Абышлі старыя смаргонскія могілкі. Дакументацыі пра пахаванні тут ніхто ніколі не вёў. Звестак пра Ніну няма ні ў смаргонскай бальніцы (інфармацыя пра хворых ёсць толькі за апошнія 25 гадоў), ні ў пашпартна-візавай службе, ні ў загсе. Супрацоўнікі загса высунулі версію, што мастачка магла жыць без пашпарта. І гэту версію пацвердзіў Міхаіл Бохан. Таму не захавалася і пасведчання аб смерці.

Людзі часам называлі Ніну Бохан жабрачкай. А на мой погляд, яна ў прамым сэнсе была вольнай мастачкай. На гэты час мы знайшлі каля трыццаці яе работ.

Папулярнае апошнім часам стварэнне муралаў – карцін на сценах гарадскіх дамоў – дало магчымасць мне памарыць. Я выразна ўяўляю, як цудоўна глядзеліся б алені, паўліны ці лебедзі на сценах смаргонскіх будынкаў. Такім чынам можна было б увекавечыць імя малавядомага пакуль народнага таленту.

Літаратура

1. Беларускія маляваныя дываны. Альбом-каталог / І. Арцем'ева. – Мінск : РЫФТУР, 2005. – 64 с.

2. Драздовіч, Я. Альбом. Біяграфія і спадчына / У. І. Пракапцоў. – Мінск : Беларусь, 2012. – 95 с.

3. Песня аб райскім жыцці. Маляваныя дываны Алены Кіш / Н. В. Русаковіч. – Мінск : Беларусь, 2016. – 72 с.

ТРАПЕЗНИКОВА ЕВГЕНИЯ АНАТОЛЬЕВНА: УЧИТЕЛЬ, КРАЕВЕД, ПОИСКОВИК

Антонова Ксения Александровна,
учитель истории, главный хранитель фондов
Народного музея боевой славы
ГУО «Средняя школа № 2 г. Новополоцка»,
г. Новополоцк

История страны, республики, деревни складывается из биографий и судеб отдельных граждан. В каждом городе, поселке, деревне есть люди, о которых хочется рассказать всем. В мире все связано. Изучая историю своей малой родины, мы волей-неволей знакомимся с людьми, жившими в то или иное время, людьми, родившимися на этой земле или переехавшими по каким-то причинам. Героиня моей работы родилась и выросла далеко от того места, где прошла вся ее сознательная жизнь, но считала это место своей малой родиной.

Определенное время выдвигает своих героев. Это не обязательно герои военных действий. В мирное время героями можно назвать людей, которые оставляют после себя, а может и при жизни, что-то важное, то, благодаря чему их будут помнить потомки.

Евгения Анатольевна Трапезникова (Котлярская) родилась 7 декабря 1930 г. в г. Херсоне Украинской ССР. Как бы тяжело не было в те годы, воспоминания детства всегда светлые и радостные. В июне 1941 г. Женю отправили в пионерский лагерь, который находился в г. Цюрупинске Херсонской области. Однако началась война. Родители стали срочно забирать детей из лагеря. Оставшиеся там ребятишки возвращались домой на трех пароходах под флагами Красного Креста. Налетели немецкие бомбардировщики, обрушились десятки бомб. Кругом крики тонущих, скрежет металла, огонь... К берегу причалил только один пароход. На нем находилась и маленькая Женя...

Именно тогда девочка впервые столкнулась со страшной правдой войны. А потом… Вместе с мамой Лидией Марковной Котлярской (отец погиб во время войны в Испании) и парализованной бабушкой они эвакуировалась в г. Балахну Нижегородской области РСФСР.

В Балахне Женя пошла в 3-й класс, любила петь и танцевать, а в мечтах видела себя артисткой – но не стала ей. В 1949 г. она окончила школу и поступила в Костромской педагогический институт на специальность «учитель русского языка и литературы». Годы учебы – это были годы, где у нее появилось много друзей, которые помогали ей выжить в то нелегкое послевоенное время. Лидии Марковне жилось непросто, она не всегда имела возможность помочь дочери деньгами или продуктами.

После окончания института Евгению направили на работу в г. Дрегли Новгородской области учителем русского языка и литературы. А учитель – это тот же артист, который каждый день должен выходить на «сцену» к доске и «играть» свою роль. Она не играла. Она жила этим. Поэтому школьники были очень расстроены, когда их педагога избрали вторым секретарем Дрегельского РК ВЛКСМ.

Период с августа 1955 по август 1957 г. – комсомольская, затем партийная работа. А потом снова школа, но теперь уже в г. Крестцы Новгородской области. В 1957 г. Евгения Котлярская вышла замуж за Андрея Трапезникова, который после окончания Ленинградской лесотехнической академии работал лесничим Дрегельского лесхоза.

В ноябре 1964 г. семья уже вместе с дочерью и Лидией Марковной приехали в строящийся город на Двине – Новополоцк.

Свой трудовой путь в Нефтеграде Евгения Трапезникова начинала заведующей детсадом № 6, затем работала ответственным секретарем Новополоцкой городской организации общества «Знание».

С 1 сентября 1967 г. ее жизнь связана со средней школой № 2.

В ее первом 8 «Б» классе из 34 учащихся – 24 мальчика. Были и трудные. «Чем заинтересовать ребят»? – думала не раз Евгения Анатольевна. Как-то прочитала книгу М. С. Прудникова «Неуловимые» действуют». Автор рассказывал о партизанской бригаде, которая в годы Великой Отечественной войны дислоцировалась в районе Полоцка [1].

Знакомясь с книгой, Евгения Анатольевна встречала знакомые фамилии и думала: рядом с нами живут такие замечательные люди, а мы ничего не знаем о них. На следующий день, придя в школу, объявила ребятам, что после уроков будем читать книгу. Остались все, однако слушали неохотно, отвлекались. Но постепенно увлеклись. Очень взволновали смелые действия начальника разведки Ивана Колосова, который, как оказалось, жил в Новополоцке и работал в ювелирном магазине.

Через несколько дней И. Н. Колосов уже выступал в актовом зале школы с воспоминаниями о своих соратниках по оружию, подсказал, кто из них живет в Новополоцке, в других городах, дал их адреса. Встречи, переписка и снова встречи. Эта работа послужила толчком для организации в школе первого отряда красных следопытов, куда вошел весь 8 «Б», и началом создания музея боевой славы.

Музей открылся в 1970 г. и был посвящен боевому пути бригады «Неуловимые». Позже музей пополнился многочисленными материалами о партизанском движении на территории Полотчины, героях-освободителях Полоцка. В 1994 г. музею было присвоено звание «Народный», которое затем подтверждалось в 2000, 2004 г. (решения коллегии Управления культуры Витебской области: № 5 от 28.04.1994 г., № 3 от 27.09.2000 г., № 4 от 26.05.2004 г.) в 2009 г. (решения коллегии Министерства Республики Беларусь № 62 от 22.04.2009 г.), в 2014 г. (рашэнне калегіі Міністэрства Рэспублікі Беларусь № 62 ад 18.06.2014 г.), в 2019 г. (постановление Министерства Культуры Республики Беларусь № 35 от 10.06.2019 г.).

Город Новополоцк молодой, и построен он на месте деревень, которых сейчас уже нет, и, казалось, ничего в нем не напоминает сегодня о войне. Но когда ребята с увлеченным педагогом решили написать историю города, то узнали, что на месте промышленной зоны было 26 деревень, а в годы Великой Отечественной войны на территории города был создан и действовал отряд «Смерть фашизму» бригады имени Ворошилова, что 220 земляков не вернулись с фронта, что при освобождении деревни Троецкое погибли четыре Героя Советского Союза: Федор Вознесенский, Михаил Виноградов, Иван Жагренков и Владимир Рублевский [2]. Работая в ЦАМО, Евгения Анатольевна с ребятами подготовили списки воинов 6-й гвардейской и 4-й ударной армий, погибших при освобождении Полоцка и Полоцкого района. Установили фамилии двух экипажей сбитых советских самолетов: Шкарпетов А. и Каргин Г. (Ил-2) и командир Петров В., штурман Кучеренко Ф., стрелок-радист Сотников М. и Плясуков И. К. (Ил-4). Найдена могила Сотникова М., позднее он был перезахоронен в братскую могилу в Боровухе-1 [1]. Благодаря поисковым работам и работе в архиве, ребята определили 12 мест падения сбитых советских самолетов и фамилии летчиков. Двум из них были установлены памятники.

Вместе с учениками Е. А. Трапезникова исходила сотни километров в поиске безымянных воинских захоронений, не раз принимала участие в вахтах памяти, в том числе международных, занималась благоустройством братских могил. Вместе со своими воспитанниками неоднократно работала в Центральном архиве военно-медицинской академии г. Подольска Российской Федерации. Причем новополоцкие школьники были первыми в Со-

ветском Союзе детьми, кому это было разрешено. По инициативе и непосредственном участии Евгении Трапезниковой в Новополоцке и Полоцком районе установлены памятники погибшим в годы войны солдатам и мирным жителям, перезахоронено с воинскими почестями более 1000 защитников Отечества. Трапезникова вела большую работу по установлению имен павших героев, поиску их родственников, проводила встречи с ветеранами Великой Отечественной войны и семьями погибших воинов.

Евгения Анатольевна была членом рабочей группы редколлегии Полоцкой районной и городской «Книг памяти», активно участвовала в работе координационного совета областного историко-патриотического объединения «Пошук». Неоднократно избиралась депутатом городского Совета депутатов.

Имя Е. А. Трапезниковой представлено в сборниках «Кто есть кто в Республике Беларусь» и «Краеведы Витебщины». Она – Почетный гражданин города Новополоцка, отмечена нагрудными знаками СССР и БССР «Отличник просвещения», «За активный поиск» Минобороны Беларуси и России, медалями «За заслуги в увековечивании памяти погибших защитников Отечества», «За заслуги перед городом Новополоцком», «Ветеран труда», юбилейными медалями, множеством других наград областного и республиканского значения, а также Российской Федерации.

О работе клубов красных следопытов и поискового отряда «Разведчики воинской славы», который действовал в ГУО «Средняя школа № 2» под руководством Евгении Анатольевны более 25 лет, она рассказала в написанных ей трех книгах: «Партизанскими тропами» (1979), «Мы ищем на земле ровесников следы» (2008), «Если бы камни могли говорить…» (2015).

Благодаря собранным архивным материалам в 2017 г. начата работа над научно-образовательным проектом «Полоцк. Освобождение. Память». Проект является результатом работы сотрудников, студентов и магистрантов кафедры истории и туризма гуманитарного факультета и факультета информационных технологий Полоцкого государственного университета совместно с музеем боевой славы средней школы № 2 г. Новополоцка.

Данная работа ведется в рамках Постановления Совета Министров Республики Беларусь от 4 июня 2014 г. № 534 «Об утверждении Государственной программы на 2015–2020 годы по увековечению погибших при защите Отечества и сохранению памяти о жертвах войн», направленной «на гражданско-патриотическое воспитание, формирование уважительного отношения к погибшим при защите Отечества, событиям, вошедшим в историю Беларуси как символы героизма, мужества, стойкости и самопожертвования народа».

Цель проекта – предоставление информации о погибших солдатах Красной Армии и местах их захоронения и о фронтовиках, оставивших после себя воспоминания о событиях освобождения Полотчины летом 1944 г.

Даже уйдя на пенсию, Евгения Трапезникова оставалась преданной своему делу. Откликалась на обращения людей, которые до сих пор ищут могилы своих родных и близких, павших в годы войны. Занималась систематизацией списков летчиков, которые погибли при освобождении Полоцка, с целью увековечить память о них. Не успела…

14 декабря 2018 г. перестало биться сердце Евгении Анатольевны Трапезниковой – великой труженицы, Педагога, общественного деятеля, матери, бабушки, прабабушки.

«Последним делом Евгении Трапезниковой», как назовут его журналисты, стало перезахоронение в канун 9 мая 2019 г. останков героически погибшей в годы войны молодой разведчицы Никишиной Елизаветы Борисовны. Ее подвиг и даже имя могли навсегда исчезнуть из истории, если бы не новополочане и продолжатели дела Евгении Трапезниковой.

В ноябре 2019 г. ГУО «Средняя школа № 2 г. Новополоцка» присвоено почетное звание «Школы мира». Этот проект реализуется в Витебской области с 2018 г. Первым в области учебным заведением, получившим это звание, стала СШ № 1 г. Городка, вторым – СШ № 28 г. Витебска, третьим – СШ № 2 г. Новополоцка. Решение присвоить новополоцкой СШ № 2 звание «Школы мира» принято областной организацией Белорусского фонда мира за многолетнюю и плодотворную работу по увековечению памяти защитников Отечества, гражданско-патриотическое воспитание подрастающего поколения.

2020 г. богат на юбилейные даты, значимые для нашей страны, нашего города, нашей школы: мы отмечаем 75-ю годовщину Победы советского народа в Великой Отечественной войне, 50-летие школьного Народного музея боевой славы и 90-летие со дня рождения Почетного гражданина города Новополоцка, талантливого педагога, краеведа, поисковика Трапезниковой Евгении Анатольевны. Ее нет с нами, но остался музей, который и сегодня живет активной и насыщенной жизнью. Остались памятники и мемориалы, которые появились благодаря ей. Остались соратники-поисковики, которые продолжают начатую ею работу. Остались ее ученики, в воспитание которых она искренне вкладывала свои сердце и душу. Остались ее дети, внуки, правнук… Осталась память.

Литература

1. Народный музей боевой славы ГУО «Средняя школа № 2 г. Новополоцка» (НМБС). – Ф. 3. Оп. 1. Д. 223–228.

2. Трапезникова, Е. А. Если бы камни могли говорить… / Е. А. Трапезникова. – Новополоцк, 2015. – 32 с.

СЛОВО О БОБРУЙСКОМ ИССЛЕДОВАТЕЛЕ ВАЛЕРИИ МЕЛЬНИКОВЕ

Овсейчик Инна Вячеславовна,
старший научный сотрудник
УК «Бобруйский краеведческий музей»,
г. Бобруйск

Имя этого исследователя не стоит в ряду широко известных историков. Так сложилась судьба уроженца г. Молодечно Валерия Федоровича Мельникова, что после окончания истфака БГУ в 1973 г. он был призван в Вооруженные Силы СССР и после прохождения срочной службы принял решение остаться в армии. И только двадцать лет спустя, после увольнения в запас, он снова вернулся к истории – стал работать преподавателем этого предмета в Воспитательной колонии № 2 для несовершеннолетних в г. Бобруйске. Увлекся историческим краеведением.

Валерий Мельников (1949–2017) был настоящим, глубоким исследователем. Краеведы и люди, интересующиеся историей, связывают его имя в первую очередь с изучением Бобруйской крепости.

В Беларуси есть немало специалистов по фортификационным сооружениям XX в. и практически нет исследователей сооружений первой половины XIX в., к которым относятся Бобруйская и Брестская крепости. Сотрудникам Бобруйского краеведческого музея, историкам и другим краеведам к началу XXI в. удалось только в общих чертах разобраться с оборонительными сооружениями крепости на Березине. В немногочисленных публикациях хватало ошибок и неточностей. Но вот около семи лет назад наконец-то нашелся человек, кому оказался по зубам такой крепкий орешек, как Бобруйская крепость. Это Валерий Федорович Мельников, историк и бывший офицер, который более пяти лет служил в Бобруйской крепости.

Он умел анализировать старые планы крепости и как никто мог их читать, потому что для несведущего человека (даже историка) многие линии и цифры на плане оборонительного сооружения XIX в. скажут немного. В отличие от многих любителей фортификации, он не просто осматривал сооружения, а вместе с учащимися гимназии № 3 г. Бобруйска (в гимназии он вел кружок) производил обмеры казематов, определяя толщину стен и другие параметры. Сопоставляя натурные исследования с планами объектов, с фотографиями разных периодов, делал выводы о том, что представляло собой сооружение в реальности, и собственноручно чертил планы укреплений. Ведь не раз оказывалось, что в действительности вместо одного сооружения было построено другое или с меньшим количеством казематов.

Валерия Федоровича всегда интересовала реальная, невымышленная история. «Я не собираю сказки, а изучаю крепость с рулеткой в руках, используя интернет и библиотеки… Но основной источник моих знаний – это архивы» [4, с. 5].

Создатели подземных «тайн» и «очевидцы» рассказывали, как в детстве по подземному ходу из крепости под Березиной добирались до поселка Титовка. А В. Мельников среди прочих изданий XIX в. изучил «Памятную книгу для инженерных и саперных офицеров», разобрался, какие подземные ходы строили военные инженеры в крепостях – с какой целью, какой высоты, протяженности. Изучил информацию о подземных войнах в России и других странах в разные периоды истории. И, разумеется, обследовал потерны и противоминные галереи непосредственно на территории нашей крепости, придя к выводу, что подземных ходов длиной в полкилометра не существовало и не существует. Написал он в подробностях и о технологии производства кирпичей и известкового раствора, раскрыв секреты прочности кирпичной кладки.

Интернет во многом облегчал работу исследователя, но на поиски необходимых сведений уходило немало времени. Представьте себе монотонное пролистывание полного собрания законов Российской империи, издания «Столетие военного министерства» в пятидесяти томах, «Памятных книжек Минской губернии» разных лет и других материалов. Кстати, В. Мельников умел признавать ошибки, которые допускал сам. Если в информации, добытой из архивных источников, обнаруживались новые факты, он переделывал разделы по фортификации Бобруйской цитадели. Отдельные его статьи были размещены на сайте Бобруйского горисполкома в разделе «Историко-культурное наследие» [2, с. 5], но любители истории не всегда могли найти их там. И тогда Валерий Федорович разместил свои материалы на одном из бобруйских форумов. Вот что сам он написал о цели новой темы на форуме: «Крепость – одна из главных исторических достопримечательностей города. Но для многих бобруйчан терминология русской фортификации XIX в. – тайна за семью печатями. Они с легкостью редюиты называют бастионами, оборонительные башни – фортами, казематы – редутами и т. д. Цель данной темы – помочь горожанам ликвидировать этот пробел и научить правильно читать “каменные страницы” Бобруйской крепости» [3, с. 5].

Валерий Федорович изучал историю строительства Бобруйской крепости и назначение оборонительных сооружений, определял значения фортификационных названий и терминов, кропотливо собирал сведения о крепостной артиллерии, органах управления, биографии комендантов и инженеров, систематизировал материалы о военно-рабочих и арестантских ротах Бобруйской крепости. Свой труд он не успел довести до конца. 17 апреля 2017 г. Валерия Мельникова не стало. Но материалов по Бобруйской кре-

пости к этому времени им было собрано уже немало, поэтому его родными и близкими, а также краеведами было принято решение подготовить их к публикации в виде книги. В 2020 г. она должна увидеть свет.

Но это только одна из тем, которые интересовали В. Мельникова. В период работы преподавателем истории в воспитательной колонии он стал заниматься поисковой работой. Вместе с учащимися направлял запросы в архивы Беларуси и России, вел переписку с историками, архитекторами, журналистами. Начинал с изучения истории Бобруйской воспитательной колонии № 2 и в 2009 г. создал там музей. Научно-исследовательские работы, написанные учащимися под руководством В. Ф. Мельникова, не раз занимали первые места на конкурсах в области и в республике. Своей энергией, страстью к исследовательскому делу он смог увлечь даже малолетних правонарушителей. Под влиянием этого талантливого преподавателя несколько бывших воспитанников колонии получили высшее образование, а один из них сегодня работает в архиве. Неудивительно, что преподаватель В. Ф. Мельников был награжден почетными грамотами Министерства внутренних дел Республики Беларусь «за эффективные результаты, весомый и плодотворный вклад в общеобразовательное обучение осужденных».

Вот только некоторые из тем исследовательских работ, которыми занимались учащиеся Бобруйска под руководством В. Ф. Мельникова: «Последний подвиг комбата» (о командире танкового батальона Николае Изюмове), «Чапаевцы» (боевой путь партизанского отряда имени В. И. Чапаева 37-й партизанской бригады имени А. Я. Пархоменко)», «Почтовые дороги и станции Бобруйского уезда в 1795–1830 гг.».

Одним из значимых его дел стало исследование жизни и подвигов летчика Георгия Правосудова. По крупицам собирал он в архивах России и Беларуси сведения о героической судьбе уроженца Рогачева, юность которого прошла в Бобруйске. Георгий Правосудов был представлен к званию Героя Советского Союза (причем дважды), но заслуженной награды так и не получил. Главным образом из-за того, что с воинскими почестями его похоронили... гитлеровцы. В. Мельников обратился в «Советскую Белоруссию». Вот что писал о нем журналист Николай Качук: «За годы исследовательской работы судьба сводила меня с многими белорусскими поисковиками, которые своим беззаветным, подвижническим трудом возвратили из небытия имена сотен героев Великой Отечественной. С благодарностью и искренним восхищением вспоминаю профессиональную работу Виталия Лунева из Бреста, Вячеслава Бриштена из Радошковичей, витебчанку Ларису Бруеву, минчан Николая Акаловича и Виктора Шомоди, москвича с минской пропиской – здесь прошла его молодость – Тараса Степанчука. Помню, как до глубины души был потрясен борьбой Тараса Степанчука за присвоение погибшему

летчику-штурмовику Василию Дегтяреву звания Героя Советского Союза… Радует, что ряды поисковиков-исследователей не редеют. Взамен выбывших – время, увы, неумолимо – в наш отряд памяти приходят новые бойцы. Валерий Федорович совместно с учениками бобруйской гимназии № 3 (ранее – школа № 5) провел большую исследовательскую работу, которая сродни подвигу Тараса Степанчука» [1, с. 5].

Благодаря журналисту Николаю Качуку материалы о Правосудове были напечатаны, но борьба за Золотую Звезду Георгия Правосудова продолжается и по сей день. Уже без Валерия Мельникова.

Хотелось бы, чтобы в Беларуси больше узнали об этом увлеченном исследователе, бывшем скромным и по-настоящему интеллигентным человеком – именно эти качества всегда отличали лучших представителей как научного, так и офицерского сообществ XIX веков.

Литература

1. Качук, Н. Н. Звезда штурмана Правосудова / Н. Н. Качук // Советская Белоруссия. – 2014. – 29 авг. – С. 8–9.

2. Мельников, В. Ф. Земляные укрепления / В. Ф. Мельников // Бобруйская крепость. Фортификация [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://bobruisk.by/kultura/nasledie/?curPos=6. – Дата доступа: 14.12.2019.

3. Мельников, В. Ф. Оборонительные сооружения Бобруйской крепости / В. Ф. Мельников // Бобруйская крепость [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://forum.bobr.by/viewtopic.php%3Ff=226&t=157231.html. – Дата доступа: 09.01.2020.

4. Молвин, А. Подземелья Бобруйской крепости / А. Молвин // Подземелья Бобруйской крепости [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://https://www.bobrtown.ru/2018/10/. – Дата доступа: 14.12.2019.

ПОЛАЦКАЯ НАСТАЎНІЦКАЯ СЕМІНАРЫЯ Ў ЛЁСЕ БЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎЦЫ ДАНІЛЫ ВАСІЛЕЎСКАГА

Аўчыннікава Раіса Ільінічна,
старшыня секцыі тапанімікі
ГА «Беларускае геаграфічнае таварыства»,
в. Лугавая Слабада, Мінскі раён, Мінская вобласць

У 1910 годзе Полацкую настаўніцкую семінарыю скончыў ураджэнец вёскі Новае Сяло Міхалоўшчынскай воласці Полацкага павета Даніла Мінаў Васілеўскі, будучы беларускі краязнаўца, географ, гісторык, літаратар і кры-

тык. Менавіта семінарыя стала для яго галоўным трамплінам, з якога ён ступіў у дарослае жыццё.

Нарадзіўся Даніла 17 снежня 1889 года ў сялянскай сям'і. Па ўспамінах аднавяскоўцаў яго бацька Міна Рыгоравіч валодаў рознымі рамёствамі і карыстаўся ў вёсцы вялікай павагай. Маці была простай жанчынай, але вельмі набожнай [1]. Бацькі разумелі важнасць адукацыі і аддалі свайго сына ў мясцовае аднакласнае Навасельскае вучылішча, дзе навучаліся дзеці сялян не толькі з Новага Сяла, але і з суседніх паселішчаў – Курыловічаў, Палякоў, Падсад, Цяпловічай, Белякова і Сасніно.

За тры вярсты ад Новага Сяла ў вёсцы Альшанікі той жа Міхалоўшчынскай воласці ў 1894 годзе нарадзіўся мой тата, Аўчыннікаў Ілля Міхайлавіч, таксама выпускнік Полацкай настаўніцкай семінарыі, але 1914 года. Жыццёвыя сцежкі Васілеўскага і майго таты не раз перакрыжоўваліся ў Полацку. Родная вёска таты Альшанікі з аднайменным маёнткам у той час належала памешчыкам Васілеўскім. Апошнім уладальнікам маёнтка быў Станіслаў Іосіфавіч Васілеўскі, урач, выпускнік Пецярбургскай медыцынскай акадэміі. Працяглы час ён працаваў у Маскоўскай дзіцячай бальніцы, затым раз'язным урачом у Курылоўшчыне. Сяляне Полацкага павета яго любілі, бо доктар аказваў ім неадкладную медыцынскую дапамогу і рабіў бясплатныя прышчэпкі іх дзецям.

Сялянскі сын Васілеўскі быў толькі цёзкам па прозвішчы памешчыкаў Васілеўскіх. Скончыўшы двухкласнае Ануфрыеўскае вучылішча, Даніла Васілеўскі паступіў у падрыхтоўчае вучылішча пры Полацкай настаўніцкай семінарыі, а наступным годам стаў навучэнцам першага курса семінарыі. У дакументах семінарыі яго імя запісалі на праваслаўны манер як Данііл. Дырэктарам Полацкай семінарыі ў час навучання Васілеўскага быў таленавіты педагог Клаўдзій Іванавіч Ціхаміраў, якога ў 1914 годзе прызначылі дырэктарам Віцебскага настаўніцкага інстытута [2]. Ён заўсёды прыходзіў у клас у форменным сурдуце з ордэнам Св. Ганны на шыі. Меў паважную фігуру, таму малодшыя навучэнцы крыху яго пабойваліся. Выкладаў псіхалогію і да навучэнцаў ставіўся як добры бацька-выхавацель. Матэматыку і фізіку вёў у семінарыі выдатны педагог і грамадскі дзеяч Мікалай Іосіфавіч Ласковіч, якога ў 1908 годзе выбралі гарадскім галавой. Ён меў прыязны вясёлы характар, насіў чорную шырокую бараду і на фотаздымках Полацкай семінарыі яго лёгка пазнаць. Гісторыю старажытную, сярэдніх вякоў і новую выкладаў настаўнік Сяргей Сцяпанавіч Мацвееў [3], які таксама вельмі сардэчна ставіўся да навучэнцаў. Наведваў іх у інтэрнаце, расказваў пра цікавыя падзеі і мясціны Полацкага краю. Самі семінарысты любілі рабіць пешыя вандроўкі на Замкавую Гару і крапасны вал. Любаваліся парэшткамі княскага палаца і велічнай панарамай Заходняй Дзвіны. Як успамінаў выпускнік семінарыі

1912 года Дзям'ян Іваноў, у гэтыя часы перад імі паўставала жывая гісторыя Полацкага краю [4]. Не дзіўна, што са сцен Полацкай семінарыі выйшлі такія шчырыя патрыёты, як віцебскія журналісты Юрыс Крэйц і Ігнат Пілін [5], паэт Янка Журба (Іван Якаўлевіч Івашэнь) [6], беларускі гісторык, краязнавец, фальклярыст Іван Данілавіч Гарбачэўскі [7], вядомы беларускі краязнавец Ісаак Сербаў, які па заданні Рускага геаграфічнага таварыства зрабіў каля пяці тысяч фотаздымкаў розных куткоў Беларусі і Украіны. У савецкія часы Сербаў займаў пасаду Галоўнага школьнага інспектара рэспублікі [8]. З кіраўніцтвам Полацкай семінарыі кантактавалі такія вядомыя ў краязнаўстве асобы, як Аляксей Парфёнавіч Сапуноў і Еўдакім Раманавіч Раманаў.

Азы мастацкай адукацыі семінарысты атрымлівалі ад прафесійнага мастака, выпускніка Строганаўскага прамыслова-мастацкага вучылішча Дзмітрыя Іванавіча Рохліна [9]. Карцінамі і пейзажамі Рохліна былі ўпрыгожаны сцены класных пакояў семінарыі. У савецкія гады Рохлін вярнуўся на сваю радзіму ў горад Уладзімір, дзе плённа працаваў як мастак.

Навучэнцаў семінарыі рыхтавалі да сельскага жыцця, таму таксама вучылі іх рамесніцтву, у тым ліку кніжнаму пераплёту, вырабу кошыкаў, табурэтак, вулляў для пчол. На трэцім курсе семінарысты атрымлівалі практычныя навыкі назіранняў за прыродай на метэаралагічнай станцыі, што размяшчалася ў двары семінарыі.

Вельмі цікавым быў настаўнік гімнастыкі Іосіф Георгіевіч Каудзелька. Ён жа навучаў семінарыстаў танцам пад суправаджэнне скрыпкі. Навучэнцы на ўроках спеваў авалодвалі музычнай граматай і па жаданні маглі вучыцца ігры на скрыпцы.

Дасканала ў семінарыі вывучаліся царкоўна-славянская мова і Закон Божы. Гэта рабілася для таго, каб сельскі настаўнік мог у выпадку неабходнасці замяніць бацюшку на службе ў царкве і кіраваць царкоўным хорам.

Рускую мову і літаратуру вёў у семінарыі Мікалай Іванавіч Зорын, які ў 1916 годзе быў прызначаны Папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі. У савецкія часы быў высланы на Урал, дзе вызначыўся навуковай працай аб дыялектах Арэнбуржжа [10]. З прыведзеных біяграфій настаўнікаў Васілеўскага бачна, што гэта былі вельмі прафесійныя педагогі.

Даніла Васілеўскі ў час вучобы захапіўся чытаннем беларускай літаратуры і стаў членам літаратурнага гуртка «Веснік ведаў», хаця на захапленні заставалася мала часу. Расклад семінарыстаў быў распісаны ад 6 гадзін раніцы да 22 гадзін.

Праграма семінарыі ўключала ў сябе 16 прадметаў, але была спецыяльна скарочана, каб семінарысты не мелі права паступаць у вышэйшыя ўстановы. Гэта выклікала незадаволенасць у моладзі, якая прагла атрымліваць далейшую адукацыю. У час пасля Першай рускай рэвалюцыі хваляванні ахапілі

і Полацкую семінарыю. Нават на нейкі час завадатары хваляванняў былі выключаны з семінарыі, але дзякуючы заступніцтву настаўнікаў былі адноўлены на вучобе. Але ідэі сацыял-дэмакратыі ўжо пасяліліся ў галовах семінарыстаў. Сярод прыхільнікаў ідэй народнікаў і сацыял-рэвалюцыянераў быў і Даніла Васілеўскі. У той жа час узровень дысцыпліны сярод семінарыстаў быў высокі. Семінарысты не былі заўважаны ў выпіўках, не было і выпадкаў крадзяжоў. Да настаўнікаў ставіліся з вялікай павагай, за ўвесь час быў толькі адзіны прыкры выпадак негатыўных паводзін.

У маі 1910 года семінарысты прымалі ўдзел у святкаванні перанясення мошчаў Ефрасінні Полацкай з Кіева ў Полацк. А летам таго ж года пасля сканчэння трэцяга курса Даніла Васілеўскі ў ліку лепшых навучэнцаў атрымаў магчымасць удзельчаць у паездцы-паломніцтве ў Пецярбург і Маскву. У Пецярбургу семінарысты наведалі Ісакіеўскі, Петра-Паўлаўскі і Казанскі саборы, Аляксандра-Неўскую лаўру, Зімні і Таўрычаскі палацы, Эрмітаж, музей Акадэміі навук, а таксама Пецяргоф і Кранштат. У Маскве праграма экскурсій была таксама звышнасычанай: Гранавітая і Аружэйная палаты, Гістарычны музей, Траццякоўская галерэя, музей Строганаўскага вучылішча, помнікі славутым расійскім героям. Для гэтай паездкі Даніла цэлы год збіраў грошы, невялікую частку выдаткаў аплаціла Віленская вучэбная акруга [11].

У наступным годзе пад кіраўніцтвам гісторыка С. С. Мацвеева полацкія навучэнцы зрабілі экскурсію ў дарагі для кожнага беларуса горад Вільню. Гэтыя вандроўкі рабілі на хлопцаў з правінцыі незабыўныя ўражанні. А ў наступным годзе Расійская імперыя святкавала 100-годдзе вайны з Напалеонам, і экскурсіі ў сталічны Пецярбург былі забаронены з-за наплыву гасцей. Таму семінарысты зрабілі вандроўку па месцах руска-французскай вайны: Масква – Смаленск – Барадзіно – Барысаў. Любоў да вандровак была прывіта ў Полацкай семінарыі і майму тату. Кожны год ён з вучнямі, сваімі дзецьмі або самастойна рабіў падарожжы па рэспубліцы і за яе межамі.

А наш герой Даніла Васілеўскі пасля выпуску з семінарыі асвойваў нялёгкую прафесію сельскага настаўніка. Захаваліся два фотаздымкі гэтага выпуску, які стаў 36-м у гісторыі Полацкай семінарыі. На жаль, фотаздымкі без подпісаў, і можна толькі здагадвацца, дзе на іх знаходзіцца Васілеўскі. Усяго разам з ім скончылі курс семінарыі 23 навучэнцы, у тым ліку Аляксандр Пятровіч Пчолка, будучы вядомы савецкі педагог-метадыст. У 1930-я гады працаваў у Наркамасвеце пад кіраўніцтвам Н. К. Крупскай, аўтар падручніка і методыкі выкладання матэматыкі ў малодшых класах. Сярод выпускнікоў – Іван Мікалаевіч Лагун, даваенны дырэктар Веліжскага педтэхнікума, у пасляваенныя гады дацэнт Пскоўскага педінстытута. А пачынаў свой шлях таксама сельскім настаўнікам Серцейскага пачатковага вучылішча далёкага Веліжскага павета Віцебскай губерні.

Даніла Мінавіч Васілеўскі пасля атрымання выпускнога пасведчання быў накіраваны на працу ў Старцаўскае сельскае вучылішча Мікалаеўскай воласці Полацкага павета. Тут ён працаваў абавязковыя для выпускнікоў семінарыі два гады [12]. Заробак сельскага настаўніка быў неблагім, 150–200 рублёў. А часта сельскае таварыства давала настаўніку бясплатна бульбу і хлеб. Васілеўскі быў сведкам нялёгкага паўсядзённага жыцця простых сялян. Але гэта яго не пужала, бо ў семінарыі хлопец атрымаў неабходны запас прафесійных ведаў і навыкаў. І менавіта ў семінарыі была закладзена аснова для яго далейшых творчых заняткаў. Таму можна смела назваць Полацкую настаўніцкую семінарыю вызначальнай у лёсе гэтага чалавека.

У вольны ад школьных заняткаў час Даніла Мінавіч любіў вандраваць па наваколлі, размаўляць з мясцовымі жыхарамі; запісваў ад іх народныя песні і паданні, рабіў замалёўкі з прыроды. З 1914 года стаў друкавацца ў «Нашай Ніве» і часопісах пад псеўданімамі Віцень і Шчыры, дасылаў апісанне свайго настаўніцкага вопыту ў расійскі часопіс «Школа и жизнь» пад псеўданімам М. Дабраведаў.

У 1914 годзе вырашыў прадоўжыць адукацыю ў Віцебскім настаўніцкім інстытуце, дзе працавалі многія знаёмыя яму па семінарыі выкладчыкі, у тым ліку былы дырэктар семінарыі К. І. Ціхаміраў.

Рэвалюцыю сустрэў прыязна. На сялянскім з’ездзе Полацкага павета 8–9 чэрвеня 1917 года быў абраны старшынёй Полацкага павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў ад партыі сацыял-рэвалюцыянераў, або скарочана эсэраў. У кастрычніку падчас выбараў ва Устаноўчы сход Расіі Васілеўскі быў вылучаны кандыдатам па Віцебскай выбарчай акрузе якраз ад партыі эсэраў. У снежні 1917 года мой тата, таксама член партыі эсэраў на той час, вярнуўся з Каўказскага фронту ў Полацк, дзе быў абраны старшынёй Полацкага павятовага Савета дэпутатаў. Пасля адыходу германскіх войск у 1919 годзе Васілеўскі і Аўчыннікаў сталі членамі партыі бальшавікоў.

З гэтага ж года Васілеўскі прызначаны інструктарам школ Віцебскай губерні, затым інспектарам народнай адукацыі ў Оршы. Увайшоў у камісію па захаванні творчай спадчыны А. П. Сапунова. У пачатку 1920-х гадоў Даніла Мінавіч актыўна займаецца краязнаўчай працай, становіцца адным з арганізатараў Віцебскага губернскага Бюро краязнаўства. З 1924 года з’яўляецца намеснікам старшыні Аршанскага акруговага таварыства краязнаўства [13]. Удзельнічаў у раскопках археалагічнай стаянкі «Бердыж». У 1926 годзе прымаў удзел у Другой Аршанскай краязнаўчай канферэнцыі, на якой абмяркоўваліся пытанні мясцовага краязнаўства, адкрыцця музея, выдання друкаванага органа краязнаўцаў. Стаў рэдактарам першага выпуску зборніка «Аршаншчына».

Працягваў займацца літаратурнымі справамі, з 1925 года лічыцца кандыдатам Аршанскага філіяла «Маладняка». Яго матэрыялы і апавяданні публікавалі газеты «Савецкая Беларусь», «Прыдзвінскі край», часопісы «Маладняк», «Наш край».

У пачатку 1930-х гадоў краязнаўчы рух пачаў турбаваць савецкіх ідэолагаў, і краязнаўчы рух быў ліквідаваны. Дзеячы краязнаўчага руху сталі падвяргацца цкаванню і праследаванню. Даніла Мінавіч працаваў у Аршанскім педтэхнікуме, і вакол яго пачалі згушчацца хмары, пасыпаліся абвінавачанні ў нацдэмаўшчыне. Таму ён вымушаны быў пераехаць у Магілёў. Тут працаваў на рабфаку і геаграфічным факультэце. З 1930 года выконваў абавязкі дэкана геаграфічнага факультэта. Прымаў удзел у стварэнні геаграфічнага апісання горада Магілёва. У 1931 годзе ў газеце «Звязда» быў апублікаваны артыкул, у якім Васілеўскі абвінавачваўся ў контррэвалюцыйных настроях і нацдэмаўшчыне. Даніла Мінавіч быў выключаны з радоў ВКП(б), а ў снежні 1936 года арыштаваны. Быў асуджаны да пяці гадоў высылкі і трох гадоў пазбаўлення правоў. Праз год яшчэ раз быў асуджаны і атрымаў больш суровы прысуд – 10 гадоў папраўчых лагераў і наступныя пяць гадоў пазбаўлення правоў. У высылцы на Поўначы працаваў простым бурылышчыкам. Толькі ў 1945 годзе быў вызвалены, а рэабілітаваны ў 1956-м. Апошнія гады жыцця правёў у Феадосіі, дзе памёр 8 снежня 1963 года.

Біяграфія Васілеўскага савецкага перыяду падрабязна даследавана і апісана беларускімі даследчыкамі Ю. Васілеўскім (1994), І. Мусінскай (1999), Г. Кісялёвым (1978, 1993, 1995), І. Саламевічам (1994). Яна прыведзена ў многіх беларускіх энцыклапедычных выданнях.

Творчая спадчына Васілеўскага вельмі рознабаковая. Ён даследаваў гісторыю кнігадрукавання і развіцця беларускай літаратуры. Асаблівы інтарэс Васілеўскі праяўляў да «чарадзейнай» літаратуры; апісаў «Лячэбнік» Ганны Таранды, вывучаў творчасць Яна Баршчэўскага. Даследаваў удзел сялянства Віцебскай і Магілёўскай губерняў у паўстанні 1863–1864 гадоў. Цікавіўся эканамічнымі пытаннямі, у тым ліку дзейнасцю Вольнага эканамічнага таварыства. Быў аўтарам некалькіх апавяданняў і навуковых прац: «Школа і настаўніцтва на Віцебшчыне» (1924); «Новыя матэрыялы творчасці Яна Баршчэўскага (1925); «Сто год краязнаўчай працы на Беларусі» (1926); «Крыніцы мінулага Беларусі» (1926); «Беларускія чараўнікі і іх зельле» (1927); «Народная асвета ў Горацкім раёне» (1927); «Пад аховай роднай песні. З перапіскі Яна Баршчэўскага» (1928); «Арцём Ігнатавіч Вярыга і яго літаратурна-мастацкая чыннасць» (1929); «Кумысалячэнне на Беларусі» (1929); «Краязнаўчая справа ў Магілёўскім раёне» (1932) і інш.

У асобе Васілеўскага Беларусь мела вопытнага даследчыка, які працаваў на стыку розных навук – гісторыі, краязнаўства, геаграфіі, літаратуразнаў-

ства. Але тагачасная маскоўская ўлада, якая атрымала ў спадчыну былыя імперскія ўстаноўкі, ходу нацыянальным талентам не хацела даваць. Бо гэта магло прывесці да адрыву нацыянальных правінцый ад іх імперскага поля. Застаецца толькі выказаць вялікую падзяку дзеячам нацыянальнага Адраджэння дваццатых-трыццатых гадоў, якія нягледзячы на страты змаглі данесці да нас свае ідэалы, сваё бачанне гістарычных падзеяў, рэальнае апісанне жыцця і культуры беларускага народа.

Літаратура

1. Васілеўскі Даніла Мінавіч // Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць, 2015. Электронны рэсурс.

2. Раиса Овчинникова. Полоцкая учительская семинария. Судьбы преподавателей и воспитанников. – Минск : Издатель В. Хурсик, 2017. – С. 64.

3. Тамсама. – С. 63.

4. Иванов, Д. А. Воспоминания о годах учёбы в Полоцкой учительской семинарии, 17.03.1972, рукопись, музей Полоцкого педагогического колледжа.

5. Раиса Овчинникова. Полоцкая учительская семинария. Судьбы преподавателей и воспитанников. – Минск : Издатель В. Хурсик, 2017. – С. 33, 34.

6. Тамсама. – С. 47–51.

7. Памяць. Полацк. – Мінск : БСЭ, 2002. – С. 301.

8. Часопіс «Асвета». №№ 1, 2. 1925.

9. Раиса Овчинникова. Полоцкая учительская семинария. Судьбы преподавателей и воспитанников. – Минск : Издатель В. Хурсик, 2017. – С. 67.

10. Тамсама.– С. 67–68.

11. НГАБ, фонд 2566, вопіс 1, справа 624, л. 2, 3, 5, 6, 7, 13, 14, 30–36.

12. Памятная книжка Витебской губернии на 1912 год. Витебск, 1912. – С. 204.

13. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. – Мінск, 1994 – С. 228.

РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКОГО КРАЕВЕДЕНИЯ В XIX–XX ВЕКАХ

Баранова Алла Саввична,
доцент кафедры педагогики
УО «Минский государственный
лингвистический университет»,
г. Минск

Известные белорусские краеведы, этнографы, фольклористы И. Д. Горбачевский, Е. Р. Романов, Н. Я. Никифоровский, А. Е. Богданович придавали большое значение развитию просвещения и образования в белорусском крае. Деятельность известных этнографов изучена и представлена в литературе [2].

В своих работах белорусские краеведы проанализировали состояние просвещения и предложили пути его совершенствования с целью улучшения положения дел в этой области. Вопросы краеведения тесно связывались с проблемами просвещения и образования. И. Д. Горбачевский (годы рождения и смерти неизвестны) в работе «Сельский учитель» (1895) с помощью просвещения и повышения грамотности в деревне предлагал развивать садоводство, огородничество, пчеловодство, различные ремесла, кухонное дело, домоводство, правильный уход за малыми детьми. Учитель Николай Иванович «завел практический питомник плодовых деревьев: яблонь, груш, слив, вишен и ягодных кустов и начал обучать детей садоводству и огородничеству» [1, с. 210]. В результате питомцы Николая Ивановича не избегали трудовой деревенской жизни, жили со всеми в мире и согласии, стремились улучшить ведение хозяйства.

На тесную связь между хозяйственно-экономическими и учебно-воспитательными проблемами указывал просветитель и педагог, ученый в области этнографии Е. Р. Романов (1855–1922). Ученый проанализировал дело народного образования в Рогачевском уезде и отметил его неудовлетворительное хозяйственно-экономическое и учебно-воспитательное состояние. Согласно Романову, «из 39 училищ этого уезда удовлетворительные помещения имеют только 10 училищ, остальные же 29 ютятся или в наемных крестьянских избах, или в ветхих, тесных и холодных помещениях» [1, с. 218]. Е. Р. Романов резко критиковал состояние народного образования. Будучи инспектором, он 19 апреля 1906 г. докладывал директору народных училищ Могилевской губернии о том, что «громадную строительную нужду (75 училищных заведений) не в состоянии удовлетворить ни казна, ни сельские общества. В течение трех-четырех лет ее могло бы удовлетворить земство, но, к сожалению, вследствие отсутствия в Рогачеве инспектора земство направило свои средства за 1904, 1905 и 1906 гг. не на приведение в должный порядок существующих училищ, но на открытие новых училищ, которое может последовать не ранее конца 1907 г.» [1, с. 218]. Такую растрату земских средств он считал непрактичной и непроизводительной. Е. Р. Романов отмечал неудовлетворительность учебно-воспитательного дела в училищах Рогачевского уезда, на которую влиял плохой состав учительского персонала, в среде которой «учителей с правильной педагогической подготовкой только 10, т.е. 23%, лиц с домашней подготовкой, учителей церковноприходских школ, бывших военных писарей 22 человека, т.е. 51%. Остальные окончили женские гимназии и училища и 2 – духовные семинарии» [1, с. 218]. Е. Р. Романов отмечал только «одно хорошее училище (Чечерское женское) и десять более или менее удовлетворительных, 28 училищ были посредственные, из них 12 были безусловно слабые»

[1, с. 218]. При таком состоянии просвещения хозяйство, экономика, культура в Могилевской губернии в указанный период были на недостаточно высоком уровне.

Белорусский этнограф, педагог, фольклорист Н. Я. Никифоровский (1845–1910) в своих работах описал материальное состояние, быт, нравы и особенности обучения в различных типах школ: примонастырских, прицерковных, чисто деревенских, переносных, «панских». Он проанализировал особенности сельскошкольного образования. В очерке «Сельскошкольное обучение в юго-восточной окраине Витебской Белоруссии, каким застает его реформа 19 февраля 1861 г.» (1893) он не соглашается с уверением в косности, неразвитости и умственной бедности простолюдина Витебской Белоруссии, которая не позволяет ему выйти из постоянной материальной нужды, не возвышает его над прадедовской жизнью. Н. Я. Никифоровский отмечает, что при всей подавленности крепостного и почти при полной его обезличенности для простолюдина было характерно «искание грамотности». Физические и нравственные ограничения не препятствовали уважению и почитанию грамотных, «письменных» людей. Затаенной мечтой было видеть грамотными собственных детей, по крайней мере – сыновей. Искание грамотности Н. Я. Никифоровский считал важной потребностью белорусского простолюдина. Вместе с тем он указывал на проблемы в так называемых «питомниках грамотности». Такие школки, как и подобные им в соседних местностях Витебской Белоруссии, имели всего от двух до пяти учеников. Н. Я. Никифоровский проанализировал причины такого скромного состава таких школок: теснота помещений и полузапретное положение школок, особенно в селах вблизи панского дома. Школы находились под постоянным контролем панских шпионов («дозорцев»), которые следили за тем, кто и чему учит крестьянских детей. В результате приходящие ученики тайно пробирались в школу и также тайно уходили из нее. Во время учения в случае нежеланного посетителя ученики готовы были скрыться в заранее указанном месте или разыграть роль наемщика-пастуха.

Как отмечал Н. Я. Никифоровский, деятельность этих школок была однообразна. Первенствующее место принадлежало примонастырским школкам, из которых в Тадулинской бывшего Суражского уезда этнограф пробыл с незначительными перерывами около полутора лет. Он также изучал сведения о примонастырской Махировской школке Полоцкого уезда. Учителями при монастырских школках были монашествующие, эпитимийные священно- и церковнослужители, престарелые миряне и немногие униатские священники, не пожелавшие воссоединения с православием в 1839 г. Испросив благословенное позволение настоятеля, учитель открывал школку для одного, двух и более учеников. Н. Я. Никифоровский описывает убогость

и стесненность таких школ: «В первом случае она помещалась в учительской келье, при многолюдстве же школки помещались в свободной келье, которая украшалась обыкновенным столом, скамьями, табуретами, а то и пустыми ящиками для размещения учащихся» [1, с. 225].

Н. Я. Никифоровский проанализировал причины выбора педагогической деятельности учителей в таких школках: «а) религиозно-христианское желание служить темному люду своими знаниями; б) монастырская скука во внебогослужебные часы, настоятельное побуждение, как мера монастырского послушания; г) неугасающее желание сообщаться с миром, что особенно заметно бывало у эпитимийных, живших в монастыре, и униатов и т. д.; д) материальные расчеты» [1, с. 225–226]. Однако, как отмечал Н. Я. Никифоровский, чем бы ни руководствовались учителя в открытии школок, дело их учения шло лучше, чем в других сельских местах.

Прицерковные школки стояли ниже монастырских, их устроителями и руководителями были сравнительно малообразованные дьяконы, еще менее образованные дьячки и полуграмотные пономари. Н. Я. Никифоровский отмечал, что «бедность, корыстолюбие, а то и предосудительные слабости отдельных учителей переменяли святое дело учения в нечто несродное: ученики нянчили учительских детей, носили воду и дрова, рубили последние, гоняли скот на водопой, – словом, исполняли многие хозяйственные работы в пределах детского умения и сил, в случае же учительского загула ученики принуждены были разделять участь его семьи – исчезать и укрываться, пока не пройдет гроза» [1, с. 226]. Чисто деревенские школки, отвечавшие современным школам грамотности, создавались в той или другой деревне, хотя бы и захолустной, если там был «одукыванец». В качестве учителей чисто деревенских школок были прогулявшиеся горожане, устаревшие ремесленники, разночинцы, разжалованные дворовые, отставные или увечные инвалиды, беглые крепостные. Такие учителя приходили к учительству как к последнему средству пропитания. К категории переносных школок относились школки, временно и случайно создававшиеся мастеровыми, которые выполняли в деревне ту или другую работу: сапожную, портняжную, шерстобитную. В таком случае мастер-учитель, выполнив специальную работу в одном доме, переходил в другой, туда же перемещалась и школка. Обучение грамотности шло между делом, нерегулярно и носило характер любезного одолжения и милости.

Материальное положение «панских» школок было неплохим. В них были классные доски, достаточное число столов со скамьями, книгами и учебными пособиями. Такие школы преследовали узкие цели – в них готовили лакеев, будущих писарей, счетчиков, мастеров. Крепостные крестьяне сторонились таких школок, как рекрутчины, искали других, непанских школок. Во

всех школках непременными орудиями для «вкоренения страха» были розги, плетки, линейки, учительский костыль или клюка.

В работе «Четыре листка из памятной книжки сельского учителя» (1874) Н. Я. Никифоровский описывает положение и быт Ловжанского начального училища, классная комната которого напоминала просторную, но аляповатую избу. В ней ничего не напоминало о классе; в амбразуре между печью и стеной было два учебных стола, которые чуть не упали, когда их покачнули. Продовольствие для учителей и учеников состояло из ржаной муки, ячменной крупы и соли. Систематическое голодание, материальная бедность, лишение нравственной поддержки учителей, неопределенность положения сельского учителя усугублялись ложным отношением среды к сельскому училищу. Надежды крестьянина на то, что сын его выйдет из училища «человеком», не исполнялись. Были отдельные случаи отдачи в рекруты лиц, окончивших курс сельского училища. Злонамеренно распространенные слухи порождали в крестьянах боязнь: даже в гимназических занятиях учителя с учениками они видели приготовления к рекрутской службе. Унизительное положение сельских учителей состояло и в том, что крестьянин в учителе ценил «побратимство». Для приобретения среди крестьян полезной популярности учителю нужно было сделаться гостем кабака, посещать пирушки. Учитель должен был посещать волостные сходы, вымаливать себе помощь в две четверти ржи или что-то другое. Унижение учителя состояло и в том, что он зависел от должностных лиц волости, должен был угождать невежественным влиятельным лицам. Унижение, постоянное одиночество, скудный материал для мысли, невозможность добывать книги для чтения, заставляли «мельчать молодую мысль, сродняться со средою, которая почти исключительно знает работу желудка и мускулов» [1, с. 231].

Прогрессивный педагог, этнограф, фольклорист А. Е. Богданович (1862–1940) в статье «Педагогические воззрения белорусского народа» (1886) отмечал, что «народное образование в Белорусском крае – дело новое; история его развития исчерпывается последним двадцатипятилетием; следовательно, возникновение его относится ко времени освобождения крестьян от крепостной зависимости» [1, с. 234]. Стремление крестьян к знаниям пресекалось помещичьей властью, изрядным количеством розг и отдачей в солдаты неблагонадежных, но стремившихся к знаниям. А. Е. Богданович подчеркивал: «Белорусский народ сознает значение воспитания как фактора, влияющего на развитие ума и нравственности, воли и характера, обусловливающих поведение личности» [1, с. 235]. В статье «Школьная страда» (1894) он предлагает усовершенствовать программы средних учебных заведений, ввести в широком объеме химию, которая имеет большое значение и для обыденной жизни и для понятия производства, экономики края, а также естествозна-

ние и биологию, которые учат сознательно относиться к множеству явлений окружающего мира.

Работы известных этнографов раскрывают особенности организации просвещения и образования в белорусском крае.

Литература

1. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост.: Э. К. Дорошевич, М. С. Мятельский, П. С. Солнцев. – М. : Педагогика, 1986. – 468 с.

2. Березкина, Н. Ю. Библиотеки и распространение научных знаний в Беларуси (XVI–XX вв.) / Н. Ю. Березкина; науч. ред.: М. П. Костюк, А. А. Коваленя. – Минск : Бел. навука, 2013. – 523 с.

ЛИЧНЫЕ ДОКУМЕНТЫ КРАЕВЕДОВ, ХРАНЯЩИЕСЯ В ГОСУДАРСТВЕННЫХ АРХИВАХ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

Бондарева Елена Михайловна,
заведующая отделом информационно-поисковых систем и автоматизированных архивных технологий Учреждения «Государственный архив Витебской области», г. Витебск

Основная часть документов, поступающих на постоянное хранение в государственные архивы Витебской области – это документы организаций, учреждений и предприятий. Помимо этого, архивные учреждения комплектуются документами личного происхождения, образовавшимися в процессе жизни и деятельности отдельного человека или семьи и имеющими историческое, научное, социальное, экономическое, политическое или культурное значение. Среди них в государственных архивах области в настоящее время хранятся документы 14 краеведов и должностных лиц, связанных по роду службы с краеведением.

Учреждение «Государственный архив Витебской области» обеспечивает хранение 7 личных фондов краеведов.

Документы Газина Дмитрия Романовича (17.09.1928 – 21.11.2012) – краеведа, ветерана Великой Отечественной войны, связиста 1-й Витебской подпольной бригады, внештатного корреспондента газеты «Витебский рабочий» образуют личный фонд № 330. В нем насчитывается 115 дел за 1936, 1942–1943, 1946–2010 гг. Среди документов: рукописи статей, очерков о подпольном и партизанском движении, становлении и развитии народного об-

разования на Витебщине, воспоминания узников концентрационного лагеря «Лужесно» (Витебский район) [1, с. 545].

Статистические сведения о церквях, духовенстве, истории Витебской епархии, послужные списки православного духовенства, отчеты, сведения о жизни православных приходов, списки священнослужителей и церквей Витебской области имеются в личном фонде № 2419 Горидовца Владимира Владимировича (23.09.1968) – кандидата богословия, протоиерея, члена комиссии по канонизации святых в Белорусской Православной Церкви, председателя Витебской епархиальной комиссии по работе в архивах. В фонде насчитывается 143 дела за 1943–1978, 1986, 1993, 1996–2013 гг. [4].

В личном фонде № 391 Зейлерта Валентина Карловича (24.05.1908 – 23.09.1994) – музееведа, педагога, отличника народного образования СССР и БССР имеется 122 дела за 1954–1992, 1994–1995 гг. В документах фонда содержатся краткий исторический очерк по истории г. Витебска, схема Рынковой площади г. Витебска конца XIX – начала XX в. и сценарии телепередач, посвященных истории г. Витебска [1, с. 548].

Личный фонд № 2252 Пищуленка Михаила Владимировича (25.05.1953 – 18.06.2008) – кандидата исторических наук, начальника отдела по архивам и делопроизводству Витебского областного исполнительного комитета, Почетного архивиста Республики Беларусь состоит из 85 дел за 1930, 1936–1937, 1975, 1980, 1982, 1985, 1988–2006 гг. Это тексты выступлений на научных, научно-практических и краеведческих чтениях, статьи, опубликованные в периодических изданиях, документы о состоянии государственной архивной службы, геральдике Витебской области, по вопросам топонимики [1, с. 553–554].

В личном фонде № 406 краеведа, основателя общественного объединения «Витебский областной краеведческий фонд им. А. П. Сапунова», члена Союза журналистов Беларуси Подлипского Аркадия Михайловича (18.03.1946) насчитывается 203 дела за 1946–2001 гг. Среди них: рукописи статей и очерков, книги и брошюры по истории г. Витебска и его окрестностей, а также посвященные знаменитым уроженцам и людям, чей жизненный и творческий путь был связан с Витебским краем (Марк Шагал, Илья Репин, Алексей Сапунов, Исаак Боровский, Владимир Адамов и др.), документы по истории евреев на Витебщине, коллекция пригласительных билетов, программ, каталогов выставок и другой печатной продукции, изданной Витебской областной типографией [1, с. 554].

Документы Рывкина Михаила Степановича (29.12.1931 – 12.03.2010), кандидата педагогических наук, краеведа в количестве 586 дел за 1975–2006, 2010 гг. образуют личный фонд № 2154. В настоящее время личный фонд М. С. Рывкина является одним из наиболее объемных, полных и тематически разносторонних личных документальных собраний, принятых архивом

на государственное хранение. Среди документов фонда: воспоминания лиц, переживших Холокост, списки мирных жителей, уничтоженных гитлеровцами в оккупированном Витебске в 1941–1944 гг., тематические картотеки о жизни и творчестве Марка Шагала, истории еврейской диаспоры Витебщины, паспорта еврейских кладбищ Витебской области, документы по истории г. Витебска дореволюционного периода [5].

В личном фонде № 399 Шульмана Аркадия Львовича (род. 25.12.1953), краеведа, главного редактора журнала «Мишпоха» насчитывается 88 дел за 1941–1945, 1947–1949, 1952–1960, 1964, 1966–1968, 1970, 1972–1974, 1977, 1979–1980, 1982, 1986–1989, 1991–2014, 2016–2017 гг. Среди документов фонда: статьи по истории евреев Беларуси, опубликованные в периодических изданиях, документы общественной деятельности (каталоги художественных выставок, программы фестивалей, научных конференций, творческих встреч, приглашения на общественные мероприятия и др.), письма читателей журнала «Мишпоха» о спасении евреев в годы Великой Отечественной войны и присвоении почетного звания «Праведник народов мира», фотографии по истории городов и местечек Беларуси, истории Великой Отечественной войны, фотографии и портреты деятелей культуры, искусства, общественных деятелей, фотоальбомы о деятельности еврейских общественных организаций [2].

В учреждении «Зональный государственный архив в г. Глубокое» в составе коллекции документов личного происхождения краеведов г. Глубокое и Глубокского района (фонд № 10) хранятся документы двух краеведов. В опись № 2 коллекции включены документы краеведа Бунто Иосифа Владимировича (22.07.1926 – 24.08.2016) в количестве 32 дел за 1932, 1943, 1944–1957, 1960–1995, 1997–2000, 2005, 2009–2010, 2013, 2015–2016 гг. Это статьи о Глубокском гетто, истории городов Глубокое, Миоры, Дисна, географические карты, фотодокументы.

Переписка с органами власти об увековечивании памяти жертв Холокоста, статьи, очерки в периодических изданиях о жизни евреев в г. Глубокое, фотодокументы, переданные в дар архиву Плавинским Геннадием Антоновичем (род. 20.12.1938), включены в коллекцию в составе описи № 1 и насчитывают 11 дел за 2002–2005, 2007–2014, 2016 гг. [3].

В учреждении «Зональный государственный архив в г. Орше» хранится личный фонд № 508 краеведа Шинкевича Александра Николаевича (род. 08.04.1956). В его составе 67 дел за 1986–2012 гг. Это рукописи историко-краеведческих исследований Оршанщины, сборники очерков, статьи, опубликованные в периодической печати, фотодокументы [6].

В учреждении «Зональный государственный архив в г. Полоцке» в составе коллекции документов личного происхождения (фонд № 1164) хранятся документы 4 краеведов.

В опись № 12 коллекции включены личные документы учителя и краеведа Богдановой Александры Михайловны (08.03.1922 – ?) в количестве 11 дел за 1939–1999 гг. Это рукописи воспоминаний о Великой Отечественной войне, довоенной жизни в г. Полоцке, фотографии.

Документы Дейниса Ивана Петровича (10.02.1890 – 20.11.1985) – преподавателя, краеведа, Почетного гражданина г. Полоцка включены в опись № 5 коллекции. Они насчитывают 26 дел за 1910–1984 гг. Среди них: рукописи, очерки, статьи, опубликованные в периодической печати по истории г. Полоцка, Полоцкого Софийского собора, Спасо-Евфросиньевской церкви, Богоявленского и Борисоглебского монастырей.

Документы по истории подпольного и партизанского движения, о героях-освободителях г. Полоцка и Полоцкого района, фотодокументы, собранные Манисом Николаем Александровичем (17.12.1912 – 19.04.1996), краеведом, Заслуженным учителем БССР, включены в опись № 25 коллекции в количестве 65 дел за 1943–2001 гг.

В опись № 11 коллекции включены документы Чернявской Светланы Сергеевны (22.09.1938 – 28.12.2010) – руководителя рабочей группы по подготовке книги «Память» при Полоцком райисполкоме. В составе описи насчитывается 98 дел за 1944–1997 гг. Это воспоминания участников освобождения Полотчины от немецко-фашистских захватчиков, списки воинов, пропавших без вести, погибших, захороненных на территории г. Полоцка и Полоцкого района, фотографии г. Полоцка [7].

Таким образом, государственные архивы Витебской области располагают множеством личных документов краеведов, доступных для широкого круга исследователей.

Литература

1. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006, сост. Т. В. Буевич, Ю. С. Петухов. – Минск : Медисонт, 2011. – 936 с.

2. Учреждение «Государственный архив Витебской области». Ф. 399. Оп. 1.

3. Учреждение «Зональный государственный архив в г. Глубокое». Ф. 10. Оп. 1, 2.

4. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/108184/. – Дата доступа: 16.12.2019.

5. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/104625/. – Дата доступа: 16.12.2019.

6. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/109725/. – Дата доступа: 16.12.2019.

7. Фондовый каталог [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/116455/. – Дата доступа: 16.12.2019.

ВАСІЛЬ ГУЗАЎ: «ДЛЯ ЖЫВЫХ І МЁРТВЫХ Я ЗРАБІЎ УСЁ, ШТО МОГ…»

Буракова Аляксандра Сяргееўна,
загадчык экспазіцыйна-выставачнага аддзела
УК «Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава»,
г. Магілёў

«Летапісец з Галоўчына», «Захавальнік Памяці», «Васіль, які помніць сваё радство» – вось толькі некаторыя загалоўкі артыкулаў пра Васіля Дзмітрыевіча Гузава, апантанага даследчыка, краязнаўца, журналіста, збіральніка фальклору, асветніка, стваральніка музея з Бялыніцкага раёна. Яго імя было даволі гучным у канцы 1980-х – 1990-я гг. на рэгіянальным узроўні. Пра яго і створаны ім краязнаўчы музей у калгасе «Наша Перамога» шмат пісалі ў газетах «Зара над Друццю», «Зара камунізму», «Советская Белоруссия». На абласным радыё ў 1991 г. была падрыхтавана перадача «У гасцях у асветніка Гузава». Ён сам актыўна выступаў у сродках масавай інфармацыі, быў членам Саюза журналістаў БССР. Улічваючы яго заслугі, праўленне калгаса «Наша Перамога» ў пачатку 1990-х гг. выступіла з ініцыятывай прысвоіць яму званне «Заслужаны работнік культуры БССР».

Гузаў пакінуў пасля сябе багатую спадчыну. Яшчэ пры жыцці ён паклапаціўся, каб яго матэрыялы засталіся нашчадкам – аформіў і перадаў іх у Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, Магілёўскі абласны краязнаўчы музей, бібліятэкі і іншыя ўстановы, з якімі меў цесныя стасункі напрыканцы свайго жыцця. У Магілёўскі абласны краязнаўчы музей матэрыялы Гузава паступалі ў перыяд з 1991 па 1995 г. Асноўны фонд склалі 20 брашур, выдадзеных краязнаўцам, 22 брашуры папоўнілі калекцыю навукова-дапаможных матэрыялаў. Акрамя гэтага, у навуковы архіў музея было аформлена 204 справы. Самыя шматлікія калекцыі – 65 і 50 спраў адпаведна – датычацца знакамітых землякоў і тэмы Вялікай Айчыннай вайны [4]. У Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці матэрыялы Гузава таксама траплялі часткамі. Першыя паступленні былі ў 1992 г. Здаваў сам краязнаўца. Потым ён дапоўніў свой асабісты архіў у 1993–1996 гг. Пасля яго смерці родныя Гузава аформілі астатнія матэрыялы ў 1997 і 2002 гг. Усяго ў архіве захоўваецца 81 справа [1].

Матэрыялы краязнаўца ахопліваюць храналагічныя рамкі з 1941 г. па 1996 г. і ўключаюць брашуры, выдадзеныя за яго ўласныя сродкі, перапіску з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, знакамітымі землякамі і іх роднымі, спісы загінулых байцоў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў на акупіраванай тэрыторыі Бялыніцкага раёна, фальклор-

ныя матэрыялы, газетныя артыкулы, фотаздымкі, дакументы і інш. У асноўным калекцыю складаюць матэрыялы па гісторыі Бялыніцкага раёна, пра знакамітых землякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай і Афганскай войнаў, дакументы, што датычацца дзейнасці створанага ім музея.

Фотаздымкі – гэта своеасаблівая ілюстрацыя жыцця і працоўнай дзейнасці Васіля Гузава. Самыя старыя – за 1941 г. У першы дзень Вялікай Айчыннай вайны 22 чэрвеня ўраджэнцу вёскі Падбелле Магілёўскага раёна споўнілася роўна сямнаццаць гадоў. За плячыма была праца па найме, навучанне ў Шчэжарскай сярэдняй школе. У ваенны час Гузаў трапляе ў нацысцкія лагеры, потым на прымусовыя працы ў Судэцкую вобласць (Чэхія), дзе вядзе антыфашысцкую дзейнасць – распаўсюджвае сярод рускіх, беларусаў, палякаў і чэхаў улёткі і патрыятычныя вершы, напісаныя ім на рускай і беларускай мовах. Пасля паспяховых уцёкаў далучаецца да Чырвонай Арміі. Падчас службы ў Венгрыі працуе бібліятэкарам 124-га армейскага дома адпачынку, потым служыць у гаспадарчай роце Адэскай ваеннай акругі. Наведвае вячэрнюю школу.

Адукацыю Гузаў працягвае на радзіме: у 1949 г. скончыў Магілёўскі настаўніцкі інстытут, у 1973 г. – Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Пра сваю адукаванасць ён гаварыў напрыканцы жыцця: «Усё жыццё вучыўся, маю некалькі дыпломаў. Добра ведаю нямецкую мову. Чытаю англійскія, французскія, польскія, іспанскія тэксты…» [3, л. 5].

У архіве Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея захоўваюцца даведкі, якія сведчаць аб тым, што ў 1947–1948 гг. Гузаў працаваў загадчыкам хаты-чытальні Шчэжарскага сельсавета, а таксама акцёрам дапаможнага складу ў Магілёўскім абласным тэатры. Але галоўнай для яго стала педагагічная праца, якой прысвяціў 38 гадоў свайго жыцця. Ён працаваў у вёсцы Галоўчын настаўнікам, праводзіў выхаваўчую работу сярод моладзі. Ён вучыў дзяцей «жыццю, працавітасці, праўдзе, дабрыні, міласэрнасці. Любіць Радзіму і людзей…» [2, л. 5].

У галоўчынскай школе ў 1950-я гг. Гузаў вёў літаратурны гурток, які аб’ядноўваў таленавітую моладзь. Настаўнік імкнуўся пашырыць веды вучняў у галіне мастацкай літаратуры, пазнаёміць іх з вуснай народнай творчасцю, тэорыяй літаратуры, садзейнічаць самастойнай творчасці гурткоўцаў. Школьнікі пісалі вершы і апавяданні, а Гузаў іх рэдагаваў і выдаваў самаробны часопіс «Залаты ранак». Рэдкалегію часопіса складалі В. Даюжэнак (рэдактар), М. Казлоў (намеснік рэдактара), А. Мельнікаў і інш. Адным з важных раздзелаў часопіса быў раздзел «Чытачы аб кнігах», у якім школьнікі дзяліліся сваімі ўражаннямі аб прачытаных мастацкіх творах. Юныя літаратары спрабавалі свае здольнасці ў перакладзе на беларускую мову ў рубрыцы «Голас рускіх сяброў на мове Янкі Купалы і Якуба Коласа». Гузаў

адзначаў неабходнасць дапаўняць часопісы фотаздымкамі выдатнікаў вучобы і перадавікоў гаспадаркі, каб стымуляваць школьнікаў на працу і добрыя паводзіны. У архіве Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея знаходзяцца пяць нумароў гэтага часопіса за 1953–1955 гг., а таксама брашура «Залаты ранак», у якую ўвайшлі некаторыя творы гурткоўцаў, даклад на педагагічных чытаннях у Інстытуце педагогікі, метадычныя парады для настаўнікаў. Гузаў таксама вёў гурток «Юныя мастакі». Вучні-гурткоўцы В. А. Бабкоў і Я. Р. Кузьміцкая сталі прафесійнымі мастакамі. Настаўнік адзначаў таксама неабходнасць выкарыстання малюнкаў вучняў у працэсе навучання на ўроках літаратуры для развіцця лагічнага мыслення, вобразнага ўспрыняцця рэчаіснасці.

Гузаў амаль усё жыццё збіраў фальклор – песні, прыказкі, прымаўкі, трапныя выразы, што мелі распаўсюджванне ў вёсцы Галоўчын і навакольных вёсках. З вуснай народнай творчасцю ён быў знаёмы з дзяцінства. З 1939 г. пачаў занатоўваць песні, якія спявала маці Ксенія Нікіфараўна. У 1949–1954 гг. запісваў жыхарак вёскі Галоўчын М. Р. Маслёнак і С. Р. Мельнікаву і вёскі Забалацце А. Р. Ермачэнка. Калі б не Гузаў, многія народныя песні зніклі б для нас бясследна. Прыказкі і прымаўкі яму дапамагала збіраць жонка Алена Раманаўна, якая таксама працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. З мэтай занатаваць сучасны мясцовы фальклор Васіль Дзмітрыевіч вельмі часта хадзіў на калгасныя сходкі, дзе і запісваў трапныя выразы аднавяскоўцаў.

Краязнаўствам Васіль Гузаў захапіўся ў 1960-я гг. Пачаў выступаць у мясцовым друку з артыкуламі пра гісторыю роднага краю. Але найбольш актыўна пошукавай працай ён заняўся, калі стаў дырэктарам музея, што стваралася ў калгасе «Наша Перамога». Ствараючы яго, Гузаў сутыкнуўся з шматлікімі цяжкасцямі, але не спыніўся, не кінуў пачатай справы. У інтэрв'ю ён гаварыў: «Музей – гэта мая настойлівасць… Дарога толькі наперад, нягледзячы ні на што…» [2, л. 30].

Камплектуючы фонды музея, Гузаў праявіў сябе як апантаны даследчык. Ён звяртаўся ў розныя ўстановы – музеі, архівы, бібліятэкі, да прыватных асоб у пошуку патрэбнай інфармацыі і экспанатаў. Асаблівую дапамогу яму аказвалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Палтаўскі музей, Дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гузаў вёў перапіску з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, знакамітымі землякамі, іх роднымі. Дзякуючы гэтаму ў фонды музея паступілі шматлікія гістарычныя матэрыялы.

Вялікай каштоўнасцю для музея былі, напрыклад, аўтарскія пасведчанні, выдадзеныя ўраджэнцу в. Галоўчын Р. С. Аксельроду Камітэтам па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР. Доктар тэхнічных

навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Рыгор Аксельрод з'яўляўся ўладальнікам больш за 20 аўтарскіх пасведчанняў. Ён вынайшаў астранамічны гадзіннік, станок па вырабе ланцужкоў Галя, схему бульбаўборачнага камбайна, апарата для сшывання крывяносных сасудаў. Матэрыялы вынаходніка ў музей перадаў яго сын Л. Р. Аксельрод, з якім актыўна перапісваўся Гузаў. У фонды музея таксама трапілі дакументы, асабістыя рэчы, прадметы абмундзіравання землякоў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны – генерал-маёра Еўдакіма Андрэевіча Магілеўчыка, генерал-лейтэнанта Яфіма Цімафеевіча Марчанкі, кандыдата сельскагаспадарчых навук Лявонція Ігнацьевіча Дракіна, з роднымі якіх Гузаў падтрымліваў цесныя сувязі на працягу многіх гадоў. Даследчык збіраў звесткі пра воінаў 100-й, 161-й, 42-й, 95-й, 199-й стралковых дывізій Чырвонай Арміі, вёў перапіску з ветэранамі 42-й стралковай дывізіі, якая прымала ўдзел у вызваленні вёскі Галоўчын, партызанамі брыгады «Чэкіст», што двойчы грамілі галоўчынскі фашысцкі гарнізон.

Збор экспанатаў не быў самамэтай для Гузава. Галоўнае для яго – вярнуць імёны. Каб стварыць спісы загінулых на тэрыторыі Галоўчынскага сельсавета ў час Вялікай Айчыннай вайны, Гузаў напісаў больш за 5 тысяч запытаў, рабіў падворныя абыходы. Яму ўдалося ўстанавіць і ўдакладніць імёны больш за 500 чалавек, выявіць абставіны іх смерці і месцы пахавання. Складанню гэтага спіса Гузаў прысвяціў каля 40 гадоў свайго жыцця. Рэгулярна на старонках газеты «Зара над Друццю» ў пачатку 1990-х гг. ад імя камісіі па напісанні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» яму выказвалася падзяка за пошук недакладнасцей у прозвішчах, імёнах і імёнах па бацьку загінулых удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, у іх біяграфічных звестках. Для кнігі «Памяць» Гузаў напісаў шмат артыкулаў па гісторыі краю, пра знакамітых землякоў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Фарміруючы спісы загінулых яўрэяў, ён занатоўваў у сшыткі вядомыя са слоў мясцовых жыхароў звесткі, а потым гэтыя сшыткі дасылаў па пошце розным людзям з прапановай дапоўніць змешчаную там інфармацыю.

Каб захаваць сабраныя гістарычныя і фальклорныя матэрыялы для нашчадкаў, Гузаў на ўласныя сродкі выдаў 47 брашур. Яны прысвечаны створанаму музею («Водгук удзячных сэрцаў», «Экспанаты і дакументы»), асабістаму жыццю краязнаўца («Маё жыццё – мае пакуты», «Жыццё. Як яно было»), мінуламу Галоўчына («Подых далёкіх гадоў»), знакамітым землякам («Памяць», «Героі Савецкага Саюза», «Заслужаныя настаўнікі», «Гартаванне ў агні», «Народныя таленты»), газеце «Зара над Друццю» («Пяром, як штыком»), фальклорным матэрыялам («Песні сівой даўніны», «Павер'і і прыкметы», «Казкі для дзетак-малалетак», «Мы гаворым так», «Лепш не скажаш», «Легенды сівой даўніны», «Ісціны жыцця», «Народныя параўнанні», «Праклёны вясковых сварлівых кабет») і інш.

Прыгаданыя матэрыялы сведчаць аб тым, што Васіль Гузаў быў рознабаковай асобай. Ён праявіў сябе як выдатны педагог, метадыст, даследчык, краязнаўца, збіральнік фальклору, журналіст, музейны спецыяліст. Самаадданая праца Васіля Гузава яскрава пацвярджае яго словы: «Для жывых і мёртвых я зрабіў усё што мог». А наш абавязак – захаваць для нашчадкаў яго багатую спадчыну.

Літаратура

1. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – Фонд 1244. – Воп. 19. – Спр. 1–81.
2. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – Фонд 1244. – Воп. 19. – Спр. 78.
3. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – Фонд 1244. – Воп. 19. – Спр. 80.
4. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава. – Калекцыя «Дакументы» (КП 29439–29444, 29731–29734, 30055–30060, 30901; 31490–31492; НВ 10880–10887; 11389, 11403, 11428), асабісты архіў Гузава В. Д.

ІВАН АНДРЭЕВІЧ – НАСТАЎНІК

Галоўка Сяргей Аляксандравіч,
журналіст,
г. Стоўбцы

Гаварыць пра Івана Адрэевіча Шавеля ў мінулым часе не зусім прыемна. Болем у душы адбіваецца ўспамін, а нявер'е, што яго няма сярод нас, так і не знаходзіць свайго пераканаўчага ўразумення. І ў той жа час пра яго, настаўніка і чалавека адкрытай душы, хочацца і хочацца гаварыць.

Івана Андрэевіча Шавеля ў свой час ведала практычна ўся Стаўбцоўшчына. У створаным ім у Старасвержанскай школе музеі ў 1960–1980 гг. перабылі разам са сваімі вучнямі ці не ўсе настаўнікі раёна, вопыт яго пазакласнай гісторыка-патрыятычнай работы са школьнікамі пераймалі калегі-гісторыкі, яго краязнаўчыя нататкі і артыкулы ў раённай газеце «Прамень» заўсёды выклікалі цікавасць у чытачоў самых розных узростаў, сацыяльных рангаў і прафесій…

Нарадзіўся Іван Андрэевіч 1 сакавіка 1919 г. у вёсцы Кухцічы, што на Уздзеншчыне [5, с. 6]. Сям'я была небагатай, бо жыла выключна са сваёй працы на зямлі. З малых гадоў спасціг яе і ён – пасьба кароў, сенакос, малацьба, ворыва… Усе жыццёвыя экзамены Іван здаваў выключна на «выдатна», а паралельна асвойваў яшчэ і школьную навуку. Спачатку паспяхова закончыў чатыры класы пачатковай школы ў роднай вёсцы, за-

тым – сямігодку ў суседніх Сямёнавічах, а ў 1935-м у ліку нямногіх вясковых юнакоў паступіў у адзіную ў раёне Уздзенскую дзясяцігодку. Сярэдняя адукацыя стала для Івана Андрэевіча адпраўной кропкай у самастойнае жыццё і адначасова праклала дарогу ў далейшы навуковы свет. У 1938-м, у год заканчэння сярэдняй школы, ён стаў студэнтам гістарычнага факультэта Мінскага педінстытута.

Першыя гады вучобы ў інстытуце запомніліся вясковаму юнаку на ўсё жыццё. Ён прагна спасцігаў навуку. Быў актывістам грамадскага жыцця. Як і многія тагачасныя студэнты, строіў планы на далейшае шчаслівае і радаснае жыццё ў Краіне Саветаў пад мудрым кіраўніцтвам Кампартыі і правадыра савецкіх народаў І. Сталіна. Аднак у хуткім часе прыйшло пэўнае расчараванне: восенню 1940 г. выйшла пастанова Савета Народных Камісараў СССР аб увядзенні платы за атрыманне на стацыянары вышэйшай адукацыі. Як згадваў пазней Іван Андрэевіч, неабходна было плаціць каля 400 тагачасных рублёў, і бацька, каб сабраць грошы на аплату, прапанаваў прадаць бычка і швейную машынку. Але гэта была занадта вялікая ахвяра сям'і, і Іван Андрэевіч пагадзіцца на яе не мог. Ён перавёўся на трэці курс завочнага факультэта і паехаў працаваць.

У канцы мая 1941-га студэнт-завочнік І. Шавель пайшоў у водпуск і паехаў у Мінск здаваць сесію. Да сярэдзіны чэрвеня ён поўнасцю справіўся з экзаменамі і меў намер крыху адпачыць. Але грымнула Вялікая Айчынная вайна. Нечаканасць гэтай навіны выклікала пэўную збянтэжанасць. І не толькі ў яго аднаго. Калі ж дні праз два ад пачатку ваенных дзеянняў пад Брэстам Іван Андрэевіч разам з многімі кухцінскімі юнакамі і мужчынамі прыйшоў у райваенкамат, там ужо нікога не заспеў. Тады і з'явілася думка падацца на ўсход. Аднак ужо за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад Узды, каля вёскі Валяр'яны, іх абстралялі немцы, якія аўтакалонай рухаліся па Слуцкай шашы на Мінск. Страціўшы падчас абстрэлу свой адзіны транспартны сродак – каня, хлопцы разышліся па дамах.

Пазней жыццё пад акупацыяй неаднойчы згадвалі Івану Андрэевічу ў самых розных інстанцыях. Аднак мала хто ведаў (а той, хто павінен быў пра гэта мець звесткі, упарта не хацеў прымаць іх да ўвагі), што ўчарашні студэнт І. Шавель падчас акупацыі роднай вёскі не проста разам з бацькамі займаўся хатняй гаспадаркай, але і супрацоўнічаў з партызанамі, збіраў для іх зброю, распаўсюджваў лістоўкі…

29 чэрвеня 1944 г. народныя мсціўцы з 300-й партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава вызвалілі Узду і тры дні ўтрымлівалі яе да прыходу часцей 65-й арміі 1-га Беларускага фронту. Як толькі ў Кухцічах з'явіліся чырвонаармейцы, ужо навучаны вопытам, назаўтра ж Іван Андрэвіч быў на зборным пункце. Яго залічылі ў 96-ю Гомельскую стралковую дывізію. У складзе гэ-

тага вайсковага падраздзялення радавы Шавель прайшоў франтавымі дарогамі роднай Беларусі, затым Польшчы і часткова Германіі, а канец вайны заспеў яго ў Чэхаславакіі.

Пра сваю ваенную «адысею» Іван Андрэевіч не любіў успамінаць. Калі мы, яго вучні, на занятках краязнаўчага гуртка ці на ўроку гісторыі прасілі штосьці расказаць з асабістага, ён заўсёды гаварыў, што вайна – гэта найвялікшае няшчасце, і вымушана згадваў адзін-два свае ваенныя эпізоды, якія, на жаль, не адклаліся ў памяці. Затое Іван Андрэевіч заўсёды вучыў нас паважліва ставіцца да ветэранаў. А колькі старасвержанскіх школьнікаў разам са сваім настаўнікам і без яго пабывалі ў сведак і непасрэдных удзельнікаў Вялікай Айчыннай! Вынікам чаго сталі шматлікія альбомы ўспамінаў аднавяскоўцаў пра перажытыя імі гады ваеннага ліхалецця. Але гэта было крыху пазней, калі настаўнік пранікся ідэяй стварэння школьнага краязнаўчага музея...

Як былога студэнта, які не закончыў навучанне, Івана Андрэевіча дэмабілізавалі датэрмінова. У кастрычніку 1945-га ён вярнуўся дадому і адразу ж аднавіўся на вучобе. У пасляваенныя гады Беларусь перажывала цяжкасці ва ўсім. Не хапала ў школах і настаўнікаў, асабліва на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі, далучанай перад вайной да БССР. Прайшоўшы паскораны курс навучання, Іван Андрэевіч атрымаў дыплом настаўніка гісторыі, пасля чаго яго накіравалі на Стаўбцоўшчыну. А першым і практычна адзіным месцам яго працы стала Старасвержанская дзесяцігодка, якой ён аддаў больш як сорак гадоў свайго жыцця. Працуючы ў школе, Іван Андрэевіч знайшоў сваю другую палавінку, таксама настаўніцу, Лідзію Дзмітрыеўну – жонку, сябра і надзейнага памочніка ва ўсіх яго справах і задумах.

Пра тое, якім Іван Андрэевіч быў настаўнікам, абапіраючыся і на ўласныя ўражанні, і на ўспаміны яго шматлікіх вучняў, можна гаварыць бясконца. Але адзінае, што ў гэтай сувязі хочацца зазначыць, гэта быў сапраўдны Педагог і Настаўнік. Яго жыццёвая энергія, чалавекалюбства, улюбёнасць у родны край, мінуўшчыну нашай зямлі, адданасць матчынай мове, спагада да прыроды, выключная інтэлігентнасць і шмат-шмат яшчэ іншых станоўчых якасцей дапамаглі не аднаму пакаленню старасвержанскіх школьнікаў стаць сапраўднымі грамадзянамі нашай краіны. І гэты жыццёвы прыклад свайго Настаўніка, без сумнення, дапамагае ім і сёння ўпэўнена крочыць па жыцці.

Прыехаўшы працаваць у сельскую мясцовасць, Іван Андрэевіч ніколі не адасабляў сябе і сваю сям'ю ад аднавяскоўцаў. Вучоба і паводзіны іх дзяцей у школе – гэта было адно, а вось суседскія шчырыя і спагадлівыя стасункі – гэта другое. Як вясковы інтэлігент, Іван Андрэевіч заўсёды быў наперадзе. Яго ініцыятывы па добраўпарадкаванні вуліц і прылеглых да

сядзіб тэрыторый заўсёды знаходзілі водгук у жыхароў Гараймаўшчыны (сёння гэта – частка вёскі Дразды), дзе ён пабудаваў дом і, дарэчы, нароўні з суседзямі да выхаду на пенсію вёў хатнюю гаспадарку, трымаў карову, свіней, меў сотак пад сорак агарода і цудоўнага саду. Смак райскіх яблычак, якімі ён з Лідзіяй Дзмітрыеўнай любіў частаваць сваіх вучняў, і сёння, напэўна, памятаюць многія.

Івана Андрэевіча, зрэшты, як і многіх настаўнікаў, спаўна скарыстоўвалі ў ідэалагічных мэтах мясцовыя ўлады. Асабліва ў пасляваенны час. Яны былі і агітатарамі, і інфарматарамі, і «калектывізатарамі» – дапамагалі ствараць калгасы, і зборшчыкамі падаткаў, і распаўсюджвальнікамі аблігацый дзяржаўнай пазыкі, і арганізатарамі выбараў, ды і дзялкай буракоў разам з калгаснікамі іх за гэта таксама не забывалі надзяляць… І ўся гэта грамадская нагрузка ўспрымалася як мае быць.

Праз прызму далучанасці да мясцовага жыцця і нават знітавання з ім, і зарадзілася ў Івана Андрэевіча ідэя аб стварэнні ў школе краязнаўчага музея. Не апошнюю ролю тут адыграла і яго прафесійная прыналежнасць, бо як гісторык ён мусіў клапаціцца не толькі пра тое, каб вучні памяталі, калі і дзе ўзнікла Вялікае Княства Літоўскае, ці ў якім годзе адбылася Палтаўская бітва, але і ведалі, як жылі ў тыя часы жыхары Старога Свержаня, Ператокаў, Драздоў і іншых вёсак Стаўбцоўшчыны.

Паходы з вучнямі па наваколлі, экскурсіі ў сталічныя музеі, асабістыя паездкі ў архівы, гістарычная літаратура дапамагалі разжыцца некаторым матэрыялам. Калі ж у канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. настаў час ссялення хутароў, у музей сталі паступаць і першыя істотныя матэрыялы – у ім знаходзілі «спачын» непатрэбныя для перасяленцаў рэчы, прадметы даўнейшага побыту і г.д. Паралельна са зборам экспазіцыйнага матэрыялу актыўна вялася работа і па ўвекавечанні памяці пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. А героі жылі побач, з імі штодня здароўкаліся дзеці, ідучы ў школу ці гуляючы на вуліцы. Разам з запісамі ўспамінаў былых франтавікоў і партызан, дайшла чарга і да старажылаў, якія ахвотна дзяліліся з вучнямі мясцовымі легендамі і паданнямі. Усё гэта і паступала ў школьны музей.

Значнай акцыяй старасвержанскіх школьных музейшчыкаў стаў пошук сваякоў чырвонаармейцаў, якія загінулі пры вызваленні Стаўбцоўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Атрымаўшы з архіва Міністэрства абароны СССР звесткі аб загінулых, вучні проста пісалі пісьмы без якіхсьці канкрэтных адрасоў у рэгіёны, адкуль прызываліся воіны. І заўсёды атрымлівалі на іх адказы. Так завязалася перапіска з многімі родзічамі загінулых у баях за вызваленне Стоўбцаў. Дзякуючы гэтаму, з далёкай Сібіры, Паўночнага Каўказа, Украіны і іншых рэгіёнаў СССР прыязджалі ў Стоўбцы пасівелыя ад гора маці, каб пакланіцца на плошчы Бессмяротнасці магіле сваіх сыноў, каб су-

стрэцца з вучнямі Івана Андрэевіча і падзякаваць уладам Стаўбцоўшчыны за захаванне памяці аб сваіх родных крывіначках [1]. Кожны такі прыезд, як і наведванне раёна воінамі-вызваліцелямі 4-га Гвардзейскага Кубанскага казацкага корпуса пад камандаваннем генерала Ісы Пліева, з якімі школьнікі таксама вялі перапіску, станавілася вялікай падзеяй не толькі для Старасвержанскай школы, але і ўсяго раёна…

Да 1986 г. створаны Іванам Андрэевічам школьны музей разросся на некалькі класных пакояў і яму стала цесна ў сценах школы. Тады старшыня калгаса «Нёман» Юльян Пятровіч Цвірка падтрымаў ідэю настаўніка, і гаспадарка ўзвяла пад размяшчэнне музея асобны будынак. І школьны музей памяняў статус на калгасны гісторыка-краязнаўчы, а яго дырэктарам быў прызначаны Іван Андрэевіч. Шкада, што ў сярэдзіне 1990-х новы старшыня калгаса «Нёман» Алег Рабчынскі не прадоўжыў ініцыятыву. Пасля пажару на мясцовым ФАПе будынак музея быў перапрафіліраваны пад урачэбную амбулаторыю, а яго экспазіцыя перавезена ў Дом культуры, дзе і была размешчана ў двух невялікіх пакоях…

Згадваючы пра Івана Андрэевіча, нельга не адзначыць яго любоў да прыроды і яго бескампрамісную барацьбу, якую ён вёў з усімі, хто асмельваўся ставіцца да навакольнага хараства не па-гаспадарку. У так званыя часы сацэльнай меліяратызацыі дайшла чарга і да невялікай рачулкі Залужанкі, плынь якой спрадвечна абягала вёску Стары Свержань. Правёўшы «паляпшэнне» наваколля на вытоках гэтай рэчкі, каля вёскі Залужжа, і затым стварыўшы Скамарошкаўскае вадасховішча, меліяратары выказалі намер спраміць пад лінейку і далейшае русла Залужанкі. Довады Івана Андрэевіча аб тым, што ператварэнне рэчкі ў канаву адмоўна скажацца на навакольным асяроддзі, ніхто не хацеў браць пад увагу. Не дапамагло і раённае начальства, кіраўніцтва аддзялення таварыства аховы прыроды таксама разводзіла рукамі. І тады Іван Андрэевіч наважыўся напісаць самому П. Машэраву [4, с. 4]. Толькі пасля гэтага супрацьстаянню настаўніка і меліяратараў быў пакладзены канец. А рэчка Залужанка сваім звілістым рэчышчам і сёння радуе кожнага ўлюбёнага ў родную зямлю старасвержанца, драздоўца і ператачаніна…

Цяжкім ударам для Івана Андрэевіча стаў пажар 1987 г. у Старым Свержані. У адначассі ўспыхнуў будынак мясцовай царквы. Нягледзечы на свае ў цэлым атэістычныя перакананні, Іван Андрэевіч з павагай ставіўся да вернікаў. А нам, сваім вучням, заўсёды казаў, што гістарычным цэнтрам Старога Свержаня з'яўляецца акурат тое месца, дзе стаіць царква. Менавіта па яго ініцыятыве і пры падтрымцы ўсё таго ж старшыні калгаса Ю. Цвіркі на раздарожжы каля цвінтара ў 1986 г. быў устаноўлены мемарыяльны камень з пазнакай першага ўпамінання Старога Свержаня ў гістарычных крыніцах [2, с. 8].

…Сёння царква Нараджэння Найсвятой Багародзіцы адбудавана ў Старым Свержані нанова. Многае зроблена на Стаўбцоўшчыне за апошні час і па аднаўленні гістарычнай спадчыны. З'явілася і раённая кніга «Памяць» [3]. Аб ёй марыў Іван Андрэевіч. Шкада толькі, што ў гэтым змястоўным выданні не знайшлося месца для пазнакі памяці пра Настаўніка і Краязнаўца Івана Андрэевіча Шавеля – чалавека, які любіў Стаўбцоўшчыну і рабіў усё магчымае, каб яе мінуўшчыну ведалі і любілі іншыя.

Літаратура

1. Вясковы настаўнік вярнуў імёны 136-і салдатам Вялікай Айчыннай [Электронны рэсурс] : рэпартаж міжнароднага радыё «Беларусь». – Рэжым доступу: https://radiobelarus.by/be/content/162. – Дата доступу: 02.02.2020.

2. Галоўка, С. Дзень нараджэння вёскі / С. Галоўка // Голас радзімы. – 1988. – 24 ліст.

3. Памяць. Стаўбцоўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2004. – 829 с.

4. Танич, М. Живёт в селе учитель... / М. Танич // Знамя юности. – 1985. – 9 янв.

5. Шавель, Я. Справа жыцця франтавіка і настаўніка / Я. Шавель // Прамень (Стоўбцы). – 2019. – 8 чэрв.

С. А. ЩЕРБАКОВ – ЖИВАЯ ЛЕГЕНДА. К 80-ЛЕТИЮ БАРАНОВИЧСКОГО КРАЕВЕДА

Горбунов Андрей Александрович,
протодиакон, кандидат богословия,
клирик Свято-Покровского храма г. Барановичи,
руководитель Миссионерского отдела
Пинской епархии Белорусской Православной Церкви,
г. Барановичи

«Мельзи млеко, и будет масло», – говорит премудрый Соломон (Притч. 30, 33). В любом деле непременным условием успеха является неравнодушие, энтузиазм и мотивация. Люди, обладающие этими качествами, не только приносят добрые плоды своих трудов, но пробуждают интерес и усердие у тех, кто вступает с ними в общение.

21 февраля сего 2020 года исполнилось 80 лет со дня рождения неустанного труженика на краеведческом поприще – Станислава Александровича Щербакова. Именно знакомство и общение с тогда еще директором Барановичского краеведческого музея вдохновило автора на исследовательскую работу по истории Барановичей.

Автор доклада пообщался с юбиляром, который любезно согласился рассказать о своем жизненном пути.

Станислав Александрович родился на ст. Целина Ростовской области (Ростов-на-Дону) в семье военнослужащего. Короткое время отец служил в Армении, а в 1946 г. семья переехала в белорусский город Калинковичи. В 1954 г. судьба привела юного краеведа в Барановичи, где, спустя четыре года, он окончил 42-ю Железнодорожную школу (сегодня СШ № 14 г. Барановичи). Во время учебы в школе занимался в школьном географическом кружке и стал частым посетителем Барановичского краеведческого музея. Любопытный факт: официальное название музей получил именно в 1954 г.

Еще будучи школьником, Станислав Александрович с увлечением изучал фонды музея, помогал сотрудникам в обустройстве экспозиции, в проведении инвентаризации. В книге поступлений музейных экспонатов за 1956 г. есть записи, что в фонды музея приняты на постоянное хранение монеты от учеников 8-го класса 42-й Железнодорожной школы Станислава Щербакова и Валерия Поликарпова.

По окончании 10 классов Станислав Щербаков на два года задержался в Барановичах. Работал подсобным рабочим и помощником машиниста углеподъемного крана в паровозном депо ст. Барановичи.

В 1960 г. приехал в Ригу и поступил в Рижское мореходное училище на судоводительское отделение, которое окончил в декабре 1963 г. Параллельно с учебой в РМУ посещал вечернюю рисовальную школу при Латвийской академии художеств. Учеба в «мореходке» дала возможность в периоды плавпрактик посетить ряд портов Балтийского моря, не только советских – Литвы, Латвии, Эстонии и России, но и зарубежных – Швеции, Германии, Бельгии, Голландии. Познакомился с музеями Риги, Ленинграда, Антверпена, Гааги, Роттердама.

К сожалению, связать свою жизнь с мореплаванием не представилось возможным. В 1964 г. он перебрался к родителям, которые жили уже в Краснодаре. Там поступил в Краснодарское художественное училище. В 1966 г. ушел в академический отпуск и занялся подготовкой к поступлению в ленинградский Художественный институт им. И. Е. Репина. Конкурс был очень высоким (около 50 человек на место), и учеба в Ленинграде также осталась в мечтах. В 1967 г. Станислав Александрович поступил на исторический факультет Краснодарского государственного педагогического института им. 15-летия ВЛКСМ. 18 февраля 1970 г. институт был преобразован в Кубанский государственный университет, который С. А. Щербаков окончил в 1972 г.

После университета вернулся в Барановичи. Директором Барановичского краеведческого музея в этот период был однокашник Станислава Щербако-

ва, Валерий Поликарпов, о котором уже упоминалось выше. Барановичский музей готовился к созданию новой экспозиции и нуждался в профессиональных кадрах. Сам по профессии музыкант, Поликарпов пригласил на работу в музей не просто школьного товарища, но, в первую очередь, историка с университетским образованием.

Работая научным сотрудником-экспозиционером, С. А. Щербаков написал тематико-экспозиционные планы нескольких отделов музея, способствуя его открытию в феврале 1974 г., принимал активное участие в формировании ряда музейных коллекций, участвовал в создании нескольких общественных музеев в учебных заведениях города, писал статьи по местной истории, выступал с лекциями по краеведению перед коллективами многих предприятий.

В 1981 г. оставил работу в музее и перешел в Барановичское бюро путешествий. Там руководил курсами экскурсоводов, сам работал экскурсоводом. Работа в бюро была отмечена Почетной грамотой Всесоюзного центрального Совета профессиональных союзов (ВЦСПС).

В декабре 1985 г. вернулся в музей уже на должность директора. В тяжелых условиях перестройки, при недостатке финансирования и дефиците материалов, удалось осуществить капитальный ремонт здания. В те годы музей расширился и занял все здание (до этого ему принадлежал лишь второй этаж). В 1994–1995 гг. была открыта основная экспозиция музея.

Параллельно с работой над созданием обновленной экспозиции (музей был закрыт на ремонт) директор и музейные сотрудники активно проводили различные выставки в Выставочном зале (открылся в Барановичах в 1984 г.). Оформляли передвижные выставки, которые экспонировались в кинотеатрах, клубах, школах, городском парке. Параллельно готовили к публикации статьи в городской газете, выступали на городском и областном радио. На местном телевидении регулярно стали выходить репортажи, освещавшие открытия выставок.

В эти годы музей стал налаживать дружеские контакты с посольствами других стран в целях укрепления культурных связей. Были подписаны соглашения о сотрудничестве с посольствами Китая, Чехии, Индии, Германии, Японии.

В конце 1990-х Станислав Щербаков принял активное участие в работе над книгой «Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка, г. Баранавічы і Баранавіцкі раён», которая увидела свет в 2000 году.

В 2001 г. решением Барановичского горисполкома С. А. Щербаков удостоен звания «Человек года г. Барановичи», а в следующем году Брестский облисполком принял решение присвоить директору Барановичского краеведческого музея почетное звание «Человек года Брестчины». В 2003 г. музей отмечен Почетным дипломом «Лучший музей».

В августе 2006 г. Станислав Александрович ушел на заслуженный отдых, подготовив к тому времени обновленный 7-й зал основной экспозиции музея – «Барановичи сегодня», посвященной истории города с 1985 г. по настоящее время. Обновленный раздел основной экспозиции открыт в сентябре 2006 г.

С уходом на пенсию неутомимый краевед не оставляет дело своей жизни. Он продолжает консультировать сотрудников музея, пишет статьи в местную газету. Его регулярно приглашают на заседания рабочих групп и координационных советов, на которых решаются вопросы, касающиеся истории города.

Свободное время, которого стало значительно больше, С. А. Щербаков использует для завершения рукописей и издания еще во время работы в музее книг.

В 2009 г. увидела свет книга «Барановичи на открытках и фотографиях».

В 2016 г. была готова к печати книга «Барановичи: улицы и переулки города в прошлом и настоящем, 1884–2014 годы». Осенью 2014 г. труд получил высокую оценку Координационного совета Барановичского городского исполнительного комитета по вопросам сохранения историко-культурного наследия.

Книгу удалось издать только в 2019 г. Вместе с ней увидела свет и книга «Мозаики Барановичского Покровского собора». В канун 80-летия автора в Барановичской городской библиотеке состоялась презентация этих работ. На мероприятие собрались близкие друзья и коллеги юбиляра. Среди поздравлений и слов признательности прозвучали и нотки сожаления о том, что такие важные труды долгие годы не доходят до типографии. Вот уже почти 20 лет ждет издания еще одна уникальная работа С. А. Щербакова: «Барановичи на картах, планах, схемах, в названиях улиц и переулков».

Кроме литературных и исследовательских трудов юбиляр известен своими акварельными пейзажами. В 2018 г. в выставочном зале Барановичского краеведческого музея состоялась выставка работ семьи Щербаковых. На ней было представлено более сотни работ: акварели Станислава Александровича (почти два десятка пейзажей), живопись и графика его супруги Аллы Брониславовны, а также фотографии их сына Виктора и текстильные куклы Натальи, его жены.

В 2005 г. автору настоящего доклада посчастливилось познакомиться с мэтром музейного дела. За 15 лет было много встреч, телефонных разговоров, совместных походов по памятным местам города, а также консультаций и советов при написании «Истории православных храмов г. Барановичи».

Удивляет способность Станислава Александровича рассмотреть даже в неприметных мелочах ниточки исторической памяти. Однажды во время

похода по авиагородку, где когда-то располагалась железнодорожная бригада, а вначале Первой Мировой войны – Ставка Верховного главнокомандующего, С. А. Щербаков обратил внимание на здание по ул. Уборевича, 5. Оно расположено по другую сторону железнодорожных путей Полесского вокзала. «Смотрите. В середине 30-х годов солдатами польской армии на кирпичах выцарапаны различные надписи. Здесь и даты есть. Это, вероятно, часовые оставили, которые охраняли генерала Андерса. Он жил в этом доме в те годы».

Из-под пера барановичского краеведа вышло 96 статей в городских и республиканских периодических изданиях, 26 статей в книжных изданиях. Он является автором пяти книг. Еще одна книга – «Барановичи» из серии «Города-побратимы» написана в соавторстве и издана на русском и финском языках в 1989 г. Многочисленные литературные и краеведческие труды, неустанное попечение о популяризации истории города и района позволяют говорить о С. А. Щербакове как о подвижнике в деле сохранения памяти старины и живой легенде города Барановичи.

КРАЕВЕДЫ БЫХОВЩИНЫ. НЕИЗДАННОЕ НАСЛЕДИЕ

Жижиян Сергей Филиппович,
директор
ГУК «Быховский районный историко-краеведческий музей»,
магистр исторических наук,
г. Быхов

Возрастающее на наших глазах внимание к краеведению как в малых городах Беларуси, так и в областных центрах, в учреждениях системы образования, науки и культуры, средствах массовой информации отражает осознание усиливающегося значения истории, прошлого нашей Родины в общественно-политической и культурной жизни страны.

Развивается краеведческое движение и на территории Быховского района Могилевской области. Но так было не всегда. В данном докладе мы расскажем о становлении краеведческого движения в регионе, о проблемах, связанных с сохранением уже наработанного материала, и задачах, стоящих перед краеведами дня сегодняшнего.

Первыми краеведами Быховщины можно условно считать историков конца XIX – начала XX в. М. О. Без-Корниловича, А. С. Дембовецкого,

Е. Р. Романова, М. В. Довнар-Запольского, нашего земляка И. А. Сербова и других исследователей этого периода [2; 8; 10].

С ноября 1924 г. в Быхове начало работу районное краеведческое общество. При обществе был создан музей. Современные исследователи музейного дела в Беларуси относят начало развития музейного дела на Быховщине именно к началу 20-х гг. XX в., а современный районный историко-краеведческий музей считают преемником музея краеведческого общества. В музее были собраны предметы археологии, нумизматики, этнографии и быта. Возглавлял общество Н. Е. Поплавский, который представил его работу на Втором всебелорусском съезде, проходившем 10–13 февраля 1927 г. в Минске. Общество занималось сбором этнографического материала, составлением археологической карты региона, изучением природных и климатических явлений в районе. Почти все материалы, трепетно собранные краеведами, уничтожила война [4, с. 28].

Наиболее активную и плодотворную работу в области исследования истории родного края проделали в послевоенное время краеведы Даниил Мартинович Абрамович, Михаил Филиппович Завальников, Илья Хононович Дригант, супруги Николай Кириллович и Галина Степановна Шульга, супруги Владимир Семенович и Нина Александровна Слиж, супруги Виктор Фомич и Анна Петровна Кулешовы, Калман Шмеркович Кугель, Таисия Никитична Бобцова, Сергей Максимович Божков, Александр Федорович Горошко и другие.

Среди них разнообразием тем исследований и активностью в изысканиях выделялись краеведы Д. М. Абрамович, К. Ш. Кугель и И. Х. Дригант.

Калман Шмеркович (Николай Семенович) Кугель родился в 1925 г. в Минске. Когда началась Великая Отечественная война, он оказался вместе с родителями в эвакуации, трудился на оружейном заводе, там же экстерном окончил 9 классов средней школы. Учился в школе рабочей молодежи. После войны вернулся в Минск и в 1945 г. поступил в медицинский институт. В то же время Кугель начинает заниматься наукой, посещает научные кружки, участвует в конференциях, выступает с докладами по акушерству и хирургии.

На Быховщину Кугель приезжает в июле 1950 г. Этот год можно считать отправной точкой в его краеведческой работе. Стоит отметить, что регион, в который волею судьбы попал молодой врач, сам по себе был, безусловно, интересен для пытливого ума. Деревня Рыжковка и Рыжковская больница, главным врачом которой Кугель проработал до 1997 г., связаны с родом Толстых, которые, собственно, эту больницу и построили. Недалеко от Рыжковки расположена деревня Грудиновка, где находится усадьба Толстых – дво-

рец и парк. Уже в начале 1960-х гг. появляются первые публикации Кугеля в местной прессе об истории Рыжковской больницы.

Со временем он начинает заниматься исследованием рода Толстых и истории деревни Грудиновка. К началу 1990-х гг. К. Кугель – автор более пятидесяти заметок об истории этого микрорегиона Быховщины в районной, областной и республиканской прессе, участник ряда научных конференций по истории и краеведению Могилевщины [5; 12].

28 июня 1999 г. Кугелю было присвоено звание «Почетный гражданин Быховского района». Умер К. Ш. Кугель 11 января 2010 г., похоронен в Минске. На сегодняшний день Кугель – единственный краевед, который сумел найти и обобщить материалы, касающиеся рода Толстых на Могилевщине. После смерти архив исследователя частично был передан Быховскому музею, а частично – разделен между родственниками [7].

Илья (Израиль) Хононович Дригант родился в 1918 г. в Быхове. Его род был одним из древнейших представителей еврейской диаспоры на Быховщине. Отец будущего краеведа был одним из активных участников революционных событий 1917 г. в крае, возглавлял артель. Израиль Хононович, окончив в Быхове школу второй ступени, уехал учиться в Могилев в газетный техникум – осваивать профессию журналиста. Когда началась Великая Отечественная война, оставшаяся в городе большая семья Дригантов погибла в Быховском гетто.

Израиль Хононович с ноября 1941 г. служит на Южном и Воронежском фронтах военным корреспондентом и добивается на этом поприще больших успехов. Постоянно находясь в самой гуще событий, он пишет статьи и заметки в различные фронтовые газеты. В 1942 г. Дригант становится секретарем редакции газеты «За Родину» 107-й стрелковой дивизии, а войну заканчивает в звании майора, имея шесть боевых наград. В фондах Быховского музея хранятся фотокопии его фронтовой переписки с И. Эренбургом [11].

После войны Израиль Хононович служит на Дальнем Востоке редактором газеты округа, затем на пять лет уезжает в Китай. Дригант – один из тех, кто, обучая и наставляя, создавал современную военную китайскую журналистику. Во время борьбы с космополитами он меняет свое имя Израиль на более безопасное – Илья. В конце 1950-х гг. Дригант возвращается в Быхов. Журналисты такого уровня были очень востребованы, и, придя работать в редакцию районной газеты «Сцяг Працы», он до выхода на пенсию становится ее бессменным ответственным секретарем. Начав свою деятельность с традиционных журналистских материалов, он со временем активно включился в активную краеведческую работу, которая проводилась работниками редакции. На протяжении почти тридцати лет Дригант

собирал и публиковал материалы о прошлом нашего региона. Основными темами его исследований были довоенная и военная история Быховщины. Он вел активную переписку со старожилами, свидетелями событий прошлого, учеными, архивами и библиотеками. Дригант – автор многих статей книги «Памяць» [9].

После выхода на пенсию Илья Хононович активно занимается краеведением и журналистикой. В районном Доме пионеров ведет кружок «Юный журналист». Умер Дригант в 1987 г. Его супруга с сыном и приемной дочерью эмигрировала в Израиль. Неизвестна судьба личного архива И. Х. Дригана. Часть его переписки сохранилась в фондах районного музея. По воспоминаниям его друзей и коллег часть своих наработок в области краеведения он передал Дому пионеров и школе № 3, однако на сегодняшний день следы этих материалов обнаружить не удалось.

Одним из самых известных краеведов Быховщины был Даниил Мартинович Абрамович, краевед всесоюзного значения. Родился Даниил Мартинович в деревне Мокрое в 1900 г. Осенью 1909 г. поступил в Мокрянское четырехклассное народное училище, которое окончил в 1913 г. с отличием. В том же году поступил в Быховское училище имени М. И. Кутузова. С 1916 г. учился в Быховском ремесленном училище, где увлекся революционными идеями. В 1917 г. – активный участник февральских и октябрьских событий на территории уезда, участник гражданской войны. В 1920-е гг. начинает публиковаться в районной и областных газетах. С 1929 г. работает в сельском хозяйстве, один из активистов коллективизации на Быховщине. С 1933 г. на партийной работе. С 1938 г. в рядах РККА, участвовал в походе Красной Армии в Западную Беларусь и Польшу, в Великой Отечественной войне, которую закончил в звании майора. Награжден двумя орденами и медалями. После войны находился на партийной работе. Персональный пенсионер с 1964 г. [12].

Коллекционированием и краеведческой работой Абрамович начал заниматься с 1924 г. Сам краевед в автобиографии писал: «Много материалов моих в библиотеках РК, районной, областной, в музеях Минска и Могилева, в Славгороде, Довске и других местах». Он очень много печатался в районной и областной прессе, при жизни собрал огромный архив и коллекцию древностей, связанных с Быховщиной. После смерти Д. М. Абрамовича 6 апреля 1994 г. его наработки и коллекция затерялись.

Следует отметить, что при жизни Абрамович был очень плодовитым «самиздатовцем»: кроме вышеперечисленных самим краеведом учреждений, часть материалов, написанных им, осталась в школьных музеях, у учителей и администрации школ, краеведов, его друзей и знакомых. Свои наработки он многим просто дарил.

Отсутствие при столь активной краеведческой работе какого-либо итогового труда, т.е. брошюры или книги, возможно, объясняет одна из цитат в автобиографии Д. М. Абрамовича: «Желательно написать хотя бы краткую историю Быховского района, но в этом должно быть заинтересовано руководство района» [6].

Вместе с тем при такой активной исследовательской работе на Быховщине в советское время единственными изданиями по материалам, собранным краеведами и отражающими прошлое региона, являются книга «Память», изданная в 1990 г. [9], и маленькая брошюрка «Быхов» Н. П. Хоботова, опубликованная годом ранее [13]. Как ни печально, но приходится осознавать тот факт, что огромное количество материалов, собранных краеведами Быховщины, не были обобщены и опубликованы ими в виде брошюр или книг при жизни, а после смерти их архивы в большинстве своем затерялись.

Полагаем, что одной из основных задач сотрудников районного музея является работа по розыску архивов краеведов прошлого, активное взаимодействие с краеведами дня сегодняшнего, дабы сохранить для будущего поколения наработки и исследования, касающиеся истории родного края.

Литература

1. Архив газеты «Маяк Прыдняпроўя».

2. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М. О. Без-Корнилович. – СПб., 1890.

3. Жижиян, С. Кровавый след холокоста / С. Жижиян // Маяк Прыдняпроўя. – 2012, № 3. – 11 студзеня.

4. Жижиян, С. Ф. 101 занимательный факт из истории Быховщины / С. Ф. Жижиян. – Могилев : АмелияПринт, 2013. – 84 с.: ил.

5. Кугель, К. З гісторыі маентку Грудзінаўка / К. Кугель // Магілёўская даўніна. Магілеў, 1996. – С. 59–64.

6. Личный архив С. Ф. Жижияна.

7. Личный архив С. П. Двоскина.

8. Опыт описания Могилевской губернии. В 3-х кн. / под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев на Днепре, 1884.

9. Памяць: Гісторыка-дакум. хроніка Быхаўскага раена / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Минск, 1990.

10. Романов Е. Р. Две археологические разведки / Е. Р. Романов // Могилевская старина. – Вып. 3. – Могилев, 1903.

11. Фонды ГУК «Быховский районный историко-краеведческий музей».

12. Фонды Могилевского государственного архива (ГАМог).

13. Хоботов, Н. П. Быхов / Н. П. Хоботов. – М., 1989.

ПЕДАГОГИ-ФРОНТОВИКИ: НАСЛЕДИЕ И НАСЛЕДНИКИ

Захаренко Наталья Ивановна,
методист отдела туризма и краеведения
ГУО «Гомельский городской центр дополнительного образования детей и молодежи»,
г. Гомель

Я не напрасно беспокоюсь,
Чтоб не забылись имена,
Ведь эта память – наша совесть.
Она как сила нам нужна.
Юрий Воронов

Судьбы педагогов-фронтовиков, обожженные войной, стали совестью поколений. Их имена, как яркие салюты, и это только капли в веренице нашей памяти. «Беларусь помнит» – акция, которая сплотила всех в едином порыве: вспомнить каждого, кто завоевал Великую Победу над фашизмом. Во всех семьях жива память о героическом подвиге родных и близких. Война сроднила людей, невзирая на нации и народности, веру и возраст. Движение по сохранению личной памяти о поколениях Великой Отечественной войны стало международным, общественно-гражданским. Летопись памяти пополняют и страницы о педагогах-фронтовиках. Важно сохранить эту память для потомков. И сегодня позвольте мне напомнить об удивительных людях, педагогах-фронтовиках, чьи имена золотом вписаны в историю Гомельщины, чьи судьбы отшлифовала война.

Выпускники школ 1941 г., молодежь, педагоги ушли на фронт. Они прошли долгими километрами военных дорог и победили. Многие из них остались в строю, но солдатами самой мирной профессии – учителями. Им выпала особая дорога – стать педагогами от бога, поднять город из руин, восстановить школы, воспитать патриотов и уйти в бессмертие. Урок жизни педагогов-фронтовиков – это огромный ресурс, помогающий нам воспитывать молодежь на героических подвигах наших земляков. Исследовать их жизнь и подвиг необходимо, потому что они история, прикоснувшись к которой, можно почувствовать и понять всю глубину и правоту выражения «в жизни всегда есть место подвигу».

Стремительно меняется время, меняется общество и отношения между людьми. Но неизменной остается роль учителя, передающего знания, учителя, ведущего нас по жизни. Разрешите мне вспомнить подвиг учителя-фронтовика, который встретился на моем жизненном пути. Это Лариса

Тихоновна Дейкун. Ее педагогическая деятельность вписана в историю нескольких школ. Но для меня Лариса Тихоновна – это учитель, идущий со мной по жизни. Это она привила нам, учащимся школы, любовь к истории и литературе, рассказала о божественном предназначении учителя – давать людям слово, свет, знания. Лариса Тихоновна солдатом не была, оружия не держала, но заслужила право носить гордое солдатское звание «фронтовик».

Лариса Дейкун родом из Речицы. На начало войны ей было всего 15 лет. На фронт ушли все ее родные. Девочку отправили в эвакуацию, но поезд по дороге разбомбили фашисты. Домой – дороги не было, ее родной город был захвачен врагами. На перепутье, между фронтом и тылом, она встретила передвижной госпиталь, попросилась с ними на фронт. Ее определили помощницей к прачке. А с ноября 1943 г. Лариса Тихоновна служила уже в прифронтовых госпиталях действующей армии нянечкой, санитаркой, медсестрой. В защитной гимнастерке и сапогах, на пять размеров больше своего, она прошагала наравне с солдатами долгими фронтовыми дорогами. Мечтала дойти до Берлина. Дважды была ранена. Войну прочувствовала и запомнила каждой своей клеточкой: первые фронтовые дни, как замачивала сотни солдатских гимнастерок, пропитанных кровью, как вытаскивала раненых с передовой, в огненном аду рвущихся снарядов, как получала похоронки на родных… Ужасы войны ее долго не отпускали. Лариса Тихоновна стала записывать воспоминания о солдатах и мирных жителях, для которых война стала частью жизни. Она открыла людям многие имена своих земляков, героев войны. Дейкун Л. Т. опубликовала много статей и очерков. У нее легкое, изящное слово.

О самой героине написала Светлана Алексиевич в книге «У войны не женское лицо». После войны Лариса Тихоновна прошла путь от учителя до директора школы. И многие мои сверстники благодарны судьбе за встречу с ней, с педагогом-фронтовиком с большой буквы.

Время, безусловно, откладывает отпечаток на характер человека. Пословица «Посеешь характер – пожнешь судьбу» – правдивое отражение жизни Клары Залмановны Резниковой. Ее судьба – это подвиг гражданина, труженика, солдата и просто женщины с твердым характером. Аттестат с отличием она получила накануне 22 июня 1941 г., а потом пришлось вместе с жителями Гомеля рыть окопы и противотанковые рвы. Просилась на фронт, хотела стать танкистом. Но семью эвакуировали в Саратовскую область. Там обучилась управлять трактором – фронту нужен был хлеб. В августе 1942 г. Клара Резникова, окончив краткосрочные курсы медицинских сестер, попала на фронт. В самый эпицентр войны – под Сталинград. Каждый день, без отдыха и сна, ей приходилось сдавать экзамен по

спасению людей. Военный путь от Сталинграда через Украину, Молдавию, Австрию Клара Залмановна прошла в должности санинструктора, затем – медсестры. Что только не пришлось увидеть и пережить этой хрупкой девушке: множество человеческих смертей, собственные ранения и контузию, агонию войны. Правительство высоко оценило ее подвиг во имя Родины. Клара Залмановна награждена медалью «За оборону Сталинграда» и орденом Красной Звезды. До войны она мечтала быть врачом, но слишком много крови и человеческого страдания пришлось увидеть Кларе в военные годы. В мирной жизни ей хотелось радости, счастья, веселого и беззаботного детского смеха.

Демобилизовалась она в декабре 1945 г. и поступила в Гомельский пединститут имени В. Чкалова. Тридцать пять лет педагогического пути от простого учителя до методиста Гомельского отдела образования она прошла достойно. 1980 г. стал для нее началом поистине важного и нужного дела – в этом году был создан клуб «Искатель», а затем и школьный музей.

Музей трудовой и боевой славы СШ № 44 им. Н. А. Лебедева был открыт 26 ноября 1983 г. в день 40-летия освобождения Гомеля от немецко-фашистских захватчиков. Музей стал центром патриотического воспитания молодежи. Ветеран Великой Отечественной войны и педагогического труда Клара Залмановна Резникова всю себя отдала служению Родине, профессии и сохранению памяти о борьбе за Родину. Люди, прошедшие войну, помнят ее всю – от начала до конца. Только поняв всю глубину несчастий и весь объем потерь, можно осознать длину пути до Победы, до бессмертия.

Высочайшая степень признания труда и служения Родине – звание Почетного гражданина города. Среди педагогов-фронтовиков г. Гомеля этого почетного звания удостоены Милевский Альбин Иванович (1967) и Лебедев Николай Афанасьевич (1988).

А. И. Милевский в числе первых педагогов-фронтовиков стал Почетным гражданином нашего города. Свой педагогический путь Альбин Иванович начал в далеком 1936 г., сразу после окончания физико-математического факультета Гомельского педагогического института. На фронт ушел добровольцем, воевал на Ленинградском, Волховском и Прибалтийском фронтах. Вернулся с боевыми наградами, в числе которых орден Красной звезды и медаль «За Отвагу». После окончания войны учителя физики назначили директором сельского детского дома, а в 1949 г. – заведующим сектором детских домов области. Альбин Иванович объездил на «полуторках», на санях по бездорожью, обошел обожженную землю Гомельщины пешком, чтобы собрать всех обездоленных войной детей, дать им приют и возможность учиться. За гражданский подвиг и профессиона-

лизм в 1963 г. Альбину Ивановичу присвоено звание заслуженного учителя БССР. В дальнейшем педагогическая деятельность фронтовика много лет была связана с разными школами города. 27 апреля 2004 г. состоялся торжественный митинг, посвященный открытию мемориальной доски на здании средней школы № 20 г. Гомеля первому педагогу-фронтовику, Почетному гражданину Гомеля, заслуженному учителю Республики Беларусь. Его педагогический опыт опережал свое время как минимум на пятьдесят лет. Альбина Ивановича называли творческим педагогом, его кипучая деятельность научила многих учителей беззаветно служить детям и Отечеству. Судьба А. И. Милевского даже после его ухода в бессмертие служит примером самоотверженного подвига учителя во имя будущего детей и развития педагогической науки.

Не должно померкнуть в памяти людской золото имен педагогов-фронтовиков, солдат самой мирной профессии, которыми по праву гордится педагогическое сообщество Гомельщины.

Необходимо глубже изучать подвиг учителей, которые ушли на фронт, оставив любимое дело и своих учеников, и подвиг тех, кто из окопов фронтовых пришел в школу восстанавливать народное образование в послевоенные годы.

События Великой Отечественной войны с каждым годом отдаляются в прошлое. Но люди хранят память о тех, кто прожил страшные дни, когда содрогалась от ужаса наша земля. Все меньше участников Великой Отечественной войны остается с нами – уходят они тихо, неспешными шагами.

В год 75-летия Победы над фашизмом в учреждениях образования Гомеля стартует акция «Великая Победа: наследие и наследники». Каждое учреждение готовит баннер, на котором будет размещена информация о педагогах-фронтовиках. Куратором этой акции выступает Гомельский городской центр дополнительного образования детей и молодежи. Акция будет способствовать увековечению памяти имен педагогов-фронтовиков.

Акция памяти – это плата наших сердец за то, что ветераны сделали для нас, для страны, для мира. «Учитель – мирный человек, но в сорок первом каждым нервом он защищал двадцатый век, чтоб жили школы в двадцать первом…». Сохранение памяти об учителях, прошедших Великую Отечественную войну, изучение их наследия является важнейшей задачей воспитания и формирования личности и обогащает последующие поколения бесценными знаниями. Подвиг учителя-фронтовика бессмертен, как и подвиг солдата, подвиг всего советского народа!

«ВСЁ СУЩЕЕ УВЕКОВЕЧИТЬ…»

Канапацкая Таццяна Васільеўна,
журналіст,
прыход храма іконы Божай Маці
«Спатоленне пагіблых»,
г. Лунінец

У Лунінцы ў Дзень беларускага пісьменства ў 2001 годзе адкрыты бюст з надпісам: «Мікалаю Калінковічу – удзячныя землякі». Помнік установлены каля цэнтральнай бібліятэкі. Лунінчане знаёмяць гасцей з біяграфіяй земляка, якому было наканавана вельмі кароткае, але насычанае багаццем літаратурнай творчасці жыццё.

Ураджэнец вёскі Цна (18.12.1950 – 24.07.1990) быў выпускніком СШ № 2 г. Лунінца (1968). Закончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна (1976), працаваў у раённай газеце «Ленінскі шлях» (Лунінец, цяпер «Лунінецкія навіны») і абласной – «Заря» (Брэст), супрацоўнічаў з рэспубліканскімі СМІ. Запрошаны ў органы дзяржаўнай бяспекі, закончыў Вышэйшую школу КДБ (Мінск), служыў у Мары (Туркменістан) і Тбілісі (Грузія), у Маскве абараніў навуковую дысертацыю на званне кандыдата юрыдычных навук. Падпалкоўнік.

Увесь гэты час Мікалай Калінковіч быў аддадзены творчасці. Першы з ураджэнцаў нашага краю прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР (1984). У яго багатай літаратурнай спадчыне і першая [1], і апошняя [2] кнігі – прысвячэнні малой радзіме.

Калі ж па волі лёсу чэкіст служыў за межамі Беларусі, у розных краінах ён шукаў звесткі аб суайчыннікаx. Ён выдаў кнігу аб двух беларусах з ліку 26-і бакінскіх камісараў [3]; занатаваў гісторыі лёсаў рэвалюцыянераў – ураджэнцаў Беларусі, якія ўсталёўвалі Савецкую ўладу ў Туркменіі [4]; аддаў даніну памяці туркменам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Беларусі [5].

І ў далёкай рэспублікі пісьменніка падтрымлівала нітка духоўнасці з радзімай. Свае творы ён прысвячаў родным і блізкім людзям (напрыклад, кніга «Не парываецца зямная сувязь» прысвечана бабулі аўтара А. Ф. Іваш-кевіч-Луд, вязню канцлагера, а кніга «Вяртанне світанкавага золку» – памяці дзядзькі А. І. Луда, «партызана і радавога вайны, які загінуў 19-гадовым»…).

Каштоўнасць і для Беларусі, і для Расіі – даследаванне, якое «выраслa» з дыпломнай работы і адкрыла для сучаснікаў старонкі знаходжання на Палессі расійскага творцы Аляксандра Блока (16[28].11.1880 – 07.08.1921) у перыяд Першай сусветнай вайны з ліпеня 1916-га па сакавік 1917 г. [6]. Дарэчы, вершаваны радок паэта як загаловак майго артыкула адлюстроўвае сутнасць нашага земляка.

Праз два гады пасля трагічнай гібелі Мікалая Мікалаевіча лунінчане пачалі адзначаць яго памяць літаратурнымі сустрэчамі. Імем М. М. Калінковіча былі названы вуліцы ў горадзе і ў яго роднай вёсцы Цна. Пісьменніку прысвячаюцца конкурсы вершаў краязнаўчай тэматыкі, конкурсы навукова-даследчых работ, навукова-практычныя канферэнцыі.

На захаванне памяці аб земляку нас натхняюць сябры М. М. Калінковіча і творцы, якія даведаліся аб ім пасля завяршэння яго зямнога шляху. Яны не дазваляюць аддаць забыццю пісьменніка. У прыватнасці, член Саюза пісьменнікаў і Беларусі, і Расіі Сяргей Трахімёнак неаднаразова прымаў удзел у лунінецкіх краязнаўчых сустрэчах.

Да дзён нараджэння і памяці М. М. Калінковіча ў раённай газеце «Лунінецкія навіны» апублікавана больш як 50 матэрыялаў, яшчэ больш – вершаў… Аб нашым земляку прыгадвалі абласныя і рэспубліканскія выданні [7–12]. Імя трагічна загінулага пісьменніка неаднаразова ўшаноўвалася ў публікацыях штотыднёвіка «Літаратура і Мастацтва» [13–16].

Аднакурснікам М. М. Калінковіча быў Віктар Супрунчук, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа, які занатаваў свае ўспаміны аб сябры [17–18]. Знаёмы па Туркменістане з М. М. Калінковічам быў Васіль Ткачоў, лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных прэмій, які прысвяціў яму нарыс [19].

Самы вялікі ўклад у захаванне памяці ўнёс Алесь Карлюкевіч, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Аўтар уключыў у дзве свае кнігі [20 і 21] напісаны ім нарыс «З душою чуйнай, як мембрана», яшчэ ў адну – аўтабіяграфію М. М. Калінковіча «Кароткі погляд на пражытае» [22]. На тэлеканале «Беларусь-3» Алесь Мікалаевіч падрыхтаваў праграму, што выйшла ў эфір 16.01.2014 г.

А. М. Карлюкевіч называе М. М. Калінковіча ў ліку «шчырых служак беларускага слова». Вядомы журналіст прысвяціў лунінецкаму радзімазнаўцу шэраг публікацый [23–28].

Вернемся да помніка пісьменніку, на ўзвядзенне якога жыхары Лунінецкага раёна тры гады збіралі сродкі. Бюст работы скульптара Мікалая Кандрацьева (14.12.1925 – 07.08.2001) набыты за сродкі тагачаснага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Васіля Гаргуна (працаваў у парламенце два скліканні, 1996–2001 і 2001–2006). Матэрыялы выдаткавалі РУВП «Граніт» і ААТ «Спецжалезабетон», работы выканалі працаўнікі ПМК-7.

Няхай у Беларусі будзе больш прыкладаў дабрачыннага ўзвядзення помнікаў намаганнямі грамадства! Лунінчане могуць лічыць сябе годнымі памяці пісьменніка, які сваю творчасць прысвяціў Радзіме – вялікай і малой…

Літаратура

1. Калинкович, Н., Литвинчук, В. Лунинец: Ист.-экон. очерк / Н. Н. Калинкович, В. А. Литвинчук. – Мінск : Беларусь, 1981.

2. Калинкович, Н. Лунинец: Ист.-экон. очерк / Н. Н. Калинкович. – Мінск : Полымя, 1990.

3. Калинкович, Н. Не обрывается земная связь: Докум. повести и рассказы / Н. Н. Калинкович. – Ашхабад : Туркменистан, 1982.

4. Калинкович, Н. Имя моё – Свобода: Докум. повести и рассказы / Н. Н. Калинкович. – Ашхабад : Туркменистан, 1986.

5. Калинкович, Н. Возвращение рассветной рани: Докум. повесть и очерки / Н. Н. Калинкович. – Ашхабад : Магарыф, 1987.

6. Калінковіч, М. Палескія дні Аляксандра Блока / М. М. Калінковіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985.

7. Белорусские дороги Александра Блока // Могилёвские ведомости. – 2008. – 20 мая.

8. Бензерук, Р. Два крокі ў звонкае лета. …Як вяртанне ў маладосць / Р. П. Бензерук // Народная Трыбуна (Брэст). – 2012. – 17 жніўня.

9. Белорусские дороги Александра Блока // Рэспубліка. – 2008. – 23 авг.

10. Осколки «бесстрашной искренности» // Беларускі час. – 2009. – 10 июля.

11. Добрыя традыцыі працягваюцца // Железнодорожник Беларуси. – 2012. – 15 дек.

12. Натхнённыя ўсходняй мудрасцю // Звязда. – 2014. – 29 кастр.

13. Памяць – працяг справы // ЛіМ. – 2012. – 6 студз.

14. Родная Цна. Назаўсёды // ЛіМ. – 2013. – 16 жніўня.

15. У Лунінцы… // ЛіМ. – 2015. – 16 студзеня.

16. Розніца – у стагоддзе // ЛіМ. – 2015. – 21 жніўня.

17. Супрунчук, В. Старшына / В. П. Супрунчук // Лунінецкія Навіны. – 2010. – 18 снежня.

18. Супрунчук, В. Старшына / В. П. Супрунчук // ЛіМ. – 2011. – 14 студзеня.

19. Ткачоў, В. Белае сонца пустыні / В. Ю. Ткачоў // Маладосць. – 2001. – № 1.

20. Карлюкевіч, А. Далёкія і блізкія суродзічы / А. М. Карлюкевіч. – Мінск : Пейто, 1999 (на вокладцы – здымак надмагільнага помніка М. М. Калінковічу).

21. Карлюкевіч, А. І векавечны толькі край / А. М. Карлюкевіч. – Мінск : РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2012.

22. Карлюкевіч, А. З росных сцяжын / А. М. Карлюкевіч. – Мінск : РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2009.

23. Карлюкевич, А. Александр Блок: «…Пинск, вроде града Китежа» / А. Н. Карлюкевич // СБ – Беларусь Сегодня. – 2005. – 27 октября.

24. Карлюкевіч, А. Дарога да святла / А. М. Карлюкевіч // Беларуская думка. – 2007. – № 9.

25. Карлюкевіч, А. Полымя купальскіх кастроў / А. М. Карлюкевіч // Звязда. – 2012. – 12 мая.

26. Карлюкевіч, А. Вуліца Акадэміка Бахулева. Беларускія адрасы ў Маскве / А. М. Карлюкевіч // ЛіМ. – 2012. – 9 ноября.

27. Карлюкевіч, А. Цеплыня ашхабадскіх вуліц / А. М. Карлюкевіч // ЛіМ. – 2014. – 22 жніўня.

28. Карлюкевіч, А. Салдат паэзіі – Керым Курбаняпесаў / А. М. Карлюкевіч // Звязда. – 2016. – 12 мая.

ВЯДОМЫЯ КРАЯЗНАЎЦЫ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА (У РАМКАХ ДАСЛЕДАВАННЯ «ЛЁС НАШ – ГОМЕЛЬСКІ РАЁН»)

Козыраў Канстанцін Дзмітрыевіч,
малодшы навуковы супрацоўнік
ДУ «Гомельскі гісторыка-краязнаўчы музей»,
аг. Пакалюбічы, Гомельскі раён, Гомельская вобласць

Гомельскі раён – сэрца Гомельскай вобласці, адзін з найпрыгажэйшых куточкаў на яе тэрыторыі, які мае значныя прыродныя і працоўныя рэсурсы.

У 2016 г. Гомельскому раёну споўнілася 90 гадоў. Напярэдадні святкавання гэтай знамянальнай даты ў Гомельскім гісторыка-краязнаўчым музеі вялася вялікая праца па збіранні цікавых звестак і артэфактаў з гісторыі развіцця сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў раёна, яго знакамітых людзей і тых, хто ўсё жыццё прысвяціў сябе працы на гэтай зямлі, а таксама захаванню і папулярызацыі гістарычнага мінулага краю.

Вынікам гэтай дзейнасці з'явіўся доўгатэрміновы праект «Захаваем гісторыю разам», у рамках якога асаблівае месца займае тэма «Лёс наш – Гомельскі раён». Праект прысвечаны 128 вядомым людзям раёна з розных галін дзейнасці: навукі і культуры, сельскай гаспадаркі і прамысловых прадпрыемстваў, медыцыны і народнай творчасці і іншых.

Напярэдадні святкавання 75-гадовага юбілею Вялікай Перамогі грунтоўна распрацавана тэма аб Героях Савецкага Саюза – ураджэнцах Гомельскага раёна, Героях Сацыялістычнай Працы, ганаровых грамадзянах, ветэранах Вялікай Айчыннай вайны і воінах, якія загінулі пры вызваленні раёна. З гэтай нагоды праведзены шэраг мерапрыемстваў, сярод якіх закладка алей у гонар герояў і воінаў-вызваліцеляў, установка білборда «Героі Савецкага Саюза Гомельскага раёна», сустрэчы, вечарыны памяці ветэранаў і многае іншае.

Той можа кінуць край гаротны
Дзеля чужых заморскіх дзіў,
Хто на сваёй старонцы роднай
Сады ніколі не садзіў.

Такія словы можна пачуць толькі ад сапраўднага патрыёта сваёй Бацькаўшчыны, які, як родную матулю, любіць і шануе родную зямліцу. Гэта радкі Галіны Аляксандраўны Рагавой, вядомай паэтэсы Гомельшчыны, ураджэнкі Гомельскага раёна. І такіх патрыётаў сярод нашых землякоў вельмі шмат, але сёння хочацца расказаць аб тых, хто ўсё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню духоўнай спадчыны роднай зямлі і ўнёс значны ўклад у развіццё навукі этнаграфіі. Адна з іх Зінаіда Радчанка.

Нарадзілася Зінаіда Фёдараўна Радчанка ў памешчыцкай сям'і. Маленства і юнацтва яе прайшлі на ўлонні прыроды ў маёнтку маці – вёсцы Дзятлавічы Гомельскага павета. Тут упершыню пачула і палюбіла яна народную песню. Жыццё ў вёсцы дало ёй магчымасць вывучыць побыт, звычаі, абрады, павер'і і вусную паэтычную творчасць сялян Дзятлавіцкай воласці. З. Ф. Радчанка цягам усяго жыцця цікавілася народнай творчасцю, асаблівасцямі гаворкі беларусаў, іх поглядамі на сусвет і наогул матэрыяльнай і духоўнай культурай жыхароў краю. Вынікамі яе збіральніцкай дзейнасці з'явіліся тры зборнікі народных песень. Зінаіда Фёдараўна – першая ў Расійскай імперыі жанчына, якая стала правадзейным членам Рускага геаграфічнага таварыства.

За першы фальклорны збор – «Зборнік маларускіх і беларускіх песень Гомельскага павета, запісаных для голасу з акампанементам фартэпіяна» (Санкт-Пецярбург, 1881, вып. 1) З. Ф. Радчанка была ўдастоена сярэбранага медаля Рускага геаграфічнага таварыства. У зборнік увайшлі 30 песень з напевамі.

Самы багаты па колькасці твораў другі выпуск – «Гомельскія народныя песні (беларускія і маларускія)», выдадзены ў Пецярбургу ў 1888 г., куды былі ўключаны 676 народных песень, таксама запісаных у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета. Апрача таго, З. Ф. Радчанка змясціла тут 84 народныя прыказкі [1, с. 171].

«Ва ўводзінах да зборніка складальніца коратка характарызуе беларусаў Гомельскага павета, іх знешні выгляд, адзенне, рысы характару. Яна лічыць беларусаў працавітамі, цярплівымі, пакорнымі лёсу, называе "рахманым народам". Наогул у той час яшчэ многія вучоныя мелі памылковае ўяўленне аб характары беларусаў (маецца на ўвазе цярплівасць, пакорнасць, забітасць)», – вось такі крытэрый ацэнкі працы Зінаіды Радчанка прысутнічае ў зборніку «Беларуская фальклярыстыка», выдадзеным у Мінску ў мінулым стагоддзі.

Вядомы этнограф і фалькларыст М. А. Янчук з жалем адзначаў, што на беларусаў склаўся няправільны погляд: «Мы і цяпер гатовы ўяўляць сабе беларуса нейкім напаўдзікуном, напаўзверам, які жыве ў лесе, і толькі навука, толькі правільнае, сістэматычнае вывучэнне тыпу, характару і побыту гэтага народа, а таксама і самой краіны, у якой ён жыве, здолее праліць сапраўднае

святло на гэту цёмную старонку нашага народазнаўства і дазволіць з цягам часу зрабіць якія-небудзь агульныя вывады і заключэнні» [2, с. 2].

Падрабязна характарызуецца ў зборніку беларуская гаворка ў Гомельскім павеце, адзначаецца ўплыў на яе рускай і ўкраінскай моў. Даследчыца пералічвае асноўныя сялянскія стравы, гаспадарчыя пабудовы, апісвае інтэр'ер сялянскай хаты. На яе думку, звычаі, павер'і, прыкметы і забабоны ў гэтай мясцовасці такія ж, як і па ўсёй Беларусі і ва Украіне.

Найбольшая ўвага ва ўводзінах надаецца характарыстыцы спеваў і народных песень. «Беларусы любяць спевы і шмат пяюць, – піша даследчыца. – У свята і ў будні, на рабоце і на вячорках, вясною, летам, восенню і нават зімою, на адкрытым паветры, – пастаянна чуюцца іх песні».

Даследчыца спрабуе вызначыць музычныя асаблівасці беларускіх песень. Яна адзначае: «У музычных адносінах гэтыя песні маюць свой асобы характар; самі беларусы гавораць: "Нашы песні не закацістыя", г.зн. няма ў іх шырыні велікарускай песні, той шырыні, якая так тыпова адрознівае яе ад народных песень іншых еўрапейскіх нацый… Як характэрную рысу ўсіх гэтых песень можна адзначыць тое, што для кожнага складу ёсць амаль заўсёды своя асобная нотка». Яна адзначае, што ў беларускіх песнях пераважае мінорны тон з мажорным заканчэннем. Вельмі нямногія спяваюць у мяккім мажорным тоне, а ў чыста мажорным – толькі танцавальныя і новыя фабрычныя.

З. Ф. Радчанка выяўляе двухгалоссе ў харавым выкананні беларускіх песень: «Кожная з іх (спявачак), калі спявае адна, то спявае ўвесь матыў, як трэба; калі ж заспяваюць хорам, то яны, як бы па інстынкце, дзеляцца на два галасы: адны, тыя, што галасістыя, спяваюць усю песню правільна з матывам; другія ж бяруць то ў тэрцыю, то ў кварту, то ў квінту, часам бяруць і секунду ніжэй, або застаюцца на той жа нотцы, калі ў гэты час бярэцца верхняя нота, але гэты другі голас ніколі не заглушае верхняга, ніколі не вылучаецца; таму спачатку і здаецца многім, што яны спяваюць ва ўнісон. Пад канец песні ніколі не бярэцца актава ўверх, як гэта часта бывае ў велікарускіх песнях» [1, с. 172].

Каб паказаць стаўленне навадзятлаўцаў да спеваў, расказваецца пра адну сям'ю, у якой усе валодаюць цудоўнымі галасамі, але асабліва прыгожа спяваў 10-гадовы хлапчук. Яму плацілі грошы і дзякавалі за добрыя спевы тыя, хто праязджаў праз вёску, заслухоўваліся і мясцовыя жыхары.

Заслугоўвае ўвагі назіранне З. Ф. Радчанка таго, хто і якія песні спявае: абрадавыя песні спяваюць толькі дзяўчаты, усе ж іншыя (іх называюць у Новых Дзятлавічах «простыя») спяваюць і мужчыны. Моладзь пераймае шмат песень ад салдат, якія прыходзяць на пабыўку, і «чым далей, тым усё больш забываюцца свае старыя песні», – адзначае яна.

З заўвагай складальніцы пра тое, што песні беларусаў гэтага рэгіёна ў большасці – варыянты ўкраінскіх, «трапляецца нямала і велікарускіх у змененым выглядзе», нельга поўнасцю згадзіцца, але, бясспрэчна, уплыў рускіх і ўкраінскіх песень яны зведалі. Няма сумнення і ў тым, што беларускія песні таксама ўплывалі на апошнія.

Песні класіфікуюцца ў адпаведнасці з календаром. У прадмове Ф. Істомін як станоўчы момант адзначае тое, што складальніца ўпершыню выкарыстоўвае ў гэтым зборніку сістэму размяшчэння песень па порах года. Спачатку падаюцца вяснянкі, потым «веснавыя танкі» (карагодныя); купальскія (купальныя), жніўныя, вясельныя, калядныя, шчадроўныя (шчадроўкі і кралькі); неабрадавыя (простыя), у тым ліку танцавальныя (падтанечныя), і ў заключэнне – калыханкі.

Навуковую каштоўнасць маюць характарыстыкі, якія З. Ф. Радчанка дае пэўным відам народных песень на падставе асабістых назіранняў. Вяснянкі адзначаюцца як самыя любімыя песні беларусаў. Яны адрозніваюцца ад усіх іншых песень сваім прыпевам – гуканнем (пасярэдзіне песні), «што па веснавым разліве і адгукаецца далёкім рэхам».

Цікавыя звычаі былі на Івана Купалу: дзяўчаты збіраліся за вёскай і плялі вянкі для ўсіх. Асабліва вялікі вянок рабілі для «русалкі». «Русалкай выбіралі тую, якая мела самыя доўгія валасы: яна здымала свой андарак і заставалася ў адной сарочцы, з расхрыстаным каўняром; калі ж русалка смялейшая, то скідала і сарочку; доўгія распушчаныя валасы вісяць па плячах, велізарны вянок, як кола, накрывае ўсю галаву». Рабілі таксама з саломы чучала, раскладвалі вогнішча, кідалі чучала ў агонь, спявалі песні, скакалі цераз вогнішча, танцавалі.

Карагодных песень у зборніку трыццаць шэсць. Веснавыя карагодныя песні, як паведамляе З. Ф. Радчанка, спяваліся ў час велікоднага тыдня. Некаторыя карагоды ёю апісаны. Праз трыццаць восем жніўных песень складальніца гаворыць, што ўсе яны спяваюцца на адзін матыў, у мажорным тоне. І змест, і мелодыі гэтых песень бадзёрыя, жартоўныя. Але ж не ўсе песні былі вясёлымі: Радчанка не захацела ўключыць ці не заўважыла тых песень, у якіх адлюстроўвалася цяжкая праца на панскім полі; не кранулі яе сэрца скаргі жнеек на здзекі паноў, што так выразна адбіліся ў жніўных беларускіх песнях. Цікава расказвае складальніца пра звычай «завівання барады» ў час дажынак (абжынак) і пра талаку. Вясельныя песні (іх сто семдзесят два) характарызуюцца ў агульных рысах паслядоўна, у адпаведнасці з этапамі шлюбнага абраду. Коратка падаюцца калядныя абрады і звычаі – хаджэнне «са звяздой», «казой», «кралькай». Апошні звычай вядомы толькі з апісання З. Ф. Радчанка, таму цікава прывесці яго тут у яе інтэрпрэтацыі:

«Шляхта на каляду водзіць кральку. Зместам гэтай песні служыць апавяданне пра нялюбую жонку, якая ўсім дагаджае, – і свёкру, і свекрыві, і дзеверу, і залоўцы, толькі мужу нічым не можа дагадзіць: “Ой доля, доля мая!”» і г.д.

«Зборнік маларускіх і беларускіх народных песень Магілёўскай губерні Гомельскага павета Дзятлавіцкай воласці», які З. Ф. Радчанка выдала ў 1911 г., выгадна адрозніваеццв ад папярэдняга наяўнасцю музычнай часткі. У ім прыводзяцца напевы да 180 народных песень. Песні размеркаваны па сямі разделах: вяснянкі; веснавыя карагодныя; калядныя; вясельныя; жніўныя; вясеннія – танок; беларускія танічныя [1, с. 174].

Фальклярыстычна-этнаграфічная спадчына З. Ф. Радчанка, нягледзячы на асобныя недахопы публікацый, увогуле адыграла значную ролю ў справе збірання і вывучэння вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа. Вялікую дапамогу ў пошуку матэрыялаў па жыццёвай і творчай дзейнасці Зінаіды Фёдараўны аказала мне загадчык кафедры беларускай культуры і фальклярыстыкі, доктар ф.н., прафесар Валянціна Станіславаўна Новак.

Заслугоўваюць высокай павагі і ўдзячнасці людзі старэйшага пакалення, якія нарадзіліся, жывуць тут і на працягу ўсяго свайго жыцця займаюцца вывучэннем гісторыі роднага краю. Прыкладам такой самаадданай працы, улюбёнасці ў прыроду і людзей сваёй малой радзімы можа служыць энтузіяст, аматар-краязнаўца Людміла Кірылаўна Фомчанка.

А нарадзілася Людміла Кірылаўна ў 1941 г. у вёсцы Яроміна. Тут прайшлі яе дзіцячыя і юнацкія гады. Напэўна, уражанні ваеннага дзяцінства не давалі ёй спакою. І таму аповед пра паходжанне вёскі, лёсы яе жыхароў сталі старонкамі ўдзячнасці ўсім, хто жыў і жыве на гэтай зямлі. Яна змагла адлюстраваць у дзвюх сваіх кнігах, першая з якіх – нарыс «Ерёмино. История деревни» – гісторыка-бібліяграфічныя нарысы, што прысвечаны землякам, ураджэнцам і жыхарам Яроміна. Матэрыял размешчаны больш чым у 30 раздзелах, прысвечаных асобным сюжэтам з гісторыі жыцця яромінцаў. Акрамя бібіліяграфічных звестак тут змешчаны аб’ёмны дадатак з прыкладамі іх літаратурна-мастацкай творчасці, а таксама асветлены розныя бакі паўсядзённага жыцця. Сабраны аўтарам матэрыял дазваляе аднавіць повязь часоў, што асабліва важна ў адносінах да нашай моладзі – для захавання культурна-гістарычнай пераемнасці нашага народа.

«Я ганаруся тым, што маё роднае сяло Яроміна багата на выдатных, таленавітых асобаў ва ўсіх галінах вытворчасці і духоўнай дзейнасці. Яркае святло, што зыходзіць ад кнігі, будзе выхоўваць у моладзі любоў да сваёй Радзімы, да яе людзей, да сваіх каранёў» [3, с. 8]. Так выказалася кандыдат геолага-геаграфічных навук А. С. Сібілёва (Ліннік), якая таксама нарадзілася ў Яроміне, у прадмове да другога тома кнігі Л. К. Фомчанка «Яроміна.

Аднавяскоўцы», дзе Людміла Кірылаўна з цяплом і дабрынёй расказвае пра лёсы аднавяскоўцаў. Гісторыя яромінцаў – гэта адлюстраванне жыцця беларускага народа. Апісанне жыцця пэўных сямей зроблена аўтарам выбарачна па ступені радства ці блізкага знаёмства. Тут і родныя, і суседзі, і аднакласнікі, і людзі паважнага ўзросту, і многія іншыя. Прачытаўшы гэты цікавы падручнік жыццёвых гісторый асобных сямей даваеннага часу, трагічных лёсаў яромінцаў ваеннай пары і пасляваенага аднаўлення жыцця на вёсцы, прыходзіш да думкі, што кожны з нас менавіта вось так павінен ведаць гісторыю сваёй малой радзімы. На такіх прыкладах і фарміруецца патрыятызм і павага да сваіх людзей, зямлі і яе спадчыны.

Яе работа накіравана на адлюстраванне асаблівасцяў жыцця народа і краю, што звычайна не трапляюць на старонкі акадэмічных выданняў. Работа Л. К. Фомчанка садзейнічае захаванню гістарычнай памяці не толькі асобнага кутка Гомельшчыны, але і ўсёй нашай краіны, падтрымлівае сувязь пакаленняў.

Літаратура

1. Пятроўская, Г. А. Беларуская Фальклярыстыка. Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Г. А. Пятроўская. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 336 с.

2. Янчук, Н. А. По Минской гурбернии: (заметки из поездки в 1886 году) / Н. А. Янчук. – Москва : Тип. А. Левенсон и К, 1889. – 130 с.

3. Фомченко, Л. К. Еромино. Односельчане / Л. К. Фомченко. – Гомель : БелГУТ, 2008. – 302 с.

АЛЕСЬ ВІЛЬЧЫЦКІ – РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА»

Кошур Святлана Андрэеўна,
краязнавец, член Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі»,
г.п. Карэлічы, Гродзенская вобласць

Вяртанне забытых імён у кантэкст беларускай гісторыі і культуры – адна з важнейшых спраў, якою займаюцца беларускія краязнаўцы. За некалькі дзесяцігоддзяў пошукавай працы мне ўдалося вярнуць імёны некаторых нашых землякоў, якіх не ведалі на радзіме. Самымі складанымі аказаліся пошукі звестак пра таленавітага мастака з Карэлічаў Валянціна Рамановіча. У выніку з'явілася кніга «Лебядзіная песня Валянціна Рамановіча». Былі

і іншыя цікавыя знаходкі, але я раскажу пра найбольш працяглыя пошукі, якімі займалася на працягу 10-і гадоў, у выніку чаго ўдалося дапісаць гісторыю ўраджэнца Міра Алеся Вільчыцкага, які ў 1926 годзе рэдагаваў у Вільні газету рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку «Беларуская справа». Гэта стала магчымым пасля таго, як я атрымала рассакрэчаныя дакументы з Дзяржаўнага архіва Алтайскага краю.

Нарадзіўся Алесь Вільчыцкі (Аляксандр Сцяпанавіч Вільчыцкі) 15 лютага 1900 года ў мястэчку Мір Наваградскага павета Мінскай губерні (цяпер Карэліцкі раён) у шматдзетнай сялянскай сям'і.

У час Першай сусветнай вайны наш зямляк разам з бацькамі выехаў у г. Растоў-на-Доне, дзе ў 1920 годзе скончыў рэальнае 7-класнае вучылішча, пасля чаго вярнуўся на радзіму. Праз некаторы час у пошуках працы адправіўся ў Вільню, дзе неўзабаве стаў удзельнікам рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі Беларуская сялянска-рабочая грамада (БСРГ), якую ўзначальваў Браніслаў Тарашкевіч. Алесь Вільчыцкі трапіў у акружэнне такіх выдатных асоб, як Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павел Валошын, Пятро Мятла і іншых, пад уздзеяннем якіх у 1926 годзе пачаў рэдагаваць газету «Беларуская справа». Рэдакцыя гэтага выдання знаходзілася на Віленскай вуліцы ў доме № 12, трохі далей на гэтай жа вуліцы ў доме № 37 працавалі кіраўнікі БСРГ. «Беларуская справа» з'яўлялася на свет у друкарні Н. Левіна на вуліцы Нямецкай, 22.

Праз газету БСРГ прапагандавала ідэі нацыянальна-вызваленчай барацьбы, выступала супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, асвятляла развіццё беларускай культуры і асветы ў Заходняй Беларусі і ў БССР. У нумары ад 19 траўня яна вызначыла мэту сваёй дзейнасці: перадача сялянству зямлі без выкупу, амністыя для палітзняволеных, скасаванне асадніцтва, увядзенне рабочага кантролю над прамысловасцю, нацыянальнае раўнапраўе. Газета пісала пра важнейшыя здарэнні ў Польшчы і за мяжой, пра эксплуатацыю парабкаў, пра беспрацоўе і дэманстрацыі беспрацоўных у Польшчы, пра святкаванне 1-га мая ў Вільні, Гродне, Баранавічах і іншых гарадах, пра тое, як спаганяюць падаткі з сялян, пра галадоўку зняволеных у Навагрудскай турме, пра закрыццё беларускіх школ і забарону беларускіх газет, пра дзейнасць ТБШ. На старонках газеты друкавалі свае вершы М. Васілёк, Н. Арсеннева, Хв. Ільяшэвіч, змяшчаў нарысы пасол П. Мятла.

Перагартаем старонкі газеты. У № 1 ад 9 красавіка была змешчана карэспандэнцыя аб жыцці сялян на радзівілаўскіх землях у Стаўбцоўскім павеце (у Стаўбцоўскі павет у той час уваходзіла і мястэчка Мір): «За пасту каровы ў лесе – плаці, пабеглі дзеткі ў лес ягад назбіраць – панскія леснікі ловяць іх, разбіваюць гаршчочкі, трэ' чалавеку печку пратапіць, – ідзі да ляснічага,

знімай перад ім шапку і прасі ласкі, каб даў квіт на дровы ці галлё – ведама ж, за грошы… і г.д. А загарыцца панскі лес, – дык тых жа сялян зганяюць прымусам тушыць пажар. І за гэта ня толькі нічога не заплацяць, але і дзякуй не скажуць!» [3].

22 траўня 1926 года газета «Беларуская справа» пісала аб тым, што ў суботу, 3 траўня, удзельнікі драматычнага гуртка ў Міры збіраліся паставіць для насельніцтва дзве беларускія п'есы. З-за дрэннага надвор'я спектакль перанеслі на другі дзень. Аднак назаўтра артыстам зноў не пашанцавала: яны змаглі паказаць гледачам толькі адну п'есу Ф. Аляхновіча «На вёсцы». Другі спектакль быў забаронены камендантам мірскага пастарунка, хаця раней камендант даў дазвол.

Камендант патлумачыў прычыну забароны тым, што нібыта артысты гаварылі са сцэны тое, чаго ў творы не было. Так, у п'есе напісана: «…будзем пяць сваю родную песьню… насіць сваю родную вопратку…», а са сцэны было сказана: «…будзем пяць сваю родную, беларускую песьню… насіць сваю родную, беларускую вопратку» [3]. Гэтае слова «беларускую» так напалохала каменданта, што ён забараніў артыстам іграць другую п'есу.

16 чэрвеня ў рубрыцы «Хроніка» з'явілася інфармацыя пра суд над рэдактарам адной з беларускіх газет: «11-га гэтага месяца ў акружным судзе разглядалася справа рэдактара «Голаса Беларуса» – Мікалая Шылы. Абвінавачаны ён быў за артыкулы, у якіх быццам «прызываў да бунтаўнічых учынкаў насяленьня і да адарваньня Зах. Беларусі ад Польшчы». Рэд. Шыла засуджаны на год цяжкага вастрогу і пазбаўленьне грамадзянскіх правоў» [3]. Хутка падобны лёс напаткае і рэдактара газеты «Беларуская справа».

Алесь Вільчыцкі рэдагаваў газету з 9 красавіка да канца чэрвеня, потым яшчэ месяц яго справу працягваў С. Макулік. З 20-і нумароў газеты, якія выдаў наш зямляк, 5 былі канфіскаваны. Праіснавала газета «Беларуская справа» да канца ліпеня 1926 года, а потым яе выданне, як і многіх іншых заходнебеларускіх газет, было забаронена, а яе рэдактар Алесь Вільчыцкі быў арыштаваны і асуджаны польскімі ўладамі. Некалькі месяцаў ён знаходзіўся ў Віленскай турме за змяшчэнне ў газеце антыдзяржаўных артыкулаў. Пасля вызвалення ў студзені 1927 года, каб пазбавіцца праследавання з боку паліцыі, наш зямляк пакінуў Вільню і апынуўся ў Савецкай Беларусі, але тут перабежчыка зноў арыштавалі і за нелегальны пераход мяжы на працягу двух тыдняў утрымлівалі ў зняволенні.

Пасля гэтых выпрабаванняў Алесь Вільчыцкі ўсё ж здолеў уладкавацца на працу настаўнікам пачатковых класаў у Барысаўскім раёне. Неўзабаве ён сустрэўся са сваёй будучай жонкай Таццянай Юхневіч, якая таксама была пе-

рабежчыцай з Заходняй Беларусі і працавала ў Барысаўскім дзіцячым доме. З успамінаў сваякоў я даведалася, што ў апошнім лісце, які былы рэдактар даслаў сваякам з Масквы ў Мір, гаварылася, што сям'я пераязджае ў Ташкент, каб памяняць клімат, таму што сын Кім часта хварэе. Абяцаў, што адтуль напіша, але больш лістоў ад яго не было.

Далейшы лёс нашага земляка можна прасачыць па дакументах НКУС Алтайскага краю, што ўтрымліваюць пратаколы яго допытаў. Сям'я накіравалася ў Ташкент, дзе ў той час жыў брат Таццяны Юхневіч, які працаваў токарам на заводзе. Прыпыніліся ў г. Янгіюль, чыгуначнай станцыі за 28 км ад Ташкента. 18 снежня 1934 года Алесь Вільчыцкі атрымаў тут пашпарт. Дакумент, як сведчыць пратакол допыту, быў выдадзены «Янги-Юльским РО РК милиции НКВД Узбекской ССР» [1, арк. 246]. Відаць там сям'я страціла сына Кіма, бо пра яго ў дакументах няма ніякіх звестак, а ўпамінаецца толькі дачка Лілія, якой на момант арышту бацькі ў 1937 годзе было 3 гады. З пратакола допыту А. Вільчыцкага ад 29 снежня 1937 года: «Состав семьи – жена: Юхневич Татьяна Яковлевна – 32 лет, домохозяйка, дочь Вильчицкая Лилия Александровна – 3 лет. Жили при мне и на моём иждивении в с. Ребриха Ребрихинского района Алтайского края. Сестра – Бельская Антонина Степановна – учительница в г. Н. Борисов БССР, отец Вильчицкий Степан Мартынович – 63 лет, мать Вильчицкая Елена Георгиевна – 60 лет, братья – Николай – 39 л. и Георгий – 32 л. Все проживают в м. Мир Новогрудского воеводства в Польше» [1, арк. 246].

У Янгіюлі Вільчыцкія надоўга не затрымаліся, яны пераехалі ў сяло Уцянка Даволенскага раёна Новасібірскай вобласці, дзе наш зямляк працаваў дырэктарам Уцянскай НСШ, але ў той далёкі і трагічны час лёс былога рэдактара і перабежчыка з Польшчы быў прадвызначаны. Праверка, што адбылася ў навучальнай установе ў сакавіку 1937 года, прызнала работу кіраўніка нездавальняючай і нават шкодніцкай. У газеце «Алтайская правда» ад 4 студзеня 1938 года пачынаецца выкрыванне і цкаванне так званых «ворагаў народа».

Звольнены з пасады, Алесь Вільчыцкі пераязджае ў сяло Рабрыха, Рабрыхінскага раёна Алтайскага края, дзе працуе настаўнікам мясцовай сярэдняй школы, але ўжо было зразумела, што і тут яго не пакінуць у спакоі.

18 снежня 1937 года былы рэдактар быў арыштаваны органамі НКУС. Яго абвінавацілі ў тым, што ён з'яўляецца агентам замежнай разведкі і ўдзельнікам контррэвалюцыйнай шпіёнска-дыверсійнай паўстанцкай арганізацыі «Таварыства латышскіх стралкоў». З дакументаў НКУС: «В контрорганизацию вошёл по заданию польской разведки, которой был переброшен на территорию СССР в 1927 г. для разведывательной и диверсионной работы» [1, арк. 242].

6 студзеня 1938 года была арыштавана і жонка Алеся Вільчыцкага, Таццяна Юхневіч, а іх трохгадовую дачку Лілію здалі ў дзіцячы дом горада Змяінагорска.

Аляксандр Сцяпанавіч Вільчыцкі быў асуджаны «Особым совещанием при НКВД СССР» 11 лютага 1938 года і прыгавораны да расстрэлу. Прыгавор выкананы 27 сакавіка 1938 года ў г. Барнауле [1, арк. 285].

Таццяна Якаўлеўна Юхневіч была асуджана 9 ліпеня 1938-га. Расстраляна 5 жніўня 1938 года [2, арк. 17].

З рассакрэчанага дакумента, што захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Алтайскага краю:

«Определение № 459

Военный трибунал Сибирского военного округа (…), рассмотрев в заседании от 29 апреля 1958 г. протест Военного прокурора Сибирского военного округа на постановление Комиссии НКВД СССР и Прокурора СССР от 11 февраля 1938 года, согласно которому подвергнуты расстрелу:

(…) 4. Вильчицкий (Вельчицкий, Вильчинский) Александр Степанович, 1900 г.р., ур. быв. Минской губ., ар. 18.XII.1937 г., до ареста – преподаватель средней школы в с. Ребриха, Алтайского края (…) (Пералічваюцца прозвішчы 80-і чалавек. – С. К.)

(…) проверкой установлено, что указанной контрреволюционной организации на территории Алтайского края не существовало, она была выдумана бывшими работниками УНКВД края, а уголовное дело по обвинению вышеперечисленных лиц сфальсифицировано.

Рассмотрев материалы дела, проверки и полностью соглашаясь с доводами протеста, Военный Трибунал Сибво, руководствуясь Указом Президиума Верховного Совета СССР от 19 августа 1955 года,

Определил:

Протест удовлетворить. Постановление Комиссии НКВД СССР и Прокурора СССР от 11 февраля 1938 г. в отношении: (Далей пералічваюцца прозвішчы 80-і чалавек, у т.л. Вільчыцкага А. С. – С. К.)

отменить и дело на них производством прекратить на основании п. 5, с. 4 УПК РСФСР за отсутствием в действиях обвиняемых состава преступления» [1, арк. 447].

Такім чынам, справа ў адносінах А. С. Вільчыцкага спынена «за отсутствием состава преступления». 29 красавіка 1958 года ён быў рэабілітаваны. Таццяну Юхневіч рэабілітавалі 24 ліпеня 1989 года. Праз некалькі дзесяцігоддзяў справядлівасць перамагла, але людзей ужо не было ў жывых, і сваякі да нядаўняга часу не ведалі, які лёс іх напаткаў.

А што ж здарылася з маленькай дачушкай Алеся Вільчыцкага, якая ў трохгадовым узросце апынулася ў дзіцячым доме? Сёння я магу адказаць

на гэтае пытанне, бо мне ўдалося наладзіць перапіску з яе дачкой, унучкай Алеся Вільчыцкага, якая жыве ў Краснаярскім краі.

Да 14-гадовага ўзросту Лілія Вільчыцкая знаходзілася ў Змяінагорскім дзіцячым доме Алтайскага краю. У пасведчанні аб нараджэнні, якое было выдадзена, відаць, тады, калі дзіця трапіла ў дзіцячы дом, памылкова ўказваецца дата нараджэння – 1933 год, у той час як бацька, арыштаваны ў 1937 годзе, указваў, што ўзрост дачкі – 3 гады, а гэта значыць, што яна нарадзілася ў 1934 годзе. Імя па бацьку ў дакуменце запісана няправільна – Аляксееўна, у прозвішчы таксама зроблена памылка. Так Лілія Аляксандраўна Вільчыцкая стала Ліліяй Аляксееўнай Вельчыцкай.

З дзіцячага дома дзяўчынку адправілі ў сяло Савушкі каля Змяінагорска. Цяжка жылося сіраце. Да гэтага часу яна скончыла 5 класаў, а далей давялося жыць у чужых людзей і працаваць спачатку нянькаю, потым на калгаснай ферме і буравой вышцы. Праз некаторы час пераехала з сяброўкаю ў г. Рубцоўск, дзе змагла ўладкавацца на Алтайскі трактарны завод. Скончыла курсы і пачала працаваць машыністам маставога крана ліцейнага цэха. У 18-гадовым узросце выйшла замуж за Анатоля Ягорава, які таксама працаваў на заводзе. Разам выгадавалі дваіх дзяцей – дачку Любу і сына Аляксандра. Сын скончыў томскі інстытут па спецыяльнасці «геолаг». Жыве ў Томску, працуе дырэктарам аднаго з ювелірных прадпрыемстваў. Дачка Люба скончыла педінстытут у Краснаярску, працавала дырэктарам школы сяла Гладкова Саянскага раёна Краснаярскага краю.

Шмат гадоў Любоў Анатольеўна Юркова шукала звесткі пра сваіх бабулю і дзядулю. Пошукі і яе прывялі ў Дзяржаўны архіў Алтайскага краю. Даведаўшыся пра лёс рэпрэсаваных продкаў, унучка Алеся Вільчыцкага адшукала сваякоў у Міры. У 2012 годзе адбылася доўгачаканая сустрэча. У Мір прыехалі дачка Алеся Вільчыцкага Лілія з дзецьмі і ўнукам. Сустрэча была цёплая і кранальная. Многія сваякі прыехалі з розных гарадоў Беларусі, каб пабачыць сваіх далёкіх родзічаў. Яны і сёння падтрымліваюць сувязь паміж сабою. Нарэшце сірата Лілія Вільчыцкая даведалася аб тым, хто быў яе бацька і які лёс яго напаткаў.

Зацікавіліся лёсам нашага земляка і настаўнікі Рабрыхінскай сярэдняй школы Алтайскага краю, з якімі мне ўдалося наладзіць сувязь. Нядаўна на будынку школы, дзе працаваў наш зямляк, была ўстаноўлена памятная дошка з прозвішчамі рэпрэсаваных настаўнікаў, сярод іх ёсць імя Алеся Вільчыцкага.

Літаратура

1. Дзяржаўны архіў Алтайскага краю. Ф. Р-2, воп. 7, спр. 5647.
2. Тамсама. Спр.1 4676.
3. Беларуская справа. – 1926 год. – 9 крас., 22 мая, 16 чэрв.

АСОБА Ў ГІСТОРЫІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ АЛЯКСЕЙ МІХАЙЛАВІЧ МАРТЫНАЎ

Курачук Святлана Андрэеўна,
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі
ДУО «Кобрынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»,
г. Кобрын

У шматлікіх гарадах і сёлах нашай Беларусі заўсёды былі, ёсць і, безумоўна, будуць людзі, бязмежна ўлюбёныя ў свой родны край, людзі, жыццём і дзейнасцю якіх можна і захапляцца, і ганарыцца. Яны скрупулёзна вывучаюць і захоўваюць гісторыю малой радзімы, выяўляюць новыя духоўныя і матэрыяльныя помнікі культуры свайго рэгіёна.

Менавіта такім чалавекам – краязнаўцам з вялікай літары, сапраўдным патрыётам – быў Аляксей Міхайлавіч Мартынаў (1904–1999). Гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч, выдатны кіраўнік, ганаровы грамадзянін горада Кобрына, ганаровы член рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Легендарны для нас, кабрынчанаў, чалавек. Аляксей Міхайлавіч сабраў велізарны матэрыял па гісторыі Кобрыншчыны. Можна сказаць, што краязнаўчая дзейнасць нашага земляка дазволіла запоўніць «белыя» старонкі гісторыі нашага краю. А. Мартынаў не толькі збіраў матэрыялы пра кобрынскі край, але быў яшчэ выдатным папулярызатарам гэтых ведаў.

У Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы сабрана шмат прац А. Мартынава, матэрыялаў-даследаванняў на папяровых і электронных носьбітах пра гэтага ўнікальнага чалавека.

Створаны электронны паўнатэкставы рэсурс «Асоба ў гісторыі Кобрыншчыны. А. М. Мартынаў», які ўключае работы А. Мартынава, літаратуру аб яго жыцці і дзейнасці, вялікі архіў фотаздымкаў, відэаматэрыялы, бібліяграфічныя выданні цэнтральнай бібліятэкі. Алічбавана каля 250 артыкулаў з перыёдыкі, раздзелаў кніг. Гэты рэсурс падтрымліваецца ў актуальным стане, своечасова папаўняецца новымі публікацыямі.

Бібліёграфамі бібліятэкі выдадзены шэраг бібліяграфічных выданняў. Сярод іх – біябібліяграфічны паказальнік «Краязнавец з Вялікай літары», прысвечаны жыццю і дзейнасці А. Мартынава (выйшаў у 2 выданнях). Паказальнік змяшчае біяграфічныя звесткі, а таксама бібліяграфічныя матэрыялы (працы А. Мартынава па тэмах, літаратуру аб яго жыцці і дзейнасці). Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным паказальнікам яго публікацый. Выданне ілюстравана. Біябібліяграфічны паказальнік прызначаны для шырокага кола карыстальнікаў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю,

дасягненнямі людзей, якія ўнеслі значны асабісты ўклад у развіццё краю, чый жыццёвы і працоўны шлях – яркі прыклад працавітасці, самаадданасці, сумленнасці [7].

Немагчыма ўявіць наш горад без устаноў, што з'явіліся пры непасрэдным удзеле і намаганнях А. Мартынава. Гэта гарадская бібліятэка, арганізаваная пад кіраўніцтвам Аляксея Міхайлавіча ў 1939 г. і адноўленая пасля вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; вузел сувязі, у станаўленні якога ён прымаў самы актыўны ўдзел. Па ініцыятыве Мартынава ў 1948 г. быў заснаваны парк культуры і адпачынку імя А. В. Суворава. У 1960 г. ён арганізаваў раённае аддзяленне таварыства аховы прыроды, помнікаў гісторыі і культуры. Але, безумоўна, самым значным дасягненнем нашага земляка было стварэнне ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава, які стаў справай усяго яго жыцця. Буклет «Стаяў у вытокаў…: аб установах г. Кобрына, да якіх меў дачыненне А. М. Мартынаў» красамоўна расказвае пра гэты ўклад нашага героя ў станаўленне і развіццё Кобрыншчыны.

Біябібліяграфічны даведнік «Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю» прысвечаны людзям, якія ўпісалі яркую старонку ў гісторыю нашага горада, раёна і якія былі ўзнагароджаны званнем «Ганаровы грамадзянін». За шматгадовы ўдзел у культурна-асветніцкай рабоце, вялікі ўклад у вывучэнне і прапаганду гістарычнай спадчыны Кобрыншчыны, актыўную жыццёвую пазіцыю і ў сувязі з 710-годдзем горада Кобрына Аляксей Мартынаў у 1997 г. удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» [1, с. 31]. Дарэчы, заслугі А. Мартынава высока ацэненыя. За актыўную краязнаўчую работу ён узнагароджаны медалём імя Н. К. Крупскай, мноствам грамат, імяннымі падарункамі. На доме, дзе ён жыў, усталявана мемарыяльная дошка. Імем А. Мартынава названа адна з новых вуліц горада.

У 2014 г. грамадскасць Кобрыншчыны адзначыла 110-годдзе з дня нараджэння Аляксея Міхайлавіча Мартынава. У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава адбылося святочнае мерапрыемства «У нагу з XX стагоддзем», прысвечанае гэтай даце. Ушанаваць памяць неардынарнага чалавека, захавальніка гісторыі Кобрыншчыны прыйшлі людзі, якія ведалі яго асабіста, прыхільнікі яго дзейнасці. Успаміналі юбіляра і ў цэнтральнай раённай бібліятэцы, дзе да асобы А. Мартынава ставяцца з асаблівай павагай. На базе СШ № 1 г. Кобрына адбылася важная падзея для краязнаўцаў Кобрыншчыны – раённыя краязнаўчыя чытанні, прысвечаныя знакамітаму земляку. Аляксей Міхайлавіч і яго сям'я ў свой час мелі самае прамое дачыненне да гэтай установы: тут працаваў яго бацька, тут вучыўся ён сам і яго будучая жонка. Менавіта гэтым падзеям прысвечаны Каляндар урачыстасцяў пад назвай «Краязнаўцу і гісторыку прысвячаецца».

Кобрынская зямля багатая на таленавітых людзей, якія даследуюць, запісваюць і захоўваюць для будучых пакаленняў сотні і тысячы імёнаў, значныя гістарычныя факты, услаўляюць, любяць свой край, сваю малую радзіму. Нарыс «Каб не абарвалася нітка памяці…» прысвечаны менавіта такім апантаным краязнаўцам Кобрыншчыны. І, безумоўна, першыя старонкі нарыса прысвечаны асобе А. Мартынава.

Шматгадовая карпатлівая праца ў архівах, уласныя назіранні, зносіны са старажыламі, шырокія веды ў галіне лінгвістыкі зрабілі вынікі яго краязнаўчых даследаванняў цікавымі, пазнавальнымі і карыснымі. Пяру А. Мартынава былі падуладны ўсе тэмы гісторыі Кобрыншчыны, пачынаючы з падзеяў першых летапісаў і заканчваючы рэаліямі сучаснага жыцця. Яго публікацыі ў друку гістарычна аргументаваны, заснаваныя на пэўных крыніцах, і ў гэтым іх вялікая каштоўнасць. Невыпадкова гэтыя матэрыялы сталі першакрыніцамі па вывучэнні і асэнсаванні мінулага роднага краю, па іх сучаснікі адкрываюць для сябе гісторыю нашага горада, вучацца любіць і паважаць сваю малую радзіму.

У верасні 2019 г. была праведзена навукова-практычная канферэнцыя «Мартынаўскія чытанні», прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння А. Мартынава, ініцыятарам і арганізатарамі якой сталі ўстановы культуры «Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава», «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка». У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел краязнаўцы з розных рэгіёнаў Беларусі, работнікі культуры і адукацыі, архіваў, музеяў, бібліятэк, супрацоўнікі СМІ, грамадскіх арганізацый, а таксама даследчыкі, якія дзейнічаюць у сферы вывучэння і аховы гісторыка-культурных каштоўнасцяў рэгіёну. Плануецца, што з мэтай прыцягнення ўвагі да развіцця краязнаўства, аб'яднання намаганняў гісторыкаў і краязнаўцаў для далейшага вывучэння гістарычнага мінулага гэта мерапрыемства стане традыцыйным і будзе праходзіць кожныя пяць гадоў да юбілейных дат з дня нараджэння Аляксея Мартынава [3, с. 4].

На жаль, да 115-гадовага юбілею А. Мартынава так і не атрымалася выданне асобнай кнігай літаратурных і публіцыстычных твораў нашага таленавітага земляка. Працы Мартынава запатрабаваныя, і неабходнасць у гэтым выданні існуе, бо такі зборнік уяўляе цікавасць як дапаможнік па краязнаўстве.

Спробай неяк кампенсаваць гэты прабел з'явілася выданне бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі тэматычных зборнікаў публікацый А. Мартынава. Адзін з іх – зборнік артыкулаў «Летапісец кобрынскага музея». Кобрынскі музей у той цяжкі пасляваенны час (1946) быў адзіным музеем у Брэсцкай вобласці. Гэта сапраўды мартынаўскае дзецішча. Дзякуючы яго дзейнасці музей стаў прывабным турыстычным аб'ектам міжнароднага значэння, на

працягу многіх дзесяцігоддзяў лічыцца візітнай карткай не толькі горада Кобрына, але і ўсёй Беларусі. Аляксей Міхайлавіч 32 гады працаваў дырэктарам музея, непасрэдна ім сабрана большасць экспанатаў з многіх музеяў былога Савецкага Саюза. Зборнік уключае артыкулы А. Мартынава, прысвечаныя кобрынскаму музею, з газет і часопісаў розных гадоў выдання.

Пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Кобрыншчыне напісана нямала. Але найбольш дасканалыя, падрабязныя матэрыялы, у якіх выкарыстаны асабістыя ўспаміны, сведчанні землякоў, архіўныя дадзеныя, змешчаны ў артыкулах Аляксея Мартынава. Ён перажыў дзве сусветныя вайны, у гады Вялікай Айчыннай быў звязаны з партызанамі атрада імя Чапаева, затым мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Да 30-годдзя вызвалення Беларусі па ініцыятыве А. Мартынава і пры яго непасрэдным удзеле былі ўстаноўлены 24 абеліскі з мемарыяльнымі дошкамі, прысвечанымі падзеям Вялікай Айчыннай. Працы А. Мартынава пра вайну заслугоўваюць асаблівай увагі. У яго ёсць шэраг артыкулаў, прысвечаных пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 1122-м дням акупацыі Кобрынскага раёна, трагічнаму лёсу спаленых вёсак і кобрынскага яўрэйства, баявым дзеянням партызан і ўсенароднай барацьбе з гітлераўцамі ў глыбокім тыле ворага, вызваленню Кобрына. Зборнік «Памяць сэрца: тэма Вялікай Айчыннай вайны ў публікацыях А. М. Мартынава» змяшчае артыкулы, што былі надрукаваныя ў раённай газеце «Камуністычная праца» («Кобрынскі веснік») у розныя гады. Зборнік асабліва актуальны напярэдадні 75-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Асобнай кніжкай пад назвай «Кобрынскія бібліятэкі» выдадзены ўспаміны А. М. Мартынава. Бібліятэкары ніколі не забываюць аб тым, што менавіта пад кіраўніцтвам Аляксея Міхайлавіча была арганізавана і адноўлена ў пасляваенны час гарадская бібліятэка. Мы, супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі, непасрэдныя сведкі таго, якую цікавасць выклікае асоба А. Мартынава ў маладога пакалення і многіх іншых людзей, як запатрабаваныя яго публіцыстычныя працы. Ушаноўваючы памяць пра свайго паважанага калегу, зберагаем яго каштоўныя гістарычныя матэрыялы для нашчадкаў, даследуем іх. Дарэчы, сам Аляксей Міхайлавіч на працягу многіх дзесяцігоддзяў быў актыўным чытачом нашай бібліятэкі, неаднаразова ўдзельнічаў у бібліятэчных мерапрыемствах, быў ганаровым госцем на нашых юбілейных святах. Апошняя сустрэча бібліятэкараў са знакамітым калегам адбылася ў дзень 60-годдзя бібліятэкі. Мне пашчасціла асабіста сустракацца і гутарыць з Аляксеем Міхайлавічам. Дагэтуль знаходжуся пад велізарным уражаннем ад тых сустрэч, паколькі рэдка жыццё нам дорыць знаёмства з такімі неардынарнымі асобамі. Вялікі інтэлектуал, найцікавейшы суразмоўца, проста добры, сціплы, з тонкім гумарам і тонкім густам чалавек… Напэўна,

штуршок таму, што захапілася і займаюся бібліятэчным краязнаўствам, быў дадзены менавіта гэтым чалавекам.

У гісторыка-краязнаўчым цэнтры бібліятэкі сфарміравана папка інфармацыйна-бібліяграфічных выданняў на аснове публікацый А. Мартынава пад назвай «У адной фігуры – цэлая эпоха», аформлены фотаальбом пад назвай «Фрагменты памяці, фрагменты жыцця…».

Да 115-годдзя з дня нараджэння А. М. Мартынава (2019) у гісторыка-краязнаўчым цэнтры бібліятэкі функцыянавала юбілейная выстаўка-дасье пад назвай «Асоба ў гісторыі малой радзімы». На галоўнай старонцы сайта Кобрынскай РЦБС (www.krcls.by) на банеры «У Календары нашай памяці» размешчана пашыраная даведка з вялікім бібліяграфічным спісам, прымеркаваная да юбілейнай даты нашага земляка. На старонках газет «Кобрынскі веснік», штотыднёвай рэгіянальнай газеты «Кобрин-информ» апублікаваны артыкулы галоўнага бібліёграфа бібліятэкі «Краязнавец з вялікай літары», «Личность в истории малой родины» [4, с. 4]. Старонка «Краязнаўчай газеты» таксама была прысвечана нашаму земляку-юбіляру – артыкул «Асоба ў гісторыі малой радзімы, ці Краязнаўца з вялікай літары» [5, с. 3].

За краязнаўчы біябібліяграфічны праект «Краязнавец з вялікай літары» Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ў 2019 г. стала найлепшай у намінацыі калектыўных працаў рэспубліканскага конкурсу «Славутыя імёны маёй малой радзімы», што быў абвешчаны ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыямі газет «Звязда» і «Краязнаўная газета», і адзначана дыпломам Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, каштоўным падарункам [6, с. 1, 3].

Краязнавец з вялікай літары – такі тытул па праве носіць даследчык Кобрыншчыны А. Мартынаў, які пакінуў багатую спадчыну, глыбокі след у гісторыі краю і ў сэрцах землякоў. На такіх неабыякавых людзях, якія заўсёды знахозяцца ў пошуку, трымаецца наша зямля. Ганарымся і выказваем падзяку лёсу за тое, што ў нашым горадзе жыў такі ўнікальны даследчык і летапісец, а таксама спадзяёмся на тое, што творчасць Аляксея Міхайлавіча не пакіне абыякавым не толькі ранейшых знаўцаў яго таленту, але і новых чытачоў, якія з дапамогай мартынаўскай спадчыны адкрыюць для сябе свет гісторыі сваёй малой радзімы.

Літаратура

1. Долготович, Б. Д. Мартынов Алексей Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 31.

2. Мартынаў Аляксей Міхайлавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 437–438 : фат.

3. Кузина, С. Площадка для исследователей истории малой родины / Светлана Кузина // Кобрин-информ. – 2019. – 3 октября. – С. 4.

4. Курачук, С. Краязнавец з вялікай літары / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2019. – 21 жніўня. – С. 4.

5. Курачук, С. Асоба ў гісторыі малой радзімы, ці Краязнаўца з вялікай літары / Святлана Курачук // Краязнаўчая газета. – 2019. – № 26 (763). – С. 3.

6. Пучынскі, У. Вынікі падведзеныя – перамаглі і тыя, хто застаўся без узнагародаў / Уладзімір Пучынскі // Краязнаўчая газета. – 2019. – № 29. – С. 1, 3, 5.

7. Краязнавец з Вялікай літары: біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; уклад. Святлана Курачук. – 2-е выд., дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2019. – 56 с. : іл.

МІКАЛАЙ КАСПЯРОВІЧ: ШЛЯХ АД ШКОЛЬНАГА КРАЯЗНАЎСТВА ДА АКАДЭМІЧНАЙ НАВУКІ

Лісаў Аляксандр Генадзьевіч,
загадчык кафедры філасофіі і паліталогіі
УА «Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»,
г. Віцебск

Мікалай Каспяровіч – адзін з прадстаўнікоў бліскучай кагорты навукоўцаў Беларусі 1920-х гг., першай хвалі нацыянальных спецыялістаў, выхадцаў з простага народа, якія вызначалі твар беларускай навукі таго часу. Можна толькі здзіўляцца, як гэта ўдалося яму за адно дзесяцігоддзе плённай дзейнасці зрабіць столькі ў розных накірунках навукі – ад мовазнаўства да краязнаўства.

Краязнаўчы рух Беларусі ў другой палове 1920-х гг. спазнаў надзвычайны росквіт. Невыпадкова на 2-й Усесаюзнай канферэнцыі па вывучэнні прыродных і вытворчых рэсурсаў СССР, якая адбылася ў 1928 г., яго дзейнасць была асабліва адзначана. Беларусі ў справе краязнаўства адводзілася не толькі першае месца, але і канстатавалася «выключнае становішча сярод усіх іншых рэгіёнаў Саюза» [1]. Гэтая адзнака з'явілася вынікам шматгадовай працы вялікай групы энтузіястаў, якія шчыра займаліся вывучэннем роднага краю, цалкам прысвяцілі сябе краязнаўству. У іх ліку перш за ўсё трэба вызначыць Мікалая Іванавіча Каспяровіча, чалавека самавітага, шчырага, працаздольнага.

1 жніўня 1924 г. Мікалай Іванавіч па загадзе Наркамасветы Беларусі быў пераведзены ў Віцебск, які раней (у сакавіку таго ж года) разам са значнай часткай тэрыторыі былой Віцебскай губерні ўвайшоў у склад узбуйненай

БССР. У рэспубліцы былі ўтвораны новыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – акругі. У Віцебскі акруговы аддзел народнай адукацыі на пасаду інспектара па сацыяльным выхаванні і быў накіраваны М. Каспяровіч. Патрэба ў нацыянальна свядомых педагагічных кадрах на Віцебшчыне была вельмі значная, бо разгортваўся працэс беларусізацыі. Галоўную ролю ў ім павінна была адыграць маладая нацыянальная інтэлігенцыя.

Прыезд М. Каспяровіча ў Віцебск у 1924 г. спрыяў канчатковаму фарміраванню мясцовай краязнаўчай арганізацыі. Дзейнасць па вывучэнні мясцовага краю, што ладзілася раней, у гэты час прыйшла ў заняпад. Пасля шэрагу рэарганізацый устаноў, што вялі гэту працу, мясцовая навуковая інтэлігенцыя спрабавала адрадзіць справу. Паводле сведчанняў Б. Брэжга, Віцебская вучоная архіўная камісія, што існавала з 1909 г., у канцы мая 1919 г. злілася з Таварыствам даследавання помнікаў даўніны пры Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута. Яго ліквідавалі ў 1922 г. Губернская камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, што існавала з 1920 г., да таго часу практычна самараспусцілася. Таму напрыканцы 1923 г. група дзеячаў былой архіўнай камісіі пачала працу па ўтварэнні часовага бюро краязнаўства. 1 лютага 1924 г. адбылася папярэдняя нарада па арганізацыі ў Віцебску Таварыства краязнаўства [2]. Яна заслухала даклад Д. Васілеўскага «Мэты і задачы губернскага краязнаўчага таварыства». У нарадзе былі вызначаны накірункі дзейнасці таварыства, разгледжаны праект статута і структура арганізацыі, абраны часовы прэзідыум. У яго склад увайшлі Д. Васілеўскі, М. Багародскі, К. Ціхаміраў, Я. Яленеўскі, А. Брадоўскі, А. Сапуноў, П. Ільінскі, В. Дракін, М. Мялешка і шэраг іншых.

Датай заснавання Віцебскага акруговага Таварыства краязнаўства трэба лічыць 7 верасня 1924 г. Сваёй мэтай арганізацыя рабіла «ўсебаковае вывучэнне і даследаванне Віцебскай акругі ў эканамічным, натуральна-гістарычным, культурна-гістарычным і інш. стасунках, а таксама навуковую распрацоўку належачых да гэтай галіны пытанняў, распраўсюджанне адпаведных звестак і абуджэнне зацікаўленасці да заданняў Таварыства ў грамадстве» [3, с. 373].

На першапачатковым этапе ўсю арганізацыйную працу ў Таварыстве вёў адзін М. Каспяровіч. І толькі на трэцім сходзе было абрана праўленне, у якое, акрамя яго самога, увайшлі М. Багародскі (1877–1938), А. Брадоўскі (1859–1928), Я. Алонаў (1875–1929) і іншыя. Старшынёй праўлення быў абраны А. Сянкевіч – загадчык Агітпрапа. М. Каспяровіч, самы малодшы з членаў праўлення, выконваў абавязкі яго намесніка. Аднак ужо літаральна праз некалькі тыдняў у сувязі з ад'ездам А. Сянкевіча з Віцебска Мікалай Іванавіч узначаліў арганізацыю. Гэта доўжылася да моманту пераводу вучонага ў Мінск.

За перыяд з верасня 1924 па кастрычнік 1925 г. было праведзена восем агульных сходаў Таварыства, на якіх прысутнічала больш за 1000 чалавек.

У верасні 1924 г. Таварыства пачало ствараць свае аддзяленнні ў раёнах. У час шматлікіх сваіх камандзіровак па акрузе Мікалай Іванавіч прыкладаў шмат намаганняў да арганізацыі «на месцах» краязнаўчых гурткоў, суполак і патрабаваў, каб мясцовыя ўстановы адукацыі кіравалі гэтай справай. Да красавіка 1925 г. раённыя аддзяленні Таварыства існавалі ўжо ў Лёзне, Сіроціне, Высачанах, Бешанковічах. Крыху пазней былі арганізаваны яны ў Сянно, Суражы, Езярышчы, Гарадку, Янавічах, Старым Сяле, Астроўне, Дабрамыслях. І гэта пералік толькі тых арганізацый, дзе вялася больш-менш значная праца. Вялікая колькасць краязнаўчых гурткоў узнікла ў Віцебску: пры ўсіх тэхнікумах (мастацкім, беларускім і яўрэйскім педагагічных, электрамеханічным, музычным, акушэрскім), Ветэрынарным інстытуце [4]. І найбольш плённа гэты рух наладжваўся ў тых мясцовасцях, якія па інспектарскіх справах наведваў М. Каспяровіч.

Вынікі арганізацыйнай працы былі падведзеныя акруговай краязнаўчай канферэнцыяй, што адбылася ў Віцебску 26–27 красавіка 1925 г. У ёй прынялі ўдзел 154 дэлегаты. Больш за трэць з іх былі настаўнікі, амаль палова – вучнёўская моладзь. Былі прадстаўлены даклады «Сельскагаспадарчая вопытная станцыя «Падбярэззе», «Віцебскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага музея», «Віцебскае аддзяленне Беларускага Цэнтраархіва», «Беларускі рух на Віцебшчыне», «Збор і загатоўка лекавых раслін на Віцебшчыне», «Арганізацыя краязнаўчага руху на Віцебшчыне», «Школьныя краязнаўчыя музеі», «Беларускі мастацкі тэхнікум і яго задачы».

Ва ўступнай прамове да канферэнцыі М. Каспяровіч адзначыў: «Школа робіцца першапачатковай краязнаўчай ячэйкай. Пры гэтым надзвычайна ўзрастае роля самога настаўніка. Неабходна, каб настаўнік не толькі ўваходзіў у тыя ці іншыя краязнаўчыя арганізацыі – таварыства, аддзяленні, гурткі і т.д., але і ўзяў на сябе пачын, праявіў актыўную ініцыятыву ў стварэнні гэтых арганізацый. Без краязнаўчай працы настаўнік немажлівы, як без пачатковай адукацыі... Школа будзе памагаць таварыству, а яно школе. Вынікі самостойных школьных работ, якія маюць вялікае педагагічнае значэнне, пасля іх адпаведнай апрацоўкі ў таварыстве, могуць вярнуцца ў школу, атрымаўшы і навуковую каштоўнасць. У працы па эканамічным і прыродазнаўчым вывучэнні краіны таварыству прыдаецца намаганнямі вучняў весці масавыя назіранні, без якіх нельга абысціся. Значыць, толькі пры цесным супрацоўніцтве школы і таварыства магчыма дасягненне пастаўленых перад школай і таварыствам мэтаў» [5, с. 199–216].

Зразумела, што ў сваёй штодзённай працы інспектара аддзела адукацыі М. Каспяровіч дабіваўся супрацоўніцтва школы і таварыства. У школьныя

ўстановы акрана накіроўваў цыркуляры. Вось тэкст аднаго з іх: «Гэтым прапануецца Вам арганізаваць пры школе гурток вывучэння мясцовага краю, у які бы ўвашлі і настаўнікі, і мясцовыя працаўнікі, і вучні, і іншыя. Апрача вывучэння краю заданнем гэтага гуртка павінна быць прадстаўленне краязнаўчага матэрыялу школам. Узорны статут можа быць укладзены згодна статуту Віцебскага Акруговага Таварыства краязнаўства. Матэрыялы для першапачатковай працы знойдзеце ў “Віцебшчыне”. Зараз жа пасля арганізацыі звяжыцесь з акруговым праўленнем Таварыства краязнаўства» [6, спр. 110, л. 156].

Адпаведныя распараджэнні даваліся і ў цыркуляры-абежніку акрана ўсім загадчыкам раённых аддзелаў адукацыі ад 24 снежня 1925 г.: «Закончыце ўрэшце арганізацыю краязнаўства ў Вашым раёне і клапаціцеся аб пашырэнні яго. Звязывайцеся з Акруговым праўленнем Таварыства Краязнаўства (Віцебск, Савецкая, 32), Цэнтральным бюро краязнаўства БССР (Менск, Рэвалюцыйная, 21), Цэнтральным бюро краязнаўства РСФСР (Ленінград, Набережная 9 студзеня, Мрамарны дварэц)... Пры чым галоўная кіруючая сувязь павінна быць з Цэнтральным Бюро БССР і Віцебскім, а з ЦБК РСФСР – таварыская» [6, спр. 110, л. 216]. У паперы вызначаны накірункі працы, на якія прапанавана звярнуць галоўную ўвагу. М. Каспяровіч з поспехам карыстаўся адміністраваннем у дасягненні мэтаў па стварэнні сеткі краязнаўчых устаноў. І ў гэтых абставінах яно было апраўданым, досыць эфектыўным і адыграла сваю ролю ў разгортванні краязнаўчага руху на Віцебшчыне.

У час працы ў Віцебску Мікалай Іванавіч захоўваў трывалыя сувязі з Наркаматам асветы Беларусі, удзельнічаў ва ўсіх агульнарэспубліканскіх з’ездах і нарадах педагагічных работнікаў 1920-х гадоў. Яго працы мелі падтрымку Інстытута беларускай культуры, уваходзілі ў агульныя праграмы доследаў гэтай установы. М. Каспяровіч быў па сутнасці ўпаўнаважаным Інбелкульта ў рэгіёне. Ён падтрымліваў асабістыя кантакты з дзеячамі інстытута У. Ігнатоўскім, Я. Лёсікам, М. Мялешкам, М. Шчакаціхіным. Яшчэ жывучы ў Віцебску, удзельнічаў у працы шэрага ўстаноў і камісій Інбелкульта, у прыватнасці, у слоўнікавай камісіі, камісіі гісторыі мастацтва, арганізаванай па ініцыятыве М. Шчакаціхіна. Гэтыя кантакты рабілі працу мясцовых краязнаўчых арганізацый мэтанакіраванай і навукова карыснай.

Актыўная навуковая праца М. Каспяровіча звярнула на сябе ўвагу кіраўнікоў беларускай адукацыі і навукі. Ужо ў час жыцця ў Віцебску ён паступова пераўтварыўся ў вучонага сапраўды нацыянальнага маштабу, зацвердзіў сябе шэрагам выдатных даследаванняў. 1 кастрычніка 1926 г. М. Каспяровіч быў вызвалены ад пасады інспектара Віцебскага акрана ў сувязі з пераводам у Мінск [6, спр. 5, л. 233]. Яму была прапанавана пасада навуковага сакратара Цэнтральнага бюро краязнаўства Беларусі, адначасова

з гэтым ён зрабіўся адказным сакратаром друкаванага органа гэтай арганізацыі – краязнаўчага часопіса «Наш край», які ў гэты час узначальваў пісьменнік Змітрок Бядуля.

Увосень 1926 г., калі М. Каспяровіч пераехаў у Мінск, у Інбелкульце адбываліся карэнныя перамены. У сярэдзіне года кіраўніцтвам рэспублікі была вызначана перспектыва рэарганізацыі гэтай установы ў Нацыянальную акадэмію навук. Адной з праблем з'яўлялася адсутнасць неабходных кадраў. Для ўзмацнення справы ў Мінск былі запрошаны навукоўцы з іншых гарадоў Беларусі. М. Каспяровіч быў у тым ліку, хаця не ўспрымаўся чалавекам з правінцыі. Справы, якімі ён займаўся ў Віцебску, каардынаваліся Інбелкультам. У Мінску яго чакала добра знаёмая, але больш маштабная праца.

21 кастрычніка ў віцебскай газеце «Заря Запада» быў надрукаваны зварот М. Каспяровіча «Да ведама краяведаў»: «Шчыра дзякую шырокія працоўныя колы Віцебшчыны за дапамогу ў маёй краязнаўчай працы, прашу не спыняць яе і ў наступны час і слоўніковы матар'ял з Віцебшчыны пасылаць непасрэдна па адрасу: Менск, Рэвалюцыйная, 21, Цэнтральнае бюро краязнаўства (марак на канверт класці не трэба), а таксама іншы матар'ял, які пасылаўся да сяго часу мне асабліва для апрацоўкі. Карысна адначасова з пасылкаю паведамляць аб гэтым праўленне т<аварыст>ва краязнаўства. Рукапісы, калекцыі, спісанкі і т.д., т.п. матар'ял, які прынімаўся мною для т<аварыст>ва краязнаўства, прашу адсылаць па адрасу: Віцебск, Пушкінская, 3. Акруговаму праўленню т<аварыст>ва краязнаўства. З паш<анай> М. Каспяровіч».

Цэнтральнае бюро краязнаўства, у якое Мікалай Іванавіч прыйшоў на пасаду навуковага сакратара, існавала ў сістэме Інстытута беларускай культуры з 1924 г. Яно кіравала працай мясцовых краязнаўчых арганізацый, у многіх навуковых праектах абапіраючыся на грамадскую падтрымку. Яшчэ ў часе працы ў Віцебску М. Каспяровіч супрацоўнічаў з слоўнікавай камісіяй Інбелкульта па збіранні лексікі Віцебскага рэгіёна, ажыццяўленні выдання краёвага слоўніка. Гэтая праца ішла асабліва энергічна ў 1926 г. За тры гады, з 1925 па 1927, у камісію было дастаўлена каля 120 тысяч картак-слоў, прычым найбольшая колькасць з Віцебскай акругі – звыш 37 тысяч. І, вядома, пры самым непасрэдным удзеле Мікалая Іванавіча. Ён працягваў кіраваць збіраннем віцебскага слоўніка і ў той час, калі пераехаў на працу ў Мінск. Па сутнасці, ён «з'явіўся пачынальнікам сістэматычнай работы ў гэтым кірунку» і кідаць яе не збіраўся.

У лістападзе 1926 г. М. Каспяровіч увайшоў у склад фальклорна-дыялекталагічнай камісіі, старшынёй якой быў П. Бузук. Членамі яе з'яўляліся А. Багдановіч, Я. Воўк-Левановіч, С. Некрашэвіч, П. Растаргуеў, І. Сербаў, а сакратаром працаваў вядомы па Віцебску А. Шлюбскі. Камісія ажыццяўля-

ла праграму па збіранні беларускіх гаворак, абапіраючыся на дапамогу настаўніцкіх сіл. У гэтай працы вопыт М. Каспяровіча быў вельмі карысны.

Улетку 1927 г. па прапанове Цэнтральнага бюро краязнаўства М. Каспяровіч ажыццявіў камандзіроўку ў Фінляндыю, Латвію, Эстонію і Літву з мэтай вывучэння краязнаўчай і педагагічнай справы ў гэтых краінах. Камандзіроўка доўжылася з 28 ліпеня па 10 верасня. У Фінляндыі ён працаваў у Хельсінкі, Гранкуме, Тузуле і Сэлікі. Імкнуўся да кантактаў з мясцовымі навукоўцамі. «Перашкодай у працы з'явілася адсутнасць шмат якіх выдатных фінскіх краязнаўцаў, якія таксама выехалі ў замежныя камандзіроўкі». У Фінляндыі яго вандроўка адзначана ў мясцовым друку. Асаблівая цікавасць Мікалая Іванавіча была да метадалогіі краязнаўства, асаблівасцяў разумення задач краязнаўства, будовы і практыкі працы арганізацый. Вяртанне на радзіму адбывалася праз Талін, Тарту, Рыгу, Каўнас, Дзвінск, «у якіх [ён] таксама цікавіўся развіццём краязнаўства». Пашырэнне практычнага вопыту мела вялікае навуковае значэнне. Вынікам вандровак стаў шэраг публікацый. У гэты ж час ён вывучаў краязнаўства ў Расіі і ва Украіне, у Ленінградзе знаёміўся з працай феналагічнага аддзела Рускага таварыства аматараў светазнаўства.

Кніга «Краязнаўства» – апошняя па часе выдання і, без сумненняў, самая значная праца навукоўца, якая не страціла сваёй каштоўнасці і да сённяшняга часу [7]. Яна зрабілася вынікам усёй вельмі бурнай, але непрацяглай дзейнасці М. Каспяровіча па вывучэнні роднага краю. Гэта не толькі падрабязная гісторыя беларускага краязнаўства, але і ацэнка яго сучаснага (на момант выдання) стану, метадычныя парады па яго арганізацыі. Нарысы, аб'яднаныя мэтай сістэматызацыі краязнаўчага вопыту, павінны прынесці карысць для далейшага развіцця руху. Кніга «Краязнаўства» і вялікая колькасць артыкулаў М. Каспяровіча, прысвечаных той жа тэматыцы, застаецца і сёння каштоўнасцю ў практычнай працы краязнаўчых арганізацый рознага ўзроўню [8].

Творчы шлях М. І. Каспяровіча ад кіравання практычнай працай краязнаўчых арганізацый да рэалізацыі грунтоўных праграм навуковага акадэмічнага ўзроўню з'яўляецца яркім прыкладам рэалізацыі ідэі пашырэння навуковых ведаў ва ўмовах фарміравання нацыянальнай навукі, мае сёння вялікае дыдактычнае значэнне. Вельмі шкада, што пакуль так і не вырашана пытанне з выданнем яго прац асобным зборам твораў.

Літаратура

1. Наш край. 1929, № 12, с. 17.

2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ), ф. 170, воп. 1, спр. 4, л. 1; спр. 13, лл. 1, 1 адв.

3. Касперович, Н. Краеведческое движение в Витебском округе // Краеведение, 1926, № 3, с. 373–376 (перакладзена з рускай мовы).
4. ДАВВ, ф. 256, воп. 1, спр. 4, лл. 58, 66 адв., лл. 80, 94.
5. Віцебшчына, т. 1. – Віцебск, 1925.
6. ДАВВ, ф. 170, воп. 1, спр. 110, л. 156.
7. Каспяровіч, М. І. Краязнаўства (Нарысы). – Менск, 1929. – 159 с.
8. Лісаў, А. Г. Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А. Г. Лісаў, А. М. Падліпскі. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2000. – 46 с.

З ГІСТОРЫІ ЛЬНАВОДСТВА І ТКАЦТВА ВЁСКІ ЗАЖЭВІЧЫ САЛІГОРСКАГА РАЁНА Ў МАЛЮНКАХ ІВАНА МІКАЛАЕВІЧА БЯЛЬКО

Мазоль Таццяна Іванаўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
кіраўнік музея «Зажэвічы: мінулае і сучаснасць»
ДУА «Зажэвіцкі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа Салігорскага раёна»,
аг. Зажэвічы, Салігорскі раён, Мінская вобласць

Імя гэтага чалавека невядома далёка за межамі нашага раёна. Затое яго ведаюць усе жыхары вёскі Зажэвічы – ад малога да вялікага. Гэта Іван Мікалаевіч Бялько. Ваенная і працоўная біяграфія гэтага мужнага і сумленнага чалавека выклікае павагу і гонар не толькі ў землякоў, але і ўва ўсіх, з кім перасякаліся яго шляхі-дарогі.

Нарадзіўся Іван Мікалаевіч 3 студзеня 1926 года. У 1940 годзе скончыў 7 класаў Зажэвіцкай сямігадовай школы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Служыў у пяхотнай дывізіі. Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі. За час ваеннай службы ўзнагароджаны медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», ордэнам Айчыннай вайны.

Вярнуўшыся дадому, атрымаў сярэднюю адукацыю ў вячэрняй школе, а затым скончыў курсы механіка-камбайнера і ўпершыню ў Старобінскім раёне вывеў у поле самаходны камбайн. У 1975 годзе скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Атрымаў дыплом інжынера-механіка і працаваў на пасадзе інжынера па працаёмкіх працэсах. Адначасова адказваў за будаўніцтва і мантаж абсталявання на новых аб'ектах. Менавіта яго рукамі шмат гадоў назад была ўстаноўлена піларама, па асабістым праекце пабудаваны жарнавы млын. У 1972 годзе пад яго кіраўніцтвам быў змантіраваны сушыльны комплекс КЗС-20 і камбікормавы цэх ОКЦ-15. З 1976 года праца-

ваў на пасадзе інжынера-будаўніка. Многія аб'екты жывёлагадоўлі і зернятока Іван Мікалаевіч рабіў па асабістых праектах. Былі пабудаваны зерняховішчы, кармасховішчы, сушылкі, цялятнікі, сокавы цэх, гаражы, гандлёвы цэнтр, абеліск загінулым у вайну землякам, дзіцячы сад і яшчэ многія іншыя аб'екты ў калгасе «Перадавік».

Як бачым, залатыя рукі ў гэтага чалавека. І гэта яшчэ не ўсё, што даў яму Бог… Іван Мікалаевіч малюе карціны. «Ну і што тут дзіўнага?», – скажаце вы. А тое, што ўсе яны намаляваны звычайным простым алоўкам. Уявіце сабе чорна-белыя фотаздымкі, выкананыя фатографам шмат гадоў таму. Менавіта так выглядаюць карціны Івана Мікалаевіча, якія ён падараваў школьнаму музею «Зажэвічы: мінулае і сучаснасць». Дзякуючы ім мы маем магчымасць вярнуцца ў мінулае, у гісторыю нашай роднай вёскі. Вось перад намі будынак сельсавета і клуба, а гэта – старая школа. А калі трэба расказаць дзецям пра тое, як жылі нашы продкі ў пачатку XX стагоддзя, – калі ласка. Вось хата з левага боку: каля печы на кручку вісіць драўлянае вядро для вады, над печчу – вянкі цыбулі, побач калыска, падвешаная на вяроўцы, і палаці, на якіх спала ўся сям'я. На сцяне вісіць зімняя вопратка.

На другім малюнку бачым стол, над ім вісіць лямпа, у куце – абразы, паўз сцяну – шырокая лава. Над лавай – паліца, на ёй ляжаць некалькі боханаў хлеба. Звычайна дзеці пытаюць, чаму паліца вісіць так высока. Экскурсавод адказвае словамі аўтара карціны: «Каб дзеці не дасталі, бо адразу ўвесь з'ядуць».

Па звестках гісторыкаў, вырошчваць лён людзі пачалі 7–9 тысяч гадоў таму ў міжрэччы Тыгра і Еўфрата, у Старажытным Егіпце. З тых часоў дзякуючы неверагодным уласцівасцям у яго з'явілася мноства прыхільнікаў у многіх кутках свету. Беларусь – адна з тых краін, дзе ёсць найбагацейшы досвед апрацоўкі і перапрацоўкі гэтай культуры.

Наша малая радзіма здаўна славіцца вырошчваннем і апрацоўкай ільну. У цяперашні час вёска Зажэвічы з'яўляецца цэнтрам льнаводства ў Салігорскім раёне, амаль што адзінай мясцовасцю, дзе вырошчванне лёну з'яўляецца асноўным відам вытворчасці сельскай гаспадаркі. А яшчэ Зажэвічы славяцца ткацкімі ўзорамі пляцення ў выглядзе косак. Мясцовыя майстрыхі ткалі на ткацкіх станках з 8-ю педалямі вельмі складаныя ўзоры.

Спачатку лён трэба было церабіць – гэта значыць рукамі захопліваць яго сцяблінкі каля самай зямлі і вырываць разам з коранем, ніякіх сярпоў у церабленні не выкарыстоўвалася.

Потым вязаліся невялікія снапы і расстаўляліся для прасушкі. Перш чым рыхтаваць лён да далейшай апрацоўцы, трэба было вымалаціць з яго насенне. З яго рабілі карысны ільняны алей. Пасля абмалоту лён ішоў на «расстрэл»: яго акуратна рассцілалі па ўсім полі. Так лён адпачываў на полі яшчэ

прыкладна месяц. Ператрымліваць было небяспечна, тканіна будзе не такой трывалай. Потым яго зноў адпраўлялі на сушку. Сушылі лён у лазні, на павеці, потым на палатках. Высахлыя сцябліны лёну лёгка ламаюцца, і толькі цяпер іх неслі размінаць, для гэтага было спецыяльнае прыстасаванне – мялка, або церніца.

У кожнай сялянскай гаспадарцы мяццё лёну, як і іншая праца, звязаная з яго апрацоўкай, выконвалася ўручную і пераважна жанчынамі. Пачыналі мяццё лёну дзяўчаты з распушчанымі косамі, каб шаўкавістым атрымаўся кужаль.

Традыцыйны спосаб пераважаў і пры далейшай апрацоўцы валакна – трапанні. У асноўным трапалі лён уручную пры дапамозе прылады працы – трапла. У вёсцы Зажэвічы, як і ва ўсёй паўднёвай Беларусі, найбольш распаўсюджаным было трапло мечападобнай формы. Левай рукой трымалі лён на вісу, правай білі па ім тонкім рубам драўлянага інструмента. Казалі, што трапло для жанчыны ўсё роўна, што сякера для мужчыны. У працэсе трапання разам з кастрыцай адбівалася і нізкаякаснае валакно, якое ўжывалася для розных бытавых патрэб (вілі вяроўкі, ткалі мешкавіну і інш.).

Больш мяккім і шаўкавістым рабілася валакно пасля часання яго на грэбні. Найбольш старажытным з'яўляецца драўляны грэбень лопасцепадобнай формы, які ў другой палове XIX стагоддзя шырока бытаваў на Палессі.

У працэсе далейшай апрацоўкі атрымлівалі розныя гатункі валакна. Адходы пасля часання на грэбені адносіліся да другога гатунку. Заставаўся высокаякасны кужаль. Прычым часалі «на ваду», пакуль на ёй не будзе асядаць нават пыл.

Пасля часання скачвалі так званыя кудзелі і прымаліся прасці. Пралі звычайна на вячорках. Вядома, што ў XIX стагоддзі электрычнасці ў вёсцы Зажэвічы яшчэ не было. Каб асвятліць хату, вяскоўцы знайшлі выйсце – агульнымі намаганнямі ў некаторых хатах рабілі лучнікі. Гэта такое прыстасаванне, калі ад коміна адыходзіць на сярэдзіну хаты тоўстая труба з бляхі з шырокай адтулінай унізе. Да гэтай трубы прымацоўвалася рашотка, на якую клалі лучыны. Такім чынам асвятлялі хату. Тут і пралі, і спявалі песні, і жартавалі.

Прылады для прадзення простыя. Гэта прасніца, да якой мацавалася кудзеля, верацяно для скручвання ніткі. Верацёны выраблялі мужчыны з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў.

Пражу з верацён перамотвалі на матавіла, лічачы і перавязваючы ніткі. Шэсцьдзесят нітак называлі пасмо. Для добрага палатна з дзевяці верацён намотвалі адзін мот (дзевяцярнік). Гэта была аснова будучага палатна. Моты старанна мылі, вымарожвалі. Паступова пража з цёмна-шэрай станавілася ўсё святлейшай. Гатовыя для ткання моты былі светла-се-

рабрыстыя. Па колькасці і якасці мотаў меркавалі аб працавітасці гаспадыні і яе дачок.

Выраб тканін у хатніх умовах выконваўся на гарызантальным ткацкім станку – кроснах. А ў гэты час дзеці ткачых самастойна спрабавалі рабіць першыя крокі ў «хадунку».

Хочацца адзначыць своеасаблівы стыль мастака. Кідаецца ў вочы дакладнасць прамаляваных дэталяў, і гэта нягледзячы на тое, што ў аўтара не было прафесійнай мастацкай адукацыі.

Вялікае значэнне творчасць І. Бялько мае не толькі для нашага рэгіёна, але і для ўсёй краіны ў цэлым, бо закранае аспекты жыццядзейнасці ўсёй Беларусі. Шмат з таго, што адлюстравана на яго карцінах, было ва ўжытку нашых продкаў. І працэсы развіцця вытворчасці былі ідэнтычныя.

О СООТНОШЕНИИ ИСТОРИЧЕСКИХ ДАННЫХ МЕСТНЫХ КРАЕВЕДОВ И АРХИВНЫХ НАУЧНЫХ ИЗЫСКАНИЙ В ВОПРОСЕ ИССЛЕДОВАНИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ Л. М. ГУТЦАЙТА – РУКОВОДИТЕЛЯ СЛУЦКИХ МЕЛЬНИЦ В ГОДЫ НЭПА

Микула Евгений Иванович,
заместитель директора
учреждения «Белорусский государственный музей
народной архитектуры и быта»,
г. Минск

Во время работы в архивах Республики Беларусь над темой «Мельничное дело в БССР в годы НЭПа» я обнаружил интересную информацию о владельце паровой мельницы в г. Слуцке в дореволюционный период Льве Михелевиче Гутцайте. Сразу возник вопрос: а что по этому поводу пишут местные слуцкие краеведы. Наиболее серьезными источниками казались книги А. В. Жука «Храналогія Слуцкай мінуўшчыны» (Слуцк, 1996) и «Памяць. Слуцкі раён. Слуцк» (Кніга 1. Мінск, 2000). Если обобщить данные этих исследований, то перед нами предстает фигура купца Гутцайта, владевшего мукомольным предприятием в 1900–1914 гг. с 15 наемными рабочими и 6 парами жерновов [2, с. 25]. Упоминается Гутцайт в контексте существовавших в г. Слуцке 3 частных мельниц. Если данные первой работы почти не соотносятся с интересующей нас личностью, то автор очерка во второй работе, известный слуцкий краевед В. С. Видлога, опиралась на данные академической монографии [3, с. 293].

Эта информация послужила для меня базовой отправной точкой для исследования слуцких мельниц в годы НЭПа и деятельности Гутцайта в частности. За последние четыре года удалось найти новые данные, которые под другим углом зрения позволили рассмотреть деятельность этого человека. Его следует отнести к особой группе хозяев крупных мельниц, которые сумели приспособиться к требованиям Советской власти, сжиться с ней и работать в новых условиях. К ним относятся хорошо оснащенные технически мельницы, которые числились в 1-й и 2-й категориях в соответствии с документами органов власти первых лет НЭПа, в первую очередь государственные. В 1922 г. в Минске насчитывалось 25 мукомольных предприятий, большинство из которых были паровые и нефтяные. Наиболее известные среди них – мельницы Гольдберга, Гохтейна, Леккерта, Лившица (Серебрянка), Рудигера, Брауэра, братьев Раковщик, Плебанская, Фундылера (Лошицкая), бывшая Чертова, а также паровая мельница в Игумене (бывшая Нисневича, или госмельница «Труд») и мельницы в Слуцке.

В г. Слуцке в начале НЭПа три мельницы были объединены в единое Управление государственными мельницами под руководством Лейбы (Льва) Михелевича Гутцайта (1868 г.р.), который до революции являлся хозяином мельницы «Восход» (второе название в годы НЭПа – госмельница № 5) и лесопильного завода, а также в 1913–1915 гг. арендовал 2 винокуренных завода в имениях Мецевичи Погостской волости Слуцкого уезда и Чепели Старобинской волости Слуцкого уезда. Он успешно находил общий язык с владельцами этих имений Сигизмундом Бонифатьевичем Крупским и Видотской Софьей Игнатьевной. И только запрет производства алкогольных напитков в военное время остановил карьеру Гутцайта на винокуренных предприятиях, но не на мельницах [4, л. 1, 3, 5, 14, 15, 17].

нил в своем сердце славный сын земли белорусской Иван Петрович Древницкий, влюбленный в свою малую родину – Поставщину, где он родился и вырос, в Островетчину, где начиналась его трудовая деятельность, и в Нарочанский край, где он прожил большую часть своей жизни. Иван Петрович писал, что любовь к родной земле, Родине, языку «як паветра, як зямля, як маці патрэбна чалавеку». Везде – в быту и на работе писал он на родном белорусском языке и считал «за гонар размаўляць па-беларуску». Известный краевед, учитель высшей категории – филолог, отличник народного образования СССР и БССР, директор школы. Награжден Почетной грамотой Верховного Совета БССР, двумя медалями. И выйдя на пенсию продолжал вести в школе краеведческо-туристический кружок «Валошкі» («Васильки»), и в почтенном возрасте неутомимо продолжал собирать старину – опрашивать старожилов, работать в архивах и библиотеках, вести переписку, охватывающую разные страны, по почте и через интернет.

Простой, по-крестьянски выносливый, человек от земли, приветливый, общительный, любознательный, обладающий энциклопедическими знаниями, – он так много сделал для родного края! Иван Петрович – автор 20 книг по краеведению, 16 из которых написаны самостоятельно, а четыре – в соавторстве. Среди них «Мая Віленшчына», «Мястэчка пры Полацкім тракце», «Касцёл у Канстанцінаве», «Прафесар музыкі з Камай» (2008), «Мастакі з дынастыі Рэмераў» (2013), «Тутэйшыя» (2013) и другие. И. П. Древницкий – автор статей в книгах «Памяць» Поставского, Мядельского и Островецкого районов. Десятки его статей напечатаны в журналах «Роднае слова», «Родная прырода» «Куфэрак Віленшчыны», «Байрам», «Нашы карані» (1994, 1995, 2003) и ряда других; в сборниках «Преподавание этики в школе» (1982), «Этика. Методическое пособие для учителей» (1982), «Беларусь – Япония» (2003), «Пацеркі хваляў і соснаў бурштын» (2005), «Дзе Мядзёлка песні пяе» (2006), а также других. Печатался в газетах, среди которых «Настаўніцкая газета», «Голас Радзімы», «Краязнаўчая газета», «Нарачанская зара», «Астравецкая праўда», «Пастаўскі край».

Иван Петрович Древницкий родился 6 мая 1932 г. в Поставском районе Витебской области в д. Гвоздовичи Камайского сельсовета в семье крестьянина-единоличника. Отец был грамотным, писал стихи. По воскресеньям вся семья – отец Петр, мать Мария, бабушка, Иван и его младший брат собирались за семейными чтениями – вслух читали Библию, стихи. После окончания школы-семилетки в Камаях в 1948 г. поступил в Поставское педучилище, которое окончил в 1952 г. После училища год работал учителем белорусского и немецкого языка в Клющанской семилетке на Островетчине (1952–1953), директором Малосырмежской НСШ (1953–1954) на Мядельщине. Отсюда был призван на воинскую службу и три с половиной

года прослужил на флоте в Калининграде. После окончания службы работал директором Великостовпеняцкой НСШ на Островетчине (1957–1958). Женился, родилась первая дочь.

Последующие 35 лет – с 1958-го по 1993-й был директором Кутьковской восьмилетней школы на Мядельщине (д. Кутьки в Мядельском районе в 1966 г. была присоединена к соседней д. Комарово). Преподавал белорусский язык и литературу. Заочно окончил в 1960 г. Минский пединститут им. М. Горького.

И выйдя на пенсию Иван Петрович еще около 20 лет вел в школе краеведческий кружок «Валошкі». С учениками, с фотоаппаратом и магнитофоном совершал пешие и велосипедные экспедиции по окрестностям в пределах 5–20 километров с ночевкой – на 3–4 дня. Ездили также на экскурсии на машинах и автобусах в Ленинград, Вильнюс, Ригу, Киев.

Материалы и впечатления, полученные в ходе путешествий по родному краю, легли в основу одной из последних книг И. П. Древницкого «Смарагдавы край» («Изумрудный край») – историко-краеведческий очерк на 184 страницах с иллюстрациями, изданный в 2011 г. Маршрут пролегает через деревни Комарово, Кутьки, Старая вёска, Бакшты, усадебно-парковый комплекс Ольшево и широко известные Голубые озера в белорусском Поозерье. Как пособие для туристов издание знакомит с историко-культурными и природными достопримечательностями озерного края, с известными земляками.

Этой книгой, как настольной, пользуются учителя и вожатые в «Национальном детском образовательно-оздоровительном центре «Зубренок». Полюбили педагоги и дети в «Зубренке» и сборник легенд и преданий Нарочанского края, составленный И. П. Древницким. Первый сборник был издан еще в 2004 г. под названием «Легенды Нарачанскага краю». Презентация второго сборника, дополненного новыми легендами и преданиями, под названием «Наднарочча ў паданнях і легендах» состоялась в 2015 г. в Доме культуры д. Комарово перед педагогами и учащимися «Зубренка». И с тех пор в зубреновской типографии сборник перепечатывают для служебного пользования – для занятий с детьми. В предисловии Иван Петрович Древницкий написал: «Пачынаючы з 1953 года, я паступова пачаў збіраць і запісваць легенды і паданні, якія датычаць навакольля Нарачаншчыны, запісаныя і іншымі збіральнікамі. З часам назбіралася больш паўсотні. Гэты зборнічак змог убачыць свет дзякуючы людзям, якія захавалі ў памяці шэдэўры народнай творчасці і падзяліліся імі».

Жаль, что этих ценных сборников нет сегодня в продаже. Давно они издавались и маленьким тиражом. И издавались за счет собственных средств семьи и благодаря помощи частных спонсоров. Иван Петрович говорил, что пришлось корову продать, чтобы изыскать средства на издание одной из

книг. А ведь Нарочь – это санатории, расположенные на побережье знаменитого озера, которое входит в рейтинг наиболее любимых и посещаемых среди стран СНГ. И каким бы спросом среди отдыхающих и туристов пользовались эти увлекательные сборники! И хорошо было бы перевести их и на русский язык.

Тема Великой Отечественной войны, сохранения памяти о погибших и ветеранах тоже всегда находилась в центре внимания краеведа. Иван Петрович говорил, что память о «палеглых – гэта святое». В 90-х годах, когда выходила книга «Памяць. Мядзельскі раён», он обратил внимание, что в книге «раздзела няма: «Яны прыйшлі пераможцамі». Предлагалось собрать материалы и издать дополнительно приложение к книге «Памяць», где будут помещены фотографии, воспоминания, работа в мирное время бывших фронтовиков. Но эти предложения, к сожалению, не удалось воплотить в жизнь. В декабре 2017 г. Иван Петрович написал: «Прайшло 20 гадоў. І што? «Я пайшоў далей. Сам сабраў звесткі, успаміны, фатаграфі вярнуўшіхся з вайны людзей былога саўгаса «Канстанцінаўскі». Больш 100 чалавек. Яшчэ многія жылі. Я меркаваў, што ўручыць кніжку пра іх будзе прыемна адпавядаць слогану «Ніхто не забыты». Аформіў на флэшцы». И несмотря на все просьбы Ивана Петровича Древницкого растиражировать собранные материалы о ветеранах этот сборник под названием «Мы памятаем! Мы ганарымся!» был распечатан только в трех экземплярах в 2015 г. – в год 70-летия Победы. Один экземпляр сейчас находится в Мядельской центральной библиотеке, второй – в сельской Комаровской библиотеке и третий экземпляр – в семье автора. В предисловии к сборнику И. П. Древницкий написал: «Памяць пра ўдзелыкаў вайны – звязваючая нітачка паміж мінулым і будучым». Всем им – погибшим, умершим от ран после войны, умершим и живым ветеранам – «шчырая ўдзячнасць і нізкі паклон ад нашчадкаў. Думаецца, што гэта публікацыя будзе спрыяць патрыятычнаму выхаванню моладзі, фарміраванню пачуцця гонару, павагі да пакалення пераможцаў за іх мужнасць, высокую маральную сілу, праяўленыя ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». «Час бяжыць і напаўняе наша існаванне новымі падзеямі, але кожнае імгненне, кожны час, кожны вынік стваральнай працы, новае адкрыццё – гэта заслуга іх, уздельнікаў самай кравапралітнай вайны. Яны ўратавалі гэты свет, каб мы, новае пакаленне, маглі жыць, любіць, тварыць». «Памяць аб іх – гэта маральны абавязак дзяржавы, нашчадкаў, пачуццё гонару за неўміручы подзвіг нашых дзядоў і бацькоў, за наш народ, за любую сінявокую Беларусь».

Являясь патриотом Беларуси, Иван Петрович Древницкий был интернационалистом – с глубоким уважением относился к людям других национальностей и вероисповедания, которые проживают в нашей республике, что

подтверждают его статьи о жизни белорусских евреев, а также вышедшая в 2015 г. его книга «Мы з Іманам жывем на зямлі беларускай», написанная в соавторстве с Татьяной Якубовской. Книга посвящена жизненному пути и творчеству белорусского татарина Якуба Якубовского – географа, историка, энциклопедиста, лауреата Государственной премии БССР.

В 2015 г. в Поставах были изданы три сборника – трилогия, посвященные периоду работы И. П. Древницкого на Островетчине: «У мядзведжым кутку», «На правабярэжжы Страчы» и «Наваколле Сарачанскіх азёраў». Автор восхищается живописной природой Островецкого края и обеспокоен тем, что со строительством атомной станции будет утрачена туристическая привлекательность этих девственных мест Поозерья.

В 2016 г. была издана в Поставах в издательстве «Сумежжа» книга И. П. Древницкого «Пастаўская Беларуская настаўніцкая семінарыя» в количестве 50 экземпляров. В ней идет речь об истории создания и развития Поставской Белорусской учительской семинарии до Второй мировой войны и во время немецкой оккупации. Рассказывается о судьбах ее преподавателей и учащихся, про деятельность Союза белорусской молодежи, Союза белорусских патриотов в Поставах и Глубоком.

И последнее издание, вышедшее еще при жизни Ивана Петровича Древницкого – в начале 2018 г. – это 2-я часть, или продолжение вышеупомянутого издания – это книга «Пастаўскае педагагічнае вучылішча ў люстэрку часу» – в количестве 50 экземпляров. В ней рассказывается об училище, его педагогах и выпускниках в послевоенные годы – с 1944 по 1954 г. Уже находясь в больнице, как радовался Иван Петрович выпуску этой книги, видя результат своих трудов!

Эти две книги интересны для историков, краеведов, педагогов с Поставского, Мядельского, Вилейского и Островецкого районов, так как выпускники Поставской Белорусской учительской семинарии распределялись на работу в основном в эти районы.

Тиражи книг И. П. Древницкого в 50 – максимум 99 экземпляров – это капля в море. А ведь эти интересные и занимательные книги по краеведению – народное достояние Беларуси, которым надо дорожить и которое необходимо передать потомкам. Надо перепечатывать, тиражировать его книги по краеведению, чтобы они были доступны как можно большему количеству читателей.

Хочется сравнить Ивана Древницкого, этого незаурядного человека, сильного духом, с могучим дубом – «волотом», которого родила и взрастила белорусская земля, который крепко держался корнями за родную землю, питался ее соками и разросся вверх и вширь, и плоды дал – сеял доброе, разумное, вечное в душах своих учеников, своих детей и внуков. И плоды

его жизни – это и его литературное наследие – книги и статьи, которые проникнуты любовью к синеокой Беларуси. Земляки вспоминают Ивана Петровича Древницкого с теплотой, уважением и гордостью, говорят: «Это наша знаменитость».

Литература

1. Драўніцкі, І. П. Смарагдавы край. Гісторыка-краязнаўчы нарыс. – 2011.
2. Драўніцкі, І. П. Сборник «Мы памятаем! Мы ганарымся!». – 2015.
3. Памяць. Мядзельскі раён. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1998.
4. Наднарочча ў легендах і паданнях. – НДООЦ «Зубренок», 2015.
5. Яська Драўніцкі. У мядведжым кутку. – Паставы : Сумежжа, 2015.
6. Яська Драўніцкі. На правабярэжжы Страчы. – Паставы : Сумежжа, 2015.
7. Яська Драўніцкі. Наваколле Сарачанскіх азёр. – Паставы : Сумежжа, 2015.

СЕКЦЫЯ «ЭКАЛАГІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА І ТУРЫСТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»

ПАДАРОЖЖА ПА ЧАШНІЦКАЙ ЗЯМЛІ

Бугрова Валянціна Аляксандраўна,
старшы навуковы супрацоўнік
ДУ «Чашніцкі гістарычны музей»,
г. Чашнікі

Чашніцкі раён Віцебскай вобласці размешчаны на поўдзень ад Віцебска. Утвораны 17.08.1924. Мяжуе з Бешанковіцкім, Лепельскім, Сенненскім, Талачынскім раёнамі Віцебскай, Крупскім і Барысаўскім раёнамі Мінскай абласцей. Плошча 1,5 тыс. км^2. Цэнтр раёна – г. Чашнікі [3, ст. 575]. У складзе раёна г. Новалукомль, пасёлак Акцябрскі, звыш 200 сельскіх населеных пунктаў. У раёне акрамя гарадоў Чашнікі і Новалукомль, 7 сельскіх Саветаў – Алыпанскі, Іванскі, Красналуцкі, Кругліцкі, Лукомскі, Новазаранскі, Празямлянскі.

На тэрыторыі раёна працуе больш дзясятка прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх Лукомская ДРЭС, завод керамзітавага гравію, папяровая фабрыка, спіртзавод. Праз тэрыторыю раёна праходзіць чыгунка Орша – Лепель, аўтамабільныя дарогі на Віцебск, Мінск, дарогі да цэнтраў сельсаветаў.

Ландшафт Чашніччыны – яскрава выражаны ландшафт Беларускага Паазер'я: хваёвыя ўзгоркі, празрыстыя пералескі, масівы цёмнахваёвых лясоў, паша і лугі змяняюцца азёрамі, якіх у раёне налічваецца звыш 70-і, балотамі і рэкамі. жвіровы

У раёне маюцца радовішчы глін, пясчана-жвіровага матэрыялу, сапрапеляў, торфу.

Праз тэрыторыю раёна працякаюць рэкі Байна, Лукомка, Ула, Усвейка, Эса, Югна і інш.

Ула – самая вялікая рака ў раёне, прыток Заходняй Дзвіны, цячэ праз Лепельскі, Чашніцкі і Бешанковіцкі раёны. Пачынаецца з Лепельскага возе-

ра. Назва Ула балцкага паходжання (літоўскае ohla, onlis – дробны камень, галька). Даўжыня 123 км. Каля в. Ула (Бешанковіцкі раён) упадае ў Заходнюю Дзвіну. Прытокі Улы – Лукомка, Усвейка, Свячанка, Хоцінка. На беразе Улы стаіць г. Чашнікі. З даўніх часоў Ула адыгрывала важную ролю ў жыцці Чашнікаў і навакольных вёсак, была адзіным водным шляхам, які звязваў іх жыхароў з Балтыйскім морам. Асабліва ж узрасла роля ракі пасля будаўніцтва (1797–1805) Бярэзінскай воднай сістэмы [4, с. 3].

З возера Лепельскае Ула цячэ на ўсход, потым за Чашнікамі крута паварочвае ў паўночным – паўночна-заходнім напрамку і каля Чашнікаў адлегласць паміж рэчышчам Улы ў верхнім і ніжнім цячэнні складае 1214 м. Тут у свой час і быў пракапаны Чашніцкі канал Бярэзінскай воднай сістэмы, які цяпер страціў сваё значэнне. Ула была не толькі шляхам зносін са знешнім светам. У ёй заўсёды лавілі рыбу.

Да р. Улы каля в. Зарэчная Слабада прымыкаюць заліўныя лугі, дзе з даўніх часоў чашнічане нарыхтоўвалі сена для жывёлы. 20–30 гадоў таму тут буяла такое разнатраўе і разнаквецце, што ўлетку цяжка было перад сенакосам прайсці праз яго. Цяпер травы сталі больш рэдкімі, як і кветкі – лугавая герань, васілёк лугавы, акопнік, званочкі, крываўнік.

У раёне звыш 70-і азёр. Найбольш вялікія з іх – Лукомскае, Жэрынскае, Чарэйскае, Баярскае.

Лукомскае возера знаходзіцца ў басейне р. Улы. Плошча 36,7 км^2, даўжыня – 3,5 км, найбольшая глыбіня – 11,5 м, сярэдняя – 6,6 м. Назва паходзіць ад старажытнарускага слова «лука», што значыць выгіб, круты паварот ракі, нізкі ці лясісты мыс. На жаль, Лукомская ДРЭС аказвае дрэнны ўплыў на стан азёрнай вады. Берагі пераважна спадзістыя, зараслі водарасцямі, хмызняком, лесам. Возера праточнае: у яго ўпадае р. Цытранка. Шырыня паласы трыснягу, чароту і сітніку даходзіць да 100 м. Возера багатае на рыбу. Водзяцца лешч, плотка, акунь, гусцяра, шчупак, верхаводка, сіг, сом, язь, лінь, мянтуз, карась. На беразе Лукомскага возера знаходзіцца помнік прыроды «Змееў камень» [2, с. 131].

Жэрынскае возера – другое па велічыні ў раёне, але неглыбокае. Плошча воднага люстэрка 8,74 км^2. Назва звязана са стараславянскім словам «жерел» – выток, вусце, гарлавіна. Вякамі возера назапашвала розныя арганічныя рэчывы, якія вялікім пластом засцілаюць дно і з'яўляюцца каштоўным арганічным угнаеннем. Гэта сапрапелі. Прывольна адчувае сябе тут рыба. Размешчана на Чашніцкай раўніне, берагі возера нізінныя, топкія, часткова зараслі лесам і хмызняком. Каля возера – катлавіна з залежамі торфу. Да берага возера прымыкае балота, дзе растуць брусніцы і журавіны.

Баярскае возера падобнае да Жэрынскага. Знаходзіцца каля в. Баяры. Назвы возера і вёскі паходзяць ад слова баяры – сацыяльная група насельніцтва

XIII–XVIII стст. У адрозненне ад Жэрынскага возера, у якім водзіцца ў асноўным белы карась, у Баярскім – карась чырвоны.

Вялікай колькасцю азёр славяцца чарэйскія землі. Тут цэлы ланцуг азёр. Асабліва прыгожае возера Чарэйскае – старажытная назва Галаўль.

Прыгажосцю славіцца Раманоўскае возера, да якога прымыкае лясное ўрочышча – заказнік «Круш». Возера амаль круглае, берагі яго балоцістыя, параслі лесам. Але ў адным месцы бераг пясчаны, узвышаны. Дно ў тым месцы павольна паглыбляецца і ўтварае цудоўны пляж. Берагі параслі травамі, ёсць шмат лекавых. Назва Раманоўскага возера паходзіць ад імя Раман.

Пра Святое возера легенда кажа, што калісьці тут стаяла царква. Аднойчы, калі ў храме ішла служба, яна разам з людзьмі правалілася, і на тым месцы ўтварылася возера. Возера глыбокае, вада ў ім халодная і ніколі не «цвіце».

Дрыгвічнае возера знаходзіцца побач з возерам Святым. Яно адметнае сваімі лекавымі гразямі, якія ў мінулыя гады выкарыстоўваліся Чашніцкай бальніцай для лячэння розных хвароб. Назва возера паходзіць ад слова «дрыгва».

За в. Баравыя ў бок в. Вішкавічы ёсць адметная мясціна. Сярод лесу, калі спусціцца з крутагору, з зямлі б'е крыніца з жыватворнай мінеральнай вадой.

А якім прыгожым, асабліва ў залацістую восеньскую пару, бывае возера Слідзец! Назва возера паходзіць ад слова «слідзец» – пластавы выхад грунтовых вод на схіле гары.

У старажытныя часы ў раёне было шмат лясоў, аб чым сведчыць нават і тое, што каля 20 назваў вёсак звязана з лесам: Бор, Бараўцы, Забор'е, Дуброва, Дуброўкі, Залессе, Трылесіна і інш.

Лясоў цяпер у раёне менш, чым у суседніх Лепельскім і Бешанковіцкім. Гэта вынікае з таго, што ў канцы XIX ст. у Чашніках пачала працаваць папяровая фабрыка. Асноўнай сыравінай для вытворчасці паперы служыла драўніна. Шмат лесу сплаўлялася ў Рыгу па Бярэзінскай воднай сістэме. Прадстаўлены лясы елкай і сасной, бярозай, асінай, вольхай шэрай і чорнай.

На тэрыторыі раёна ў міжрэччы Лукомкі і Усвейкі раскінулася Карнілаўская пушча, плошча якой каля 800 га. У мінулым – буйны масіў шыракаліста-цёмнахваёвых лясоў. Празмерная гаспадарчая эксплуатацыя ў XIX ст. і пашырэнне сельскагаспадарчых угоддзяў значна скарацілі плошчу пушчы. Пераважаюць кіслічныя ельнікі, асіннікі і шэраалешнікі, невялікія плошчы заняты дубровамі, паніжаныя месцы – чорнаалешнікамі.

На тэрыторыі раёна створаны 4 заказнікі. Батанічны заказнік «Зялёнае ляда» непадалёку ад в. Белая Царква прадстаўлены чыстым дрэвастоем дуба звычайнага ўзростам 60–70 гадоў. Батанічны заказнік «Ліпнікі» размешча-

ны каля в. Кавельшчына. Агульная плошча яго 1,7 га. У ім расце ліпа драбналістая. Біёлага-батанічны заказнік балота «Саснягі» каля в. Двор-Павулле. У ім ёсць гняздоўі жураўля шэрага, а таксама расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу, – купальніца еўрапейская, венерын чаравічак.

Маюцца два паляўнічыя ўзнаўленчыя ўчасткі: «Круш» каля Раманоўскага возера і «Барок» на тэрыторыі Васькаўшчынскага лесу.

У лясах ёсць дзялянкі ягаднікаў: бруснічніку, журавінніку, маліннiку, чарнічніку і інш. У лясах раёна растуць усе вядомыя на тэрыторыі Беларусі грыбы – баравік, падасінавік, падбярозавік, махавік, ваўнянка, грузд, лісічка, сыраежка, свінушка, страчок звычайны, смарчок звычайны, апенька, восеньскі рыжык, курачка, чага (лекавы грыб) і інш.

На прасторах раёна расце вялікая колькасць траў, многія з якіх з'яўляюцца лекавымі: дурман, каравяк звычайны, дурнічнік, залатая розга, крывасмок лекавы, крываўнік звычайны, ландыш майскі, трыпутнік вялікі, святаяннік, хвошч палявы, чабор звычайны, падбел звычайны, сушаніца дрыгвяная, рамонак аптэчны, наперстаўка чырвоная, сардэчнік пяцілопасны, талакнянка звычайная, піжма звычайная, чыстацел вялікі, стрэлкі звычайныя, частуха падарожнікавая і інш.

Ёсць расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу: званочак шыракалісты, белы гарлачык, вадазбор звычайны, купальніца еўрапейская, венерын чаравічак, сон-трава, чарамша (мядзведжая цыбуля), ветраніца лясная, каменяломнік зярністы, гарачаўка вясенняя, наперстаўка буйнакветкавая і інш.

У параўнанні з мінулымі часамі колькасць дзікіх жывёл у лясах раёна значна паменшылася. Жывуць тут лось, касуля, воўк, лісіца, куніца, гарнастай, вавёрка, заяц-бяляк і заяц-русак, рысь, норка еўрапейская, бабёр, выдра, андатра, вожык, янотападобны сабака, барсук, ласка і інш.

У лясах мноства птушак: шэрыя і белыя курапаткі, глухары, рабчыкі, качкі, гусі (пралётам), цецерукі, вальдшнэпы, бекасы, гаршнэпы, совы, сарокі, вароны, буслы, вераб'і, жаўрукі, сойкі, удоды, дразды-рабіннікі, чорныя дразды, шызаваронкі, салаўі, сініцы, малінаўкі, крумкачы, ястрабы-цецерукоўнікі і ястрабы-перапялятнікі, канюкі, скапы.

Маюцца птушкі, занесеныя ў Чырвоную кнігу. Гэта бусел чорны, які жыве ў двух месцах Чашніцкага і двух месцах Красналуцкага лясніцтваў, чапля шэрая – на сажалках Чашніцкай ПМК-38 і на прыбярэжжы Лукомскага возера каля в. Сіманавічы.

Маецца каля 80-і відаў качак, 12 відаў вялікіх і малых стракатых дзятлаў, а таксама дзяцел зялёны. Водзіцца жаўна, але дакладнага ўліку яе няма.

У апошнія гады павялічылася колькасць лебедзяў-шыпуноў. Калі ў 1980-х гг. іх заставалася зімаваць на Лукомскім возеры 7–8 пар, то цяпер – сотні. У час паходу намі выяўлены гняздоў'і журавоў каля в. Падмошша.

На паўднёвы захад лясы Чашніччыны прымыкаюць да Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

У XIX ст. у рэках Чашніччыны, што належаць да басейна Заходняй Дзвіны, вадзілася шмат рыбы: сом, карась, лінь, лешч, гусцяра, верхаводка, калінка (сялява), язь, галавень, таймень, шчупак, сіг, рапушка, сняток, вугор, налім, траска, акунь, судак, ёрш, бычок, колюшка, пячкур і інш.

Цяпер у рэках і азёрах рыбы стала значна менш, а некаторыя віды зусім зніклі. Напрыклад, у сувязі з павышэннем тэмпературы вады Лукомскага возера пасля будаўніцтва ДРЭС знікла рыба сіг. У рэках і азёрах Чашніччыны жывуць сом, шчупак, лешч, лінь, галавень, вугор, карась, плотка, акунь, налім, краснапёрка, сазан, карп і інш.

Вывучэнне прыроды і экалагічная адукацыя – адзін з прыярытэтных напрамкаў у рабоце нашага музея. На працягу многіх гадоў мы арганізуем турыстычна-пазнавальныя паходы, задача якіх – беражлівае стаўленне да навакольнага свету.

Турыстычны маршрут «Зямля бацькоў» праходзіць па лесе Чашніцкага лясніцтва. Мы арганізуем экскурсію «Жывёльны і раслінны свет». Турысты наведваюць помнік прыроды, святую крыніцу «Езус». Адпачываюць у лесе, абавязкова прыбіраюць тэрыторыю. Асноўная ўвага надаецца выкананню прыродаахоўнага заканадаўства.

Пры наведванні жывёлагадоўчага комплексу ў в. Шаўкоўшчына асноўная ўвага надаецца экалогіі.

Сотні людзей прыходзяць да нас. Іх цікавіць прыгажосць Чашніцкай прыроды, цяга да ведаў, да аздараўлення арганізма, спартыўны інтарэс.

У час нашых паходаў турысты знаёмяцца з гісторыяй роднага краю, пейзажамі, чашніцкімі ландшафтамі, раслінным і жывёльным светам, з прыроднымі адметнасцямі. У паходзе чалавек развівае здольнасць адчуваць прыроду, разумець яе складаную «мову», дапамагаць ёй, берагчы яе.

Літаратура

1. Даследчая праца «Прырода Чашніцкага краю» супрацоўнікаў Чашніцкага гістарычнага музея.

2. Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.: іл.

3. Рэгіёны Беларусі: энцыклапедыя. У 7 т. Т. 2. Віцебская вобласць. У. 2 кн. Кн. 2. К-Я / рэдкал.: Т. В. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 640 с.: іл.

4. Стэльмах А. У. Бярэзінская водная сістэма / А. У. Стэльмах. – Віцебск : Віцеб. абл. друкарня, 2009. – 24 с., [8] с. фат.

НОВЫЯ НАКІРУНКІ І ФОРМЫ ЭКАЛАГІЧНАГА ТУРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ Ў 2014–2019 гг.

Бусько Сяргей Іванавіч,
старшыня РГА «Беларускае таварыства экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў»,
дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры»,
г. Мінск

Турызм з'яўляецца адной з вядучых і найбольш дынамічных галін сусветнай эканомікі, бо спрыяе стварэнню дадатковых працоўных месцаў, забяспечвае занятасць насельніцтва. Турызм аказвае вялікі ўплыў на такія галіны эканомікі, як транспарт і сувязь, будаўніцтва, сельская гаспадарка, вытворчасць тавараў народнага спажывання і іншыя. У сваю чаргу, на развіццё турызму ўздзейнічаюць розныя фактары: дэмаграфічныя, прыродна-геаграфічныя, сацыяльна-эканамічныя, гістарычныя, рэлігійныя, палітычныя і прававыя. Адным з адметных складнікаў турызму ў апошнія дзесяцігоддзі стаў экалагічны турызм. Працэсы індустрыялізацыі і ўрбанізацыі вымушаюць людзей шукаць некранутыя кавалачкі прыроды і экасістэмы, ці наадварот, прыцягваюць увагу да месцаў тэхнагенных катастроф [3, с. 51].

Для фарміравання канкурэнтаздольнага рынку турыстычных паслуг у межах Дзяржаўнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2016–2020 гады была распрацавана эфектыўная стратэгія па прасоўванні айчыннага турызму на ўнутраных і знешніх рынках [2]. Беларусь валодае багатым прыродным патэнцыялам для развіцця экалагічнага турызму. Гэта шырокія лясныя, леса-азёрныя, леса-рачныя прыродныя комплексы, якія ўключаюць помнікі прыроды; багны беларускіх Палесся і Паазер'я з іх унікальнымі экасістэмамі; разнастайны раслінны, птушыны і жывёльны свет, прыродныя лячэбныя рэсурсы, паляўнічыя і рыбалоўныя ўгоддзі, маляўнічыя ландшафты з умовамі для арганізацыі пешаходных, конных, веласіпедных, водных турысцкіх паходаў, адпачынку і аздараўлення ў прыродным асяроддзі [4]. Усё гэта і стварае перадумовы для паспяховага развіцця на тэрыторыі краіны экатурызму.

Адным з ключавых фактараў, што паўплываў на якасныя сістэмныя змены ў галіне турызму, стаў Чэмпіянат свету па хакеі 2014 года. Падпісаныя міжнародныя дамовы прымусілі абнавіць гатэльную інфраструктуру, шляхі зносін (цалкам завершана ў 2019 годзе пасля мадэрнізацыі трасы М6), апрабіраваць бязвізавы рэжым і інш. Прыкладна ў гэты час шыро-

кую вядомасць набывае феномен аграсядзіб як форма адпачынку турыстаў у прыродным асяроддзі.

Новыя запыты часу выклікаюць развіццё новых сегментаў турызму, традыцыйныя формы турызму шукаюць новыя рашэнні, адбываецца іх тэхналагізацыя. Інфармацыйныя сродкі дазваляюць больш эфектыўна рэалізаваць прасоўванне прадукту на турыстычныя рынкі. Якасна і колькасна мяняецца і кадравае забеспячэнне турызму: толькі за 2016 год атэставана 114 экскурсаводаў і 30 гідаў-перакладчыкаў (прыкладна 10%), за 2018 год – 106 і 32 адпаведна – прыкладна 12% (падлік аўтара).

У разглядаемы час неабходна вылучыць некалькі новых накірункаў экалагічнага турызму: Чарнобыльская зона; прамысловыя зоны з аб'ектамі экалагічнага профілю (Мікашэвічы, Ваўкавыск, Крычаў, Любань); экалагічныя маршруты па балотах (ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Ельня» і рэспубліканскі ландшафтны запаведнік «Альманскія балоты»); новыя прапановы ад класічных дэстынацый (Бярэзінскі біясферны запаведнік, Белавежская пушча); бердвотчынг.

У 2017 годзе быў праведзены адукацыйны семінар Нацыянальнага агенцтва па турызме Рэспублікі Беларусь для турыстычных арганізацый і экскурсаводаў на базе Палескага радыяцыйнага запаведніка. Унікальны комплекс, які не мае аналагаў у іншых краінах, падрыхтаваў і прэзентаваў маршрут па беларускай частцы Чарнобыльскай зоны. Ён уключае наведванне зоны адчужэння аж да ўкраінскай мяжы (даследчая станцыя Масаны, каля 10 км ад рэактара), пад'ём на назіральную пляцоўку (на вышыні больш за 50 м), знаёмства з адселенымі вёскамі, уражлівым ландшафтам («іржавы лес», пясчаныя выдмы). Інфраструктура запаведніка таксама прадстаўлена ў межах экскурсіі – месцы падкормкі і назірання за жывёламі, станцыя кантролю над радыяцыйным фонам, музей (з шырокім наборам сродкаў барацьбы з радыяцыяй), помнікі ліквідатарам, база для персаналу. Перамяшчэнне па тэрыторыі на спецтэхніцы ў суправаджэнні супрацоўнікаў запаведніка таксама дадае каларыту. Пашырэнне цікавасці да чарнобыльскай зоны прывяло да якасных змен у інфраструктуры (напрыклад, гатэль і сядзіба ў Хойніках). Серыял «Чарнобыль» (амерыканскі тэлеканал HBO, 2019 год зноў надаў сусветную вядомасць гэтай тэрыторыі.

Крычаўскі раён можа быць цікавы вялікімі мелавымі кар'ерамі, у адрозненне ад падобных тэрыторый каля Ваўкавыска і Любані, у дадзеным выпадку існуючая дарога без праблем дазваляе дабрацца да аглядной пляцоўкі. Жыткавіцкі раён прапануе экскурсію на гранітны кар'ер у Мікашэвічах, у рамках маршруту ёсць наведванне цэхаў, азнаямленне з тэхнікай, аглядныя пляцоўкі, музей прадпрыемства. Гомельскі раён валодае такім аб'ектам, як фасфатныя горы, аднак іх выкарыстанне, як і салігорскіх гор, пакуль далёка ад рэалізацыі.

У 2014–2019 гадах «Ельня» і «Альманы» з вузкаспецыялізаваных і абмежавана распаўсюджаных тэрмінаў сталі вядомымі масаваму спажыўцу і большасці турыстычных фірм Беларусі. Кожны год у канцы верасня на верхавое балота Ельня ў Міёрскім раёне – адно з самых вялікіх у Еўропе – збіраюцца ад 5 да 7 тысяч шэрых жураўлёў, што ляцяць на зімоўку ў цёплыя краіны. Акрамя таго, балота здаўна славіцца багатымі ўраджаямі гаючай ягады – журавінаў. Госці фестывалю «Жураўлі і журавіны Міёрскага краю» могуць паназіраць за цудоўнымі птушкамі і зрабіць фота, даведацца шмат цікавага пра прыроду і насельнікаў тутэйшых месцаў, паспрабаваць незвычайныя стравы з журавінамі. Сярод паслуг для турыстаў заказніка «Ельня» – візіт-цэнтр, які адкрыўся ў верасні 2013 года. Цэнтр абсталяваны інтэрактыўнымі стэндамі і гульнявымі тэрміналамі. Тут праводзяцца віртуальныя экскурсіі і дэманструюцца фільмы пра заказнік. На балоце ствараецца экалагічная сцежка (1,5 км), даступны эксклюзіўны прадукт – хаджэнне па дрыгве на «снегаступах» і пракат балатахода айчыннай вытворчасці.

«Альманы» прапаноўваюць наведаць экалагічны маршрут. Сцежка цалкам дазваляе пагрузіцца ў унікальную аўру гэтай экасістэмы, удыхнуць на поўныя грудзі пах багуну і іншых балотных траў. Жадаючым паназіраць за жыццём дзікай прыроды, за паводзінамі жывёл і птушак у натуральных умовах будзе прадастаўлена назіральная вышка з магчымасцю размяшчэння відэа- і фотаапаратуры. Нават гістарычны кампанент прысутнічае на гэтай тэрыторыі (ад «мора Герадота» да савецкага ваеннага палігона 1950-х гадоў). На жаль, са жніўня 2017 года Палескі лясгас (ён мае сядзібу ў Давыд-Гарадку) пачаў будаваць 24-кіламетровую лесагаспадарчую дарогу ад вёскі Букча на поўнач заказніка. Запланаваная шырыня дарогі каля 5 м, аднак будаўнічая пляцоўка створана шырынёй больш за 20 м. Гэта знішчае экалагічную сістэму і паніжае турыстычную прывабнасць рэгіёну.

У разглядаемы перыяд новыя варыянты турыстычнага прадукту прапануе Бярэзінскі біясферны запаведнік [5]. Штогод у лістападзе там адбываецца фестываль «Міфы на балоце», здзіўляўчы не толькі прыгажосцю і ўнікальнасцю тутэйшай прыроды, але і таямнічай атмасферай беларускай міфалогіі. Гасцей сустракаюць сам Балотнік – сімвал запаведніка, а таксама іншыя істоты і духі – Цмок, Багнік і іншыя. Падчас фестывалю праходзяць займальныя дзённыя і начныя экскурсіі, выставы, майстар-класы па традыцыйных рамёствах, народныя гулянні з міфалагічнымі анімацыйнымі праграмамі. Трэба адзначыць прафесіянальную падрыхтоўку супрацоўнікаў (у тым ліку атэставаных экскурсаводаў па профільнай тэматыцы).

У чэрвені 2017 года ў Бярэзінскім біясферным запаведніку адбылося афіцыйнае адкрыццё ўнікальнага Цэнтра міфалагічнага турызму. Цэнтр створаны пры дапамозе Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» ў межах праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай эканомікі"», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Дырэктар ГПУ «Бярэзінскі біясферны запаведнік» Андрэй Пракошын падкрэсліў, што галоўная мэта Цэнтра – «праз апавяданні пра міфалогію развіць у турыстаў, асабліва ў дзяцей, пачуццё беражлівых адносін да прыроды. Зварот да міфалогіі стане важным інструментам экалагічнай асветы. Багаты свет беларускай міфалогіі пакуль яшчэ не так часта выкарыстоўваецца ў турыстычных праграмах, валодае вялікім патэнцыялам у развіцці этнаграфічнага турызму, і гэта становішча трэба выпраўляць» [5].

Кожны з пералічаных заказнікаў і запаведнікаў з'яўляецца і пляцоўкай для назірання за птушкамі. У Беларусі захаваліся ўнікальныя для Еўропы месцы рассялення птушак, дзе, напрыклад, жыве знакамітая вяртлявая чаротаўка (у нас гняздуецца палова ўсёй папуляцыі свету, і на лагатыпе «Ахова птушак Бацькаўшчыны» менавіта яна). Менавіта Беларусі ёсць што прапанаваць замежным аматарам: дзякуючы ўнікальнаму геаграфічнаму становішчу тут можна ўбачыць віды як з тайгі, так і субтропікаў. У выніку мы можам цалкам паспяхова канкурыраваць, напрыклад, са скандынаўскімі краінамі, прапаноўваючы падобны, але больш разнастайны набор відаў, ды яшчэ і прыкметна выйграючы па кошце тураў (у сярэднім ён складае 1500 € за 10 дзён, выдаткі на авіяпералёт у гэтую суму не ўваходзяць). Да таго ж беларуская лясная гаспадарка пакуль вядзецца не гэтак інтэнсіўна, што дазваляе сустрэць за адну паездку – а калі пашанцуе, то і за адзін дзень – усе віды дзятлаў, якія існуюць у Еўропе [1].

Такім чынам, за 2014–2019 гады адбыліся якасныя змены ў развіцці экалагічнага турызму. Гэтаму спрыяюць размяшчэнне Беларусі ў цэнтры Еўропы, унікальнасць ландшафтаў, багацце жывёльнага і расліннага свету, развітая сетка ААПТ. Зацікаўленасць дзяржавы і грамадскай супольнасці, паступовая змена светапогляду насельніцтва прывяла да новых форм экалагічнага турызму (чарнобыльская зона, экалагічныя сцежкі па багнах і музеі новага тыпу, прамысловыя тэрыторыі ў Мікашэвічах і Крычаве, бёрдвотчынг). Адначасова ідзе развіццё інфраструктуры, падрыхтоўка экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў з інавацыйнымі метадамі працы для якаснага абслугоўвання турыстаў. На жаль, не рэалізаваны патэнцыял Салігорска; працягваюць існаваць і негатыўныя моманты (шаша праз Альманы і іншыя), што неспрыяльна адбіваюцца на экасістэмах.

Літаратура

1. Бородин, А. Бердвотчинг в Беларуси. Кто и почему приезжает к нам наблюдать за птицами / А. Бородин // Планета Беларусь: туристический портал. – Режим доступа: https://planetabelarus.by/publications/berdvotching-v-belarusi-kto-i-pochemu-priezzhaet-k-nam-nablyudat-za-ptitsami/. – Дата доступа: 10.01.2020.

2. Государственная программа «Беларусь гостеприимная» на 2016–2020 годы [Электронный ресурс]: пост. Совета Министров Республики Беларусь, 4 ноября 2016 г., № 903 // Нац. Прав. Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=C21600232. – Дата доступа: 11.01.2020.

3. Лаптиева, Л. Н. Экотуризм: состояние и перспективные направления развития в Республике Беларусь / Л. Н. Лаптиева, Г. И. Индушко // Веснік МДПУ імя І. П. Шамякіна. – 2016. – № 2 (48). – С. 51–57.

4. Стратегия устойчивого развития экологического туризма в Беларуси / Л. М. Гайдукевич [и др.]; под ред. Л. М. Гайдукевича, С. А. Хомич. – Минск : БГУ, 2008. – 351 с.

5. Суслова, Н. В Березинском заповеднике открылся Центр мифологии, 26.06.2017 / Н. Суслова // Планета Беларусь: туристический портал. – Режим доступа: planetabelarus.by/publications/v-berezinskom-zapovednike-otkrylsya-tsentr-mifologii/. – Дата доступа: 10.01.2020.

ФЭСТ ЭКСКУРСАВОДАЎ І ЯГО РОЛЯ Ў ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ТУРЫЗМУ І КРАЯЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ

Гайдук Таццяна Іванаўна,
экскурсавод, настаўнік гісторыі
ДУА «Гімназія № 50 г. Мінска»,
г. Мінск

Пачынаючы з 1984 г. ва ўсім свеце па прапанове Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) адзначаецца Міжнародны дзень помнікаў і мясцін, зацверджаны ЮНЕСКА. Гэта асаблівы дзень у календары, бо ён дапамагае пашырыць веды грамадства аб разнастайнасці гісторыка-культурнай спадчыны ў свеце, а таксама засяродзіць увагу на тых помніках гісторыі і архітэктуры, якім патрэбна наша дапамога [1].

У Беларусі гэта свята годна адзначаецца дзякуючы правядзенню ў красавіку Фэсту экскурсаводаў. Ідэя Фэсту нарадзілася ў 2009 годзе ў асяродку неабыякавых да гісторыі і культуры людзей. Задума правядзення Фэсту экскурсаводаў – звярнуць увагу да тых помнікаў, якія мы абмінаем падчас шля-

ху на працу ці вучобу. Адбываецца гэта дзякуючы правядзенню бясплатных экскурсій, якія могуць праводзіць не толькі атэставаныя гіды, але і краязнаўцы, гісторыкі, мастацтвазнаўцы, спецыялісты ў сваёй галіне.

На першым Фэсце (2009 г.) адбыліся 25 экскурсій, а праз 10 гадоў колькасць павялічылася да 350 экскурсій. Першыя гады спісы экскурсій друкаваліся ў СМІ з пазначэннем месца збору, але ўлічваючы, што з кожным годам колькасць наведвальнікаў расла, апошніх тры гады рэгістрацыя адбываецца на сайце з пазначанай колькасцю наведвальнікаў самім гідам.

Экскурсіі ў межах Фэсту адбываюцца не толькі ў Мінску, а таксама і ў абласных гарадах. Дзякуючы нашым каардынатарам у рэгіёнах праводзяць экскурсіі ў Брэсце, Віцебску, Гродне, Гомелі, Магілёве і абласцях. За 10 гадоў прайшлі экскурсіі і ў вёсачках: Каралішчавічы, Залессе, Сёмкава, Станькава і інш. З'явіліся таксама і новыя маршруты.

Падчас Фэсту былі апрабаваны і роварныя вандроўкі: Раман Абрамчук заснаваў «Менскі велашпацыр» і кожны год праводзіць экскурсію на ровары.

Былі распрацаваны экскурсіі з элементамі квэста. Для дзетак гэта добрая магчымасць падчас гульні засвоіць цікавосткі па гісторыі і культуры Беларусі. Квэсты адбываецца не толькі ў памяшканнях ці музеях, але таксама і ў гістарычных цэнтрах гарадоў.

Асобна, з дапамогай адмысловых аўдыя-тактыльных макетаў, праводзяцца вандроўкі для людзей з парушэннем зроку і слыху. Заснавальніца праекта «Мівія» экскурсавод Людміла Скрадаль распрацавала маршруты для людзей з інваліднасцю, і таксама з'явілася магчымасць не толькі пачуць гісторыю мінскай ратушы і плошчы Незалежнасці, але і дакрануца да іх з дапамогай тактыльных макетаў.

Актыўна далучаюцца да Фэсту і храмы розных канфесій. Святары праводзяць экскурсіі па касцёлах, цэрквах, сінагогах і мячэцях. Прамысловыя прадпрыемствы таксама адкрываюць таямніцы сваёй вытворчасці.

Да Фэсту кожны год друкуюцца паштоўкі з выявамі розных гістарычных помнікаў. Таксама былі паштоўкі, дзе друкавалі інфармацыю пра храм у Кухцічах і фрэскі ў Полацку, якім трэба была дапамога ў захаванні. Упершыню ў 2019 г. адбыўся конкурс паштовак, на які нашыя экскурсанты дасылалі свае працы. Па выніку было абрана 3 паштоўкі, якія былі надрукаваны напярэдадні свята.

13–14 красавіка 2019 г. прайшоў X юбілейны Фэст экскурсаводаў. У 2019 г. да Фэсту актыўна далучыліся рэгіёны (каля 250 экскурсій) і замежжа (Вільня, Прага, Беласток, Даўгаўпілс, Масква, Мадрыд, Львоў). Пад час Фэсту экскурсаводаў толькі па Мінску адбыліся больш чым 100 экскурсій, прымалі ўдзел каля 4000 чалавек.

Апошнія гады расце цікавасць да малой радзімы. У Дзяржаўную праграму на 2016–2020 гг. Фэст экскурсаводаў таксама патрапіў. 2020 год не стане выключэннем, і ў красавіку шэраг бясплатных экскурсій адбудзецца па ўсёй Беларусі.

Літаратура

1. International Day for Monuments and Sites [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://whc.unesco.org/en/events/1164/. – Дата доступа: 25.01.2020.

БЕЛОРУССКИЕ ГОРЫ, ГРЯДЫ И ВОЗВЫШЕННОСТИ КАК ЦЕЛЕВЫЕ ОБЪЕКТЫ КРАЕВЕДЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ

Дикусар Евгений Анатольевич,
старший преподаватель
УО «Белорусский государственный университет физической культуры»,
г. Минск

Белорусские горы, высота которых варьируется в пределах от 345.0 м (гора Дзержинская, Минская область, Дзержинский район) до 126.9 м (гора Мокрая, Гомельская область, Буда-Кошелёвский район), относительно невысоки. В данной статье белорусские горы, особенно горы, имеющие собственные исторически сложившиеся названия, рассматриваются не в географически принятом контексте, а в качестве самобытных экскурсионно-познавательных краеведческих объектов-топонимов или урочищ.

Вершины белорусских гор, в отличие от таких высокогорных систем, как Гималаи, Каракорум, Гиндукуш, Памир, Памиро-Алай, Алтай или Кавказ (высота их отдельных пиков достигает 8848 м – г. Эверест, 5642 м – г. Эльбрус Западный, 4509 м – г. Белуха Восточная), не могут похвастаться наличием отвесных скал или каменных осыпей, их не укрывают ледяные или снежные шапки. Тем не менее белорусские горы тоже представляют интерес для проведения краеведческих исследований и географических изысканий. В результате наших поисковых исследований, заключавшихся во внимательном просмотре доступных топографических карт масштабом 1:50000, 1:100000 и 1:200000 или изучении литературных источников, к настоящему времени удалось выявить и идентифицировать более 300 таких низкогорных объектов [3−5]. На данный момент удалось посетить, сфотографировать, сделать географическое и административное отнесение их расположения на местности,

определить навигационные координаты примерно 200 белорусских вершин, имеющих собственные названия. Остальные около 100 вершин еще предстоит изучить и описать в будущем. Определены их расчетные GPS-координаты, что в дальнейшем должно облегчить задачу по их поиску и идентификации.

Следует отметить, что список белорусских гор, имеющих собственные названия, постоянно пополняется и их количество постепенно увеличивается. Еще одним направлением исследований по краеведению является изучение гор, имеющих собственные названия, но расположенных на прилегающих к Беларуси территориях сопредельных стран (Латвии, Литвы, Польши, России и Украины). Во времена существования СССР (1922–1991 гг.), посещение этих интересных объектов не представляло никаких административно-юридических сложностей (за исключением Польши).

В настоящее время легко удается проводить исследование только вершин, находящихся на территории Российской Федерации и расположенных рядом с границами Беларуси: из 10 подобных российских объектов пока удалось посетить всего 3. Остальным 98 выявленным горам, расположенным на прилегающих к Беларуси территориях сопредельных стран (Латвии, Литвы, Польши и Украины, придется ожидать смягчения международной напряженности, политической разрядки и безвизового доступа граждан соседних стран на прилегающие территории. Но это вопрос неопределенного будущего, и он не входит в компетенцию авторов данной работы. Можно только надеяться, что изучение как белорусских, так и соседних вершин позволит хотя бы на географическом уровне улучшить взаимопонимание между соседними народами и государствами!

Кроме белорусских вершин, имеющих собственные названия, определенный интерес представляет детальное изучение и таких объектов, как высшие точки областей и районов, высшие точки гряд и возвышенностей [1], а также исследование поселков, деревень и урочищ [2], имеющих характерный топоним «гора». Идентификация и исследование текущего состояния на местности этих озовых или камовых холмов, которые и послужили прототипами таких названий (например, гора Синяя и деревня Синяя Гора, гора Лысая и деревня Лысая Гора, гора Дубовая и урочище Дубово, расположенных в Минской области), является интересной краеведческой задачей и поводом для проведения занимательных и поучительных экспедиций и путешествий.

Исследования белорусских гор поддерживают ОО «Белорусский республиканский туристско-спортивный союз» (http://rtss.by/), Министерство спорта и туризма Республики Беларусь (http://mst.by/ru/), кафедра спортивного туризма и технологий в туристической индустрии Белорусского государственного университета физической культуры (http://www.sportedu.by/

kafedra-tehnologij-v-turisticheskoj-industrii/) и ОО «Белорусское географическое общество» (http://www.bgo.by/). Эти исследования активно проводят члены Минского городского альпинистского клуба «Апекс» и Туристского клуба Национальной Академии наук Беларуси. Белорусские вершины имеют шанс стать привлекательными экскурсионными объектами для отечественного и международного научно-познавательного, экологического, спортивного и оздоровительного туризма.

В результате проведенных исследований белорусских гор, которые активно проводятся нами с 2005 г., удалось практически полностью изучить и описать горные объекты, расположенные на территориях Минской и Витебской областей [1–3]. Методом экспертных оценок каждой из исследованных вершин был присвоен условный рейтинг (от 1 до 4 – по мере его убывания), который определяет их ценность и возможный интерес для экскурсантов и восходителей (по аналогии с принятым в Интернет-ресурсе «Глобус Беларуси», см. http://globus.tut.by/). Каждый из указанных рейтингов может быть примерно «расшифрован» следующим образом: 1 – увидеть обязательно; 2 – увидеть интересно; 3 – увидеть по дороге; 4 – взглянуть. Каждый из указанных рейтингов отражает также следующие объективные параметры исследованных вершин: 1 – вершины со склонами средней и большой крутизны, с заметным возвышением относительно окружающего ландшафта и хорошим обзором окружающей местности, открывающимся с нее, с хорошо сохранившимся геодезическим или памятным знаком; 2 – вершины со склонами средней крутизны и небольшим возвышением относительно окружающего ландшафта; 3 – вершины с пологими склонами и малым возвышением относительно окружающего ландшафта; 4 – слабо выраженные вершины и вершины, изменившие внешний вид в результате хозяйственной деятельности человека – полностью застроенные домами или превращенные в свалки бытовых отходов; их посещение может быть рекомендовано только после обширной реконструкции.

В качестве примера можно привести описание горы Тарасовцы высотой 282.6 м, которая является высшей точкой Дятловского района и входит в состав Дуги Струве. Она расположена в Дятловском районе Гродненской области на территории Дятловского сельсовета. Вершина находится в 0.7 км на север от деревни Тарасовичи, в 1.0 км на юго-юго-восток от деревни Миклаши, в 1.8 км на запад от хутора Куликовщина, в 2.0 км на восток от деревни Герники, в 2.5 км на северо-запад от деревни Рыболово и расположена на южной опушке леса, на краю пахотного поля. На вершине имеется геодезический пункт в виде предвершинного рва (канавы) и характерного бетонного опознавательного столбика. Координаты вершины горы Тарасовцы: 53° 25,261’ N, 25° 26,736’ E. Рейтинг вершины – 1 балл.

В исследованиях белорусских вершин Минской и Гродненской областей самое активное участие принимали: Клецков Алексей, Ковенский Алексей, Койнова Ольга, Кособуцкий Игорь, Крусь Вадим, Куницкий Александр, Листопадова Виктория, Подлисских Валерий, Пузанкевич Викентий, Рак Владимир, Свиридов Николай, Свирин Сергей, Цыганчук Юрий и многие другие. Всего в этих краеведческих экспедициях приняло участие более 100 человек.

Исследование и посещение белорусских горных объектов с туристско-рекреационными, учебно-экскурсионными, познавательными и краеведческими целями может быть рекомендовано для более полного изучения географии Беларуси, ознакомления с его географическими комплексами и отдельными слагающими его компонентами. Краеведение в приложении исследования белорусских гор или высших точек гряд и возвышенностей дает возможность не только с пользой проводить свое свободное время, но и вести учебно-познавательную деятельность. Примером такой межпредметной и междисциплинарной связи при исследовании гор, высших точек административных районов, белорусских гряд и возвышенностей может быть работа по выявлению новых историко-культурных и природно-рекреационных объектов, исторических памятников и перспективных мест отдыха, привлечение государственных организаций к природоохранной деятельности.

Следует подчеркнуть, что абсолютное большинство нынешних местных жителей сельских поселений, агрогородков или хуторов не имеют ни малейшего представления ни об истоках названий ближайших к этим населенным пунктам «гор», гряд или возвышенностей, ни о самих этих объектах и их названиях. Большинство топонимов горной тематики остались только на топографических картах местности. И если не предпринимать сознательных усилий для их систематизации и сохранения, то они рискуют полностью исчезнуть, раствориться в процессе Всемирной глобализации и нивелирования национальных, географических и топонимических особенностей неких безликих геополитических территорий!

По мнению авторов, белорусские горы, высшие точки гряд, возвышенностей, административных областей и районов, а также некоторых урочищ должны бережно охраняться государством для потомков, что необходимо для поддержания национальной гордости, самосознания и самоидентификации белорусского народа. На всех этих объектах необходимо установить геодезические знаки (триангуляционные вышки) или пояснительные стелы, обелиски или охранные таблички, как это сделано на высшей точке Ошмянского района – горе Тюпишкинской, высотой 311.2 м (которая входит в Дугу Струве), на горе Дзержинской или у подножия горы Сторожевой.

Литература

1. Высшие точки белорусских гряд и возвышенностей / Е. А. Дикусар [и др.] // Геаграфія. 2016. № 3. С. 9−13.

2. Дикусар, Е. А. Топонимика урочищ республики Беларусь. Алфавитный перечень, координаты, кадастрофикация и систематизация по областям / Е. А. Дикусар, В. Э. Пасанен, С. Г. Стёпин. Saarbrücken, Deutschland: LAP LAMBERT Academic Publishing / OmniScriptum GmbH & Co. KG, 2017. – 231 с.

3. Пасанен, В. Э. Вертикальная Беларусь: путеводитель по 125 уникальным и самобытным туристско-экскурсионным объектам Беларуси / В. Э. Пасанен, Е. А. Дикусар, В. Е. Подлисских. – Минск : Право и экономика, 2013. − 164 с.

4. Пасанен, В. Э. Горные вершины Витебской области / В. Э. Пасанен, Е. А. Дикусар, С. Г. Стёпин. – Минск : Право и экономика, 2016. − 162 с.

5. Пасанен, В. Э. Горные вершины равнинной Беларуси / В. Э. Пасанен, Е. А. Дикусар, В. Е. Подлисских. – Минск : ГУ «Республиканский учебно-методический центр физического воспитания населения», 2014. − 224 с.

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ НА ТЭРЫТОРЫІ ІЎЕЎСКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Захарэвіч Іван Іванавіч,
настаўнік-дэфектолаг
ДУА «НПК Эйгердоўскі дзіцячы сад – сярэдняя школа Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці»,
аг. Эйгерды, Іўеўскі раён, Гродзенская вобласць

2018–2020 гады ў нашай краіне аб'яўлены Годам малой радзімы. Прыняцце такога рашэння выклікала разважанні сярод усіх жыхароў Беларусі аб важнасці малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека. Таму сёння мы засяродзім увагу прысутных на археалагічных даследаваннях Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці.

У кастрычніку 1920 года ў Рызе паміж РСФСР (якая, у тым ліку, прадстаўляла інтарэсы Беларусі), а таксама УССР, з аднаго боку, і Польшчай, з другога, была заключана прэлімінарная мірная дамова, у адпаведнасці з якой новая дзяржаўная мяжа дзяліла беларускія тэрыторыі на дзве часткі [8, с. 63]. Аднак пасля гэтага мяжа ўсё яшчэ не была стабільнай. Пазней бальшавікі пагадзіліся перадаць Другой Рэчы Паспалітай яшчэ частку беларускіх тэрыторый [9]. Так, напрыклад, у складзе польскай дзяржавы апынулася мястэчка Радашковічы, тады як аднайменная чыгуначная станцыя (вёска Пятрышкі) засталася ў БССР [6, с. 6]. 18 сакавіка 1921 года ў Рызе было падпісанае канчатковае мірнае пагадненне, якім скончылася кровапралітная польска-бальшавіцкая вайна. Пасля Рыжскай мірнай дамовы больш за 100 тысяч квадратных кіламетраў зямлі і 4 мільёны жыхароў Беларусі апынуліся ў складзе Другой Рэчы Паспалітай. Дэмаркацыя мяжы пачалася ў траўні 1921 года. Пры гэтым праца змешаных памежных камісій ішла вельмі марудна. Канчаткова правесці вызначэнне польска-бальшавіцкай мяжы атрымалася толькі восенню 1922 года. Яшчэ два гады пасля гэтага адбывалася ўстаноўка памежных знакаў.

Першыя бальшавіцкія памежныя часткі сталі прыбываць на дзяржаўны кардон у 1921 годзе. У Беларусі былі створаны 6-я, 10-я і 21-я асобныя памеж-

ныя брыгады. На мяжы ствараліся заслоны ў выглядзе пастоў, якія, у сваю чаргу, аб'ядноўваліся ў памежныя ўчасткі. Мяжа разбівалася на раёны. Штабы дзвюх памежных дывізій знаходзіліся ў Мінску і Віцебску. У 1922 годзе ахова межаў была перададзена Дзяржаўнаму палітычнаму ўпраўленню (ДПУ) [5]. Неўзабаве (у 1924 г.) была створана Заходняя памежная акруга, якая складалася з сямі атрадаў. У горадзе Ізяслава знаходзіўся штаб 15-га памежнага атрада.

У пачатку 1930-х гадоў з тэрыторый, што былі побач з мяжой, пачалі высяляць «непажаданыя элементы» – буйных землеўласнікаў, хутаран, «кулакоў», асоб, якія мелі сваякоў у Польшчы [3]. Тады ж была ўведзена абмяжоўваючая сістэма правіл, мерапрыемстваў і нормаў, якія рэгулявалі парадак уезда, пражывання і прац у памежных зонах. Уезд у пагранзону быў забаронены ўсім, акрамя сталых жыхароў [6, с. 96–97].

У 1924 годзе ўрад Другой Рэчы Паспалітай стварыў памежную службу – Корпус аховы памежжа (КАП). Ужо ў верасні таго ж года была распрацавана арганізацыйная структура новага органа. Корпус адначасова падпарадкоўваўся Міністэрству абароны і Міністэрству ўнутраных спраў. Галоўнай задачай КАП была ахова памежнай тэрыторыі з Літвой, Латвіяй, СССР і Румыніяй (з лютага 1939 года). Польскімі суседзямі 15-га Заслаўскага пагранатрада быў батальён КАП «Краснае». Штаб батальёна знаходзіўся ў мястэчку Краснае [1, с. 32–33]. З пачаткам вайны з Германіяй большасць баяздольных часцей польскай арміі, у тым ліку і некаторыя падраздзяленні корпуса памежнай аховы, былі перакінутыя на заходні фронт. Ва ўсходніх ваяводствах засталіся толькі аслабленыя гарнізоны памежных застаў ды штабное камандаванне. Раніцай 17 верасня 1939 года гарнізоны польскіх стражніц спрабавалі арганізаваць супраціў часцям Чырвонай Арміі, якія перайшлі «рыжскую» мяжу, але сілы былі няроўнымі. Памежнікі з заставы Шапавалы (знаходзілася прама насупраць фальварка Хмелеўка) пад камандаваннем капрала Нядзельскага некалькі гадзін вялі бой супраць савецкіх пяхотнікаў, якія спрабавалі прарвацца на польскую тэрыторыю. Гераічна змагаліся і абаронцы іншых польскіх стражніц. Так, чырвонаармейцам атрымалася зламаць супраціў абаронцаў стражніцы «Кучкуны» толькі пасля ўвядзення ў бой артылерыі і бронетэхнікі [7, с. 49].

Новая савецка-германская мяжа праходзіла па Бугу. Разам з гэтым не знікла і старая «рыжская мяжа». У мэтах «унутранай бяспекі» савецкія памежнікі ахоўвалі яе аж да нападу нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз, а дзеля яе перасячэння патрабаваўся адмысловы пропуск. У 1940 годзе 15-ы памежны атрад з Заслаўя быў расфармаваны, а яго асабовы склад быў перададзены ў распараджэнне 16-га Дзяржынскага памежатрада. Пасля нападу Германіі на СССР савецкія памежнікі на заставах у Новым Полі,

Меткаве, Чыравічах, Вялікім Сяле і інш., якія знаходзіліся на даваеннай мяжы, змагаліся супраць нямецкіх дыверсантаў. Начальнік упраўлення камендатуры 1-га памежнага ўчастка ў Радашковічах капітан Павел Ломцеў спрабаваў арганізаваць абарону. 25 чэрвеня 1941 года ён разам з памежнікамі выехаў на 2-ю заставу, каб узмоцніць яе гарнізон. У выніку ўдала праведзенай атакі гэты атрад дэблакаваў акружаных немцамі савецкіх памежнікаў. Адыходзячы ў бок Радашковічаў, «вартавыя мяжы» ўступілі ў бой і знішчылі групу нямецкіх дыверсантаў у савецкай вайсковай форме. 26 чэрвеня 1941 года 20-я нямецкая танкавая дывізія захапіла Радашковічы. Атрад капітана Ломцева з баямі вымушаны быў адыходзіць да Заслаўя. Ля вёскі Хмелеўка гэтае падраздзяленне папоўнілася байцамі 3-й заставы пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Топчыя і 26 чэрвеня прарвалося ў Заслаўе, дзе злучылася з падраздзяленнямі 159-га стралковага палка 64-й дывізіі РСЧА. Мужна змагаўся з нацыстамі і гарнізон 5-й заставы пад камандаваннем лейтэнанта Трыгубава. Салдаты ў «зялёных фуражках» абаранялі аўтамабільны мост праз Свіслач ля вёскі Векшыцы. 25 чэрвеня 1941 года памежнікі знішчылі танк і некалькі матацыклістаў праціўніка. Немцы амаль 12 гадзін, пры падтрымцы бамбавікоў, штурмавалі іх пазіцыі. 26 чэрвеня Трыгубаву і яго салдатам удалося вырвацца з акружэння і накіравацца ў бок Заслаўя. На працягу трох дзён з 25 па 28 чэрвеня 1941 года савецкія памежнікі і чырвонаармейцы абаранялі горад Ізяслава, змагаючыся супраць пераўзыходзячых сіл ворага [2, с. 63–64]. Сёння, на старых заслаўскіх могілках, ёсць брацкая магіла савецкіх жаўнераў, якія загінулі ў тых баях. Аднак адмысловай экспазіцыі, прысвечанай даваеннай савецка-польскай мяжы і баям верасня 1939 года, а таксама чэрвеня 1941 года на старой мяжы, няма ні ў адным з беларускіх музеяў.

У сувязі з тым, што гісторыя даваеннага кардона практычна не даследавана ў Беларусі, аўтар артыкула вырашыў распрацаваць уласны турыстычны маршрут, прысвечаны гэтай тэме. У лістападзе 2015 года гісторык Ігар Мельнікаў атрымаў ліцэнзію экскурсавода, якая дае права праводзіць экскурсіі на тэрыторыі Беларусі. Экскурсія «Мяжа была пад Мінскам. 1921–1941 гг.» пачынаецца на чыгуначнай станцыі «Беларусь», у цэнтры Заслаўя. Экскурсанты, якія прыязджаюць з Мінска на чыгуначным ці ўласным транспарце, знаёмяцца з гісторыяй станаўлення савецкай памеженай аховы ўвогуле і 15-га памежнага атрада ў Заслаўі ў прыватнасці. Госці бачаць арыгінальны будынак мытнага склада (пабудаваны ў 1938 г.), будынкі камендатуры і казармы памежнага атрада. Акрамя гэтага, экскурсавод дэманструе фотаздымкі, матэрыялы і артэфакты са сваёй калекцыі. Тут жа ўдзельнікі экскурсіі атрымліваюць прыемныя сувеніры – копіі даваенных пашпартоў розных еўрапейскіх краін з адзнакамі аб дазволе знаходжання ў памежнай

зоне (узору 1930-х гадоў). Нарэшце, турысты атрымліваюць копіі даваенных чыгуначных і аўтобусных квіткоў.

Далей экскурсія рухаецца ў бок касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі, дзе экскурсавод расказвае пра баі ў Заслаўі ў чэрвені 1941 года. Наступным пунктам, які наведваюць экскурсанты, з'яўляецца адзін з ДАКаў Мінскага ўмацаванага раёна, які знаходзіцца непасрэдна ў Заслаўі. Там экскурсавод распавядае пра гісторыю стварэння Мінскага ўмацаванага раёна Чырвонай Арміі, а таксама пра іншыя палявыя ўмацаванні савецкага войска на тэрыторыі БССР на мяжы з Другой Рэччу Паспалітай. Расказ ілюструецца здымкамі, дакументамі і матэрыяламі з багатай калекцыі беларускага гісторыка Ігара Мельнікава.

Далей экскурсія накіроўваецца на старыя могілкі ў Заслаўі. Тут знаходзіцца брацкая магіла савецкіх памежнікаў і чырвонаармейцаў, якія загінулі падчас абароны Заслаўя ад нацыстаў у чэрвені 1941 года. Пасля гэтага экскурсанты накіроўваюцца ў аўтобус і едуць у бок даваеннай савецка-польскай мяжы. Па дарозе яны знаёмяцца з гісторыяй абарончых баёў савецкіх ДАКаў, а таксама памежных застаў на лініі «зоны загароды» ля Заслаўя ў чэрвені 1941 года.

Нарэшце, прыпынак. Але яшчэ на «савецкім баку». Турысты накіроўваюцца ў бок палаца князёў Друцкіх-Любецкіх у вёсцы Новае Поле. Апошнім уладаром гэтай сядзібы быў князь Геранім Друцкі-Любецкі – чалавек багаты і ўплывовы. Аднак Першая сусветная і польска-бальшавіцкая вайна прымусілі гэтую сям'ю з'ехаць з родных мясцін. У 1930-я гады ў палацы была камендатура савецкіх памежных войскаў, а зараз знаходзіцца адзін з карпусоў Аграрна-тэхнічнага каледжа. Пра ўсё гэта, і не толькі, расказвае выстава Ігара Мельнікава «Новае Поле на "мяжы цывілізацый"», якая працуе ў музеі каледжа. Там турысты ўбачаць унікальныя здымкі, матэрыялы і артэфакты з калекцыі Ігара Мельнікава.

Далей экскурсія рухаецца… на мяжу. На трасе Мінск – Гродна аўтобус перасякае лінію даваеннага дзяржаўнага кардона, які ў 1920-я – 1930-я гады аддзяляў БССР ад Другой Рэчы Паспалітай. Сёння гэта адміністратыўная мяжа паміж Мінскім і Валожынскім раёнамі. Нарэшце, сталіца кантрабандыстаў. Экскурсанты накіроўваюцца на каталіцкія могілкі да пахавання князёўны Крысціны Друцкай-Любецкай. Трагедыя гэтай дзяўчыны непасрэдна звязана з польска-савецкай мяжой [4]. Яна адна з тысяч звычайных жыхароў Беларусі, якія вымушаныя былі жыць і паміраць на «мяжы цывілізацый».

Пасля гэтага экскурсія накіроўваецца на плошчу ля касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі Ружанцовай, дзе госці горада на Іслачы знаёмяцца з гісторыяй даваеннага Ракава, а таксама шпацыруюць па вуліцы «8-га са-

кавіка», на якой засталася даваенная брукаванка. Акрамя гэтага, гісторык Ігар Мельнікаў знаёміць турыстаў з гісторыяй падзей 17 верасня 1939 года на сумежных з БССР тэрыторыях. Пасля гэтага турысты сядаюць у аўтобус і праз новую кальцавую дарогу едуць у бок Заслаўя. Перад горадам экскурсія спыняецца і наведвае адзін са знішчаных падчас баёў у чэрвені 1941 года савецкіх ДАКаў. На гэтым экскурсія заканчваецца.

У выніку экскурсанты знаёмяцца не толькі з ключавымі момантамі з гісторыі Заслаўя і Ракава ў 1920–1930-я гады, гісторыяй даваеннай савецка-польскай мяжы, але і атрымліваюць копмлекс ведаў па палітычнай, эканамічнай і культурнай гісторыі Беларусі першай паловы XX стагоддзя. Вялікім плюсам экскурсіі з'яўляецца значная колькасць артэфактаў, здымкаў і матэрыялаў з калекцыі беларускага гісторыка Ігара Мельнікава, якія экскурсавод дэманструе падчас падарожжа. Асаблівасцю з'яўляюцца і сувеніры ў выглядзе копій даваенных пашпартоў розных краін, а таксама аўтобусных і чыгуначных квіткоў 1930-х гадоў.

Несправядлівая мяжа 1921 года стала адным са змрочных эпізодаў беларускай нацыянальнай гісторыі. Шмат пытанняў застаецца і ў дачыненні да «вызваленчага паходу Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 года». Бясспрэчным з'яўляецца тое, што ў яго выніку адбылося ўз'яднанне этнічных беларускіх зямель у адной дзяржаве, з якой нарадзілася Рэспубліка Беларусь. Але не варта забываць і аб ахвярах. Памяць пра тых людзей, незалежна ад іх нацыянальнасці, веравызнання і дзяржаўнай прыналежнасці, павінна жыць з намі, бо з гэтых момантаў і складаецца наша нацыянальная гісторыя. Экскурсія «Мяжа была пад Мінскам. 1921–1941 гг.» якраз і дапамагае захаваць гэтую памяць.

Літаратура

1. Jabłonowski, M. Formacja specjalna. Korpus Ochrony Pogranicza 1924–1939. – Warszawa, 2002/2003.

2. Акалович, Н. М. Стоять насмерть. – Минск, 1975.

3. Заерко, А. Л. Кровавая граница. Книга первая. 1918–1939. – Минск, 2002.

4. Мельнікаў, І. Ахвяра «рыжскай мяжы». Сапраўдная гісторыя трагедыі князёўны Крысціны Друцкай-Любецкай // https://historiapobach.livejournal.com/39948.html. – Рэжым доступу: 24.08.2019.

5. Мельнікаў, І. Мяжа была пад Мінскам // Новы Час. – 27.01.2012. – https://novychas.by/poviaz/mjazha_bila_pad_m_nskam. – Рэжым доступу: 24.08.2019.

6. Мельнікаў, І. Мяжа была пад Мінскам: 1921–1941 гг. – Мінск : Альфа-кніга, 2017.

7. Мельнікаў, І. Мяжа ля Заслаўя: 1921–1941 гг. – Мінск : Галіяфы, 2015.

8. Сборник действующих договоров, соглашений и конвенций, заключённых Р.С.Ф.С.Р. с иностранными государствами. Выпуск I. Действующие договоры, соглашения и конвенции, вступающие в силу по 1-е января 1921 года. – Петраград, 1922.

9. Хомич, С. Территория и государственные границы Беларуси в XX веке: от незавершённой этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo. – Минск : Экономпресс, 2011.

СЯДЗІБА СВЯТАПОЛК-ЧАЦВЯРЦІНСКІХ У ЖАЛУДКУ ЯК ПРЫКЛАД НЕГАТЫЎНАГА СТАЎЛЕННЯ ДА АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Рудакоў Уладзіслаў Алегавіч,
супрацоўнік
установы «Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту»,
аспірант кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,
г. Мінск

Сядзібна-паркавыя комплексы – найбольш выразныя і каштоўныя аб'екты матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Яны адлюстроўваюць быт заможнага насельніцтва Беларусі ў пэўны час, з'яўляюцца сведкамі гістарычных падзей, развіцця айчыннай культуры і мастацтва. Таму, безумоўна, заслугоўваюць пэўнай увагі з боку дзяржавы і маюць патрэбу ў захаванні.

Толькі на Гродзеншчыне да сённяшняга дня ў той ці іншай ступені захавалася больш за 370 помнікаў сядзібна-паркавай і палацавай архітэктуры. Большая частка з іх знаходзіцца ў занядбаным стане і патрабуе аднаўлення. Адным з выхадаў з'яўляецца продаж сядзіб у прыватную ўласнасць, і ў апошнія 10 гадоў такі варыянт актыўна выкарыстоўваецца дзяржавай. Здавалася б, што гэта ідэальны варыянт: дзяржава атрымоўвае грошы і ў той жа час цалкам кантралюе працэс аднаўлення помнікаў, якое выконвае прыватная асоба для далейшага выкарыстання ў асабістых мэтах. Але не заўсёды ўладальнікі свядома падыходзяць да набыцця такой праблемнай нерухомасці, як гісторыка-культурная каштоўнасць. Аднаўленне помнікаў архітэктуры патрабуе вялікай колькасці сродкаў, шматлікіх узгадненняў з Міністэрствам культуры і ператвараецца ў доўгі і складаны працэс, які ў выніку становіцца нецікавым для новых уладальнікаў. Прыкладам можа паслужыць сітуацыя з сядзібна-паркавым комплексам Святаполк-Чацвярцінскіх – гісторыка-культурнай каштоўнасцю 2 катэгорыі, якая знаходзіцца ў г.п. Жалудок Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці [3, с. 249].

З пачатку XVIII ст. Жалудком валодалі прадстаўнікі выдатнага шляхецкага роду Тызенгаўзаў і шэсць пакаленняў вялі тут сваю гаспадарку. Да гэта-

га часу Жалудок належаў і іншым фаміліям, але менавіта Тызенгаўзы сталі першымі, хто стала абжыўся на гэтым месцы. У 1835 годзе дачка Рудольфа Тызенгаўза Германцыя выйшла замуж за Северына Урускага, і землі перайшлі ў валоданне гэтага роду. Але затрымаліся нядолга – дачка Северына і Германцыі Марыя Уруская стала жонкай Уладзіміра Святаполк-Чацвярцінскага, і ў другой палове XIX ст. Жалудок перайшоў да сваіх апошніх уладароў [4].

Акрамя вялікай тэрыторыі, якая ўключала лясы, палі і лугі, Святаполк-Чацвярцінскія сталі гаспадарамі сядзібна-паркавага комплексу. У яго склад уваходзілі парк, закладзены ў другой палове XVIII ст., і некаторыя прысядзібныя пабудовы розных эпох. Самы стары будынак – сядзібны дом Тызенгаўзаў XVIII ст., які таксама называюць «замачкам» з-за падабенства на сярэднявечны гатычны замак. З пачатку XIX ст. засталіся два класіцыстычныя каменныя флігелі, якія, магчыма, былі пачаткам недабудаванай рэзідэнцыі ў падобным стылі. Але вядома, што да пачатку XX ст. як Тызенгаўзы, так і Урускія, і Святаполк-Чацвярцінскія жылі менавіта ў «замачку» [9, с. 470].

Урэшце стары сядзібны дом стаў цесным для сям'і Святаполк-Чацвярцінскіх, таму яны вырашылі пабудаваць новы вялікі палац. У навуковых работах і артыкулах, прысвечаных жалудоцкай сядзібе, беларускія даследчыкі, а таксама вядомы польскі аўтар Р. Афтаназі, згадваюць, што палац быў пабудаваны па праекце вядомага польскага архітэктара Уладзіслава Марконі ў 1907–1908 гг. Аналагічныя звесткі змешчаны ў энцыклапедычным зборніку «Архітэктура Беларусі» [1, с. 210]. Аднак у мемуарах Андрэя Раствароўскага, сына вядомага архітэктара Тадэвуша Раствароўскага, я знайшоў цікавыя звесткі – аўтар, пералічваючы рэалізаваныя праекты свайго бацькі, згадвае: «…Жалудок – Чацвярцінскіх, потым па жаданні гаспадароў Марконі няўдала перарабіў яго» [6, с. 391]. Таму, магчыма, першапачатковы палац быў пабудаваны раней і меў зусім іншы выгляд.

Будынак у тым выглядзе, у якім захаваўся да нашых дзён, пабудаваны ў рысах неабарока. Абодва фасады вылучаюць рызаліты з фігурнымі шатровымі завяршэннямі, парадны ўваход упрыгожвае балкон на чатырох калонах. У дэкоры фасада выкарыстаны і элементы ракако – фігурныя ліштвы, авальныя люкарны, вазы і гірлянды, геральдычная кампазіцыя над уваходным рызалітам. Будынак накрыты мансардавым дахам з невялікімі паўцыркульнымі вокнамі [5, с. 68].

Падчас Першай сусветнай вайны палац разрабавалі як нямецкія, так і рускія войскі. Былі страчаны амаль усе каштоўныя рэчы і творы мастацтва, сабраныя шматлікімі пакаленнямі ўладароў Жалудка. Некаторы час палац выкарыстоўваўся ў якасці нямецкага шпіталя. Пасля завяршэння Першай сусветнай Святаполк-Чацвярцінскія выдзелілі вялікія сродкі на аднаўлен-

не палаца, але да Другой сусветнай будынак так і не быў заселены. Гаспадар і яго сям'я жылі ў адным з флігеляў, куды перамясцілі астатнюю мэблю і каштоўнасці. Усё гэта таксама было страчана ў верасні 1939 г. падчас «вызваленчага паходу Чырвонай Арміі». Апошні ўладальнік сядзібы – Людвіг Святаполк-Чацвярцінскі і яго жонка былі арыштаваны савецкай уладай. Іх вызвалілі толькі дзякуючы заступніцтву італьянскага караля Віктара Эмануэля. Але лёс князя Людвіга склаўся сумна: праз некаторы час немцы адправілі Святаполк-Чацвярцінскага ў Асвенцым, дзе 3 мая 1941 г. ён загінуў [9, с. 472].

Як сядзібу выкарыстоўвалі пасля Другой сусветнай – невядома. З 1960-га па 1983 г. яна належала вайсковай часці супрацьпаветранай абароны. Потым тут знаходзіўся склад ваеннай тэхнікі. Пасля таго, як у 1992 г. вайсковая часць была расфармаваная, маёнтак перадалі Нацыянальнай акадэміі навук, у дэпартамент па сельскай гаспадарцы. Потым сядзібай валодал лідскі завод гарачага цынкавання «Конус». У гэты час тут быў зняты беларускі фільм «Масакра», што значна пашкодзіла палац, бо падчас здымкаў у будынку зладзілі сапраўдны пажар і пафарбавалі сцены [2].

У чэрвені 2014 г. сядзібу ў Жалудку набыла з аўкцыёну сям'я маскоўскіх бізнесоўцаў Гаўрылавых з мэтай адкрыцця буйнога турыстычнага комплексу. Адразу ж было падпісана ахоўнае абавязацельства [7]. Аднак за амаль што 6 гадоў ніякіх прац па рэканструкцыі палаца і прысядзібных будынкаў зроблена не было. За гэты час у сядзібе быў адрэмантаваны КПП на ўваходзе, заменены вароты, некалькі разоў праводзілася чыстка тэрыторыі ад травы і кустоў. Толькі ў пазамінулым годзе быў праведзены аварыйны рэмонт даху, пракладзена сістэма водаадвода ў палацы [8]. Між тым да 2018 г. турысты маглі бесперашкодна трапляць унутр палаца, аднак, па выніках працы адмысловай камісіі, была зроблена адназначная выснова: знаходзіцца ўнутры пабудовы небяспечна, бо яна ў аварыйным стане [1]. З таго часу ў будынку забілі дзверы, нацягнулі стужку, якая забараняе набліжацца да помніка. Райвыканкам падаваў хадайніцтва ў суд, уладальніка сядзібы абавязалі аплаціць штраф у памеры 4 базавых велічынь. Гаўрылавы выплацілі штраф, але сітуацыя не змянілася.

Калі райвыканкам чарговы раз падаў дакументы ў пракуратуру, каб прыцягнуць ўласніка за невыкананне ахоўных абавязацельстваў, гаспадар паведаміў, што ўладальнікам сядзібы цяпер з'яўляецца яго жонка. Як высветлілася, былы ўладальнік заключыў з жонкай шлюбны дагавор, па якім перадаў ёй права валодання сядзібай. А гэта азначае, што ў далейшым гісторыка-культурная каштоўнасць можа быць перададзена і трэцяй асобе.

Вярнуць помнік дзяржава не можа – калі ў 2014 г. сядзібу прадавалі, у дагаворы куплі-продажу не былі дэталёва прапісаны абавязкі новага ўла-

дальніка і абмежаванні па часе ўвядзення ў эксплуатацыю сядзібы, так як здзелка паміж былым і новым уладальнікамі была праведзеная без апавяшчэння мясцовых уладаў. Цяпер справа будзе вырашацца праз суд, райвыканкам паспрабуе вярнуць гісторыка-культурную каштоўнасць і знайсці ёй новага ўладальніка [7].

Сучасны стан захаванасці сядзібы можна назваць крытычным: усе будынкі патрабуюць рэканструкцыі. Але найбольшую занепакоенасць выклікае самы каштоўны і рэпрэзентатыўны помнік – палац Святаполк-Чацвярцінскіх. Існуе шмат праблемаў, звязаных з захаванасцю будынка, паспрабуем вылучыць асноўныя з іх.

Шматлікія трэшчыны па фасадзе. У некаторых месцах прыкладна да 10 см. Эркер з балконам з заходняга боку будынка амаль «адарваўся» ад асноўнага аб'ёму, трэшчыны раскалолі яго на дзве часткі, трымаецца гэты кавалак сцяны на металічных падпорках. Без прыняцця тэрміновых належных мер расколіны могуць прывесці да абвалу сцен.

Страты тынкоўкі. У месцах, найбольш схільных да ўздзеяння вільгаці, масава адвальваецца тынкоўка. Гэта прыводзіць да таго, што цагляная муроўка сцен застаецца без пакрыцця, якое абараняе ад прыродных сіл. Адсюль вынікае наступная праблема.

Дэструкцыя цэглы і выветрыванне швоў. Муроўка, што засталася без пакрыцця, кожны дзень падвяргаецца ўздзеянню ветру, сонца і вады. Наступствамі становяцца выветрыванне швоў, цэглы, а таксама адслойванне і абсыпанне яе паверхні. Пашкоджаная муроўка значна ўплывае на трываласць канструкцыі, таму патрабуе тэрміновай замены.

Стан даху і кроквеннай сістэмы. Працяканне даху з'яўляецца найбольш сур'ёзнай праблемай: праз дах вада трапляе ўнутр памяшканняў, бурыць муры, падлогі, перакрыцці. Нягледзячы на тое, што ў жніўні 2018 г. дах праверылі на працёкі, у неабходных месцах залаталі, а таксама прамачылі кроквы прэпаратамі ад біяразбурэнняў, усе гэтыя меры з'яўляецца часовымі і патрабуюць больш глабальнага ўмяшання: замены кроквеннай сістэмы і непасрэдна самой страхі.

Для таго, каб палац Святаполк-Чацвярцінскіх праз некалькі гадоў не быў безваротна разбураны, усе гэтыя праблемы патрабуюць неадкладнага вырашэння. Так як уладальнік гісторыка-культурнай каштоўнасці не жадае займацца аднаўленнем і ўкладваць у аб'ект асабістыя грошы, трэба ўсімі сіламі намагацца вяртання сядзібы і шукаць новыя варыянты яе адраджэння.

Літаратура

1. Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

2. Дворец в Желудке закрыт для посещений, его могут забрать у владельцев-россиян [Электронный ресурс] // Блог Гродно S13.ru. – Режим доступа: http://s13.ru/archives/211111.

3. Дворец из «Масакры» в Желудке купила за почти 90 тысяч долларов семья из Москвы [Электронный ресурс] // Белорусский портал TUT.BY. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/411659.html.

4. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Минск : БЕЛТА, 2018. – 552 с.

5. Морозова, С. Тизенгаузы и Желудок / С. Морозова // Grafų Tyzenhauzų giminės paveldas. Rokiškis. – 2013. – S. 6–19.

6. Падарожжа па Панямонні / Г. В. Вараб'ева [і інш.] ; уступны артыкул А. В. Клімовіч ; пераклад на англійскую мову: К. А. Швед, М. М. Грэсь, Т. В. Казак ; рэдактары-складальнікі: А. С. Драгайцава, В. М. Царук ; рэдкалегія: Ю. В. Кітурка [і інш.]. – Мінск : Беларускі Дом друку, 2008. – 254 с., іл.

7. Раствароўскі, А. Зямля, якой ужо не ўбачыш / А. Раствароўскі // Ад Лідскіх муроў. Літаратурна-мастацкі зборнік. – 2012–2015. – № 8. – С. 354–393.

8. Усадьбу Святополк-Четвертинских могут снова выставить на продажу? [Электронный ресурс] // Портал «Беларусь Сегодня». – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/kogda-khozyain-ne-barin-usadba-svyatopolk-chetvertinskih.html.

9. Ход хозяйственных и реставрационных работ [Электронный ресурс] // Дворец Святополк-Четвертинских в Желудке. – Режим доступа: http://www.palace-zheludok.com/node/785.

10. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej – Tom 4 / R. Aftanazy. – Warszawa : Ossolińskich, 1993. – 547 s.

ИСТОРИЯ МЕТЕОНАБЛЮДЕНИЙ В ПОЛОЦКЕ

Сверж Светлана Александровна,
ведущий научный сотрудник,
Природно-экологический музей
НИиПУК «Национальный Полоцкий
историко-культурный музея-заповедник»,
г. Полоцк

Первая известная нам летописная запись о погоде в Полоцке восходит к 1092 г. В древнерусских летописях под этим годом описана небывалая жара в крае, когда сами собой возгорались леса, боры и болота, а среди жителей Полоцка наблюдалась страшная эпидемия моровой язвы, или чумы. Такой же мор опустошил полностью город в 1341 г. Под 1348 г. летописец отметил, что зима была сырая, а весна благоприятная, и «того же лета мор бысть на люди в Полоцке» [3].

Иногда экстремальные природные проявления помогали полочанам переносить невзгоды и войны. Так, в 1434 г. в Полоцке во время похода князя Свидригайло на своих соплеменников княжье войско не смогло пройти дальше из-за сильных дождей и было распущено [3].

Влажным летом 1504 г. в Полоцке наблюдались такие сильные туманы во время проведения традиционного летнего кирмаша, что воевода Станислав Глебович вынужден был перенести время кирмаша, на который приплыли по Двине купцы из многих мест [3].

Письменные свидетельства о погодных условиях весны 1517 г. в Полоцке оставил нам австрийский дипломат Сигизмунд Герберштейн, проезжавший через город с посольством в Москву [3].

В 1579 г. дождь в Полоцке шел непрерывно все лето. И с начала августа во время осады города войсками короля Стефана Батория лили такие дожди, что обозы тонули в грязи, лошади гибли, но 29 августа погода прояснилась, засияло солнце и город вскоре был освобожден от русских войск [3].

25 июля 1871 г. при сильном ветре загорелась часть города у кадетского корпуса, и огонь перекинулся на соседние здания, что послужило толчком к принятию решения о прокладке водопровода и устройстве пожарной части в городе. Летом 1892 г. в город пришла холера, а осенью и зимой отмечались эпидемии инфлюэнцы (гриппа), чему немало способствовала непостоянная погода. Зимой от продолжительной оттепели вскрылась Западная Двина [3].

Это лишь некоторые сведения из различных источников о погодных условиях в Полоцке.

А сейчас представлю вам средние климатические характеристики Полоцка:

Среднегодовая температура воздуха: +5,2°С;

Максимальные значения температуры воздуха: +34,3°С (июль 1936)

Минимальные значения температуры воздуха: -39,4°С (январь 1940)

Продолжительность солнечного сияния за год: 1750 часов.

Среднегодовое давление на уровне станции: 998,7 гПа;

Среднегодовая сумма осадков: 662 мм;

Наибольшее количество осадков за сутки: 76 мм (май 1995);

Преобладающее направление ветра: западный, южный и юго-западный;

Средняя скорость ветра: 2,8 м/с;

Максимальная мгновенная скорость ветра: 32 м/с (ноябрь 1969);

Максимальное число дней с грозой за год: 39 (1953);

Среднегодовое число дней со снежным покровом: 117 [9].

История метеорологических наблюдений

Первые инструментальные метеорологические наблюдения в Полоцке были начаты предположительно во второй половине XVIII в. Известно, что

в Полоцком иезуитском коллегиуме, существовавшем с 1580 г., на базе которого в 1812 г. была создана академия, в начале XIX в. имелись более 140 физических приборов, в том числе телескопы, секстанты, квадранты, теодолиты, термометры и барометры. Барометры были изготовлены в Кембридже во второй половине XVIII в. в мастерской известного оптика и механика Питера Долланда. Барометры этой системы были довольно значительных размеров и устанавливались на треножниках. Образцы инструментов Долланда сохранились в музее Вильнюсского университета и в усадьбе «Архангельское» в Подмосковье. Большой стационарный ртутный барометр в Полоцком коллегиуме находился на площадке перед входом в библиотеку с левой стороны от двери, справа размещались часы. Барометр и часы были вделаны в полированные деревянные футляры, что указывает на ценность этих приборов и важное значение, придававшееся метеорологическим наблюдениям.

Регулярные инструментальные метеорологические наблюдения в Полоцке в начале XIX в. стали производиться по указанию Витебской врачебной округи. Известно, что с 1813-го по 1828 г. их проводил уездный штаб-лекарь Медовников. Им наблюдались температура воздуха, давление и направление ветра по термометру и барометру Реомюра, вскрытие и замерзание Западной Двины. В Национальном историческом архиве Беларуси сохранились так называемые «Топографические замечания» о «метеорологическом положении» Полоцкого уезда за период 1813–1822 гг. Вот как Медовников описывал климатические условия 1813 г.: «Зимой погода была переменная, морозы не слишком сильные, степени стужи по термометру Реомюра 10°, а средние 6°. Весной погода была мокрая, холодная. Прозябения (проталины) показались в начале апреля-месяца. Двина вскрылась 22 марта. Лето наступило с 15 мая. Погода была по большей части влажная, жары посредственные, дожди частые. Степени жара по термометру Реомюра 26°, средняя 17°. Осень сказалась с 8 августа, была мокрая, холодная. Ветры дули южные, а временами и западные. Плоды были посредственные» [3].

Начиная с августа 1834 г., проведение наблюдений за погодой было возложено на местные органы полиции. В Полоцке такие наблюдения в течение ряда лет осуществляли полицмейстер Субботин и исправник Ленкевич [3].

В середине XIX в. инструментальные наблюдения производились в Полоцком кадетском корпусе. Об этом свидетельствует тот факт, что в кадетский корпус в этот период поступали экземпляры «Свода метеорологических наблюдений, произведенных в Главной Физической и подчиненных ей обсерваториях», которые рассылались лишь в пункты, производящие метеорологические наблюдения [3].

Можно предположить, что инициаторами проведения таких наблюдений был преподаватель математики корпуса Никифор Иванович Кайгородов,

отец известного русского фенолога Дмитрия Никифоровича Кайгородова, выпускника корпуса 1863 г. Никифор Иванович прослужил в корпусе с момента его создания в 1835 г. и до 1864 г. Выпускником кадетского корпуса был и отец Алексея Ивановича Кайгородова, будущего строителя Белорусской геофизической обсерватории в Минске. Основы практической метеорологии преподавал кадетам с 1871-го по 1885 г. на уроках физики Афанасий Карлович Морель. [3]

Метеорологические наблюдения в Полоцке при Полоцкой учительской семинарии начались в 1885 г. по программе станций III разряда (по количеству наблюдений в сутки). С кратковременными перерывами они продолжались до 1900 года. С декабря 1900 года станция начала работать по программе станций II разряда, т. е. 8 наблюдений в сутки, через 3 часа. Период работы станции: 1885, 1886, 1889, 1891–1900, 1901–1907, 1912–1914 гг. [3]

В январе 1925 г. метеорологические наблюдения начались при железнодорожной станции Полоцк; они продолжались по июнь 1941 г. В июле 1944 г. станция восстановлена в 2,5 км к юго-западу от прежнего положения [3].

В январе 1947 г. начаты наблюдения за продолжительностью солнечного сияния по гелиографу Кэмбэлла [3].

В августе 1949 г. на станции установлен осадкомер Третьякова. В июне 1951 г. установлен флюгер с тяжелой доской на высоте 11,7 м [2].

До января 1953 г. наблюдения за осадками проводились по двум приборам: дождемеру и осадкомеру [2].

В июне 1953 г. установлены почвенно-вытяжные термометры на пяти глубинах [2].

В июне 1955 г. станция перенесена на расстояние 1,5 км к западу от прежнего местоположения, и в сентябре 1956 г. вновь перенесена на расстояние 60 м к северу [2].

10 сентября 1963 г. на станции установлен прибор М-54 для наблюдения за температурой почвы. 22 июня 1965 г. станция перенесена на расстояние 3 км и объединена с авиаметеорологической станцией Полоцк АМСГ (район Аэропорт) на базе аэропорта [2].

Вместо флюгера с тяжелой доской установлен анеморумбометр на высоте 11,5 м [2].

С 1 мая 1970 г. метеорологические наблюдения снова перенесены на гидрологическую станцию. Метеоприборы размещены на прежней метеорологической площадке. Станция продолжает работать по программе станций II разряда [2].

Станционный барометр после переноса установлен на высоте 132,5 м (до переноса – 135,8 м) [2].

С 1 декабря 1956 г. по 19 октября 1970 г. проводились шаропилотные наблюдения для определения высоты облаков. С 20 октября 1970 г. нижняя граница облаков определяется по прибору ИВО (измеритель высоты нижней границы облаков). В ноябре 1960 г. организованы инструментальные наблюдения за метеорологической дальностью видимости в дневное время по прибору М-53А и ночью по прибору М-71. 20 октября 1970 г. для наблюдений за видимостью установлен РДВ. В марте-апреле 1971 г. наблюдение по приборам М-53 и М-71 прекращено. В мае 1961 г. установлен плювиограф для наблюдения за интенсивностью осадков [2].

В августе 1987 г. плювиограф снят с установки [2].

25 марта 1971 г. введена в эксплуатацию автоматическая станция М-106 с датчиками температуры и влажности воздуха, атмосферного давления, жидких осадков, температуры почвы на глубинах 5, 10, 15, 20, 40, 80, 120, 160, 320 см, скорости и направления ветра. В феврале 1975 г. автоматическая станция М-106 прекратила свою работу [2].

В сентябре 1975 г. была задействована автоматическая станция М-106М с тем же набором датчиков, что и станция М-106. В апреле 1985 г. станция М-106М была демонтирована [2].

С июля 1976 г. направление и скорость ветра определяется по автономному анеморумбометру М-63. До 1976 г. в качестве основного ветроизмерительного прибора используется флюгер [2].

1 мая 1991 г. прекращены наблюдения за продолжительностью солнечного сияния, а с 1999 г. – за температурой почвы по коленчатым термометрам [2].

Гидрологическая станция сегодня

Современная Гидрологическая станция Полоцк осуществляет постоянный мониторинг и сбор информации о состоянии окружающей среды западной части Витебской области. Сотрудниками станции проводится комплекс метеорологических, гидрологических, агрометеорологических и специальных наблюдений в Полоцке и на прикрепленных постах. Наземные метеорологические наблюдения проводятся 8 раз в сутки более чем за 40 параметрами: температурой и влажностью воздуха, атмосферным давлением, направлением и скоростью ветра, осадками, дальностью видимости, температурой почвы и другими атмосферными явлениями. Станция входит в состав сети Всемирной Метеорологической Организации (ВМО). Метеорологические наблюдения по станции Полоцк включены в базы климатологических данных, на основе которых проводится изучение и обобщение климата Республики Беларусь, Витебской области и Полоцкого региона. Они используются также для проведения гидрометеорологического обслуживания органов управления и народнохозяйственных организаций.

Метеорологическое обслуживание включает в себя: обеспечение всех заинтересованных организаций и населения фактической информацией, консультациями и справками о средних значениях наблюдавшихся метеорологических элементов за определенные периоды (сутки, месяц, многолетние данные); прогностической информацией, штормовыми предупреждениями и оповещениями, неблагоприятных явлениях погоды: сильных ветрах, сильных осадках, грозах, граде, снежных заносах и метелях, налипаниях мокрого снега на провода, гололеде и гололедице, сильной жаре или сильных морозах, пожарной опасности, резких изменениях погоды и другую специальную информацию [3].

Агрометеорологи станции проводят наблюдения за сельскохозяйственными культурами и воздействием на них различных метеорологических условий, что позволяет установить взаимосвязь погоды с их произрастанием, рекомендовать проведение необходимых агротехнических приемов. В вегетационный период ежедекадно проводятся определения запасов влаги в почве, в зимний период ведутся наблюдения за условиями перезимовки озимых зерновых, трав, плодовых культур. Материалы агрометеорологических наблюдений обобщаются в виде ежедневных, декадных и месячных бюллетеней, справок и докладов, которые передаются в райисполкомы и управления сельского хозяйства [3].

Гидрологи станции ведут наблюдения за состоянием водного бассейна реки Западная Двина и ее многочисленных притоков (Полоты, Начи, Дисны, Дрысы), озера Нещердо. В ведении станции находятся 7 гидрологических постов (6 речных и 1 озерный), расположенных на территории Витебской области от Полоцка до границы с Латвией и Литвой. Производятся наблюдения за уровенным, температурным и ледовым режимами, расходами и химическим составом воды и другие специальные наблюдения. Совместно с Новополоцкой экологической лабараторией отбираются пробы и проводятся анализы воздуха и воды в Полоцком регионе. Данные о режиме и ресурсах поверхностных вод включаются в Государственный Водный Кадастр РБ. Во время паводков специалисты Гидрологической станции оповещают местные органы власти, структуры МЧС о прогнозируемых и фактических уровнях воды, зонах подтопления. [3]

Специалистами ГС Полоцк осуществляется необходимое гидрометеорологическое и специальное обслуживание нескольких десятков организаций Полоцка, Новополоцка, Россонского и Ушачского районов на основе заключенных договоров, в том числе на платной основе [3].

В 2011 году был создан электронный альбом о работе ГС Полоцк, в котором содержится информация о работе специалистов станции по всем направлениям деятельности, приведены фотографии приборов и установок.

Литература

1. Гарохаў, А. К. Полацкі раён / А. К. Гарохаў // Энцыклапедыя прыроды Беларусі: энцыклапедыя ў 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 4. – С. 239.

2. Гидрологическая станция Полоцк, электронный альбом, 2011.

3. Гидрометеорологические наблюдения в Полоцке // Блог Раисы Авчинниковой [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: http://www.geoversum.by/blogs/tapan-m-ka/gidrometeorologicheskie-nablyudenija-v-polocke-1518.html. – Дата доступа: 14.06.2017.

4. Кто расскажет о погоде // Информплюс, 8 декабря 2005, № 49.

5. Они делают погоду // Полацкі веснік, 6 снежня 2005, №№ 188–189.

6. Отчет участника республиканского конкурса на лучшее подразделение, осуществляющее гидрологические наблюдения.

7. Полоцкий район // Республика Беларусь: энциклопедия в 7 т. – Минск, 2008. – Т. 6. – С. 174.

8. Состояние окружающей среды Республики Беларусь: национальный доклад / Министерство природных ресурсов и окружающей среды Республики Беларусь, Гос. науч. учр-е «Инс-т природопользования Нац. академии наук Беларуси»; сост.: М. Л. Амбражевич [и др.]. – Минск : Белтаможсервис, 2010. – 150 с.

9. Справочник по климату Беларуси, вып. 1–6, 1998–2007.

10. Справочник по климату СССР. Вып. 7, 1968, с. 72–74.

11. Стихийные гидрометеорологические явления на территории Беларуси. – Мн., 2002.

12. У природы нет плохой погоды // Химик, 29 ноября 2005.

13. Хто адказны за надвор'е // Звязда, 23 сакавіка 2007.

ПЕШЫЯ ВАНДРОЎКІ ЯК ШЛЯХ ДА ВЫРАШЭННЯ ШЭРАГУ ПРАБЛЕМ СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

Сцяпанаў Віктар Міхайлавіч,
журналіст-фрылансер,
г. Віцебск

Напачатку варта пералічыць тыя праблемы, вырашэнню якіх, як падаецца, можа паспрыяць развіццё пешага турызму ў нашай краіне.

Першым варта згадаць крызіс у падтрыманні належнага стану здароўя насельніцтва, выкліканы распаўсюдам электронных гаджэтаў, гіпадынаміяй, і, як наступства, пашырэннем сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Другі крызіс назіраецца ў арганізацыі адпачынку, і звязаны ён з матэрыяльнымі праблемамі ў вялікай часткі беларускага насельніцтва, асабліва ў рэгіёнах. Пешыя краязнаўчыя вандроўкі могуць стварыць альтэрнатыву

выязному турызму, і нават, прынамсі, у некаторых аспектах, санаторнаму лячэнню, а таксама даюць шанец забеспячэння адпачынку таннага і актыўнага.

Трэці крызіс тычыцца стану мясцовага краязнаўства, у якім пачала адчувацца адсутнасць пераемнасці паміж пакаленнямі. Прыток маладых людзей у шэрагі краязнаўцаў амаль спыніўся, а тыя, хто далучаецца цяпер, выяўляюцца неабазнанымі адносна ўжо зробленага сваімі папярэднікамі (нават жывымі і актыўнымі).

Таму праект мусіць дапамагчы ў колькасным і якасным развіцці краязнаўства, мусіць мець вынікам пераадоленне бар'ера паміж пакаленнямі ў краязнаўстве, прыцягненне маладых людзей да краязнаўства, унясенне ў краязнаўчую дзейнасць новых тэхналогій накаплення, адлюстравання і распаўсюду інфармацыі.

Мэты і задачы

Натуральнай мэтай пешых вандровак ёсць развіццё цікавасці да роднай прыроды, культуры і гісторыі. Трэба спалучыць турызм як спорт з краязнаўствам, тэарэтычным і практычным, гэта значыць у часе вандровак арганізаваць чытанне лекцый, на месцы вывучаць гістарычныя і прыродныя помнікі ды добраўпарадкоўваць іх.

Вандроўкі ствараюць спрыяльныя ўмовы для вывучэння прыродных багацця ў роднага краю, дазваляюць атрымаць уяўленне пра магчымае іх выкарыстанне ў мэтах развіцця мясцовай эканомікі.

Вандроўкі могуць спрыяць экалагічнаму выхаванню, як дзяцей і падлеткаў, так і дарослых, праз практыку прыборкі месцаў грамадскага адпачынку ў наваколлі прыродных аб'ектаў і актыўнай агітацыі за культурныя паводзіны на прыродзе.

Вандроўкі могуць паслужыць справе дэманстрацыі магчымасцяў актыўнага адпачынку і раскрыццю турыстычнага патэнцыялу мясцовых прыродных, архітэктурных, культурных ды гістарычных цікавостак.

Варта спадзявацца, што развіццё мясцовага турызму надасць болей матываванасці барацьбе за захаванне помнікаў гісторыі і культуры, стварэнню і развіццю мясцовых музеяў, барацьбе супраць разрабавання археалагічных помнікаў.

Практычны ўдзел у захаванні прыродных і культурна-гістарычных каштоўнасцяў можа ўключаць добраўпарадкаванне тэрыторыі помнікаў, стварэнне аб'ектаў (напрыклад, пірамідак з каменя), усталяванне інфармацыйных шыльдаў. Таксама магло б ажыццяўляцца стварэнне першаснай інфраструктуры (месцаў для вогнішчаў, намётаў, лавачкі, столікі, альтанкі), добраўпарадкаванне крыніц.

Вандроўкі, звязаныя з наведваннем культавых пабудоў, будуць спрыяць выхаванню канфесійнай талерантнасці.

Урэшце, пешыя вандроўкі могуць дапамагчы стварэнню магчымасцяў для авалодання беларускай мовай у сітуацыі актыўных і нефармальных зносінаў, спрыяць літаратурнай творчасці на роднай мове.

Працягласць, удзельнікі ды змест

Вандроўкі могуць быць як аднадзённыя ці двухдзённыя (так званыя «вандроўкі выхаднога дня»), так і больш працяглыя, прымеркаваныя да дат і падзей.

Удзельнікамі могуць быць жыхары горада розных узроставых катэгорый, з адпаведнымі працягласцю і зместам экскурсій паводле ўзросту, адукацыі і асноўных заняткаў.

Падчас вандровак можна было б вывучаць не толькі гісторыю, але і флору з фаўнай, вучыць выжыванню, першай медыцынскай дапамозе, арыентаванню. Напрыклад, удзельнікі з ліку дарослых могуць у працэсе вандроўкі атрымліваць тэарэтычныя веды пра выжыванне ў прыродзе і першасную медыцынскую дапамогу. Потым гэтыя веды маглі б замацоўвацца падчас практычных заняткаў.

Таксама можа выкладацца інфармацыя пра лекавыя ўласцівасці мясцовых раслін, а таксама спосабы арыентавання ў лесе.

Заўважу, што вельмі прыкра чытаць кожнае лета і восень трагічныя гісторыі гібелі нашых суайчыннікаў у лесе падчас паходаў у грыбы ці ягады, з улікам таго, што беларусы – лясны народ, і мусілі б лёгка знаходзіць у лесе ўсё неабходнае для выжывання.

Прычым гэта можа быць як асноўным зместам вандроўкі, так і дадаткам да асноўнай інфармацыі пра гістарычныя альбо геаграфічныя аб’екты.

Завяршацца вандроўкі маглі б добраўпарадкаваннем гістарычных аб’ектаў, усталяваннем на месцы інфармацыйных стэндаў, вызначэннем каардынатаў для пазначэння на адмысловай электроннай мапе.

Па выніках вандровак можна праводзіць выставы альбо здымаць фільмы. Адзначу тут вельмі карысную ініцыятыву арганізатараў конкурсу аматарскага турыстычнага кіно «Путешествуем по Синеокой».

Адной з праблем і неабходных умоваў развіцця мясцовага турызму з’яўляецца забеспячэнне неабходнага ўзроўню камфорту, асабліва ў выпадку сямейнага адпачынку. Гэтага можна, на маю думку, дасягнуць праз уключэнне ў маршруты аб’ектаў аграгурызму.

Вынікі

Развіццю пешых вандровак можна спрыяць праз адмысловы інтэрнэт-рэсурс, на які можна было б выкладаць гатовыя маршруты, з магчымымі варыяцыямі, з каардынатамі GPS, ды з аўдыяфайламі, тэкстам, фотаздымкамі, відэа. Варта было б забяспечыць магчымасць карыстальнікам дадаваць свае матэрыялы.

Усялякага пашырэння заслугоўвае і такі сучасны сродак інфармавання, як QR-код, які мог бы размяшчацца па шляху вандроўнікаў і такім чынам служыў бы падвышэнню бяспекі вандровак.

Па выніках вандровак распрацаваныя і выпрабаваныя маршруты мусілі б стаць здабыткам грамадскасці праз некалькі варыянтаў арыентавання на мясцовасці, як традыцыйных, так і сучасных:

* з дапамогай праваднікоў;
* з выкарыстаннем традыцыйнай папяровай мапы;
* з выкарыстаннем GPS-навігацыі;
* з выкарыстаннем размешчаных у ключавых пунктах маршрутаў білбордаў з комплексам інфармацыі: выявай мапы з пазначэннем месца размяшчэння білборда; каардынатамі паводле GPS; QR-кодам; тэлефонамі для выкліку праваднікоў і спецыяльных службаў (выратавальнікаў, міліцыі).

Болей інфармацыі можна знайсці на форуме сайта «Глобус Беларуси» ў раздзеле «Вопросы о путешествиях».

УДЗЕЛ КРАЯЗНАЎЧАГА РУХУ Ў ЗАХАВАННІ ПАМЯЦІ АБ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Хворастаў Дзяніс Віктаравіч,
аспірант кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,
г. Мінск

Па меры таго, як Беларусь і суседнія краіны адзначылі стагоддзі пачатку і канца Першай сусветнай вайны, а час згладжвае ўспаміны перажытага, расце патрэба ў папаўненні ведаў і шанаванні памяці аб Вялікай вайне.

Першая сусветная вайна ўскалыхнула ўсё беларускае грамадства, з'яўлялася адным з галоўных каталізатараў для ўзмацнення нацыянальнага руху па ўсёй Еўропе. Але па волі гісторыі памяць аб вайне была выцеснена падзеямі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Для новастворанай улады менавіта яны аб'ектыўна сталі значна большым выпрабаваннем, якія засланілі Сусветную вайну, таму яна і апынулася на перыферыі грамадскай свядомасці свайго часу.

На сённяшні дзень гэта вайна з'яўляецца галоўным аб'ектам і вялікім пластам для дзейнасці краязнаўчага руху, каб актуалізаваць пашану непасрэдных удзельнікаў тых жудасных падзей, а таксама садзейнічаць патрыятычнаму выхаванню і пашырэнню свядомасці аб лёсе тэрыторыі Беларусі

ў ваенна-палітычных канфліктах XX стагоддзя, якія нельга пакінуць у забыцці ў цяперашні час.

Гістарычна склалася, што на розных перыядах развіцця беларускага грамадства, дзейнасць краязнаўчага руху была ў пэўнай карэляцыі з уплывам савецкай ідэалогіі. Так падзеі Першай сусветнай вайны ў многім засталіся «белай плямай» у гісторыі СССР на працягу доўгага часу. Рэвалюцыя 1917 года і грамадзянская вайна як бы запаланілі сабою больш даўнія падзеі, а савецкая ідэалогія не дазваляла аб'ектыўна ацаніць перадумовы, планы і вынікі Першай сусветнай вайны [4, с. 7].

На тэрыторыі Беларусі ўздоўж стабільнай лініі фронту і ў тылавых зонах двух супрацьстаячых армій засталася вялікая колькасць воінскіх пахаванняў і брацкіх магіл расійскіх, нямецкіх і аўстрыйскіх салдат і афіцэраў [1, с. 384].

16 снежня 1919 г. была створана нямецкая гуманітарная грамадская арганізацыя, задачай якой з'яўлялася добраўпарадкаванне і стварэнне новых могілак нямецкіх салдат за межамі Германіі, а таксама збор дадзеных аб нямецкіх воінскіх пахаваннях за мяжой. Арганізацыя атрымала назву «Народны саюз Германіі па доглядзе за ваеннымі пахаваннямі», а яе афіцыйным лозунгам сталі словы «Прымірэнне над магіламі – праца ў імя міру» [5]. На працягу 1920-х гг. гэтая арганізацыя вяла перамовы і ўсталёўвала сувязі з краінамі, на тэрыторыі якіх апынуліся захаванні нямецкіх салдат Першай сусветнай вайны.

Паўнавартасным пачаткам краязнаўчай дзейнасці па напрамку Першай сусветнай вайны трэба лічыць пераход заходяй часткі Беларусі ў склад Польскай дзяржавы. Так у 1921–1939 гг. на яе тэрыторыі паводле дадзеных «Народнага саюза Германіі па доглядзе за ваеннымі пахаваннямі» загінула каля 400 тыс. нямецкіх салдат. Значная частка воінскіх пахаванняў рускай, нямецкай і аўстрыйскай армій апынулася на тэрыторыі Заходняй Беларусі [3, с. 16].

Паводле распараджэння польскага ўраду ад 27 жніўня 1922 г. пытанні па наглядзе за воінскімі пахаваннямі былі ўскладзеныя на Міністэрства грамадскіх работ Польшчы. На тэрыторыі Заходняй Беларусі на ўзроўні ваяводстваў былі створаны акруговыя дырэкцыі грамадскіх работ, а пры іх – адмысловыя сектары воінскіх пахаванняў. Непасрэднай працай па добраўпарадкаванні ваенных могілак і мемарыялаў, акрамя адміністрацыйных структур, займаліся грамадскія арганізацыі, напрыклад, агульнапольскае Таварыства аховы пахаванняў, а таксама парафіі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Паралельна працу па добраўпарадкаванні могілак Першай сусветнай вайны і доглядзе за ваеннымі пахаваннямі вёў «Народны саюз Германіі». Дзейнасць гэтай арганізацыі асабліва актывізавалася ў пачатку 1930-х [3, с. 16].

Такім чынам, у 1921–1939 гг. на землях Заходняй Беларусі намаганнямі польскіх дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, органаў гарадскога

і сельскага самакіравання, рэлігійных структур і мясцовых жыхароў, а таксама нямецкіх арганізацый і грамадзян, праводзіліся маштабныя работы па захаванні і добраўпарадкаванні воінскіх пахаванняў і мемарыялаў Першай сусветнай вайны незалежна ад дзяржаўнай прыналежнасці загінулых.

Калі ў Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы, працэсы мемарыялізацыі былі спалучаныя з данінай памяці загінулым, то ў Савецкім Саюзе зварот да мінулай вайны падпарадкоўваўся толькі прапагандысцка-ідэалагічным матывам і краязнаўчага руху там не існавала. У выніку, мерапрыемствы, праведзеныя ў перыяд з 1920 па 1939 г. у рамках міжнароднай кампаніі па ўладкаванні воінскіх могілак Першай сусветнай вайны, Савецкай дзяржавы не закранулі. Тым больш падзеі наступнай – Другой сусветнай вайны, надоўга адкінулі і так слабую памяць аб Першай вайне ад увагі насельніцтва і дзяржаўнай улады.

Выключэнні складаюць невялікая колькасць брацкіх магіл расійскіх салдат, на якіх былі ўстаноўлены невялічкія помнікі, альбо памятныя знакі – у вёсцы Нягневічы Навагрудскага раёна, Камары і Мядведзіна Вілейскага раёна, Скробава Баранавіцкага, Брусы, Чарэмшыцы Мядзельскага, Сташаны Пінскага і інш. [6, с. 130] А што датычыцца ўсходняй часткі БССР, то пераважная большасць пахаванняў, якія знаходзіліся ў тылавой зоне рускіх войск, да нашых дзён не захаваліся. Частка іх была знішчана ў працэсе будаўнічай і іншай гаспадарчай дзейнасці, а могілкі, якія размяшчаліся ў лясах і палях, з цягам часу зраўняліся з навакольным ландшафтам [8, с. 19]. Лакалізаваць іх магчыма толькі з дапамогай архіўных крыніц.

Новы перыяд, звязаны з аднаўленнем краязнаўчага руху па напрамку Першай сусветнай вайны, на тэрыторыі рэспублікі пачаўся з канца 1980-х, калі праца ў даным напрамку стала больш актыўнай. Варта адзначыць, што ініцыятыва зыходзіла ў асноўным ад прыватных асоб і рэдка ад мясцовых арганізацый [1, с. 384].

Асобна неабходна згадаць Вілейскі раён, дзе вядомы беларускі краязнавец і мастак Барыс Цітовіч ужо шмат гадоў працуе над стварэннем у рэгіёне мемарыяльнага комплексу – своеасаблівага музея пад адкрытым небам, які прысвечаны Першай сусветнай вайне. Па яго ініцыятыве адноўлены лазарэтныя могілкі расійскіх салдат каля вёскі Забродзе. Прыведзена ў парадак пахаванне ў вёсцы Жарсцвянка, у 2003 г. пастаўлены вялікі помнік-крыж на месцы былых могілак у вёсцы Рускае Сяло і інш.

Згодна з даследаваннем А. В. Шаркова «Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси» на 2010 г. на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь знаходзіцца 249 воінскіх пахаванняў гэтага перыяду [7].

Немалая колькасць помнікаў, пачынаючы з сярэдзіны 1990-х гг., адноўлены і ўладкаваны «Народным саюзам Германіі па доглядзе за ваеннымі па-

хаваннямі». Таксама адносная большасць догляду праводзіцца мясцовымі краязнаўцамі і адміністрацыяй, прычым амаль палова помнікаў добраўпарадкавана, там пастаўлены альбо адноўлены памятныя знакі. Існуе частка пахаванняў, якія знаходзяцца ў здавальняючым стане, хоць рэгулярнага догляду за імі не назіраецца [2, с 675].

У савецкі перыяд не існавала работ па ўвекавечанні памяці мясцін і ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны на беларускіх землях. У айчыннай гістарыяграфіі дадзены напрамак з'яўляецца новым, ён распрацоўваецца сучаснымі краязнаўцамі дастаткова актыўна. Гэта праблема была адлюстравана ў публікацыях акадэмікаў і краязнаўцаў В. В. Шумскага, В. А. Багданава, А. В. Шаркова, Б. Б. Цітовіча, В. Н. Лігуты і інш.

Дастойным укладам для візуальнага ўспрыняцця падзей Першай сусветнай вайны стала выданне краязнаўцам У. Ліхадзедавым кнігі «Беларусь праз фотааб'ектыў нямецкага салдата. 1915–1918 гг.», якое змяшчае рэпрадукцыі каля чатырох з паловай сотняў нямецкіх фотаздымкаў перыяду вайны з асобным раздзелам «Памяць», дзе прадстаўлены ўнікальныя фотаздымкі як рускіх, так і нямецкіх і аўстрыйскіх пахаванняў Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Важнымі крокамі на шляху да адраджэння памяці аб Першай сусветнай вайне і актуалізацыі некаторых праблем яе гісторыі сталі навукова-краязнаўчыя канферэнцыі «Падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі ў дакументах беларускіх архіваў», «Першая і Другая сусветныя войны: акупацыя і яе наступствы на Беларусі» і «Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць», праведзеныя ў 2005 і 2007 гг. Вялікім укладам па ўвекавечванні памяці аб Першай сусветнай вайне з'яўляюцца выставы ў Нацыянальным гістарычным музеі і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, што былі арганізаваны з дапамогай вядомых краязнаўцаў Б. Цітовіча і У. Ліхадзедава.

Такім чынам, краязнаўчы рух выконвае галоўную ролю ў захаванні памяці аб Першай сусветнай вайне, якая напрамую залежыць ад ступені азнаёмленасці насельніцтва ў дадзеным напрамку. Але зацікавіць насельніцтва даволі складана, аднак магчыма, калі задзейнічаць не толькі краязнаўчыя, але і дзяржаўныя структуры. Калі дзяржава накіруе ўвагу на глабальнае пераасэнсаванне падзей Першай сусветнай вайны, то можна чакаць толькі станоўчыя зрухі ў развіцці вывучаемага накірунку. У будучыні, магчыма, з'явіцца наогул адзіная канцэпцыя аб ролі беларускага насельніцтва ў ваенных канфліктах XX стагоддзя, што значна пашырыць светапогляд сучаснай супольнасці і не будзе такога вялікага разбегу ў аксеалагічным сэнсе паміж Першай і Другой сусветнай вайной, таму што любыя страты і змаганні Беларусі вартыя агульнай увагі.

Літаратура

1. Белявина, В. Н. Беларусь в годы Первой мировой войны / В. Н. Белявина. – Минск : Беларусь, 2013. – 398 с.: ил.

2. Богданов, В. А. Воинские захоронения Первой мировой войны на территории Беларуси: современное состояние / В. А. Богданов // Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць. Мат-лы міжнар. нав.-практ. канф. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2009. – С. 666–678.

3. Вабішчэвіч, А. М. Стан і захаванне воінскіх пахаванняў Першай сусветнай вайны ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / А. М. Вабішчэвіч // Беларускі гістарычны часопіс, 2014. – № 9. – С. 15–22.

4. История войн XX века в памятниках их участников: Каталог / Сост. Суздальцев Е. В., Некрылова И. Б., Никитина Н. М., Тимонен Л. В. – М. : НИИЦентр, 2009. – 400 с.: ил.

5. Народный союз Германии по уходу за военными могилами. Краткая информация. [Электронный ресурс]: // Volksbund Deutsche Kriegsgräberfürsorge e.V. – URL: http://www.volksbund.de/ru/volksbund.html. – Дата доступу: 17.02.2020.

6. Последний приют солдата = Letzte Ruhestätte für die Soldaten / А. В. Шарков [и др.]. – Минск : Звязда, 2014. – 208 с.: ил.

7. Шарков А. В. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси = Soldatengraberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus. – Минск : НАРБ, 2010. – 188 с.

8. Шумский В. В. Некоторые уроки Первой мировой войны. Воинские захоронения периода Первой мировой войны на территории Республики Беларусь / В. В. Шумский // Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць. Мат-лы міжнар. нав.-практ. канф. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2009. – С. 121–146.

КОПЫЛЬЩИНА ТУРИСТИЧЕСКАЯ

Шуракова Валентина Леонидовна,
директор
ГУ «Копыльский районный краеведческий музей»,
г. Копыль

К Году малой родины ГУ «Копыльский районный краеведческий музей» был запущен проект «Копыльщина туристическая». Сегодня это путеводитель для каждого, кто посещает наш район. Люди путешествовали всегда и во все времена, выделяя наиболее интересные и значимые для себя места, но не задумываясь, что как раз они формировали устойчивое мнение о привлекательности того или иного региона, музея, достопримечательности. Впоследствии появилось слово «бренд», и оно стало применимо к интерес-

ным местам, объектам показа, музеям. Неудивительно, что говоря о Красном костёле, мы сразу вспоминаем Минск, а те, кто «в теме» и Савичи. При первом упоминании о Кудиновичах думаем о невыдуманной истории о камне-следовике и его лечебной силе. Считается, что бренды – это образные представления, сохраненные в памяти заинтересованных лиц или групп, которые определяют поведение потребителей при выборе продуктов или услуг. Бренд территории – это своего рода знак качества, отличительная особенность, которая даёт людям понять, что интересного, важного и полезного можно увидеть на отдельно взятой территории. А музейный туризм – это разновидность туризма, специфика которого заключается в использовании туристского потенциала музеев и прилегающей к ним территории. Музейный туризм вкупе с понятием «бренд территории» даёт качественную оценку достопримечательностям в целом. Связывание вещей, представленных в экспозиции музея с объектами на территории района даёт возможность человеку поехать и вживую увидеть городище, курганы, усадьбы, храмы, камни… При этом особенно важно сюжетно – мифологическое наполнение пространства. Бренды, конечно, необходимо продвигать, но сначала их нужно находить и даже придумывать. Вот увидит турист в музее выставку «Копыльско-Клецкий строй», но ничего не узнает про Центр ткачества в Семежеве, который как раз ему возможно и был интересен. Вот так во внешнем мире будет формироваться репутация города и района, имеющего свои корни, традиции, культурное своеобразие, свой особенный характер, а эти качества являются непременными составляющими не только благополучия жителей, но и благоприятного инвестиционного климата.

В Год малой родины с проектом «Копыльщина туристическая» мы отправились в путешествие по нашему городу Копылю и району, в отдаленные его уголки для знакомства с культурой, бытом, достопримечательностями, традициями, природой. Наш проект проходил под пристальным взглядом всех неравнодушных людей, любящих и знающих свою малую родину. Если мы что-то не знали, пропускали, нас дополняли. Вообще всех маршрутов, реализуемых музеем, 16. Мне хотелось бы остановиться на нескольких, чтобы показать их результативность. Одним из них является проект «Катастрофа и память о ней», который раскрывает причастность Копыля к еврейской культуре.

Для развития Копыльского региона важное значение имели жители еврейского происхождения. До Второй Мировой войны евреи составляли 60% всего населения. К сожалению, война принесла трагический конец существования этой части населения. Сегодня по следам евреев ведёт маршрут еврейского наследия. На этой трассе находится немало историко-культурных объектов, связанных с историей еврейской общественности, объединённых

в проект «Катастрофа и память о ней», который реализуется с 2009 года по настоящее время: бывший синагогальный двор; место размещения гетто и памятный знак, установленный на этом месте; мемориальная доска классику еврейской литературы Менделе Мойхер-Сфориму, установленная музеем; городская усадьба Л. М. Клейнбота, автора книги «Молодая Белоруссия»; здание бывшей еврейской школы; могила командира семейного еврейского партизанского отряда Л. М. Гильчика; могила расстрелянных узников гетто (2965 человек); место расстрела узников гетто; коллекция картин (200 полотен) П. И. Розина – заслуженного художника РСФСР, чьи родственники погибли в гетто; старое еврейское кладбище с сохранившимися мацевами XIX века, где музеем установлен камень – валун и информационная доска на трех языках; аллея Героев с портретом Героя Социалистического Труда А. Л. Нахмановича (дополненного музеем), семья которого была репрессирована и проживает в Казахстане; здание музея, в котором в начале XIX века располагалась кожевенная мастерская Шолома Рабиновича. Целью проекта стало изучение истории еврейского населения местечка Копыль конца XIX – начала XX вв. и темы Холокоста на территории Копыльского района в годы Второй Мировой войны. В результате в 2009 г. в музее создана экспозиция «Трагедия и подвиг. Век XX»; в 2010 гг. музеем издана брошюра «Навекі постаць сваю захаваушыя» в рамках проекта «Вклад в мировую культуру уроженцев Копыльщины, эмигрировавших в начале XX века», реализованного при поддержке Представительства зарегистрированного общества ФРГ в РБ, куда вошло имя Марвина Духова, автора музыкального произведения «Три песни о Холокосте», родители которого эмигрировали в США; сотрудники музея участвовали в международных конференциях: Новогрудок (2011), Минск (2014), Копыль (2015), Николаев (2017). В 2013 г. и в 2017 г. сотрудники музея были приглашены для обучения в Яд Вашем в Иерусалиме. В 2015 г. в результате поисковой работы было установлено имя двенадцатого Героя Социалистического труда Льва Нахмановича, чей портрет появился на Аллее Героев. Одним из самых важных результатов работы остается увековечивание памяти и благоустройство мест захоронения узников гетто. В июне 2010 г. в Копыле состоялось открытие отреставрированного памятного знака с нанесением надписи на трех языках: «Ахвярам нацызму. Тут у 1942 годзе былі зверскі закатаваны 2965 яўрэяў Капыльскага гета». Открытие прошло с участием посольств Израиля, США, Германии. В 2014–2015 гг. у памятного знака установлены информационные доски с именами погибших семей Каплан и Менхус, чьи родственники проживают в России, Кыргызстане и США. В 2018 г. КУП «Копыльский РСУ» благоустроен подъезд к могиле расстрелянных узников гетто со стороны зоны отдыха. В 2020 г. планируется благоустройство пешеходной дорожки к захоронению со сторо-

ны озера. В 2019 г. районным музеем совместно с Леонидом Смиловицким, доктором исторических наук, старшим научным сотрудником Тель-Авивского университета, изучающим историю евреев Беларуси, обследованы все старые еврейские кладбища района. Апробацию экскурсионно-туристического маршрута «История еврейского населения на Копыльщине» прошла Анжела Миндел, генеральный менеджер центра Холокост в Израиле. Проект «Катастрофа и память о ней…» был представлен на III Музейном форуме в Могилеве в 2016 г. в номинации «Лучшее представление музея в экспозиции форума». В 2018 г. открыта мемориальная доска классику еврейской литературы Менделе Мойхер-Сфориму. В 2019 г. установлен камень-валун и открыта информационная доска на трех языках на старом еврейском кладбище в г. Копыле.

Реализация проекта не завершена. Именно сейчас, когда прошло более полувека после Холокоста, когда мир так напряжен, так наэлектризован и агрессивен, гибнут люди – уроки Холокоста актуальны. Сегодня мир содрогается от глобальной ненависти, перед которой все заповеди, все постулаты человеческого сосуществования – ничто. Благодаря проекту и туристической привлекательности города в последние годы вырос поток туристов из ближнего и дальнего зарубежья на Копыльскую землю, к истокам своих предков. Это ностальгический туризм. К примеру, в 2019 г. Копыль посетила семья Шеймовичей из Флориды, семьи Пласе и Сигалович из Нью-Йорка, семья Фридман из Лос-Анджелеса с целью поиска родных. Книга «Память. Копыльский район» показала, что кто-то из оставшихся их родственников были расстреляны в гетто, судьба же других неизвестна. В музее гости оставили фото, привезенные из Америки, фото тех, кто жил здесь 100 лет назад и создавал историю города. У нас появились фотографии с видами старого Копыля, которого теперь нет. Так семья Розиных приехала из Израиля увидеть только город, где родился их дед, а нашла целый комплекс материала о нём в музее и увидела более чем 200 полотен кисти своего деда. Так стала проторенной дорогой дорога в Копыль на многие годы для эмигрировавших из семьи Розиных. Семья Нахмановичей из Казахстана познакомила Копыль с двенадцатым Героем Социалистического труда – их дедом. И сразу на Аллее Героев появился его портрет. «МЕККА» – так назвал наш Копыль профессор из Израиля, Израиль Бартер, посетивший город 16 августа 2017 года. Так формируется Память. На территории района находится 15 фрагментов усадебно-парковых комплексов, о чем и повествует маршрут «По бывшим усадьбам и паркам». К примеру, историко-культурный объект: «Фрагменты бывшей усадьбы» в Бобовне – усадьба известна со вт. пол. XVI века. С 1823 г. принадлежала Наркевичам-Иодкам. Сегодня потомки рода со всего мира приезжают к нам для проведения здесь конференций по научным открытиям,

к примеру, Якуба – электрического человека. Несколько лет назад была обнаружена надмогильная плита Томаша Наркевича-Иодко – владельца усадьбы «Пуково». В 2020 г. планируется новая встреча потомков рода, будет установлен камень валун с плитой на месте когда-то стоявшей каплицы, где и был похоронен Томаш. Таким образом, идет привлечение туристов, обратная взаимосвязь и обозначение историко-культурных объектов.

Посещаем и привлекателен туристический маршрут «По местам религии». В нач. XX века разнообразие религий на Копыльщине было представлено православными и католическими храмами, еврейскими синагогами и мусульманскими мечетями. Сегодня из духовного наследия их осталось немного. Маршрут ведет по всему району, где можно увидеть церкви, костел, старые еврейские и мусульманские кладбища, гору крестов, камни-следовики, камни с символами иудаизма, ислама, православия. Одним из пунктов остановки является д. Кудиновичи, где на кладбище лежит большой камень известный в народе как «Божий следок». На ровной поверхности камня высотой один метр виден отпечаток человеческой ступни длиной 25 см. Ниже под следом высечен в технике плоского рельефа крест, а сбоку сделано конусоподобное углубление, где собирается вода. Среди местного населения этот каменьпочитается и сегодня. На праздник Св. Роха сюда приносят пожертвования. А вода, что собирается в ямке, считается лечебной и лечит болезни глаз. Этот камень притягивает много посетителей, хотя добраться туда и не так легко. Почитаема и гора крестов около д. Харитоновка. История этого места очень богатая, чем-то схожая с историей места в городе-побратиме Йонишкис (Литва). Люди несли сюда свои кресты по случаю важнейших событий в их жизни и обращались с различными просьбами. Эта гора уничтожалась несколько раз и опять возрождалась. Сюда мы заново проложили тропу, сюда потянулись туристы.

У учащихся школ востребован маршрут «Тропами мужества», который включает посещение места партизанского боя в д. Лавы, партизанских землянок, памятника погибшим в бою, дота, рассказ у костра и партизанскую кашу, встречу с настоятелем Троицкого храма в д. Телядовичи и его благословление. Сегодня существует издание «Копыльщина туристическая», проект публиковала районная газета, с ним можно познакомиться на сайте музея, на сайте Копыльского райисполкома.

ДЗІКАРОСЛЫЯ РАСЛІНЫ Ў КУПАЛЬСКАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ: СІМВАЛІЧНЫ СТАТУС І РЫТУАЛЬНЫЯ ФУНКЦЫІ

Бабкова Ганна Уладзіміраўна,
студэнтка
УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»,
г. Наваполацк

Купалле – адно з самых значных свят беларускага народнага календара. Прымеркаванае да летняга сонцастаяння, яно з'яўляецца кульмінацыяй усяго гадавога земляробчага кола. Гэты час лічыцца кропкай найвышэйшага росквіту жыватворных сіл зямлі. Менавіта таму ў купальскіх рытуалах актыўна выкарыстоўваюцца і ўшаноўваюцца разнастайныя дзікаслыя расліны, якія ў гэты час надзяляюцца надзвычайнай сілай.

Даследаванне расліннага кода ў сістэме традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння з'яўляецца адным з напрамкаў этнаграфічнага краязнаўства ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. Аналіз апублікаваных фальклорна-этнаграфічных крыніц і матэрыялаў палявых даследаванняў дазваляе вызначыць сімвалічны статус і рытуальныя функцыі дзікаслых раслін у сцэнарыі купальскага рытуалу Паўночнай Беларусі.

Абрадавыя дзеянні з ужываннем купальскіх зёлак вельмі пралангіраваныя па часе і выходзяць за рамкі ўласна Купалля. Трэба адзначыць, што сам працэс збору зёлак напярэдадні свята меў свае асаблівасці. Як адзначаў Е. Раманаў, падчас збору зёлак «абавязкова спяваюць купальскія песні, бо іначай кветкі не будуць мець гаючае сілы, нават пасля асвячэння іх у царкве» [5, с. 211–212]. Гэта падкрэслівае архаічныя асновы купальскай абраднасці і, у прыватнасці, высокі сімвалічны статус «купальскіх зёлак» у беларускай традыцыйнай культуры.

Адкрытым застаецца пытанне, якія менавіта расліны збіралі на Купалле. Як адзначаюць этнолагі Полацкага ўніверсітэта, «сучасныя палявыя даследаванні паказваюць, што «рэестр» купальскіх зёлак у народнай традыцыі не з'яўляецца строга вызначаным» [2, с. 27]. Калі гаворка ідзе пра збор зёлак, значная частка інфармантаў паведамляе аб зборы ўвогуле ўсіх зёлак, што дасягаюць росквіту ў гэты час. Аднак існуе шэраг найбольш часта фігуруючых раслін, які ўключае ў сябе *купалку, святаяннік, васілёк, мар'яннік, рамонак* і *мацярдушку*. З гэтага пераліку можна асобна вылучыць святаяннік і купалку, як расліны, назвы якіх ёсць вытворнымі ад назвы каляндарнага абраду, што вызначае іх як абавязковы атрыбут рытуалу. Такім чынам, можна лічыць, што цудадзейная сіла купальскага букета абумоўлена менавіта часам збору, рытуальным канктэкстам, а не асаблівымі ўласцівасцямі асобна ўзятых раслін.

Існуе пэўная спецыфіка і ў абрадавым выкарыстанні дзікаросłых зёлак. Значная частка раслін ёсць функцыянальнай ужо ў рамках Купалля. У першую чаргу, гэта расліны, якім прыпісваліся моцныя апатрапейныя якасці. Купалле лічылася часам, калі актывізавалася «нячыстая сіла»: чараўнікі, ведзьмы, русалкі, якія імкнуліся пашкодзіць здароўю і дабрабыту чалавека. Таму вялікая ўвага надавалася менавіта засцерагальна-ахоўным абрадавым дзеянням.

У якасці апатрапея на тэрыторыі Падзвіння актыўна ўжываліся *крапіва* і *дзядоўнік*. Менавіта гэтыя расліны выкарыстоўваліся для аховы хатняй жывёлы ад шкоднага ўздзеяння чараўнікоў і «малочных ведзьмаў». Крапіву і калючы «дзед» клалі на парозе ці вешалі на сцены хлявоў. Апатрапейныя якасці гэтых зёлак хутчэй за ўсе заснаваны на іх рэальных «агрэсіўных» біялагічных асаблівасцях. «Дзед вот есць, калючы, расцет такі калючы. Вот, тут раней многа было. Калючы, калючы гэты быў дзед … дык гэтага дзеда калючага вешалі на ноч у хлеве, за дзвярмі. Гэта была ўжо зашчыта ад чарадзея гэтага дзеда калючага»[1]; «Могут сурочыць, і скаціна ёсьць, што скаціна можыць і здохнуць … Нада каля хлева на Купалку абкладаць крапівай-жыгучкай…» [3, с. 298].

Як апатрапей таксама выкарыстоўваліся вянкі з купальскіх зёлак. Вянок у купальскай абраднасці беларусаў увогуле з'яўлялся вельмі важным элементам, які сумяшчаў у сябе як медыятыўную, так і ахоўную функцыі. На Падзвінні зафіксаваны звесткі аб кветках, вянок з якіх засцерагаў ад шкоднага ўздзеяння русалкі на чалавека. Цікавасць у тым, што гэтыя кветкі вырошчвалі самі русалкі. «Вот на Івана хадзілі збіралі цвяты купалінка. Эта ж русалка іх ужо садзіла, вянкі вілі з іх. Яна тады тога чалавека абіжаць ня бу-

[1] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФАПДУ): Зап. у 2010 г. Аўсейчык У. Я. ад Пілімон Галіны Іосіфаўны, 1935 г.н. у в. Шо Глыбоцкага р-на.

дзець, хто вянкі [віець], хто пачытаець яе» [4, с. 83–84]. Ахоўнае ўздзеянне купальскага вянка распаўсюджвалася не толькі на чалавека, але і на жывёліну. На поўначы рэгіёну, у Верхнядзвінскім і Расонскім раёнах, плялі вянкі для хатняй жывёлы: «Перад Купалам дзяўчаты цвятоў разных насабіраюць па полю і вянкі плялі, а патом гэты вянок карові на рогі адзявалі, толька сваёй, так убіралі кароў» [1, с. 208].

Неад'емнай часткай купальскай абраднасці на ўсёй тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў з'яўлялася варажба. Сярод шэрагу купальскіх варожбаў існавалі такія, дзе выкарыстоўваліся менавіта зёлкі. Варажылі як на шлюб, так і на здароўе і дабрабыт кожнага з сямейнікаў. Адной з такіх варожбаў было пляценне дзяўчатамі вянкоў з купальскіх зёлак, якія потым кідалі на ваду, каб даведацца пра будучы шлюб. «*На Купалле плялі вянкі дзяўчаты: адзін вялікі, другі маленькі. Пускалі ў дваннаццаць гадзін ночы. Малеткі (гэта задуманы хлопец) павінен быў падплыць пад вялікі (дзяўчыны). Калі падплыве – выйдзе за гэтага хлопца замуж*»[2]. Таксама даведацца пра шлюб дапамагала зёлка «багатырка», якую ўторквалі ў сцяну хаты і чакалі, чыя кветка распусціцца першая – тая дзяўчына і пойдзе замуж. «*Ну сабіралі цвяточкі разныя. Такія былі багатыркі, прынасілі, торкалі ў хаце, перад Купалам, перад Янам. А тады каторая, эта самае. Дзеўка, як распусціцца (кветка) замуж скора пойдзець. Варажба такая была*»[3].

Падобным чынам варажылі пра здароўе і будучы лёс кожнага члена сям'і: «*Беленькая, распушыцца, як адуванчык… Ну дык вот прынасілі ўжо ў дом на гэта перад Купалай і торкалі ў сцяну. На кажнага члена сям'і гэтую купалачку. І чыя расцвіцець лепей – даўжэй жыць будуць*». – «А калі наадварот засохне?» – «*Ну, вродзе, ужо гэта к смерці*»[4].

Акрамя зёлак, што выкарыстоўваліся падчас Купалля, вялікая колькасць раслін захоўвалася і ўжывалася на працягу ўсяго года. Але гэтаму папярэднічала выкананне пэўных умоў. На наступны дзень пасля Купалля зёлкі неслі асвячаць у храм, што яшчэ больш узмацняла іх сакральны статус. «*Ну, сабіралі, казалі на Яна нада насабіраць. А тады няслі гэтыя кветкі ў цэркву і свенцілі*»[5]. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца захоўванне купальскіх зёлак менавіта на покуці за абразамі. «Гэтыя зёлкі ўсягды саблюдаем, дзяржым, і цяпер у меня за абразом ёсць, ну яны высахнуць, каб нігдзе не валяліся, я па-

[2] ФАПДУ: Зап. у 1999 г. Шухлеў К. ад Жарнасек Надзеі Іванаўны 1929 г.н. у в. Каз'яны Ушацкага р-на.

[3] ФАПДУ: Зап. у 2012 г. Аўсейчыкам У. Я. ад Карнацэвіча Анатоля Уладзіміравіча, 1931 г.н. у в. Верацеі Пастаўскага р-на.

[4] ФАПДУ: Зап. у 2010 г. Аўсейчык У. Я. ад Пілімон Галіны Іосіфаўны, 1935 г.н. у в. Шо Глыбоцкага р-на.

[5] ФАПДУ: Зап. у 2012 г. Аўсейчык У. Я. ад Зубовіч Валянціны Уладзіміраўны, 1933 г.н. у в. Лапішкі Глыбоцкага р-на.

лажу за святы абраз…»[6]. Такім чынам, асвячэнне купальскіх зёлак у храме падвышала іх сакральны статус у традыцыйнай карціне свету беларусаў.

Расліны, нарыхтаваныя ў часе Купалля актыўна выкарыстоўваліся ў сістэме народнай медыцыны. «*Калі хто захварэе, гаспадыня бярэ з бажніцы жменю іванаўскай травы, раздзьмухвае вуголле на засланцы ці ў чарапку, моліцца Богу і святому Івану і абкурвае хворага*» [2, с. 27–28].

Таксама асвечаныя зёлкі выкарыстоўвалі ў якасці апатрапея. Іх падпальвалі, каб адвесці чары, дурное вока і нават навальніцу. «*Гэтай жа травою абкурваюць дом, хлявы, свірны і іншыя пабудовы, калі ў доме пабудзе чалавек з дурным вокам ці ведзьма або вядзьмар*» [2, с. 27–28]; «А ад чаго гэтыя зёлкі? Памагаюць можа?» – «*Вот находзіць туча, граза, вот гэтыя зёлачкі возьмеш, запаліш, пожыгнаешся, ну вот гэтак даўней было*»[7].

Калі частка купальскіх зёлак заставалася нявыкарыстанай да наступнага Купалля, то іх ні ў якім разе не выкідалі, як простае смецце. «*Все сжыгаецца. Старынное все сжыгаецца. А бросаць под ногі нельзя*»[8]. Падкрэсленая абавязковасць менавіта спальвання зёлак яшчэ раз пацвярджае паважнае стаўленне да іх чалавека і наяўнасць высокага сакральнага статуса ў традыцыйнай карціне свету беларусаў.

Палявыя даследаванні паказваюць істотныя змены ў рытуальным выкарыстанні зёлак у часе Купалля. Напрыклад, крапіва і дзядоўнік як магічныя абярэгі ад ведзьмаў-малочніц практычна не выкарыстоўваюцца, бо пагалоўе хатняй жывёлы ў сучаснай вёсцы істотным чынам скараціласа. То бок паступова знікае сам аб'ект ахоўвання. Таксама змяняецца рэестр купальскіх зёлак, пераважная роля надаецца культурным раслінам, садовым кветкам замест дзікарослых. Асвячаць у храме нясуць пераважна букеты з уласных палісаднікаў. Гэта звязана з тым, што для пажылога пакалення, якое лічыць працэдуру асвячэння кветак абавязковай, значна прасцей сабраць кветкі каля дома.

Такім чынам, сучасныя палявыя даследаванні паказваюць, што дзікарослыя расліны ў рамках купальскай абраднасці беларусаў Падзвіння выконвалі апатрапейную, лекавую і медыятыўную функцыі і з'яўляліся неад'емным атрыбутам каляндарнага рытуалу. З цягам часу адбыліся істотныя змены ў абрадавых дзеяннях, звязаных з купальскімі зёлкамі, але менавіта гэтая трансфармацыі сведчыць аб жыццяздольнасці традыцыі, якая мадыфікуецца і рэагуе на сацыякультурныя працэсы, што адбываюцца ў беларускай вёсцы.

---

[6] ФАПДУ: Зап. у 2012 г. Аўсейчык У. Я. ад Андрэевай Гелены Міхайлаўны, 1935 г.н. у в. Канстанцінава Глыбоцкага р-на.

[7] ФАПДУ: Зап. у 2012 г. Аўсейчык У. Я. ад Андрэевай Гелены Міхайлаўны, 1935 г.н. у в. Канстанцінава Глыбоцкага р-на.

[8] ФАПДУ: Запісана ў 2012 г. Лобачам У. А. ад Ленкевіч Ксеніі Міхайлаўны, 1926 г.н. у в. Верацеі Пастаўскага р-на.

Літаратура

1. Кухаронак, Т. І. Купальская абраднасць на Віцебска-Пскоўскім памежжы / Т. І. Кухаронак // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. – Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018.

2. Полацкі этнаграфічны зборнік. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 148 с.

3. Полацкі этнаграфічны зборнік. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2 / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.

4. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. А. У. Лобач. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 292 с.

5. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина. – 1912. – Вып. VIII. – 411 с.

ГЕНДАРНЫЯ АСПЕКТЫ ШКАДАНОСНАЙ МАГІІ Ў НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

Бондар Ірына Генадзьеўна,
студэнтка
УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»,
г. Наваполацк

У свядомасці прадстаўнікоў беларускай традыцыйнай культуры, незалежна ад рэгіёну, існуе вобраз людзей, якія валодаюць звышнатуральнымі здольнасцямі і могуць уплываць на знешні свет як у пазітыўным, так і ў негатыўным ключы. Уяўленні пра асоб, якія могуць аказваць шкаданосны ўплыў на навакольны свет, застаюцца даволі трывалымі і ў сучаснай культуры вясковага насельніцтва Беларусі. На тэрыторыі Падзвіння такія людзі найчасцей маюць назву *чараўнік* і *чараўніца*, радзей – *вядзьмак* (*ведзьма*), альбо *калдун* (*калдунья*). Разам з тым, вобраз чараўніка (чараўніцы) у традыцыйнай карціне свету далёка не стэрэатыпны і мае шмат нюансаў, не ў малой ступені абумоўленых гендарнымі фактарамі.

У народнай інтэрпрэтацыі мужчыны і жанчыны, якія валодаюць магічнымі здольнасцямі, істотна адрозніваюцца, бо жаночае чарадзейства заўсёды разглядаецца як з'ява ніжэйшага парадку, звязаная з гаспадарчымі справамі, чым мужчына-чараўнік практычна не займаецца. Вядомы даследчык народнай культуры Віцебшчыны М. Нікіфароўскі адзначыў у сваёй працы, што

чарадзеямі могуць быць як мужчына, так і жанчына. Таксама ён піша, што жанчыны звычайна займаліся «бабскімі справамі» – чараваннем хатняй скаціны, псотай на палетках і да т.п. Мужчыны ж, хоць таксама могуць гэта рабіць, але амаль ніколі не апускаюцца да такіх заняткаў [2, с. 283].

Пад «бабскі справамі» маецца на ўвазе адабранне малака ў кароў, а таксама псаванне іх, насыланне хвароб, сурокі, заломы на неўраджай, падлогі, але гэта характэрна для XIX–XX стагоддзяў. Псаванне жывёліны або знішчэнне ўраджаю былі накіраваныя не толькі на карысць чараўніцы, але і на шкоду гаспадара. У большасці выпадкаў чараўнікі шкодзілі сваім суседзям, і прычынай, як правіла, былі побытавыя канфлікты. Фальклорныя наратывы пра ведзьм-малочніц у значнай колькасці зафіксаваныя этнаграфічнымі экспедыцыямі ПДУ практычна ва ўсіх раёнах Віцебшчыны. *«У аднаго хазяіна нехта адабраў у каровы малако. Ён пайшоў да знахара, а той яму сказаў: «Паглядзі добра, што ў цябе ў хляве ёсьць". Вярнуўся дамоў хазяін, а каля дзвярэй у хлеў сядзіць жаба. Ён за сякеру і адсёкёй лапу [...] А заўтра яго дачка з парубленай рукой хадзіла і плакала» (Ушацкі р-н)* [4, с. 13].

У другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя актуальным сюжэтам у апавяданнях пра чарадзейства з'яўляецца ўзгадка пра шкодныя *падлогі* – наўмыснае і таемнае размяшчэнне ў жыццёвай прасторы чалавека (сям'і) рэчаў ці прадметаў з выразнай сімволікай смерці ці хваробы. Актуалізацыя чараў супраць асабістай долі чалавека (здароўя, сямейнага ладу) ці яго прысядзібнай гаспадаркі абумоўлена тымі абставінамі, што пагалоўе хатняй жывёлы, як аб'ект магічнага уздзеяння, радыкальным чынам зменшылася. *«І аднажды я ўвідзела сваю саседку, выбігаюччай [...] Всё там падкладавалі [...] всякія вузлы накручана [...] Ані ж тагда не должны з кем-та разговарівать [...] І клубніка была красная і крупная, вся высохла до едзінава! [...] І я нашла там пакет такой, чэво-та там накручана» (Верхнядзвінскі р-н)*[9]*; «Адна баба адбіла ў другой мужыка. [...] І тут пачала гэта другая сохці, бо першая падкінула ёй яйка пад хату. Другая жонка спужалася і кінула тое яйка ў раку. Яна сразу жа палепшыла, але мужык той памёр» (Ушацкі р-н)* [4, с. 17].

Шырока распаўсюджаным уяўленнем адносна ведзьм з'яўляецца і матыў іх ператварэння ў розных жывёл, калі фізічныя пашкоджанні, нанесеныя апошнім, дазваляюць выявіць ведзьму ў вясковым соцыуме. *«Дружыў парэнь з дзяўчонкай. Як толькі сядуць на лавачцы, а кошка бегаець [...] не даець ім пасядзець [...] Тады [...] узяў з сабой тапор і як толькі кошка бегла, ён ёй па лапе і адсек лапу. [...] Прыходзіць, а маць на печы ляжыць. [...] Эта сын мацеры руку адсек» (Лепельскі р-н)* [4, с. 7–8].

[9] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ): зап. Бондар І. у 2019 г. ад Рудлевскай Ганны Станіславаўны, 1943 г.н. у г. Верхнядзвінск.

Мужчыны-чараўнікі, паводле ўяўленняў беларусаў Падзвіння, заўсёды лічыліся мацнейшымі за жанчын-чараўніц. *«Чараўнікі [...] І бабы і мужукі бываюць. Але сіла ў мужчыны ёсць крапчэйшая» (Сененскі р-н)* [4, с. 37]; *«Мужыкі болей чаравалі, большая сіла ў іх была» (Чашніцкі р-н)* [4, с. 63]. У сваю чаргу, чараўнікі падзяляліся паводле сваёй кампетэнцыі (сілы) на «сапраўдных» (моцных) і «слабых». Прынцыповае адрозненне паміж імі заключалася ў тым, што «слабы» чараўнік мог толькі шкодзіць людзям, а «моцныя» – маглі як шкодзіць, так і дапамагаць. Гэтае адрозненне ляжыць у аснове канфлікту або спаборніцтва паміж «слабымі» і «моцнымі» чараўнікамі. *«Адзін хваліцца, што я ўмею. І другі [...] “Раз ты ўмееш дзелаць, то ідзі, Вікенцій [...] прынясі мне рэдзьчыну” [...] Пайшоў дзед і прынёс рэдзьчыну. Тады гаворыць: “Возьмі яе разрэж. На табе кусок, і мне кусок. Калі вы зделаеця, каб яна была чорная, а тады белай назад”. Гэты ўзяў і здзелаў яе чорнай, і гэты ўзяў – чорнай. Ну а тады, гавораць: “Здзелай белую”. Дык адзін здзелаў, а другі ня здзелаў. Дык гэты, каторы чорную здзелаў і белую, падышоў і гэтай рэдчынай як удзяліў яму ў морду!» (Талачынскі р-н)* [4, с. 52].

Заўважым, што падобны матыў адсутнічае ў фальклорных наратывах пра ведзьм, якія ў традыцыйнай карціне свету беларусаў былі суаднесены толькі са шкаданоснай дзейнасцю.

Статус мужчын-чараўнікоў заўсёды ацэньваецца больш высока за статус жанчын-чараўніц, бо менавіта мужчынам, якія валодалі магічнымі ведамі, была ўласціва ўлада над ваўкамі, змеямі, пчоламі, а таксама прыроднымі стыхіямі. У прыватнасці, як сведчаць палявыя запісы, моцныя чараўнікі маглі выклікаць град, віхор, буру. *“А яшчэ баба адна гаварыла, што сама бачыла, як Дрозд вызываў віхор на пшаніцу. [...] А ён стаіць каля поля, каля пшаніцы, раскінуў рукі і пачаў імі махаць. І раптам як узняўся сільны вецер, які ўсю пшаніцу паклаў на зямлі» (Міёрскі р-н)* [3, с. 88].

Дагэтуль захоўваецца перакананне ў сувязь чараўнікоў і знахараў з паўзунамі (змеямі), ёсць асобае правіла аб тым, што «людзям ведаў» нельга забіваць змей. Гэты негалосны закон жорстка выконваўся чараўнікамі і знахарамі. *«Так ён [...] браў любую змею рукамі. Он знаў, гдзе яе узяць. І ні адна змея (не кусала. – К. А.). Вот пасадзіць на руку і гладзіць яе, [...] і змея яго нікагда не ўкусіць. Нікагда!» (Полацкі р-н)* [4, с. 88].

Прасочваецца адметная сувязь чараўнікоў і з ваўкамі. Існуе тры сюжэтныя лініі «ваўчынай тэмы», калі чараўнік: мае мыгчымасць ператварацца ў ваўка, або ператварае ў ваўкоў іншых людзей, ці кіруе ваўкамі і кантралюе іх. Здольнасць ператварацца ў ваўка прыпісваецца толькі моцным чараўнікам, бо гэта дазваляе ім эфектыўна рэалізоўваць свае задумы. Варта заўважыць, што матыў ператварэння ў ваўка вядомы яшчэ з часоў ранняга

сярэднявечча, калі такая здольнасць прыпісвалася легендарнаму полацкаму князю Усяславу Брачыслававічу.

Гэтаксама чараўнікі выступаюць і як магічныя гаспадары ваўкоў. *«І вот у нас там расказвыла адна жэншчына [...] Яна ідзець, а ён кажа на яе, гэты Васіль: “Ты хочаш ваўка ўвідзець?” А яна кажыць: “Хачу. І вот перада мной сейчас становіцца волк. Я, – гаворыць, – анямела, стала, не знаю, што мне рабіць. Ай, не хачу ўжо відзець яго”. – “Счас, – гаворыць, – ваўка не станіць» (Ушацкі р-н)* [4, с. 71–72].

Найчасцей з’явы ператварэння чараўніком людзей у ваўкоў сустракаюцца ў кантэксце вясельнага сцэнарыя. Але звяртае на сябе ўвагу тое, што гэтае ператварэнне выконвае функцыю пакарання за парушэнне традыцый і сацыякультурных норм. Напрыклад, за ігнараванне статуса чараўніка або за непавагу да яго на вяселлі. «*Адна пара жанілася, свацьба ў нас была. А саседа ні прыгласілі. А ён што здзелаў. [...] Дык дзеўка гэта ваўчыцай абярнулася, а жаніх – ваўком, бегаюць па полю. Дык таго чалавека прыгласілі, напаілі. А каб аддзелаць, ён іх цераз ізгароду турнуў. Во, як было» (Ушацкі р-н)* [4, с. 52].

Чараўніцтва закранала ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, то бок, яго фізічнае і псіхічнае здароўе, сямейныя і грамадскія адносіны, гаспадарчы і прафесійныя заняткі. Моцныя чараўнікі мелі свае функцыі ў вясковым соцыуме. Калі ў вёсцы быў такі моцны чараўнік, то яго абавязкова звалі на вяселле, а ведзьм амаль ніколі не запрашалі. Такім чынам чараўнік падтрымліваў сваю асабістую негалосную ўладу ў вёсцы. Ён выступаў своеасаблівым абярэгам для маладых, ён мог выявіць і абясшкодзіць чары, якія былі на маладых, або пакараць таго, хто збіраўся гэта зрабіць або ўжо зрабіў. Але калі чараўніку не аказвалася належнай увагі, то тады вяселле магло скончыцца сумна: «*Вот я гэта, як вышла замуж у дзярэўню Пранікі. Там расказвалі, была свадзьба, і аднаго мужчыну там не ўгасьцілі: не далі там выпіць. Ну і ён [...] падробіў маладой, што яна завалілася, як нежывая. Тады і дагадаліся. І ўгасцілі. І ўсе было харашо» (Ушацкі р-н)* [4, с. 32]. Аналагічную з’яву, калі чараўнік на вяселлі карае непрыяцеляў, яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя апісаў вядомы беларускі літаратар Ян Баршчэўскі [1, с. 19–20], што ўказвае на трывалы і кансерватыўны характар падобных уяўленняў у традыцыйным светапоглядзе беларусаў Падзвіння.

Аналіз фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў паказвае, што статус мужчыны-чараўніка ў народнай культуры Паўночнай Беларусі быў больш высокі за статус жанчын, якія займаліся выключна шкаданоснай магіяй. Аднак наратывы пра мужчын-чараўнікоў, якія фіксуюцца на тэрыторыі Падзвіння ў апошнія дзесяцігоддзі, маюць пераважна характар успамінаў пра рэаліі 1950–1970 гадоў. Як актуальная з’ява сучаснага сельскага ландшафту

Віцебшчыны мужчыны-чараўнікі ўжо практычна не ўзгадваюцца. На сённяшні дзень у апавяданнях пра чарадзейства найбольш фігуруюць жаночыя вобразы. Пры гэтым, у адрозненне нават ад сярэдзіны XX стагоддзя, адбываецца змяшчэнне сферы дзейнасці, калі меркаваныя ведзьмы пераносяць свае шкаданосныя практыкі з хатняй жывёлы і палеткаў на здароўе людзей і іх асабісты лёс.

Літаратура

1. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. – 214 с.

2. Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи… Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровкий. – Витебск : Губерн. Тип-литограф., 1897. – 338 с.

3. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. У. А. Лобач, У. С. Філіпенка. – Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.

4. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 366 с.

ИСТОРИКО-ГЕОГРАФИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ ТУРИСТИЧЕСКИХ ОБЪЕКТОВ ПИНСКОГО РАЙОНА

Демьянов Сергей Александрович,
старший преподаватель
УО «Полесский государственный университет»,
г. Пинск

Бердник Андрей Михайлович,
студент
УО «Полесский государственный университет»,
г. Пинск

Пинский район представляет собой один из значимых центров развития туризма в Брестской области, обладающих достаточными культурно-историческими и природными ресурсами для формирования центра туристского спроса. Однако такие факторы, как удаленность от ключевых транспортных путей, центров формирования туристского предложения и незаинтересованность органов власти в развитии туристской зоны привели к снижению аттрактивности и популярности района. Для решения данной задачи необходимо провести анализ аттрактивности объектов туристиче-

ского интереса в регионе, позволяющий выявить наиболее привлекательные туристические объекты.

Одним из религиозных центров Пинского района, наряду с Пинском, является Логишин, который известен еще с 1552 г. – тогда он входил в Пинский повет Брестского воеводства. На протяжении XVI–XVII вв. этим местечком владели Радзивиллы, Огинские, а затем Любецкие. Первый костел в Логишине был построен в 1634 г. на средства пинского старосты Альбрехта Радзивилла [3, с. 169]. Спустя 9 лет селение получило Магдебургское право и герб, уникальный свой полиформой: на синем барочном щите изображен волк с лосиными ногами. То есть наблюдается причудливое сочетание традиционных обитателей белорусских лесов как единого существа.

На протяжении XIX в. в Логишине действовали мельницы Айзенберга, Бунькевича, Хазана и Дубимского, Марцинкевича, маслобойня и мельница Циперштейна и кожевенный завод Фридмана [1, с. 173]. К концу XIX в. в городе были построены каменные торговые ряды, открылась еврейская молитвенная школа. А в 1863 г. была вновь отстроена Спасо-Преображенская церковь. Соседствует с церковью костел Святых Петра и Павла (1907–1909 гг.). Острый шпиль неоготического костела является архитектурной доминантой Логишина. Однако главная жемчужина костела – Санктуарий Матери Божьей Логишинской, который ежегодно привлекает сотни паломников. Икона Богоматери с младенцем, оставленная шведским отрядом во время Северной войны, была передана в костел. Иконе приписывают множество случаев исцеления и помощи в сложных ситуациях, за что она обрела славу чудотворной. После губительного пожара в костеле в XIX в. икону передали на хранение в Спасо-Преображенскую церковь, и только в 1930-е гг. она была возвращена в костел Святых Петра и Павла. В 1997 г. Богоматерь Логишинская была коронована папскими коронами. Ежегодно процессии пилигримов стекаются в Логишин, чтобы отдать дань одной из самых почитаемых святынь Полесья.

В непосредственной близости к Пинску расположена деревня Пинковичи. История Пинкович насчитывает 520 лет, а ее начало связано с потомками пинского князя Михаила Константиновича из рода Курцевичей. В различные периоды истории Пинковичи принадлежали Войцеховичам, Огинским и Скирмунтам. В 1904–1906 гг. в Пинковичской школе работал учителем классик белорусской литературы Якуб Колас. Через 60 лет в здании бывшей школы был открыт народный литературно-этнографический музей. На территории музея также располагается памятник природы – «Колодец Якуба Коласа». Говорят, что вода из этого колодца придавала природную силу и энергию молодому белорусскому классику. В октябре 1934 г. Пинковичи посетила член Американского географического общества Луиза Арнер Бойд. Сегодня возле музея уста-

новлен памятный знак в честь ее экспедиции. Пинковичи могут похвастаться и сакральным объектом – Покровской церковью, которая была построена еще в 1830 г. и относится к полесской школе деревянного зодчества.

Архаичная деревушка Кудричи, затерянная меж трех полесских рек – Припяти, Ясельды и Пины, в следующем году отметит свое 465-летие. Ее захватывающая история будто остановилась и застыла до наших дней. Еще недавно дома в Кудричах выглядели как неприступные крепости – ведь непроходимые болота и большая вода надежно защищали их от внешних угроз. Сама деревушка имеет одну единственную улицу, но не совсем обычную: скорее это жилые островки, соединенные между собой насыпными дорогами.

Кудричам долгое время прочили стать полесским скансеном (музеем под открытым небом), демонстрирующим быт полешуков на рубеже XIX–XX вв. Здесь действительно сохранилась застывшая во времени аутентичность архитектуры и быта «людей на болоте»: деревянные хаты и хозяйственные постройки, крытые болотным камышом, рабочий инвентарь, лодки и рыболовные приспособления. Здесь также можно увидеть оригинальный способ хранения пищи, раскладки дров и множество других интересных вещей. Кудричи стали постоянным местом жительства не только полешуков, но и аистов, гнезда которых можно встретить повсюду.

Однако в настоящее время этот уникальный полесский скансен тихо отмирает и потихоньку превращается в дачный поселок. Много интересного об истории Кудрич и жизни «людей на болоте» может поведать местный староста Моисей Елисеевич Махновец, который бережно чтит традиции полешуков. Для любителей активного туризма местные жители предлагают туристический маршрут «ЗК» – Кудричи–Качановичи–Кривичи, который знакомит туристов с прекрасными природными ландшафтами Пинского Полесья и аутентичностью полесских деревень [2, с. 11].

Полесье – это уникальный край с богатой историей. Особенно стоит выделить деревню Качановичи. Первые упоминания этого поселения датируются 1378 г., когда здесь обосновался старинный шляхетский род Качановских герба «Остоя». Местные жители уже на протяжении нескольких столетий известны как искусные рыбаки и пчеловоды. Дары природы они возили на лодках на продажу в Пинск. Известный белорусский художник и этнограф Язэп Дроздович, находясь в 1926 г. в Качановичах, зарисовал местную каменную каплицу и церковь Святой Параскевы Пятницы. Церковь, однако, впоследствии была закрыта, а в 1960-е гг. полностью разрушена [1, с. 275].

Американская исследовательница Белорусского Полесья и член Американского географического общества Луиза Арнер Бойд во время своей полесской экспедиции останавливалась в Качановичах, о чем свидетельствует оставленный ею фотографический материал и воспоминания отца Николая

Качановского. Сам Николай Качановский, продолжая традиции полесского бортничества своего именитого шляхетского рода, содержит в Качановичах агроусадьбу, большую пасеку и музей бортничества. Коллекция музея «Полесский бортник» включает более 50 колод, возраст некоторых из них насчитывает порядка 100 лет. На территории агроусадьбы также есть конструкция, демонстрирующая, как добывали мед из колод на деревьях.

Недалеко от агроусадьбы расположен гидроузел «Качановичи» и плотина, которая создает искусственный водопад высотой два метра. Гидроузел располагается в живописном месте и привлекает любителей активного загородного отдыха.

Не меньшую роль в сохранении традиций и культуры полешуков играют Мерчицы. Официально первое упоминание о Мерчицах датируется 1514 г., однако эти места были известны еще во времена Киевской Руси, а в каменном веке здесь располагалась стоянка первобытных людей. Мерчицы могут похвастаться и известными людьми. Здесь основал родовое гнездо переселенец из Польши Петр Твардовский. Самым известным в семье стал его сын Юзеф – доктор философии, профессор, ректор Виленского университета в эпоху филоматов и филаретов [1, с. 423]. После подавления восстания и увольнения из Виленского университета Юзеф вернулся домой в Мерчицы, где продолжил свою образовательную и просветительскую деятельность. А в октябре 2017 г. здесь открылся Центр традиционной культуры и быта «Спадчына Палесся». В шести экспозиционных залах размещены тканые, гончарные и деревянные изделия ручной работы, белорусские национальные костюмы и многочисленные предметы истории. В музее можно также поучаствовать в традиционных полесских обрядах.

Пинское Полесье славилось предпринимательскими и промышленными традициями, ведь неспроста деревню Поречье называли «Ливерпуль на Ясельде» за развитое промышленное производство. Поречье берет отсчет своей славной истории в далеком 1495 г., когда пинская княжна Мария пожаловала Матвею Гричине два дворища в этих местах. В начале XVII в. собственниками поселения стали Терлецкие, затем Огинские. Однако расцвет деревни приходится на эпоху шляхетского рода Скирмунтов, при которых был построен усадебный дом и разбит парк. В 1830-х гг. Александр Скирмунт основывает здесь несколько заводов и фабрик. В Поречье в разные периоды истории работали: сахарный завод (был лучшим в Минской губернии), крупнейшая суконная фабрика, а также винокуренный завод [4, с. 496]. При этом Скирмунты хорошо оплачивали труд своим работникам и выступали за отмену крепостного права.

Позже Поречье переходит к внуку Александра – выдающемуся хозяйственному и политическому деятелю – Роману Скирмунту. Хорошее образо-

вание, широкий кругозор и гибкость ума позволили ему успешно управлять богатым промышленным наследием Скирмунтов. Несмотря на свой статус, Роман Скирмунт всячески помогал крестьянам: выплачивал большие зарплаты, предоставлял лес для постройки домов, запустил автобус из Поречья до Пинска, ежегодно организовывал сельскохозяйственные ярмарки с призами и даже спас однажды поречан от расправы. Роман Александрович впоследствии стал премьер-министром БНР, депутатом польского и российского парламента [4, с. 499]. Он прославился как истинный патриот Беларуси и национальный деятель, внесший значительный вклад в становление белорусского государства. До наших дней в Поречье сохранилась лишь церковь Рождества Богородицы (1912), оборонительные сооружения Первой мировой войны, здание сахарного завод и парк «Поречье» [4, с. 496]. На окраине этого парка находится могила Романа Скирмунта.

На территории Пинского района располагается несколько природных парков, самый известный из них – «Дубой». История местечка Дубой насчитывает более 520 лет. На протяжении XVI в. Дубой принадлежал Карповичам, Веренич-Стаховским, Огинским и Радзивиллам. А в 1630-е гг. Канцлер Великий литовский и пинский староста Альбрехт Радзивилл подарил имение Дубой пинским иезуитам [4, с. 137]. Во время своего обучения в пинском иезуитском коллегиуме здесь жил известный историк, поэт и автор «Истории польского народа» Адам Нарушевич. Основал уникальный парк и дворец шляхтич Ян Полоз. Во второй половине XVIII в. владельцем имения стал гетман ВКЛ граф Огинский, который распорядился создать здесь уникальную водную систему, не повторяющуюся больше нигде в Беларуси. Во времена Куженецких Дубой посетил король Речи Посполитой Станислав Август Понятовский в сопровождении епископа Адама Нарушевича. Богатая история местечка Дубой оставила нам одноименный парк, церковь Рождества Богородицы (1811 г.), костел Воздвижения Святого Креста (XVIII в.) и каплицу на воинском кладбище (конец XIX в.). Церковь Рождества Богородицы построена в стиле классицизма с редкой восьмигранной формой зала [4, с. 138]. В парке также сохранилось несколько строений.

Парк Дубой имеет статус памятника природы республиканского значения, здесь произрастает несколько десятков экзотических пород деревьев и кустарников. Особое место в парке занимает дуб королевы Боны, возраст которого насчитывает более 450 лет. В парке также есть пасечный остров, или остров любви, который связан с трагической любовной историей. Насладиться местными красотами можно в агроусадьбе «Дубое над Пиной», в которой просматриваются традиции полесской архитектурной школы, а также собрана обширная этнографическая коллекция.

Литература

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.: іл.

2. Справочник-бюллетень обязательных и рекомендуемых экскурсий для студентов и учащихся в соответствии с государственными программами обучения: справочное издание / сост. Е. А. Сисмеева, Т. А. Хвагина, С. И. Климец [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2006. – 55 с.

3. Туристские регионы Беларуси / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И. И. Пирожника / худож.: В. И. Терентьев, Ю. А. Тореев. – Минск.: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – 608 с.: ил.

4. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2006. – 2-е изд. – 576 с.

ВОБРАЗ ЧОРТА Ў МІФАЛАГІЧНЫХ УЯЎЛЕННЯХ БЕЛАРУСАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ ПАЧАТКУ XXI ст.

Жукаў Дзяніс Вітальевіч,
студэнт
УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»,
г. Наваполацк

Вобраз чорта з'яўляецца найбольш вядомым і распаўсюджаным у народнай культуры ўсходніх славян, у тым ліку беларусаў. Этнаграфічныя экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, праведзеныя на тэрыторыі Віцебшчыны ў 1995–2019 гадах, зафіксавалі значны матэрыял, які адлюстроўвае сімволіку вобраза чорта ў карціне свету сельскага насельніцтва Падзвіння.

Чорт уяўляецца нячыстай сілай, супрацьпастаўленай Богу, ад якой чалавеку не варта чакаць нічога добрага. «У беларускай міфалогіі ліхі дух, які шкодзіць толькі чалавеку і супрацьстаіць Богу» [1, с. 556]. Вобраз чорта існаваў яшчэ ў язычніцкай міфалогіі, але са з'яўленнем хрысціянства быў асіміляваны прадстаўленнямі аб д'ябле, бо меў з ім немала падабенстваў.

Аднак, у беларускіх касмаганічных легендах чорт выступае разам з Богам стваральнікам Свету, дакладней, такіх элементаў ландшафту, як балоты і пагоркі. «Усё стварыў Бог. Але ёсць такая легенда, што калі Бог ствараў зямлю, то яна была роўная і прыгожая, а чорт ішоў за ім і набраў зямлі ў рот, і зямля пачала расці, якая была ў роце чорта. Чорт пачаў выплёўваць зямлю і куды ён пляваў, адразу ж з'яўляліся горы. І зямля стала няроўнай. І Бог не

стаў перарабляць зямлю, бо былі ўжо першыя людзі, і не было куды перасяліць. Так і засталася зямля такая, як мы бачым яе сёння» [2, с. 25].

Сучасныя палявыя даследаванні паказваюць, што ў традыцыйных уяўленнях касмаганічныя функцыі чорта практычна не ўзгадваюць, але ў значнай колькасці былічак гэты міфалагічны персанаж выступае ініцыятарам такога грахоўнага для чалавека ўчынку, як самагубства. Чэрці з'яўляюцца людзям у найбольш крытычны момант іх жыцця і заахвочваюць да самагубства. Наратывы такога роду можна падзяліць на дзве катэгорыі: 1) чорт даводзіць сваю задуму да трагічнага фіналу і, адпаведна, авалодвае чалавечай душой; 2) чалавек з дапамогай Божай сілы пазбягае грахоўнай смерці. «А яшчэ вот была прычына ў Берэзіне. Расказваў чалавек, была хата з аднаго боку халодная, а ў другім сын жывуць з нявесткай, а старыкі ў гэтым, у халодным. І кажуць, сідзяць яны абоі, старыкі, а старуха адкрыла во так платок і кажыць: «Як гэткая жызнь надаела, каб узяў сам сабе і задавіў». І толькі яна гэта сказала, а старык гэты з ёй радам сядзеў і казаў, што відзеў, як бегалі дзевачкі, мальчыкі ў шляпах маленькія. І толькі вот так яе пацягнулі далоў і задавілі яе. Гэта чэрці задавілі і ўсё. Гэта толька надумаць гэту работу, дык тады ўсё, падкасываюцца чэрці» [3, с. 215].

У супрацьстаянні Бога і нячыстай сілы вырашальным аказваецца зварот чалавека да божай дапамогі праз малітву ці нават простага жагнання. «Жыла баба з дзіцямі. Была яна бедная, многа гарувала. І рашыла яна павешацца. Палажыла дзяцей спаць. У 12 часоў узяла яна вяроўку, але тутака яна ўстрашэла, перакрысьцілася. Бог ня даў ёй павесіцца. Тады прыйшлі да яе чэрці і гаворуць: "Баба, баба, чаго ты не робіш, што ўдумала?" А яна кажа, што як гарувала, так і буду далей гаруваць» [2, с. 111].

Не менш распаўсюджаны сюжэты, дзе чорт выступае ў іпастасі шкадлівай істоты, што ўсяляк замінае і стварае перашкоды ў жыцці чалавека. Часам «жарты» чорта носяць даволі бяскрыўдны характар. «Бывала, чэрці і гаворуць у хаце. Вот сядзіць чорт, як кот. Ён паказаўся. Як чорт у хаце. […] Ну а дочка сабіраецца на танцы: "Мама, я пайду на танцы". І ён паўтараець: "Мама, я пайду на танцы". Што яна гаворыць, тое і ён паўтараець за ей. А патом і ішчэз, і ты яго ня ўвідзіш» [2, с. 104].

Куды больш небяспечным заняткам чорта можна назваць яго спробы заблытаць чалавека, збіць яго з дарогі. Невыпадкова, што ў былічках падобнага роду найчасцей у якасці ахвяр чорта фігуруюць аматары гарэлкі, бо страта арыентацыі ў прасторы ёсць адной з базавых прыкмет алкагольнага ап'янення. «Могільнік, там жа аўстрыйцы пахаронены, і там з XIII века могільнік. Там, каторыя ідуць, п'яныя асобенна, там называецца эта "Вадацеча" і там рэчка ўпадаіць у гэта возера. Там кладбішча і пачаму-та там многа, каторыя ідуць п'яныя, начынаюць сразу разуваца там, раздзеваца і лажыцца там

спаць і там, гавораць, ужо чорт там водзіць, там каменныя крыжы, курганкі. Вадацеча – гэта такое названіе, што там рэчка ўпадае ў возера» [2, с. 273].

Злосныя жарты чорта над п'янымі людьмі не выглядаюць выпадкова з гледзішча міфалагічнай свядомасці, бо гарэлка і ёсць вынаходніцтва чорта. Адпаведна, калі чалавек ужывае чортаў прадукт, то ён ужо трапляе ў сферу ўплыву нячыстай сілы. «Гарэлку выдумаў чорт. Гоніць чорт гарэлку, а Бог ідзець. А ён гаворыць: "Што ты дзелаеш?" – "Ганю гой, а хто яе вып'ець, той будзець мой". А Бог гаворыць: "Ты гоніш гарэлку, а я дам мерку". Даў чарачку. Чарачку вып'ець [чалавек], тады і нічога» [2, с. 38]. Менавіта таму карчма, як лічаць беларусы, адзначана злом. Акрамя таго, лічылася, што ў той момант, калі паміж храмам Божым і карчмой чалавек выбірае другое, ён становіцца лёгкай здабычай для чорта і фактычна завочна аддае яму сваю душу.

Вобраз чорта з'яўляецца даволі частотным у народнай міфалогіі прасторы, калі шэраг аб'ектаў культурнага ландшафту ў карціне свету вясковага насельніцтва трывала суадносіцца з нячыстай сілай. У першую чаргу, размова ідзе пра балоты, само з'яўленне якіх звязана менавіта з чортам. «Чортава балота ёсь. Прама па дарозе, там яно заросшая. […] Балота гібкая такоя, топкая, калі ўжо хто ў гэту трасіну ўлезіць, то ўжо ня вылезіць, вот яно і завецца Чортава. У балота ўцягаваіць чорт нейкі, туды і ўсё. Выйці чалавек ня можаць» [2, с. 185]. Трэба адзначыць, што балотных урочышчаў з назвай «Чортава балота» і адпаведнымі фальклорнымі гісторыямі на Віцебшчыне даволі шмат [2, с. 183–186].

Яшчэ адной катэгорыяй прыродных аб'ектаў, з якой вельмі часта суадносцца вобраз чорта, ёсць вялікія, прыкметныя валуны з паказальнымі назвамі «Чортаў камень», «Чортава печ». «Ёсць каля Лынтуп камень, які называюць "Чортаў". Аднайчы, калі дадому вяртаўся адзін музыка, ён убачыў на камяні чарта, і чорт прымусіў, каб музыка іграў яму цэлую ноч. А калі настала раніца, чорт знік, а музыка без сіл пайшоў дахаты. З той пары і пачалі называць камень "Чортаў"» [2, с. 240].

Паводле народных уяўленняў, чорт можа з'яўляцца чалавеку не толькі ў прыродных локусах, але і ў прасторы, засвоенай чалавекам, асабліва ў тых месцах (дарога, ростані, лазня), якія маюць выразную сімволіку «мяжы» паміж «сваім» і «чужым» светам. «Вот мы, маладзёж, падышлі раз паглядзець. Аж там (у бані) хахочуць, плёскаюць. Я адкрыла баню, аж там чэрці. І ў катле, і ў баку. Касматыя такія, валасы длінныя, ніжы жопы, чорныя, закапцелыя, ногі ў катлах ня відна. У меньшых рожкі меньшыя, у большых большыя. Яны на нас дажа і не глянулі. А назаўтра прышлі, аж вада ўся павыліта» [2, с. 98].

Сярод найбольш архаічных і дзейсных абярэгаў ад чорта ў беларусаў Віцебшчыны фігуруе лён альбо вырабы з яго. У адной з легенд лён высту-

пае як жывая істота, што бароніць дзяўчыну ад чорта. «Ішла дзеўка адна і пагнаўся за ей нехта, мабыць, чэрці. Тая ратунку крычаць, дай уцякаць. А дзе ж ты ад чорта схаваесься? Ну дык во, яна забегла ў сарай, дзе ўжо лён з поля звезшы былі. За тым лёнам яна схавалася, і чэрці за ей ужо тут прыбягаюць. А ісьці чэрці туды ня могуць, дзе лён, то й і гавораць яму: “Аддай нам дзеўку!” А лён ім: “Я тады вам дзеўку аддам, як вы мае пакуты прыймяце”. – Якія твае пакуты? – Ірвуць мяне са ўсёй сілы... – І ўсё? – Мочаць мяне і сонцам пякуць... – І ўсё? – Не. Потым б’юць мяне, што ёсь сілы… – І ўсё? – Мнуць ды трэплюць, цераз зубы жалезныя цягнуць, а потым прадуць… Ну во, так той лён аж да самых пеўняў тым чартам пра свае пакуты расказваў. А як ужо пеўні запіялі, то паўцякалі тыя чэрці, ды пазабыліся на дзеўку» [2, с. 92].

Вырабы з лёну ці прадукты яго апрацоўкі (кастра) нярэдка выкарыстоўваліся ў барацьбе з чортам. У адной з версій зброяй супраць чорта служыла льняная вяроўка, узмахі якой надоўга адганялі яго. «Каб лён добра рос, попелам пасыпалі. Збіралі даўней попел па кажнай хаце. І пасыпалі па льну. Цераз лён ніякая змяя не ўкусіць. Нікада ў жызь! Вот надзявай насок гэты, каб палатняны гэты – нікада цябе не ўкусіць змяя. І чорт лёну баіцца. Баіцца лёну абязацельна! Вяроўкай з лёну махні – дык прэць, ты яго век не найдзеш. Уцякаіць. Праўда, баіцца. Не знаю чаго, вот эта, можа ён святы, лён» [3, с. 267].

Аднак пад уплывам хрысціянства ў народнай культуры сфармавалася ўяўленне, што галоўнай зброяй у барацьбе з нячысцікам з’яўляецца хрысціянская (царкоўная) атрыбутыка (крыж, абраз, святая вада) альбо малітва. «Ну, а было, што во дзеўкі раней збіраліся і пралі ў адной хаце. Сядзелі яны пралі, а як дванаццаць часоў, прыйшлі да іх мальцы. Маладыя такія, красівыя, але незнаёмыя. І тут у адной верацяно пад лаву закацілася. Тая нагнулася, глядзіць – хвасты! Яна перахсьцілася – чэрці й паляцелі» [2, с. 92].

Згадваць чорта лічылася непажаданым, бо гэта прыцягвала нячыстую сілу і дазваляла ёй рабіць тое, у кантэксце чаго яна была прыгаданая. «Адна жанчына ругалася на свайго сына, пракляла яго чортам. “Чорт цябе бяры”, – гаворыць. А тады мылася ў бані з дзіцём. Прыйшоў нехта, пастучаў. Яна падумала, што муж, падала рабёнка і кажа: “На рабёнка”. А потым прыйшоў муж. А рабёнка, аказалася, забраў чорт. Адмальвалі тады таго дзіцёнка ў царкве» [2, с. 101].

Аналіз фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў паказвае, што ў асноўным у людзей склалася такое ўяўленне аб чорте: ён нячыстая сіла, водзіць людзей (часцей за ўсё – п’яных), можа быць і ў абліччы розных жывёл. Звесткі аб тым, што чорт выступае разам з Богам стваральнікам Свету, можна лічыць архаізмамі, бо пра іх кажуць менш за ўсё.

Літаратура

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Вадодзіна, У. Васілевіч [і інш.]; пад рэд. Л. Дучыц, І. Крука, У. Лобача, Л. Салавей [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 593 с.

2. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 366 с.

ЖЫЦЦЁ «ЗА ПОЛЬШЧАЙ» ВА ЎСПАМІНАХ ВЯСКОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ДОКШЫЦКАЙ ГМІНЫ

Згірскі Юрый Іванавіч,
студэнт
УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»
г. Наваполацк

Докшыцкі край з'яўляецца ўнікальным рэгіёнам, бо гэта адзін з нешматлікіх раёнаў сучаснай Беларусі, у склад якога ўваходзяць тэрыторыі, што ў недалёкім мінулым адначасова былі ў складзе II Рэчы Паспалітай і БССР. Па тэрыторыі сучаснага Докшыцкага раёна праходзіла мяжа, што падзяляла Беларусь на Усходнюю і Заходнюю. Паводле Рыжскага трактата: *«далее к юго-западу до реки Вилия у впадения в неё с востока безымянной речки (к западу от Дрогомичи), оставляя на стороне Белоруссии деревни Углы, Вольбаровичи, Боровые, Шуновка, Бестроцк, Далёкая, Клячковск, Зязантов и Матвеевцы, а на стороне Польши деревни Комайск, Рашкова, Осова, Куск, Вардомичи, Солоное и Мильча»*. Пасля Рыжскай мірнай дамовы 1921 г. Докшыцкая вясковая гміна ўваходзіла ў склад Дзісненскага павета Навагрудскага ваяводства, а пасля далучэння да II Рэчы Паспалітай Сярэдняй Літвы было ўтворанае Віленскае ваяводства, у склад якога ўвайшоў і Дзісненскі павет з Докшыцкай гмінай.

У якасці крыніц даследавання выступаюць уласныя запісы аўтара, а таксама матэрыялы палявых этнаграфічных экспедыцыяў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Трэба адзначыць, што большасць рэспандэнтаў, пераважна пажылыя вясковыя жанчыны, былі ў той час дзецьмі. Успаміны вызначаюцца эмацыянальнасцю, што абумоўлена спецыфікай дзіцячага ўспрыняцця гістарычных падзеяў, на інтэрпрэтацыю якіх уплывае і вопыт сям'і рэспандэнта. У дадатак да рэспандэнтаў 1930-х гадоў нараджэння, аўтар выкарыстоўваў успаміны жыхароў, якія нарадзіліся пасля 1939 года.

Гэтыя людзі ведаюць той час па словах сваіх бацькоў – сведкаў часоў II Рэчы Паспалітай.

Памежны статус Докшыцкай гміны ў міжваенны час знайшоў сваё адлюстраванне ў матэрыялах вуснай гісторыі. Адзін з самых распаўсюджаных сюжэтаў – сюжэт існавання мяжы і яе ўплыў на штодзённае жыццё: «*Ужо і савецкая граніца была з Польшчай. У іх дзве граніцы было. Перахадзілі граніцу, таму што як нам неякага выхаду не было, тут Польша. Толькі ў тую сторану, у гэту сторану ніхто дажэ ў ягады не хадзіў. Мая цётка як-та цяля пасвіла, цялёнак перайшоў, так пан так выдаў, што цялёнка таго! Гэта недзе ў 38-м гаду было*» (Клаўдзія Пятроўна Аўласевіч, 1940 г.нар.). Усталяванне мяжы парушыла адзінства рэгіёну і сваяцкія сувязі. Ва ўспамінах жыхароў раёна зафіксаваны сюжэт пераходу праз мяжу з мэтай сустрэцца з раднёй: «*сразу пашлі на Шунеўку, гэта, на Шунеўкі пашлі, хацелі ў Азерцы. Зналі, што ў дзеда і браты былі, адзін у Вольберавічах жыў, а гэта сястра ў Вуглах, усе там, адзін брат у Азерцах*» (Ефрасіння Аляксандраўна Казачонак, 1940 г.нар.). Менавіта сярод людзей, якія з'яўляліся раднёю, адсутнічалі спецыфічныя настроі, што існавалі пры падзеле на «ўсходнікаў» і «заходнікаў», – «*ай, пшэкі*». «*Ну дык мама кажа: "Што вы гаворыце!" – "Ай, што ты?! Сястрыца, мы не на цябе"*» (Е. А. Казачонак). Выразны ўнутраэтнічны падзел на «заходнікаў» і «ўсходнікаў» з шырокім спектрам узаемных сацыякультурных стэрэатыпаў артыкуляваны ва ўспамінах тых, хто не меў радню ці знаёмых на другім баку мяжы. Сярод сваякоў такога падзелу не існавала. Жаданне сустрэцца з раднёй спрыяла нелегальнаму пераходу праз мяжу, падагравала своеасаблівы інтарэс да жыцця «на тым баку». У адрозненне ад легальнага пераходу такі матыў не ўтварыў сваю тэрміналогію. Тых, хто пераходзіў мяжу легальна, звалі «білятовыя»: «*Ну мусіць жа добра, там называліся білятовыя. Там танцы былі, там ваенныя ж стаялі, тамака хадзілі на танцы дзеўкі адгэтуль, называлася білятовая. Там толькі па запрашэнню былі хадзілі. Тут дзе граніца ж недзе тут. Ну, дзеўкі ж хадзілі. У іх прыглашэнні былі. Так жа не пойдзеш так, там жа ўсе былі такія важныя*» (Якаў Давыдавіч Касцюк, 1933 г. нар.). Калі тлумачэнне сэнса слова «білятовыя» відавочнае (як і «пшэк» – «заходнік», паляк), то тлумачэнне слова «талэханец» («усходнік») – не. Сюжэт спецыфічнага стаўлення да прадстаўнікоў суседняга замежжа добра адлюстраваны ў сустрэчы падлеткаў з розных бакоў мяжы пасля аб'яднання Беларусі: «*Так, а мы іх талэха. А даўна пойдзем у ягады, тады сюды пад Нябышына, дык яны як, ну мы як дзеці такія, падросткі, і яны ж гэтыя, яны як прылятуць, у нас і ягады адбяраюць, чаму мы ў іхны лес прыйшлі. Граніца ж была сразу за дзярэўняй, гэта ўжо іхні лес счытаўся*» (Я. Д. Касцюк). Усё гэта дазваляе сцвярджаць, што спецыфічныя сітуацыі спрыялі ўтварэнню мясцовай тэрміналогіі, звязанай з асаблівасцю таго часу.

Цікавым падаецца сюжэт пра тое, як выглядала арганізацыя калгаснай працы ў вачах сялянаў-аднаасобнікаў: *«І даўна пахалася аж да граніцы. І ў іх пахалася пакуль лесам, после ўжо запусцілі, дык мама кажыць, што пойдуць жаць, нівы блізка, яны прыедуць, калхоз прывязе, у нас хто на кані прывязе, гэта на каждай ніве, а яны обшча жнуць, дык яны кажуць, што станем, глянем, можа хто з родственнікаў там, а ў іх была строгасць, не атагнуца, жнуць, гэдак сагнуўшчыся, баяліся ж тады… дзісціпліна…»* (Е. А. Казачонак).

Ва ўспамінах рэспандэнтаў Заходняй Беларусі часта фігуруе асоба пана: *«…Там да вайны пан Міхалевіч. Каторага забілі. Працавіты чалавек быў. Каторы жыў, так сказаць, сваім мазылём»* (Зінаіда Сцяпанаўна Сіндрэвіч, 1954 г.нар.). Нягледзячы на факт найму людзей для працы на ўласнай зямлі і лепшае матэрыяльнае становішча паны лічыліся даволі працавітымі людзьмі. Гэта не супадала з меркаваннем «усходнікаў», сярод якіх прапагандавалася негатыўнае стаўленне да парадкаў у Заходняй Беларусі: *«І вот такая агітацыя была. Яны ж можа гэта не нада… Прыдумаць: “Вы, во, нашаму салдату, вушы адрэзалі!” Ну так настраівалі людзей, каб людзі былі проціў гэтага»* (Е. А. Казачонак). Рэспандэнты лічылі асаднікаў панамі. Падставай для гэтага было лепшае, у параўнанні з сялянамі, матэрыяльнае становішча, наяўнасць ў асадніка ўласнай зямлі. Землі атрымоўвалі ветэраны Войска Польскага і дзеячы II Рэчы Паспалітай. Рэспандэнтамі быў узгаданы пан, які, па меркаванні сялянаў, быў дэпутатам Сейма ў Вільні: *«Дажэ рашкаўскі пан, што быў, ён гэта ў Вільнюсе, там як цяпер, дэпутаты, у нас, у Мінску сядзяць, так ён гэта, так і засядаў»* (Е. А. Казачонак).

Нягледзячы на нейтральнае стаўленне да паноў з боку рэспандэнтаў Заходняй Беларусі ўзгадваецца распаўсюджаны сюжэт, у якім перад прыходам Саветаў паны прадавалі зямлю сялянам, а тыя, у сваю чаргу, не ведалі аб хуткай змене ўлады і ўсталяванні калгасаў: *«Яны зналі, яны прадавалі. Ён пан, у Рашкаўцы, усю зямлю, прадаў, а людзі не зналі ж, што гэдак. І пакуплялі на хутары. Дажэ павынасіліся ўсе дамы паставілі ў Рашкаўцы. А ўжо ж, пасля вайны… хадзілі яшчэ на танцы ўсё, па хутарах. Ну а тады ж, у калхоз сцянулі»* (Е. А. Казачонак).

У наратывах жыхароў Докшыцкай гміны сустракаюцца аповеды пра яўрэяў. Докшыцы, як і большасць беларускіх мястэчак, мелі ў сваім складзе дастаткова вялікую колькасць прадстаўнікоў гэтай этнічнай групы. З даўніх часоў у Докшыцах праводзіўся свой кірмаш, на які з’язджаліся сяляне з ваколіцаў. Гандлю спрыяла знаходжанне мястэчка на скрыжаванні дарог, што вялі да Полацка, Глыбокага, Барысава, Мінска, Вільні і інш. І яўрэі актыўна займаліся гандлем: *«А яшчэ еўрэйскія ж магазіны былі два… Што хочаш пакупай! А еўрэі ў долг давалі, ты ўсё раўно аддаш, у долг што хочаш бяры,*

ён тока запішыць, што ты должан, і ўсё аддаваў» (За першымі саветамі: польска-беларускае памежжа 1939–1941 гг. у вусных успамінах жыхароў Беларусі. – Мінск, 2019).

Падобныя ўспаміны фіксуюцца ў жыхароў вёсак даволі часта. Гэта абумоўлена тым, што традыцыйна асноўным гаспадарчым заняткам сялянаў было земляробства, а яўрэям давяралі тавар для гандлю, ці наадварот, збывалі ў яўрэйскія крамы па дамовах: «*А да дзеда прыехаў этат, яўрэй. Ну па нейкіх там дагаворах, яны ж заключалі дагаворы, вот, яўрэі, яны перакуплівалі, тады дзе-та прадавалі. Каб ужо дзед не сядзеў кажды раз на этам самам»* (Я. Д. Касцюк).

Цікавым фактам, зафіксаваным аўтарам гэтага артыкула, з'яўляецца прыклад самастойнага вырабу сялянамі магільных помнікаў: *«На гэных. Тады ўжо на тых харанілі. І ў Камайску ёсць такі. Дык вот, а папа ўжо рабіў па маіх братах, яны маладзенькія памерлі, дык яны што скаваны з жалеза, сам скаваў, а цамент прыйшлось замяніць. А вот як яны рабілі (прадзед помнікі), што яны туды набілі, ці што, но ты прэдстаўляешь, што яны до сіх пор. З 33-га года»* (Я. Д. Касцюк). У параўнанні з помнікамі, што ўсталёўвалі паны, помнікі сялянаў выраблялiся з цэменту. Паны ставілі гранітныя помнікі, а некаторыя маглі дазволіць пабудаваць склеп: «*Тут жа ў нас маладая панна памерла да вайны. Яна памерла, яе ўсе паважалі. Ну, магілка ёсць магілка. Вось мама казала, глядзі, каб на магілке ніколі не аліядку не з'ела. Не патаму шта там эці самыя, штоб паважалі. Сказалі, нельзя і ўсё. Нельзя значыць нельзя. Так там жа её памятнік зцягнулі»* (Я. Д. Касцюк).

Вусныя ўспаміны жыхароў Докшыцкага раёна сведчаць, што тут не існавала варожага стаўлення да прадстаўнікоў іншых веравызнанняў. У саміх Докшыцах былі сінагога, мячэць, две царквы і касцёл. І на сённяшні дзень не існуе перашкодаў у выглядзе падзелу на «ўсходнікаў» і «заходнікаў».

Літаратура

1. Довоенная польская топографическая карта центральной Беларуси [Электронный носитель]: ЭТО МЕСТО // http://www.etomesto.ru/map-belarus_zapad/. – Дата доступа: 10.12.2019.

2. Запісана ў 2019 г. Згірскім Ю. І. ад Казачонак Ефрасінні Аляксандраўны, 1940 г.нар., в. Восава, Докшыцкі р-н, Віцебская вобласць.

3. Запісана ў 2009 г. Аўсейчыкам У. Я. ад Аўласевіч Клаўдзіі Пятроўны, 1940 г.нар., в. Бірулі Докшыцкі раён.

4. Запісана ў 2009 г. Філіпенкам У. С. і Зенько В. ад Хілько Лідзіі Рыгораўны 1932 г.нар., в. Несцераўшчына, Докшыцкі раён.

5. Запісана ў 2019 г. Згірскім Ю. І. ад Касцюка Якава Давыдавіча 1933 г.нар., в. Восава, Докшыцкі р-н.

6. Запісана ў 2019 г. Згірскім Ю. І. ад Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны 1954 г.нар., в. Янкі, Докшыцкі р-н.

7. Рижский трактат. Полный текст [Электронный носитель]: INOSMI.BY // https://inosmi.by/2015/05/26/rizhskij-traktat-polnyj-tekst//. – Дата доступа: 10.12.2019.

8. За першымі саветамі: польска-беларускае памежжа 1939–1941 гг. у вусных успамінах жыхароў Беларусі [Тэкст] // Уклад. канд. гіст. н. В. Івановай; пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука. – Мінск : Зміцер Колас, 2019. – С. 255.

9. Шлях да ўзаемнасці: матэрыялы XVII міжнароднай навуковай канферэнцыі [Тэкст] / рэдкал.: Г. Хацкевіч, Я. Панькоў, Э. Ярмусік, І. Папоў [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2011. – С. 203–206.

ЯЎХІМ КАРСКІ І ЯГО ЎНЁСАК У РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎСТВА

Кірдзік Дзяніс Мікалаевіч,
студэнт
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»,
г. Мінск

У гісторыі кожнага народа ёсць асобы, якія вылучаюцца сярод астатніх сваёй прагай да новых ведаў, прагай да адкрыцця, прагай да пазнання сябе і тых, хто жыве побач, у адной краіне. Для Беларусі такой асобай з'яўляецца Яўхім Карскі.

Карскі даследаваў розныя сферы жыцця беларусаў у канцы XIX – пачатку XX ст. Ён з'яўляецца адным з самых знакамітых навукоўцаў нашай зямлі, зрабіў значны ўнёсак і ў краязнаўства. Пагэтаму менавіта Яўхім Фёдаравіч з'яўляецца тым, пра чыю навуковую дзейнасць у галіне краязнаўства варта распавесці.

Карскі Яўхім Фёдаравіч (01.01.1861 – 29.04.1931) нарадзіўся ў в. Лаша Гродзенскага раёна. Ён першы беларускі акадэмік, заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, філолаг-славіст, этнограф, фальклярыст, палеограф, педагог. Акадэмік Пецярбургскай АН, прафесар, дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта і рэктар Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта, правадзейны член Інстытута беларускай культуры, Чэшскай АН, ганаровы член Віцебскай губернскай вучонай архіўнай камісіі [3].

Усё жыццё прысвяціў вывучэнню Беларусі, яе мовы, культуры, традыцый. Нарадзіўся ў шматдзетнай сям'і. Ужо з юнацтва праяўляў цікавасць

да роднай мовы. Першай навуковай працай была «Агляд гукаў і форм беларускай мовы». Затым яшчэ дзясяткі розных прац і артыкулаў. Самыя знакамітыя з іх: фундаментальная трохтомная праца «Беларусы» і «Славянская кірылаўская палеаграфія» [1].

Вялікая ўвага вучоным надавалася фальклору, этналогіі і быту. Так, Вітаўт Тумаш у сваёй працы «Яўхім Карскі: жыццё, навуковая спадчына, погляды (1861–1931)» адзначае: «У сваім собскім запісе Карскі апублікаваў больш ста беларускіх народных песняў, значны лік замоваў, абрадаў, казак. Шмат беларускага фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу было сабрана і пазней апублікавана і дзякуючы апрацаванай Карскім з даручэння Акадэміі навук «Программы для собирания особенностей белоруских говоров», што была выдадзена ў 1897 г., а перавыдадзена ў 1916 г. Хоць апытальнік гэты меў служыць выданню ды збору беларускіх моўных асаблівасцяў, аднак-жа ў публікаваных колькі дзясяткаў прысланых адказаў ёсць і шмат запісаных песняў, казак, прыказак, прымавак, замоваў ды абрадаў. Шырокае апісанне беларускае абраднасці і народнай творчасці Карскі даў пазней у першай кнізе III тому «Беларусаў» [2]. Адсюль можна зрабіць выснову, што Яўхім Фёдаравіч, даследуючы ў асноўным беларускую мову, зрабіў велізарны ўнёсак у краязнаўства Беларусі і, па сутнасці, быў заснавальнікам сучаснага беларускага краязнаўства, а яго трохтомная праца «Беларусы» – сапраўдная скарбніца краязнаўчага матэрыялу, дзе апісаны моўныя, культурныя і побытавыя асаблівасці кожнага рэгіёну нашай краіны.

Так, у томе III можна ўбачыць цэлы шэраг краязнаўчых матэрыялаў. Яўхім Фёдаравіч клапатліва збіраў свае матэрыялы, каб паказаць багацце беларускай мовы. У раздзеле «Загаворы» прыведзены замовы з кожнага рэгіёну Беларусі: Магілёў, Віцебск, Ельня [4, т. III]…

Бачна, што для кожнага рэгіёну характэрны свае асаблівасці. Прыведзены ў працы і шматлікія беларускія абрадавыя песні [4, т. III]. Іх зборам таксама займаўся Яўхім Карскі. Ён таксама адзначаў, што для кожнага рэгіёну характэрны свае песні і іх выкананне [4, т. III]. Навуковец таксама прааналізаваў тое, як змяняліся песні і абрады ад дахрысціянскіх часоў.

Што тычыцца абрадаў, то найбольш яскрава паказваюцца адрозненні ў абрадзе калядавання. Немалаважную ролю адыгрываюць абрады з хлебам і г.д. [4, т. III].

Менавіта рэгіянальныя асаблівасці і даюць тую краязнаўчую базу, на якую абапіраецца цяперашняе краязнаўства. Кожны раён Беларусі і да сённяшняга дня зберагае свае традыцыі. Характэрна, што заходнія рэгіёны – Ашмяншчына, Навагрудчына і іншыя – адрозніваюцца ад усходніх: Смаленшчыны, Гомельшчыны і г.д. Нягледзячы на асаблівасці, можна прагледзець, што ёсць шмат таго, што іх аб’ядноўвае.

Такім чынам, трэці том працы «Беларусы» дае вялікую краязнаўчую базу. Даследаванні Я. Карскага ў галіне этналогіі, мовазнаўства і культаралогіі склалі аснову для краязнаўства цяперашняга часу.

На працягу 48 гадоў навуковай працы Яўхім Фёдаравіч Карскі напісаў 1016 прац. І ўсе да адной яны прысвечаны Беларусі [1].

Як у любога выбітнага навукоўца, у Яўхіма Фёдаравіча былі і свае вучні. Найбольш вядомым з іх быў Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч.

Сцяпан Міхайлавіч таксама займаўся вывучэннем беларускай мовы. Дзякуючы яго намаганням з'явіліся першыя дыялектычныя слоўнікі, расейска-беларускія слоўнікі [5].

Займаючыся вывучэннем мясцовых гаворак, С. Некрашэвіч немінуча сутыкаўся і з рэгіянальнымі асаблівасцямі. Такім чынам, праца па назапашванні краязнаўчага матэрыялу пашыралася і займала сваё месца ў беларускай навуцы.

Такім чынам, акадэмік Карскі пакінуў пасля сябе вялізную спадчыну. Дзякуючы яму зарадзілася сучасная беларуская навука ў цэлым і яе асобныя галіны: краязнаўства, этналогія, мовазнаўства і інш. Шматграннасць асобы Карскага выклікае цікавасць у любога даследчыка, які займаецца гісторыяй і гістарычнымі дысцыплінамі. Як адзначалася раней, дзякуючы Яўхіму Фёдаравічу назапашаны вялізны краязнаўчы матэрыял, які выкарыстоўваецца да нашага часу.

Памяць пра знакамітага навукоўца шануецца яго землякамі. У яго роднай вёсцы Лаша створаны мемарыяльны музей імя Я. Карскага. У Гродне абласная бібліятэка названа імем знакамітага навукоўца.

Літаратура

1. Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага // Легенды Гродзеншчыны // Галерэя знакамітых асоб // Яўхім Карскі [Электронны рэсурс]. – 2019. – Рэжым доступу: https://legendy.grodnolib.by/html/Karski_Jawhim_Fjodaravich.html.php. – Дата доступу: 26.12.2019.

2. Pawet // Электронная старонка горада Ліда // Вітаўт Тумаш // Яўхім Карскі: жыццё, навуковая спадчына, погляды (1860–1931) // Вітаўт Тумаш // Выбраныя працы. – Мінск, 2002 [Электронны рэсурс]. – 2019. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/o_philology/150/%D0%A2%D1%83%D0%BC%D0%B0%D1%88_%D0%92i%D1%82%D0%B0%D1%9E%D1%82._%D0%AF%D1%9E%D1%85%D1%96%D0%BC_%D0%9A%D0%B0%D1%80%D1%81%D0%BA%D1%96.html. – Дата доступу: 26.12.2019.

3. Афіцыйны сайт БДУ // Наши предшественники // Яўхім Фёдаравіч Карскі [Электронны рэсурс]. – 2019. – Рэжым доступу: https://bsu.by/ru/main.aspx?guid=315671&map=315671. – Дата доступу: 26.12.2019.

4. Е. Ф. Карский «Белорусы» (в трёх томах) [Электронны рэсурс]. – 2019. – Рэжым доступупу: https://zapadrus.su/bibli/etnobib/133-qq.html. – Дата доступу: 26.12.2019.

5. Газета «Звязда» // Гісторыя і этнаграфія // Сцяпан Некрашэвіч – грамадскі дзеяч і арганізатар беларускай навукі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/be/news/20131022/1382436966-scyapan-nekrashevich-gramadski-dzeyach-i-arganizatar-belaruskay-navuki. – Дата доступу: 26.12.2019.

ВОЗМОЖНОСТИ ТУРИСТСКОГО ОСВОЕНИЯ МАЛЫХ ГОРОДОВ БЕЛАРУСИ КАК КОМПЛЕКСНЫХ ОБЪЕКТОВ ЭТНОКУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ

Ольгомец Валерия Васильевна,
студентка,
Белорусский государственный университет,
г. Минск

Малые городские поселения являются широко распространенной и устойчивой во времени категорией населенных мест Беларуси. Именно эти города являются региональными центрами, буферными зонами между крупными урбанизированными центрами и сельскими поселениями. В них мало мест приложения труда, что снижает престижность и привлекательность проживания в них. Очевидно, что для ряда регионов, не располагающих значимым промышленным либо сельскохозяйственным потенциалом, реальной возможностью социально-экономического подъема становится ориентация на культурное достояние. Актуальность темы определяется интенсивно возрастающим спросом на туристско-экскурсионные услуги при малой разработанности туристических продуктов с акцентом на этнокультурную составляющую. Гипотеза-основание: каждая обитаемая в прошлом территория любого таксономического ранга – от макрорегиона до конкретной местности – с относительно развитой инфраструктурой, эффективным продвижением может стать полигоном для создания и реализации туристских продуктов этнокультурного туризма.

Цель исследования: выработка подхода к туристскому освоению малых городов, обладающих индивидуальным этнокультурным потенциалом, с последующим продвижением уникального продукта. Для достижения цели поставлены следующие задачи:

1. Рассмотреть теоретико-методологические основы и практические аспекты развития этнокультурного туризма.

2. Выявить особенности, условия и направления деятельности малых городов.

3. Проанализировать возможности использования материального и нематериального культурного наследия г. Давид-Городок как одного из малых городов Беларуси.

4. Разработать макет конкурентоспособного туристского продукта, объединяющего различные формы туристической активности с последующим продвижением его на рынок.

Этнокультурно-туристский потенциал – совокупность различных категорий объектов и явлений этнографического, социокультурного, историко-культурного, природно-экологического и экономического порядка, более или менее значимых для организованного и самодеятельного туризма на определённой территории на современном этапе и в обозримой перспективе [1]. Малые города Беларуси – это особенные культурные ландшафты, многие из них сохранили памятники архитектуры и градостроительства: ценные фрагменты исторической планировки и застройки, уникальные ансамбли и памятники, рядовую застройку прошлых лет. Сегодня активно используется потенциал наличия архитектурных достопримечательностей одних малых городов (Радзивилловский комплекс в Несвиже, наследие Тышкевичей вВоложине и т.д.) при полном отсутствии работы в данном направлении в других городах. Неотъемлемой частью традиционной культуры являются народные промыслы и ремесла (соломоплетение, народный текстиль, керамика), старинные обряды. Преимущества нематериального наследия уже начинают осознаваться во многих «этнических» регионах, что проявляется в приобщении к событийному туризму посредством проведения праздников урожая, фестивалей, трансляции старинных обрядов.

Для определения возможности создания туристско-рекреационного продукта этнокультурной направленности нами оценен потенциал одного из малых городов (г. Давид-Городок, Брестской обл.). Выявлено, что в бывшем местечке сохранилось множество самобытных памятников архитектуры и быта. Отмечена высокая степень этнической уникальности населения, сложившаяся в процессе длительной обособленности жителей города, а также аккультурации населявших его народов [2].

1) Город отличается высокой степенью этнокультурной уникальности, сложившейся в процессе длительной обособленности жителей, а также аккультурации населявших его народов.

2) Композиционная структура города может содействовать организации туристско-рекреационной деятельности.

3) Нематериальное культурное наследие имеет достаточный потенциал: а) Сохранились традиционные праздники и обряды; б) В городе существует уникальный язык с большим количеством диалектизмов; антропонимы и ур-

банонимы также имеют свои отличительные черты; в) Для жителей города характерен нетипичный вид занятости – семеноводство.

4. На базе имеющихся объектов и явлений материального и нематериального культурного наследия города предлагается развивать этнокультурный туризм. Для этого разработан макет развития туристской дестинации.

Литература

1. Бутузов А. Г. Этнокультурный туризм: учебное пособие / А. Г. Бутузов. – М. : КНОРУС, 2013. – 248 с.

2. Шелехов М. В. Давид-Городок. Время и люди. – Брест : брестское управление по печати, 2000. – 304 с.

МЕСТА ПАМЯТИ О ГЕНОЦИДЕ ЕВРЕЙСКОГО НАСЕЛЕНИЯ НА ПРИМЕРЕ ГЛУБОКСКОГО ГЕТТО

Скрабатун Юлия Игоревна,
студентка
УО «Полоцкий государственный университет»,
г. Новополоцк

Накануне нацистского вторжения в Советский Союз в июне 1941 года еврейское население было третьей по величине этнической группой на белорусских территориях и во многих случаях составляла около 50% от общего количества городского населения [6].

Реализация политики «окончательного решения еврейского вопроса» в Беларуси началась практически с момента нацистской оккупации в 1941 году. Согласно административному распоряжению № 1 командующего тылом группы армий «Центр» генерала пехоты М. фон Шенкендорфа от 7 июля 1941 года вводились отличительные знаки для еврейского населения: «Все евреи и еврейки, которые находятся на занятой русской территории и достигшие десятилетнего возраста, обязаны носить на правом рукаве верхней одежды и платья белую полосу шириной до 10 см с нарисованной на ней сионистской звездой или жёлтую повязку шириной до 10 см. Такими повязками обеспечивают себя сами евреи и еврейки». Евреям также запрещалось выезжать из местности проживания, пользоваться тротуарами, общественным транспортом, местами и учреждениями отдыха, посещать театры, библиотеки, больницы [5].

Следующим этапом гитлеровской политики было отделение евреев от других жителей и создание гетто. Созданием гетто занимались военные комендатуры, службы полиции безопасности, СД и айнзатцгруппы (мобильные военные подразделения, созданные накануне войны), если одномоментная ликвидация евреев представлялась им невозможной [2].

Нацисты вошли в Глубокое 2 июля 1941 года. Приступили к истреблению еврейского населения в августе 1941 года, начав с расстрела 42 жителей города [3].

Стремясь оградить еврейское население от насилия оккупантов, Гершон Ледерман, руководитель глубокского юденрата, принял меры для установления с ними взаимовыгодных отношений. Он предложил властям разрешить юденрату самостоятельно направлять евреев на выполнение нужных нацистам работ, стал создавать ранее отсутствовавшие в Глубоком производства необходимых немцам вещей. Полагая, что нужных евреев нацисты сохранят, юденрат продолжал развивать с ними диалог. Однако диалог был бессмысленный, так как был план по уничтожению еврейского населения, о котором данное население ещё не знало. После Ванзейской конференции в январе 1942 года высших чинов СС и СД был доработан и рекомендован к исполнению план «окончательного решения» еврейского вопроса. Уничтожение евреев Европы обрело более высокий статус, став государственной задачей Третьего рейха [3].

Немецкая гражданская власть появилась в Глубоком в сентябре 1941 года, а вслед за этим там было организовано еврейское гетто. К тому времени из ряда местечек восточной Польши, Литвы, Беларуси, где нацистские акции уничтожения еврейского населения уже состоялись, в город стали бежать выжившие тамошние евреи. По словам очевидца событий И. Лапицкого: «…при расстреле Дисненского гетто множество евреев, спасаясь бегством, укрылось в лесу. Тогда немцы объявили, что все оставшиеся евреи могут прийти в Глубокое для отправки в Палестину. Нашлись те, кто поверил в обман» [8].

Систематическое уничтожение узников началось с декабря 1941 года. Местный житель Х. Гительзон вспоминал: «Очень хорошо помню первый расстрел евреев. Всех согнали на рынок, который находился на Физкультурной улице. Большого роста немец выкрикивал: “Лево – право, лево – право…” Таким образом он проводил отбор евреев. Кому уже идти в яму, а кому еще жить» [9].

После состоявшегося 25 марта 1942 года неспровоцированного расстрела фашистами в пригородном лесу Борок 110 жителей гетто, руководители юденратане прекращали сотрудничество с немцами в надежде на спасение [3].

В мае 1942 года произошло насильственное переселение силами еврейской полиции в беднейший район гетто неспособных к физическому труду «бесполезных» евреев – старых и слабых, калек. Так с согласия юденрата было сформировано гетто внутри гетто [3].

20 июня 1942 года нацисты провели в Глубоком (урочище Борок) казнь 2 200евреев. Это были как и евреи из недавно созданного гетто, так и другие евреи с основного гетто. Из рассказа М. Шапиро: «Раздетым евреям приказывали ложиться в ямы лицом вниз, а затем выстрелом в голову убивали. После расправы немцы собрали всю одежду убитых для продажи в своих магазинах. Всего было убито 2 200 человек». Данная акция уничтожения еврейского населения была также способом запугивания узников, чтобы подорвать желание к сопротивлению [1].

Наряду с активизацией строительства убежищ, стали формироваться новые группы сопротивления. Правда, отсутствие единого руководства эти группы разобщило – одни решили защищаться дома, другие предпочли уйти к партизанам. После 20 июня 1942 года из глубокского гетто ушла в лес не одна вооруженная группа, а всего в партизанских отрядах с фашистами сражалось более 60 евреев [3].

В июле 1942 года гебитскомиссар Глубокого дал приказ о том, чтобы всё еврейское население округа собралось в Глубокском гетто уверяя, что расстрелов больше не будет. Были выданы пропуска членам еврейского совета для различных поездок, чтобы искать оставшихся евреев. В это время в Глубокое было собрано еврейское население из 42 окрестных городов и местечек: Друи, Миор, Прозорок, Шарковщины и других [4].

17 августа 1943 г. действовавший в этой местности полк Родионова из армии Власова, разгромив немецкий гарнизон станции Крулевщизна и прибывших к нему на помощь подразделений глубокского гарнизона, объединился с партизанами. Опасаясь возможности усиления этого объединения узниками гетто, немцы решили депортировать глубокское гетто в Майданек. Но они столкнулись с акцией сопротивления [3].

Молодежь концлагеря созвала раду, где решила через партизан достать взрывчатые вещества, заминировать все местные органы управления и в эту же ночь поднять восстание и организовать массовый выход из гетто. Имеющееся оружие и боеприпасы 18 августа в 5 часов утра были распределены между всеми, кто умел с ними обращаться. Восстание, организованное Либерманом, началось 19 августа 1943 г. По заранее установленному сигналу (взрыв гранаты и крик «ура») все пошла на прорыв. Завязался бой, были брошены гранаты, зажжён полицейский пост. Немцы старались подавить восстание, но евреи стойко сопротивлялись. Один бункер немцы не могли взять в течение дня [7].

По показаниям очевидцев и участников этого восстания Пинтова и других, было убито и ранено около 100 гитлеровцев [7].

Депортация в лагерь смерти была сорвана. В свою очередь был отдан приказ о расправе с еврейским населением не вывозя его. Гетто подожгли с низколетящих самолетов, сбрасывали зажигательные бомбы, одновременно стреляя в людей [3; 4; 7, с. 6].

Списки узников гетто сгорели вместе с юденратом. Уничтожение гетто Глубокого остается одной из наименее исследованных страниц гибели восточноевропейских евреев. Трудность исследования этих трагедий вызвана не только крайне ограниченным числом выживших свидетелей, но и скудностью информации, которой они располагали [3].

По итогам гетто в Глубоком было уничтожено самым последним в Витебском регионе – в августе 1943 года [4].

Места массового уничтожения еврейского населениядолгое время оставались без присмотра и памятных знаков, но эта проблема касалась и мест памяти белорусского народа в целом. Но стоит отметить, что евреи как национальность не указывались инаравне с остальными именовались «советскими гражданами».

Таким образом власть пыталась нивелировать альтернативные общесоветской версии идентичности, в том числе и не допуская формирования особой еврейской идентичности, основанной на памяти о Катастрофе, в рамках СССР.

Но с обретением независимости Беларуси ситуация изменились и на местах уничтожения бывших узников в том числе и Глубокского гетто появились памятники – два в урочище Борок и один на бывшей улице Легионовой. Воздвигнуты благодаря инициативе Рахили Иоффе (Клебановой) из Израиля, заботе, настойчивости и личным средствам Артура Льва из Германии. Существенную помощь им оказали Залман и Дон Фейгельсоны из США и Лейб Иоффе из Израиля [3].

Литература

1. Акт по расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков и их сообщников в г. Глубокое и Глубокском районе // Зональный государственный архив в г. Полоцк. Ф. 687. Оп. 1. Д. 1. Л. 55 а, 55 б.

2. Гетто // Энциклопедия Холокоста [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.ushmm.org/wlc/ru/article.php?ModuleId=10005059. – Дата доступа: 08.05.2018.

3. Едидович, В. Глубокое. История о рождении и гибели одного из старейших еврейских ишувов Восточной Европы / В. Едидович, Г. Гольдман // Моё местечко [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://shtetle.com/Shtetls/glubokoe/edidovich.html. – Дата доступа: 15.12.2019.

4. Корсак, А. «Чтобы не стала планета печальным гетто…». Трагедия евреев Беларуси во время Великой Отечественной войны / А. Корсак // Родина. – 2008. – № 7. – С. 116–119.

5. Корсак, А. І. Знішчэнне яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 1941–1943 гг. / А. І. Корсак // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта ім. А. А. Куляшова. – 2007. – № 2–3 (27). – С. 18–23.

6. Космач, Е. Что белорусы помнят о Холокосте / Е. Космач // thinktanks.by [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://thinktanks.by/publication/2018/02/18/chto-belorusy-pomnyat-o-holokoste.html. – Дата доступа: 08.05.2018.

7. Нордштейн, М. Погибать – так в бою. Свидетельствуют документы // Авив. № 09–10 (214–215), сентябрь-октябрь, 2014.

8. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. Мінск. 1998. С. 265.

9.Пашковіч, Л. Памяць людская ўсё зберагла // Веснік Глыбоччыны. 1993. 21 верасня.

КУЛЬТОВЫЕ ИСТОРИЧЕСКИЕ ОБЪЕКТЫ, СВЯЗАННЫЕ С ПЕРЕПРАВОЙ НАПОЛЕОНОВСКОЙ АРМИИ ЧЕРЕЗ РЕКУ БЕРЕЗИНУ В ХОДЕ ВОЙНЫ 1812 ГОДА

Траскевич Рафаэл Рафикович,
студент
УО «Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка»,
г. Минск

Война 1812 года драматическим и судьбоносным событием в истории нашей страны; столкновение двух империй, полем боя для которых стала в том числе и Беларусь, привело к очередной демографической и культурной катастрофе. Переправа через Березину, забравшая жизни не только значительной части французской армии, но и большое количество местных мирных жителей, по всей видимости, является самым трагическим моментом в исторической памяти данного периода времени. С целью увековечиванияпамяти об участии, жертве и героизме нашего народа в этой войне создаются музеи, устанавливаются памятники, организуются археологические раскопки, проводятся военно-исторические реконструкции.

Сегодня в Борисове принимает посетителей«Борисовский объединенный музей», где собраны артефактов военных действий, связанные с присутствием на территории современной Беларуси Наполеона, разного рода

иллюстрации и статистические данные, постоянно проводятся экскурсии для желающих узнать как можно больше об истории нашей страны. Близ деревни Студенки, реки Березины находится рядкультовых памятников, которые являются бессмертными символами героизма и страданий людей, участвовавших в противостоянии с обеих сторон. В данной работе представлены важнейшие краеведческие объекты, представляющие собой культурно-историческую ценность и связанные с переправой Наполеона через Березину.

Еще до начала непосредственно военных действий было понятно, что конфликт неизбежен. Именно поэтому на правом берегу реки Березины в Борисове было начато строительство фортификационных сооружений. Весной 1812 г. у моста возводятся редуты (2), соединенные ретраншементом. Но в итоге достроить сооружение до конца не удалось, и 11 июля Борисов заняли авангардные части войска Даву [3]. Символично, что французы собирались уничтожить недостроенные сооружения, но не успели. Остатки фортификаций стали первым масштабным памятником военных действий на территории Беларуси. Памятник был взят под охрану еще при советской властив 1926 г. [1]. Сегодня же, согласно постановлению Министерства культуры Республики Беларусь от 14 сентября 2012 г. № 60, утвержден проект зон охраны историко-культурной ценности «Остатки земляных фортификационных сооружений «Батарея» в г. Борисове Минской области» [2].

Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14 мая 2007 г. № 578 памятное место, связанное с событиями войны 1812 года, которое расположено в д. Студенка Борисовского р-на, является историко-культурной ценностью категории «3», внесенной в Государственный список историко-культурных ценностей Республики Беларусь [2]. «Памятное место, связанное с событиями Отечественной войны 1812 г., в д. Студенка Борисовского района Минской области» является важнейшим элементом в системе памятников и охранных зон в Борисове и близ него. Связано это в первую очередь с тем, что здесь погибло большое количество людей – как жителей Борисова, так и солдат наполеоновской армии» [1].

Еще один памятник, знак-указатель, расположенный по дороге из Борисова в Студенку, был установлен уже после войны с Наполеоном (в 1836 г.) полководцем войны 1812 года Яковлевым в виде бревна. В 1965 г. был сооружен знак в виде стелы высотой 3,2 м. Так он выглядит и сегодня [5].

К 150-летию войны 1812 года ожидался приезд французской делегации, в связи с которым на месте старого памятника была воздвигнута стела в виде гранитного валуна с мраморной плитой. Помимо сохранения исторической памяти, стела выполняет интегративную функцию, поскольку объединяя и французов, и белорусов, и русских вокруг общего прошлого.

Еще один памятник, посвященный жертвам войны, создан в античном стиле и изображает сраженного юношу. Он символизирует трагический уход из жизни молодых людей разных вероисповеданий, конфессий и национальностей. Памятник открыт 17 ноября 2002 г. [1].

Верхние грани памятника символизируют холодные воды Березины, в которой погибло немало французских завоевателей. Авторы памятника – скульптор А. Е. Артимович и архитектор И. В. Морозов [1].

По счастливой случайности были обнаружены два моста переправы наполеоновского войска. Нашел их И. Х. Колодеев – один из специалистов по вопросам военной кампании 1812 года исостоятельный человек, от которого до сегодняшнего дня дошли потрясающие коллекции книг идом-усадьба. По его инициативе и были созданы два идентичных памятника в виде четырехгранных пилонов и барельефов с изображениями Наполеона и Александра I. Увы, до нас памятники не дошли – они были уничтожены в советский период. К счастью, в 2002 г. на месте верхнего моста был восстановлен памятный знак [1].

